Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**С.В.ЗЫГМАНТОВІЧ**

# АРГАНІЗАЦЫЯ І ТЭХНАЛОГІЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў спецыяльнасці
«бібліятэказнаўства і бібліяграфія» ўстаноў,
якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі*

Мінск 2006

УДК 025.5
ББК 78.58я7
З 96

**Рэцэнзенты**

*С.І.Івашчанка,* галоўны бібліёграф даведачна-інфармацыйнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь;

*Л.І.Ракавецкая,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт Беларускага інстытута праблем культуры;

*В.І.Саітава,* дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, кандыдат педагагічных навук БДУ культуры і мастацтваў.

**Зыгмантовіч, С.В.**
**З96** Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці: вучэб. дапам. – Мн.:БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325с.

ISBN 985-6798-04-3.

Вучэбны дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з аднайменнай тыпавой праграмай курса. У ім раскрываюцца пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь у розных тыпах бібліятэк, а таксама тэхналагічныя і метадычныя асаблівасці асноўных кірункаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Прызначаны студэнтам факультэтаў інфармацыйна-дакументных камунікацый ВНУ. Можа быць карысным для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных установ, супрацоўнікаў, якія выконваюць бібліяграфічныя функцыі ў сістэме інфармацыйна-дакументных камунікацый.

ББК 78.58я7

ISBN 985-6798-04-3

© С.В.Зыгмантовіч, 2006
© Вокладка Л.А.Малахавай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА** ........................................................................ 6

**Раздзел I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ** ........................................................................ 9

**Глава 1. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь** ........................................................................ 9

1.1. Бібліяграфічная дзейнасць: азначэнне і асноўныя напрамкі ........................................................................ 9

1.2.Бібліяграфічная дзейнасць: арганізацыя, методыка і тэхналогія ........................................................................ 11

1.3. Агульныя пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці 14

1.4. Цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь 18

1.5. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь ........................................................................ 29

1.6. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці Беларусі з замежнымі ўстановамі і арганізацыямі ................................ 38

**Глава 2. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы** ........................................................................ 45

2.1. Агульныя пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы ........................................................................ 45

2.2. Асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў ......................... 48

2.3. Бібліяграфічнае падраздзяленне бібліятэкі і яго асноўныя функцыі ........................................................................ 56

2.4. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі ........................................................................ 64

**Раздзел II. ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ БІБЛІЯТЭКІ** ........................................................................ 67

**Глава 3. Агульныя пытанні арганізацыі ДБА бібліятэкі** .... 67

3.1. Азначэнне, функцыі, уласцівасці, прынцыпы і метадычныя патрабаванні да арганізацыі ДБА ........................................... 67

3.2. Структура ДБА і задачы бібліятэк па яго развіцці ............. 73

**Глава 4. Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі** ................ 77

4.1. Каталогі бібліятэкі ........................................................................ 78

4.2. Картатэкі і базы даных бібліятэкі ........................................ 81

4.3. Пошукавыя сістэмы ў інтэрнэце ........................................ 93

**Глава 5. Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі** 107

5.1. Азначэнне, структура, камплектаванне і арганізацыя ДБФ у бібліятэках ........................................................................ 107

5.2. Афіцыйныя дакументы і БД прававой інфармацыі ў ДБФ бібліятэкі ........................................................................ 114

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.3. Даведачныя выданні і фактаграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі ........ 118
5.4. Даведачныя рэсурсы ў інтэрнеце ........ 124
5.5. Бібліяграфічныя крыніцы ў ДБФ бібліятэкі ........ 126
5.6. Крыніцы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі ........ 127
5.7. Крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі ........ 140
5.8. Крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі ў ДБФ бібліятэкі ........ 155
5.9. Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі ........ 159
5.10. Бібліяграфічныя базы даных у ДБФ бібліятэкі ........ 177
5.11. Крыніцы папулярнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі ........ 184
5.12. Бібліяграфічныя рэсурсы ў інтэрнеце ........ 190
5.13. Паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў у ДБФ бібліятэкі ........ 196
5.14. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў.... 209

**Раздзел III. АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ** ........ 213
**Глава 6. Тэхналогія і методыка падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў: агульныя пытанні** ........ 213
6.1. Тэхналагічная характарыстыка падрыхтоўчага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў ........ 215
6.2. Тэхналагічная характарыстыка аналітычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў ........ 219
6.3. Тэхналагічная характарыстыка сінтэтычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў ........ 225
6.4. Тэхналагічная характарыстыка заключнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў ........ 229
6.5. Тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі ........ 234

**Раздзел IV. АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ** ........ 241
**Глава 7. Спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі і асноўныя метады вывучэння іх інфармацыйных патрэбнасцей** ...... 241
7.1. Паняцце і сутнасць інфармацыйных патрэбнасцей ........ 241
7.2. Метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей ........ 244
7.3. Асноўныя групы спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі ў бібліятэках розных тыпаў і асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей ........ 246

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Глава 8. Бібліяграфічнае абслугоўванне: агульныя пытанні** .......... 249
8.1. Масавыя формы бібліяграфічнага інфармавання .......... 250
8.2. Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне.......... 255
8.3.Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне з выкарыстаннем аўтаматызаваных тэхналогій .......... 261
**Глава 9. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: агульныя пытанні** .......... 263
9.1. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання .......... 268
9.2. Асаблівасці выканання розных тыпаў даведак .......... 272
9.3. Аўтаматызаваная тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання .......... 278
9.4. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з выкарыстаннем сродкаў інтэрнета .......... 284

**Раздзел V. ФАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СПАЖЫЎЦОЎ ІНФАРМАЦЫІ** .......... 296
**Глава 10. Агульныя пытанні фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі** .......... 296
10.1. Формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі .......... 309
10.2. Асаблівасці фарміравання бібліяграфічнай культуры асобных груп спажыўцоў інфармацыі .......... 317
**ЛІТАРАТУРА** .......... 321

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАДМОВА

Дзейнасць суб’ектаў сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый накіравана на дасягненне дзвюх асноўных мэт – рэалізацыю правоў чалавека на свабодны доступ да ведаў і інфармацыі і захаванне назапашанай культурнай спадчыны краіны. Імкненне Беларусі да ўваходжання ў інфармацыйнае грамадства, сацыяльна-палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні, што адбываюцца ў краіне, прынцыпова мяняюць ролю бібліятэк, цэнтраў інфармацыі, музеяў, архіваў, іншых культурна-інфармацыйных устаноў у развіцці грамадства, абумоўліваюць іх тэхнічную мадэрнізацыю, пераход на новыя інфармацыйныя тэхналогіі, развіццё інтэграцыйных працэсаў. Усе гэтыя інавацыйныя працэсы ўплываюць і на бібліяграфічную дзейнасць суб’ектаў сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый, якая сваімі сродкамі спрыяе больш эфектыўнаму і якаснаму дасягненню пастаўленых перад імі мэт.

Функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве вывучаецца ў межах цыкла спецыяльных бібліяграфазнаўчых дысцыплін, адной з якіх з’яўляецца “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці”. Мэта курса “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці” – даць студэнтам глыбокія веды па арганізацыйных, тэхналагічных, метадычных пытаннях бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, ажыццяўляемай пераважна ў бібліятэках; сфарміраваць уменні і навыкі рэалізацыі асноўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, такіх як стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату, падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў як у традыцыйнай форме, так і бібліяграфічных баз даных, задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў у працэсах бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі, кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю.

Вучэбны дапаможнік па названым курсе падрыхтаваны ў адпаведнасці з тыпавой праграмай; у ім адлюстраваны ўсе раздзелы, акрамя раздзела “Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю”, якому будзе прысвечана самастойнае выданне.

У працэсе вывучэння курса студэнты атрымліваюць уяўленні аб:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асноўных цэнтрах бібліяграфічнай дзейнасці і асаблівасцях выканання імі бібліяграфічных функцый у адпаведнасці з іх месцам і роляй у сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый грамадства;

– кірунках узаемадзеяння цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў новых умовах выкарыстання аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій, стварэння карпаратыўных сетак;

– асаблівасцях структуры бібліяграфічнай службы цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці, у першую чаргу бібліятэк розных тыпаў;

– складзе даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноўнай базы бібліяграфічнай дзейнасці;

– тэхналогіі выканання розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжыме.

Акрамя сказанага, студэнты набываюць уменні і навыкі бібліяграфавання, бібліяграфічнага абслугоўвання, фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў інфармацыі.

Вучэбны дапаможнік “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці" падрыхтаваны з улікам традыцый выкладання гэтай дысцыпліны, якая ўпершыню была ўключана ў вучэбныя планы бібліятэчных факультэтаў з 1983 г. і па якой у 1990 г. быў падрыхтаваны першы падручнік “Библиографическая работа в библиотеке: организация и методика” (пад рэд. А.П.Коршунава). У 2004 г. адбылося другое выданне падручніка пад назвай “Библиографическая деятельность библиотеки: организация, управление, технология» (аўтар Д.Я.Кагаткоў). У адрозненне ад названых падручнікаў у нашым вучэбным дапаможніку разглядаюцца пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, узаемадзеяння бібліяграфічных цэнтраў як у краіне, так і з замежнымі цэнтрамі. У аснове курса – сучасны стан бібліяграфічнага забеспячэння дзейнасці цэнтраў інфармацыйна-дакументных камунікацый Рэспублікі Беларусь, асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках краіны, назапашаныя тэхналага-метадычныя веды, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці бібліяграфічных цэнтраў Беларусі.

У дапаможніку знайшлі адлюстраванне тыя змены ў канцэптуальных падыходах да арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці, сродкаў яе ажыццяўлення, тэхналогій, якія выклікаλаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнымі, эканамічнымі і тэхнічнымі пераўтварэннямі, што адбываюцца ў краіне.

Развіццё сучасных бібліятэк звязана з узмацненнем іх інфармацыйнай функцыі, пераходам ад стратэгіі валодання дакументнымі рэсурсамі да стратэгіі забеспячэння доступу да інфармацыйных рэсурсаў. Сучасныя бібліятэкі ў тэхнічных адносінах становяцца так званымі “гібрыднымі бібліятэкамі”, гэта значыць бібліятэкамі, якія спалучаюць традыцыйныя бібліятэчныя і камп’ютэрныя тэхналогіі і працуюць у аднолькавай ступені з крыніцамі інфармацыі як у традыцыйнай, так і электроннай формах. У сувязі з гэтым у вучэбным дапаможніку пры асвятленні пытанняў, звязаных з фарміраваннем і выкарыстаннем ДБА, разглядаюцца інфармацыйныя рэсурсы трох узроўняў: традыцыйныя карткавыя і друкаваныя выданні, лакальныя электронныя рэсурсы на матэрыяльных носьбітах і аддаленыя электронныя інфармацыйныя рэсурсы. Пытанні тэхналогіі бібліяграфічных працэсаў, кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці раскрываюцца як ва ўмовах выкарыстання традыцыйнай тэхналогіі, так і аўтаматызаванай. Тэндэнцыя да больш цеснай інтэграцыі бібліятэк і каардынацыі іх дзейнасці знаходзіць адлюстраванне ў працэсах фарміравання размеркаванага ДБА краіны, рэгіёна і ў той жа час стварэння зводных частак ДБА, якія павінны спрыяць рацыяналізацыі бібліяграфічнай працы і больш поўнаму задавальненню інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў незалежна ад месца іх пражывання.

Сёння пытанні бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, якія ажыццяўляюцца ў новых умовах, да канца не асэнсаваны, і многія бібліятэкі, інфармацыйныя цэнтры ў працэсе творчай дзейнасці прапануюць цікавыя метадычныя падыходы, звязаныя з фарміраваннем асобных частак ДБА, бібліяграфаваннем электронных дакументаў і інтэрнэт-рэсурсаў, стварэннем разнастайных крыніц бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, правядзеннем работы па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі, што таксама знайшло адлюстраванне ў дапаможніку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел I
# АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## Глава 1. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

### *1.1. Бібліяграфічная дзейнасць: азначэнне і асноўныя напрамкі*

Згодна з міждзяржаўным стандартам 7.0–99 "Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения" пад бібліяграфічнай дзейнасцю разумеецца "сфера дзейнасці па задавальненні патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі". Тэрмін “бібліяграфічная дзейнасць” ужываецца незалежна ад таго, хто ажыццяўляе яе: бібліёграфы ці небібліёграфы, людзі ці тэхнічныя сродкі.

Асноўнымі напрамкамі бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляюцца:

– стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату;

– складанне бібліяграфічных матэрыялаў рознага зместу, прызначэння, формаў;

– бібліяграфічнае абслугоўванне, накіраванае на давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі да спажыўцоў;

– фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў;

– метадычная работа ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці;

– падрыхтоўка і павышэнне бібліяграфічнай кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк;

– навукова-даследчая дзейнасць па пытаннях функцыянавання бібліяграфічнай інфраструктуры;

– кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю.

Асноўныя напрамкі і складаюць змест бібліяграфічнай дзейнасці. У цяперашні час, у перыяд інфарматызацыі грамадства і распаўсюджвання электронных камунікацый, адбываюцца пэўныя змены і ў бібліяграфічнай дзейнасці:

– змяняюцца носьбіты інфармацыі (разам з традыцыйнымі крыніцамі інфармацыі бібліяграфічныя цэнтры працуюць як з лакальнымі, так і сеткавымі электроннымі рэсурсамі);

– змены ў аб'екце бібліяграфавання (дакументальным патоку) прыводзяць да таго, што ён не можа быць структураваны і не можа мець агульнага дапаможнага даведачнага апара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ту, таму што большая частка яго не канцэнтруецца ў бібліятэках, не кантралюецца і не апрацоўваецца па адзінай схеме;

– значна пашыраецца інфармацыйная база бібліяграфічнай дзейнасці за кошт выкарыстання як уласных, так і аддаленых "віртуальных" фондаў і інтэрнет-рэсурсаў;

– мяняюцца сродкі перадачы бібліяграфічнай інфармацыі і іх магчымасці;

– адбываюцца змены ў тэхналогіі ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў;

– карэнным чынам мяняюцца магчымасці абслугоўвання карыстальнікаў. Бібліяграфічнае абслугоўванне ўяўляе сабой прамежкавы этап задавальнення запытаў карыстальнікаў. Апошнія маюць большую магчымасць адразу атрымаць бібліяграфічную інфармацыю ў сукупнасці з тэкстамі неабходных дакументаў, фактаграфічнымі звесткамі, што павышае камфортнасць іх абслугоўвання, эфектыўнасць задавальнення інфармацыйных патрэб. Сучасныя сеткавыя тэхналогіі дазваляюць карыстальнікам атрымліваць падрыхтаваную бібліяграфічнымі цэнтрамі інфармацыю не толькі пры іх непасрэдным наведванні, але і на рабочых месцах або па месцы жыхарства;

– ва ўмовах павелічэння інфармацыйных магчымасцей узрастае роля самаабслугоўвання карыстальнікаў, што ўплывае, з аднаго боку, на пашырэнне абавязкаў бібліёграфаў, якія павінны выконваць функцыі інфармацыйнага брокера – пасрэдніка паміж спажыўцамі і інфармацыйна-пошукавымі сістэмамі, а з другога – бібліёграфы адказныя за фарміраванне бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры карыстальнікаў, грамадства ў цэлым;

– ускладняюцца праблемы камплектавання фондаў, у тым ліку і даведачна-бібліяграфічнага фонду бібліятэк, праблемы доступу да платных інфармацыйных рэсурсаў, якаснага адбору неабходных інфармацыйных крыніц, што патрабуе высокага прафесіяналізму ад бібліёграфаў у рабоце з разнастайнымі носьбітамі інфармацыі;

– узмацняецца тэндэнцыя да больш цеснай інтэграцыі бібліятэк, іншых цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці па стварэнні карпаратыўных сетак, фарміраванні размеркаванага фонду і адпаведна стварэнні сукупнага размеркаванага ДБА краіны, рэгіёна, стварэнні зводных пошукавых сістэм, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павышае інфармацыйныя магчымасці і зніжае эканамічныя затраты кожнага суб’екта бібліяграфічнай дзейнасці.

Такім чынам, роля бібліяграфіі ў век новых інфармацыйных тэхналогій не змяншаецца. Інтэрнет, як паказала, практыка, не з’яўляецца ні панацэяй, ні прычынай, якая садзейнічае адміранню бібліяграфіі. Вельмі часта блытаюцца паняцці патэнцыяльных тэхнічных магчымасцей доступу да інфармацыі з рэальнай даступнасцю каштоўнай інфармацыі. Таму не толькі захоўваецца, але і ўскладняецца роля бібліяграфіі як пасрэдніка ў пераўтварэнні і забеспячэнні доступу да інфармацыі. Існаванне традыцыйных і электронных дакументаў, даступных як у лакальным, так і аддаленым рэжымах, стварае для бібліёграфаў новыя магчымасці, якія дазваляюць ім у складаных сучасных умовах дабівацца высокага ўзроўню бібліяграфічнага забеспячэння навукі, вытворчасці, адукацыі, немагчымых пры выкарыстанні толькі традыцыйных выданняў.

### *1.2. Бібліяграфічная дзейнасць: арганізацыя, методыка і тэхналогія*

У агульнанавуковым сэнсе пад арганізацыяй разумеецца ўстанаўленне мэтанакіраванага парадку і ўзаемадзеяння паміж элементамі сістэмы. У дачыненні да бібліяграфічнай дзейнасці *арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці* трэба разглядаць у некалькіх аспектах: у межах краіны – як сукупнасць устаноў, якія выконваюць бібліяграфічныя функцыі і ўзаемасувязі паміж імі; у межах пэўных інфармацыйных устаноў, бібліяграфічных цэнтраў – як сукупнасць падраздзяленняў, якія выконваюць бібліяграфічныя функцыі і ўзаемасувязі паміж імі; нарэшце, як функцыю кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю, сукупнасць мерапрыемстваў, накіраваных на ўпарадкаванне дзейнасці і стварэнне ўмоў, што забяспечваюць вытворчасць і выкарыстанне бібліяграфічных прадуктаў і паслуг.

Паняцце "*методыка бібліяграфічнай дзейнасці*" абазначае сукупнасць навукова абгрунтаваных прынцыпаў, прыёмаў і правіл, якія садзейнічаюць рацыяналізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Методыка тлумачыць, як, якім чынам вырашаць канкрэтную задачу, якіх правіл патрэбна прытрымлівацца. Яна грунтуецца на тэарэтычных ведах, атрыманых у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работы, навыках і ўменнях. Яе мэта – даць правільныя ўстаноўкі, раскрыць цяжкасці ў рабоце. Складаючымі элементамі методыкі выступаюць метад – метадычнае рашэнне – метадычны савет, метадычны прыём. Вынікам методыкі з'яўляецца замацаванне атрыманага вопыту, стварэнне ўмоў для яго выкарыстання, распаўсюджвання найбольш эфектыўнага варыянта з усіх магчымых і існуючых на практыцы.

*Тэхналогія* – гэта сукупнасць працэсаў, аперацый і сродкаў іх рэалізацыі, прымяненне якіх забяспечвае вытворчасць канчатковага прадукту з заданымі якасцямі. Бібліяграфічная тэхналогія – гэта паслядоўна ажыццяўляемыя, мэтанакіраваныя дзеянні з дакументамі ці звесткамі аб іх для стварэння і прадастаўлення спажыўцам бібліяграфічных прадуктаў і паслуг. Тэхналогія дае адказ на пытанні: што рабіць? З чым рабіць? Што ў выніку трэба атрымаць? Складаючымі элементамі тэхналогіі з'яўляюцца тэхналагічны працэс, тэхналагічная аперацыя, тэхналагічнае рашэнне. Для тэхналагічнага працэсу характэрныя складаны комплекс дзеянняў, мэтанакіраванае пераўтварэнне зыходных матэрыялаў у гатовы прадукт. Тэхналагічны працэс складаецца з шэрага аперацый. Адметнымі прыметамі аперацыі з'яўляюцца прастата, аднароднасць прыёмаў работы і выкананне адным чалавекам.

А.П.Коршунаў вылучае тры асноўныя працэсы: бібліяграфаванне, бібліяграфічнае абслугоўванне, бібліяграфічны пошук. М.Г.Вохрышава да працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці адносіць вытворчасць бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфаванне); давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі да спажыўца (бібліяграфічнае абслугоўванне); выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі; бібліяграфічнае навучанне; кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю; бібліяграфічныя зносіны.

У межах гэтых комплексных асноўных працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці могуць вылучацца асобныя працэсы. У бібліяграфаванні выдзяляюць працэсы выяўлення дакументаў, адбору, групоўкі, бібліяграфічнай характарыстыкі, складання дапаможнага даведачнага апарату, рэдагавання; у бібліяграфічным абслугоўванні – бібліяграфічны пошук, абвяшчэнне аб дакументах, ацэнка дакументаў; у выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі – прагляд бібліяграфічных крыніц, зварот да дакументаў, выяўленых з дапамогай бібліяграфічных крыніц, выкарыстанне спажыўцом атрыма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най інфармацыі ў сваёй дзейнасці. Названыя працэсы могуць дыферэнцыравацца і далей.

Дакладнасць вылучэння працэсаў і аперацый неабходна для павышэння эфектыўнасці дзейнасці (якасць дзейнасці знаходзіцца ў прамой залежнасці ад якасці працэсаў і складаючых іх аперацый); для нарміравання бібліяграфічнай працы; планавання і ўліку бібліяграфічнай работы; аўтаматызацыі бібліяграфічных працэсаў; параўнальнага аналізу дзейнасці бібліятэк і інш. Трэба адзначыць, што доўгі час тэрміны “тэхналогія” і “методыка” бібліяграфічнай дзейнасці ўжываліся як сінонімы. Развіццё і ўкараненне аўтаматызацыі ў бібліяграфічную практыку прымусілі звярнуць больш увагі на даследаванне пытанняў тэхналогіі, распрацоўку тэхналагічных карт на ажыццяўляемыя бібліяграфічныя працэсы. У той жа час бібліяграфічная тэхналогія і методыка бібліяграфічнай дзейнасці ўзаемазалежныя: новыя інфармацыйныя ўмовы, выкарыстанне новых тэхнічных сродкаў патрабуюць перагляду і аднаўлення традыцыйнай тэхналогіі, распрацоўкі новых тэхналогій доступу, атрымання, стварэння бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, што ў сваю чаргу абумоўлівае і пошук новых метадычных прыёмаў, рашэнняў ажыццяўлення гэтай дзейнасці.

Вынікам тэхналагічнага працэсу з'яўляецца канкрэтны бібліяграфічны прадукт або паслуга. *Бібліяграфічны прадукт* – гэта вынік бібліяграфічнай дзейнасці ў дакументальна фіксаванай форме, які можна шматразова выкарыстоўваць у працэсе задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей. Да прадуктаў бібліяграфічнай дзейнасці можна аднесці бібліяграфічныя дапаможнікі, пісьмовыя тэматычныя даведкі і агляды, бюлетэні новых пастуленняў, бібліяграфічныя базы даных, бібліяграфічныя каталогі і картатэкі, дайджэст-агляды і інш. *Бібліяграфічная паслуга* – гэта вынік падрыхтоўкі і давядзення да спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі ў адпаведнасці з паступіўшым запытам ці выяўленай патрэбнасцю. Спецыфічнымі асаблівасцямі паслугі з’яўляюцца пераважнае выкарыстанне ў працэсе яе рэалізацыі раней створанай ці цэнтралізавана падрыхтаванай бібліяграфічнай прадукцыі; разавы характар выкарыстання. Да бібліяграфічных паслуг адносяцца вусныя даведкі, метадычныя кансультацыі, якія выдаюцца ў працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання, дні бібліяграфіі, дні інфармацыі, вусныя бібліяграфічныя агляды і інш.

Важнейшымі задачамі, якія ставіць інфармацыйны рынак перад бібліяграфічнымі цэнтрамі, з'яўляюцца пастаяннае ўдасканаленне і пашырэнне ў адпаведнасці з попытам асартыменту бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, павышэнне іх якасці.

### *1.3. Агульныя пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці*

Бібліяграфічная дзейнасць не характарызуецца арганізацыйна афармленай цэласнасцю, яна раздроблена і арганічна ўключана ў розныя грамадскія інстытуты, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы дакументных камунікацый у грамадстве. У якасці калектыўных суб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці выступаюць кніжныя палаты, бібліятэкі, цэнтры НТІ, выдавецтвы, кніжныя магазіны, архівы, музеі, сродкі масавай інфармацыі.

Бібліяграфічная дзейнасць атрымала найбольшае развіццё ў межах бібліятэчнай справы. Сувязі яе з бібліятэкамі сталі настолькі арганічнымі, што нейкі перыяд заставаліся незаўважанымі яе сувязі з іншымі інстытутамі. Спатрэбіўся час, каб вывесці бібліяграфію з бібліятэчных сцен і выявіць яе ўсёпранікальнасць. Перспектыўнае развіццё бібліяграфіі павінна будавацца на далейшай дыферэнцыяцыі, разглядзе спецыфікі яе функцыянавання ў розных сферах, але ў рамках адзінага бібліяграфічнага цэлага, з адзіных пазіцый.

Сёння даволі выразна разумеюцца перавагі аб'яднання бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці. У бібліятэцы ствараюцца найбольш спрыяльныя ўмовы для бібліяграфічнай дзейнасці, бібліяграфія ўзбагачае работу бібліятэкі сваімі метадамі. Бібліяграфічныя працэсы і аперацыі ўключаны ў бібліятэчныя працэсы (напрыклад, камплектаванне фондаў бібліятэкі ўключае вывучэнне планаў выдавецтваў, афармленне бланкаў-заказаў, якія ўяўляюць сабой па сутнасці бібліяграфічныя дапаможнікі); наяўнасць бібліяграфічных аперацый адзначаецца ва ўсіх дзеяннях бібліятэкара, звязаных з афармленнем заказу на літаратуру пры абслугоўванні чытачоў, пры функцыянаванні МБА і інш. Бібліяграфічныя метады шырока выкарыстоўваюцца для рэалізацыі задач, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаяць перад бібліятэкамі: метад бібліяграфічнага згортвання дакументаў выкарыстоўваецца пры каталагізацыі дакументаў, пры афармленні выстаў; метады ідэнтыфікацыі бібліяграфічнай інфармацыі, абвяшчэння аб дакументах, рэкамендацыі выкарыстоўваюцца пры абслугоўванні чытачоў, фарміраванні фондаў. У той жа час у рамках бібліятэчнай практыкі сфарміраваліся многія формы бібліяграфічнай дзейнасці (каталогі, картатэкі, спісы літаратуры і інш.), з'явіліся сінтэтычныя формы дзейнасці, якія па сваіх метадах, што выкарыстоўваюцца ў працэсе іх арганізацыі і правядзення, носяць бібліятэчна-бібліяграфічны характар (напрыклад, дні інфармацыі, дні спецыяліста – комплексныя мерапрыемствы, якія ўключаюць розныя працэсы, звязаныя як з непасрэдным экспанаваннем дакументаў, так і абвяшчэннем, давядзеннем звестак аб іх). Як сучасную тэндэнцыю развіцця бібліяграфіі спецыялісты адзначаюць узмацненне ўзаемапранікальнасці бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці.

Узаемапранікальнасць бібліяграфічных працэсаў, метадаў, формаў дзейнасці характэрна і для другіх відаў бібліяграфічнай дзейнасці: кнігагандлёва-бібліяграфічнай, выдавецка-бібліяграфічнай, музейна-бібліяграфічнай, архіўна-бібліяграфічнай і інш. Спецыфіка кожнага з названых відаў сістэмы дакументных камунікацый вызначае своеасаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці, вывучэнне якіх уяўляецца значным з пункту гледжання ўдасканалення асобных формаў і метадаў, развіцця ўзаемадзеяння ў межах адзінай бібліяграфічнай сістэмы.

Акрамя ведамаснага прынцыпу, арганізацыйная структура бібліяграфічнай дзейнасці ў краіне будуецца яшчэ на аснове двух прынцыпаў: тэрытарыяльнага і змястоўнага. Паводле тэрытарыяльнага прынцыпу вылучаюцца тры ўзроўні цэнтраў – суб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці: рэспубліканскі, рэгіянальны (абласны), нізавы. Паводле змястоўнага прынцыпу вылучаюць універсальныя цэнтры, шматгаліновыя і галіновыя.

Рэспубліканскія цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці забяспечваюць бібліяграфічнае суправаджэнне працэсаў фарміравання, вядзення і арганізацыі выкарыстання рэспубліканскіх інфармацыйных фондаў розных суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый, стварэнне баз і банкаў даных па розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відах крыніц інфармацыі, галінах ведаў і сферах практычнай дзейнасці, інтэграцыю беларускіх рэсурсаў у сусветную інфармацыйную прастору і развіццё рынку інфармацыйных, у тым ліку бібліяграфічных, прадуктаў і паслуг.

Рэгіянальныя (абласныя) цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці выконваюць аналагічныя функцыі ў дачыненні да рэгіянальных інфармацыйных фондаў і ажыццяўляюць забеспячэнне бібліяграфічных патрэбнасцей карыстальнікаў рэгіёна, незалежна ад месца вытворчасці і знаходжання бібліяграфічнай інфармацыі.

Нізавыя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці, якія ў большасці функцыянуюць у межах пэўных арганізацый, прадпрыемстваў, арыентуюць сваю бібліяграфічную дзейнасць на задавальненне патрэбнасцей карыстальнікаў ведамасных структур з выкарыстаннем як уласных бібліяграфічных сродкаў, так і падрыхтаваных на рэспубліканскім, рэгіянальным узроўнях, а пры наяўнасці адпаведных сродкаў сувязі і тэхнічных магчымасцей і сусветных інфармацыйных рэсурсаў. Безумоўна, што функцыі розных суб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці дэталізуюцца, канкрэтызуюцца ў залежнасці ад іх спецыфічных задач і асаблівасцей.

Функцыянаванне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці трэба разглядаць і ў межах станаўлення ў рэспубліцы дзяржаўнай сістэмы НТІ, якая практычна пачала аднаўляцца з 1996 г. і працэс фарміравання якой сёння ўзначальвае Нацыянальны цэнтр інфармацыйных рэсурсаў і тэхналогій НАН РБ, і як састаўную частку агульнай нацыянальнай інфармацыйнай сістэмы краіны. Арганізацыйная структура бібліяграфічнай дзейнасці ў РБ, несумненна, працягвае сваё развіццё на сучасным этапе: адбываецца рэструктурызацыя былых цэнтраў НТІ, ствараюцца новыя інфармацыйныя ўстановы, удасканальваецца сістэма інфармацыі на рэспубліканскім, рэгіянальным і нізавым узроўнях.

Дыферэнцыяцыя цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці па змястоўнаму прынцыпу звязана з вылучэннем цэнтраў універсальнага, шматгаліновага, галіновага характару. Цэнтры універсальнага характару, якія змяшчаюць дакументы па ўсіх галінах ведаў, прадстаўлены перш за ўсё Нацыянальнай кніжнай палатай Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, абласнымі універсальнымі навуковымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкамі, публічнымі бібліятэкамі ЦБС. У гэтым шэрагу неабходна назваць органы навукова-тэхнічнай інфармацыі, якія спецыялізуюцца на асобных відах дакументаў па ўсіх галінах ведаў. Сярод іх Інстытут прыкладных праграмных сістэм Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выконвае функцыі інфармавання аб электронных інфармацыйных рэсурсах, уключаных у дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў; Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА), які спецыялізуецца на рабоце з непублікуемымі дакументамі: справаздачамі па навукова-даследчых работах, вопытна-канструктарскіх распрацоўках, вопытна-тэхналагічных работах, а таксама з дэпаніраванымі рукапісамі; Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) Камітэта па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі спецыялізуецца на рабоце з нарматыўнымі дакументамі па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі; Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці працуе з патэнтнай дакументацыяй; Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі пры Адміністрацыі Прэзідэнта РБ спецыялізуецца на рабоце з прававой інфармацыяй; Камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў РБ (Картфонд) спецыялізуецца на рабоце з картаграфічнай інфармацыяй.

Да бібліяграфічных цэнтраў шматгаліновага профілю адносяцца Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка, Прэзідэнцкая бібліятэка, Фундаментальная бібліятэка БДУ, цэнтры навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі ў абласных гарадах, абласныя навукова-тэхнічныя бібліятэкі, бібліятэкі універсітэтаў і іншых ВНУ.

Фарміраванне, вядзенне і арганізацыю выкарыстання галіновых даведачна-бібліяграфічных фондаў, баз і банкаў даных, падрыхтоўку і выданне розных відаў бібліяграфічных крыніц, задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей спецыялістаў пэўных галін ведаў ажыццяўляюць галіновыя бібліятэкі і органы навукова-тэхнічнай інфармацыі. Сярод іх – Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка, Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка, Беларускі цэнтр навукова-медыцынскай інфармацыі, Белбудінфармцэнтр, Інфармацый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны цэнтр Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання РБ, аддзелы навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва, аддзел інфармацыі РУП “Цэнтр навуковых даследаванняў лёгкай прамысловасці”, абласныя навукова-медыцынскія бібліятэкі, галіновыя бібліятэкі, аддзелы НТІ, службы стандартызацыі, патэнтныя службы нізавога ўзроўню.

Сярод бібліяграфічных цэнтраў вылучаюцца таксама ў залежнасці ад спецыялізацыі універсальныя, шматгаліновыя, галіновыя выдавецтвы, кнігагандлёвыя прадпрыемствы і арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі, архівы, музеі.

## *1.4. Цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь*

Згодна з міждзяржаўным ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения” бібліяграфічны цэнтр вызначаецца як інфармацыйны цэнтр, які выконвае функцыі па вытворчасці, зборы, перапрацоўцы і распаўсюджванні бібліяграфічнай інфармацыі.

Сярод бібліяграфічных цэнтраў асобае месца належыць *Нацыянальнай кніжнай палаце (НКП) Рэспублікі Беларусь*. Яна з’яўляецца нацыянальным бібліяграфічным цэнтрам краіны, які згодна з азначэннем, прыведзеным у тым жа ГОСТ 7.0 – 99, забяспечвае дзяржаўны ўлік і распаўсюджванне інфармацыі аб друкаванай прадукцыі краіны.

На базе абавязковага бясплатнага экземпляра НКП ажыццяўляе дзяржаўны бібліяграфічны ўлік, фарміруе электронны бібліяграфічны банк даных дзяржаўнай бібліяграфіі, які складаецца з баз даных кніг і брашур, нарматыўна-тэхнічных дакументаў, аўтарэфератаў дысертацый, картаграфічных выданняў, выяўленчых і нотных выданняў, газетных і часопісных артыкулаў, а таксама экстэрыёрыкі Беларусі. НКП выпускае крыніцы нацыянальнай бібліяграфіі, якія складаюцца з бягучых і рэтраспектыўных паказальнікаў. З 1924 г. выходзяць бягучае выданне “Летапіс друку Беларусі”, а таксама кумулятыўныя выданні: два штогоднікі “Кнігі Беларусі” (з 1981 г.) і “Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі” (з 1976 г.). Вядучае становішча гэтых крыніц у сістэме бібліяграфічнай інфармацыі краіны вызначаецца тым, што яны маюць базавы характар і з’яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асновай для фарміравання іншых відаў бібліяграфічнай прадукцыі і выканання разнастайных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці рознымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый.

У галіне агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі Нацыянальная кніжная палата працуе над поўным адлюстраваннем рэпертуару твораў друку, якія выходзілі на тэрыторыі краіны з 1924 г. па сённяшні час.

Універсальны бібліяграфічны ўлік з'яўляецца галоўнай функцыяй Нацыянальнай кніжнай палаты, акрамя таго, гэтая ўстанова ажыццяўляе шэраг іншых важных кірункаў дзейнасці. НКП выконвала функцыі цэнтра цэнтралізаванай каталагізацыі (да 1992 г. выпускала карткі цэнтралізаванай каталагізацыі для масавых бібліятэк, а з сакавіка 1992 г. у якасці "кампенсацыі" выпускала штотыднёвую экспрэс-інфармацыю "Кнігі і брашуры", у якой адлюстроўвалася асноўная выдавецкая прадукцыя). Зараз НКП выконвае функцыі Нацыянальнага агенцтва па міжнароднай стандартнай нумарацыі кніг, што выйшлі ў Беларусі (ISBN – абавязковы элемент кожнай кнігі, па якім ажыццяўляецца ідэнтыфікацыя дакумента, на яго аснове распрацоўваецца штрыхавы код выдання).

НКП ажыццяўляе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па заказах устаноў, арганізацый краіны, замежных краін, а таксама грамадзян краіны і замежжа ў выглядзе даведак аб усёй прадукцыі, выдадзенай у Рэспубліцы Беларусь. Палата аказвае і платныя інфармацыйныя і бібліяграфічныя паслугі.

Выконваючы функцыі цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі ў галіне выдавецкай справы, паліграфіі, кніжнага гандлю, бібліяграфіі, НКП вядзе спецыялізаваны даведачна-інфармацыйны фонд.

Ад стану дзяржаўнай бібліяграфіі залежаць становішча спраў не толькі ва ўсіх іншых сферах бібліяграфічнай дзейнасці, але і эфектыўнасць і эканамічнасць многіх працэсаў статыстыкі друку, кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання. Менавіта таму Нацыянальная кніжная палата праводзіць навуковыя даследаванні па праблемах нацыянальнай бібліяграфіі, сацыялогіі чытання, кан'юнктуры кніжнага рынку, пастаянна ўдасканальвае метадычнае і арганізацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай бібліяграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Служба стандартызацыі НКП не толькі ажыццяўляе кантроль за выкананнем патрабаванняў стандартаў, якія дзейнічаюць у выдавецкай справе, але і сама распрацоўвае нацыянальныя стандарты, тэхнічныя ўмовы па выдавецкай справе, паліграфічнай прамысловасці, кніжным гандлі, бібліяграфіі. Галоўным фактарам, які вызначае якасць і кошт выданняў нацыянальнай ці любой іншай бібліяграфічнай інфармацыі, выступае адпаведнасць яе зместу і формы міжнародным стандартам. Таму ўжо сёння распрацоўваемыя ці пераглядаемыя нацыянальныя бібліяграфічныя стандарты абапіраюцца на стандарты Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі і рэкамендацыі ЮНЕСКА і ІФЛА. Створана база даных нарматыўна-рэгламентаванай дакументацыі галіны. Вядуцца таксама БД "Ідэнтыфікатары ISBN: выдаўцы Беларусі", БД па статыстыцы друку, якія прадстаўлены для карыстальнікаў у інтэрнеце.

Нацыянальнай кніжнай палаце неабходна вырашыць шэраг задач: пашырэнне саставу аб'ектаў дзяржаўнай рэгістрацыі, бібліяграфавання, статыстычнага ўліку і архіўнага захавання з дапамогай інфармацыйных прадуктаў новага пакалення, так званых някніжных матэрыялаў; забеспячэнне найбольшай паўнаты, аператыўнасці і дакладнасці нацыянальнай бібліяграфіі, у тым ліку і дзякуючы прыняццю рыхтуемага закона "Аб абавязковым экзэмпляры дакументаў"; распрацоўка і ажыццяўленне мерапрыемстваў па ўкараненні ў інфармацыйна-бібліяграфічны комплекс НКП новых, больш дасканалых праграмных і апаратных сродкаў, уключаючы сеткавыя тэхналогіі; удзел у карпаратыўнай каталагізацыі выданняў краіны, стварэнні нацыянальных файлаў нарматыўных (аўтарытэтных) даных; распрацоўка і выкарыстанне праграм рэтраканверсіі каталогаў і бібліяграфічных паказальнікаў НКП для прадастаўлення карыстальнікам магчымасці пошуку ў інтэрактыўным рэжыме інфармацыі з 1924 г.; мадэрнізацыя і актуалізацыя інфармацыйна-пошукавых моў, схем прадметызацыі і класіфікацыі, камунікатыўных фарматаў у адпаведнасці з патрабаваннямі галіны, а таксама на падставе міжнародных стандартаў, распрацоўваемых ІСА, ІФЛА і іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

Значнымі цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляюцца *бібліятэкі*. Ужо на пачатковым этапе развіцця бібліятэчнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справы і бібліяграфіі быў дастаткова выразна сфармуляваны тэзіс аб перавагах злучэння бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці: бібліятэка стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для бібліяграфічнай дзейнасці; бібліяграфія ўзбагачае работу бібліятэкі сваімі метадамі і сродкамі. Асноўнымі кірункамі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў з'яўляюцца: раскрыццё з дапамогай бібліяграфічных сродкаў фондаў бібліятэк (для рэалізацыі гэтай задачы ствараюцца каталогі, картатэкі, бюлетэні, спісы новых паступленняў); стварэнне бібліяграфічных крыніц рэпертуарнага характару, якія б адлюстроўвалі ўвесь рэпертуар кнігавыдання, пачынаючы з пачатку кнігавыдання да пачатку дзяржаўнай рэгістрацыі; падрыхтоўка бібліяграфічных крыніц, у тым ліку ў выглядзе картатэк, бібліяграфічных дапаможнікаў, БД па бібліяграфічным забеспячэнні пэўных галін ведаў у адпаведнасці са сваёй спецыялізацыяй (змястоўнай, відавой, функцыянальнай); бібліяграфічнае забеспячэнне адпачынкавай, адукацыйнай, выхаваўчай дзейнасці праз падрыхтоўку і выданне крыніц папулярнай бібліяграфіі; бібліяграфічнае абслугоўванне спажыўцоў інфармацыі; арганізацыя доступу спажыўцоў інфармацыі да інфармацыйных рэсурсаў іншых бібліятэк, цэнтраў інфармацыі, міжнародных БД; фарміраванне бібліяграфічнай культуры чытачоў сваёй бібліятэкі; метадычная дапамога бібліятэкам сваёй сеткі ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці; каардынацыя і кааперацыя бібліяграфічнай дзейнасці з іншымі бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі ў межах рэгіёна, краіны, замежнымі цэнтрамі; арганізацыя навуковых даследаванняў у галіне бібліяграфіі.

Такім чынам, асаблівасцямі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк з'яўляюцца не толькі апора на фонд канкрэтнай бібліятэкі, але і садзейнічанне выкарыстанню фондаў іншых бібліятэк, суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый з мэтай максімальна поўнага задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей спажыўцоў.

У залежнасці ад статусу, месца бібліятэкі ў агульнай бібліятэчнай сетцы рэгіёна, краіны пералік гэтых функцый, іх змястоўная напаўняльнасць будуць розныя. У буйных бібліятэках бібліяграфічныя службы выконваюць увесь комплекс функцый. На нізавым узроўні бібліятэчнай сеткі пераважаюць функцыі распаўсюджвання бібліяграфічнай інфар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацыі, бібліяграфічнага абслугоўвання, хаця ў пэўных межах ажыццяўляецца і стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі.

Значнае месца сярод цэнтраў бібліяграфічнай інфармацыі займаюць *выдавецтвы і кнігагандлёвыя арганізацыі.* Асаблівасці іх бібліяграфічнай дзейнасці абумоўлены мэтай, якая ставіцца перад выдавецтвамі і кнігагандлёвымі арганізацыямі, – продаж кніг. Таму атрымалі развіццё асобыя формы, накіраваныя на садзейнічанне продажу кнігі, – формы рэкламнага характару.

Менавіта дзякуючы бібліяграфічным сродкам выдавецтвы маюць найбольш спрыяльныя магчымасці для аператыўнага, яшчэ да выхаду самога дакумента, інфармавання спажыўцоў, што садзейнічае больш аператыўнаму задавальненню патрэбнасцей спажыўцоў у дакументах, эфектыўнай дзейнасці кніжных магазінаў і мэтанакіраванаму камплектаванню фондаў бібліятэк. Выкарыстанне камп'ютэрных тэхналогій дазваляе аднаразова ажыццяўляць бібліяграфічны запіс на этапе вытворчасці дакумента з наступнай перадачай яе бібліятэкам і кніжным магазінам.

Важнейшым кірункам дзейнасці выдавецтваў з'яўляецца стварэнне бібліяграфічных матэрыялаў. Гэта тэматычныя планы выпуску літаратуры, якія з'яўляюцца крыніцай, сродкам для афармлення заказаў кнігагандлёвымі прадпрыемствамі, а таксама асобнымі спажыўцамі; выдавецкія каталогі, якія адлюстроўваюць пералік кніг, выпушчаных канкрэтным выдавецтвам за пэўны перыяд; прайс-лісты; рэкламныя матэрыялы ў сродках масавай інфармацыі аб плануемых да выхаду і выдадзеных выданняў. У сувязі з аўтаматызацыяй і развіццём сродкаў тэлекамунікацыі выдавецтвы ствараюць базы даных выдадзеных імі кніг, змяшчаюць рэкламна-бібліяграфічную інфармацыю на сваіх сайтах у інтэрнеце.

Вялікая работа па стварэнні бібліяграфічнай інфармацыі і яе распаўсюджванні сярод пакупнікоў праводзіцца кніжнымі магазінамі, у буйнейшых з якіх маюцца бібліяграфічныя службы. Задачы бібліяграфічных службаў магазінаў (бібліяграфічных аддзелаў, бібліёграфаў або таваразнаўцаў, якія выконваюць функцыі бібліёграфаў) – сачыць за асартыментам кніг у магазіне, папаўняць яго, выкарыстоўваючы тэматычныя планы выдавецтваў, бланкі заказаў і іншыя бібліяграфічныя крыніцы выдавецтваў або кнігараспаўсюджваль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікаў; адлюстроўваць кніжны асартымент у разнастайных картатэках: заказу ці заказаабароту; наяўнасці кніг у продажы; папярэдніх заказаў пакупнікоў; распраданых кніг; свабодных астаткаў і паўторных заказаў – або базах даных.

У кніжных магазінах ажыццяўляецца і бібліяграфічнае абслугоўванне пакупнікоў. У некаторых магазінах для выканання гэтых функцый арганізуецца стол даведак або куток пакупніка. У рэжыме даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання выконваюцца даведкі аб выданнях папярэдніх гадоў; аб наяўнасці кніг у продажы; аб выданнях, якія плануюцца да выпуску ці перавыдання і калі (у якім квартале); якія выданні паступяць у продаж у бліжэйшы час. Выконваюцца таксама тэматычныя даведкі.

Вядучае месца ў паспяховым вядзенні кнігагандлёвай дзейнасці займае кнігагандлёвае бібліяграфічнае інфармаванне пакупнікоў. Для гэтага выкарыстоўваюцца разнастайныя формы масавага, групавога, індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання: кнігагандлёвыя бібліяграфічныя выданні, асобныя картатэкі, выставы новых кніг, сродкі масавай інфармацыі – газеты “Книжный мир”, “Строительная газета”, “Свой дом”, на старонках якіх кніжныя магазіны рэгулярна змяшчаюць інфармацыю аб кніжных навінках і рэкламу саміх магазінаў; рэкламу на радыё і тэлебачанні (кніжныя магазіны “Праваслаўная кніга”, “Акадэмічная кніга”). Часцей за ўсё бібліяграфічнае інфармаванне мае рэкламны характар і праводзіцца з дапамогай рэкламных лістовак, закладак, плакатаў, каталогаў, праспектаў, выстаў-продажаў і інш.

Роля бібліяграфічнага інфармавання значна павышаецца пры выкарыстанні электронных сродкаў інфармацыі пры пазамагазінных продажах кніг (радыё, тэлебачанне, тэлефонныя лініі сувязі, камп’ютэрныя сістэмы). Інтэрнэт-магазіны (сярод беларускіх кніжных магазінаў – OZ.by, “Белсонет”, “Попурри”, “Эксмо”, “Дзед Талаш” і інш.) будуюць сваю дзейнасць не на візуальным, непасрэдным знаёмстве пакупніка з выданнем, а пераважна на другасна-дакументным узроўні – прадастаўленні разнастайнай бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі аб выданні ў форме каталогаў або спісаў кніг, анатацый і рэцэнзій на іх, электронных сродкаў пошуку неабходных выданняў, рэкамендацый лепшых кніг і рэкамендацый саміх чытачоў, асабістай службы абвяшчэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па электроннай пошце індывідуальных пакупнікоў. Працуючы з крыніцамі інфармацыі, даступнымі праз інтэрнет, пакупнікі маюць магчымасць аператыўна атрымліваць поўную інфармацыю аб канкрэтных выданнях, іх кошце і каналах распаўсюджвання, весці тэматычны пошук або пошук новых дакументаў, пры гэтым у распараджэнні карыстальніка будуць самыя апошнія звесткі аб выдавецкай прадукцыі. Звяртаючыся да вэб-старонак выдавецтваў і кнігагандлёўцаў, карыстальнік мае магчымасць атрымаць не толькі спіс выпускаемых або прадаваемых выданняў, але і праглядзець іх змест, анатацыю; шэраг выдавецтваў даюць магчымасць доступу да тэкстаў публікацый.

Новыя кнігагандлёвыя тэхналогіі актывізавалі сумесную дзейнасць выдавецтваў і кніжных магазінаў. Акрамя выдавецтваў і кніжных магазінаў, суб’ектамі кнігагандлёва-бібліяграфічнай дзейнасці выступаюць кнігагандлёвыя арганізацыі, базы, бібліятэчныя калектары.

Свае асаблівасці мае бібліяграфічная дзейнасць *інфармацыйных цэнтраў і службаў навукова-тэхнічнай інфармацыі*. У рамках Дзяржаўнай сістэмы НТІ (ДСНТІ) вырашаюцца дзве галоўныя задачы: фарміраванне рэсурсаў ДСНТІ і іх выкарыстанне. Фарміраванне рэсурсаў ДСНТІ ўключае наступныя працэсы: збор дакументаванай інфармацыі; апрацоўку інфармацыі і перавод яе на іншы носьбіт; падтрымку баз даных, вэб-сайтаў, электронных каталогаў, бібліяграфічных масіваў навукова-тэхнічнай інфармацыі і інш.; забеспячэнне захаванасці інфармацыі.

Не менш важнай праблемай, чым стварэнне інфармацыйных рэсурсаў, з’яўляецца праблема іх выкарыстання. Вырашэнне задачы павышэння эфектыўнасці выкарыстання вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці ў сучасных умовах ставіцца ў прамую залежнасць ад стварэння сістэмы ўліку інфармацыі аб выніках навуковых даследаванняў і забеспячэння доступу да яе. У кантэксце гэтага канкрэтызуюцца задачы ДСНТІ наступным чынам: вядзенне рэестра вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці як аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці; маніторынг; каталагізацыя і рэферыраванне апублікаваных інфармацыйных крыніц, стварэнне дзяржаўных рэсурсаў бібліяграфічнай інфармацыі; фарміраванне і забеспячэнне захаванасці фондаў першасных даку-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ментаў і баз даных першасных навуковых даных; забеспячэнне доступу карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў ДСНТІ; навігацыя ў сусветнай інфармацыйнай прасторы, аказанне дапамогі карыстальнікам у пошуку патрэбнай інфармацыі; вядзенне і падтрымка навігацыйнай службы ДСНТІ; забеспячэнне ўзаемадзеяння інфармацыйных рэсурсаў ДСНТІ, каардынацыя фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў у межах пэўных праграм і праектаў.

Важнейшай складаючай дзейнасці кожнага цэнтра ДСНТІ з'яўляецца бібліяграфічная дзейнасць. Мэта бібліяграфічнай дзейнасці гэтых суб'ектаў – з дапамогай бібліяграфічных сродкаў садзейнічаць развіццю навукі, вытворчасці, падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў адпаведных галін ведаў. Цэнтры НТІ праводзяць бібліяграфаванне як апублікаваных, так і неапублікаваных дакументаў па асобных галінах ведаў або пэўных відаў дакументаў; ствараюць даведачна-пошукавы апарат, аб'ектамі адлюстравання ў якім з'яўляюцца як першасныя дакументы, у тым ліку і нарматыўна-тэхнічныя і тэхнічныя дакументы, неапублікаваныя матэрыялы, так і фактаграфічная інфармацыя. Інфармацыйныя цэнтры даюць магчымасць спецыялістам знаёміцца з першаснымі дакументамі з дапамогай каталогаў, картатэк, інфармацыйных выданняў, бібліяграфічных, фактаграфічных і паўнатэкставых БД па пэўнай галіне ведаў, тэме або відах выданняў. Яны ажыццяўляюць вытворчасць інфармацыйных прадуктаў і паслуг з дапамогай выкарыстання метадаў больш глыбокай аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі першасных дакументаў (для спажыўцоў рыхтуюцца рэфератыўныя матэрыялы, аналітычныя агляды, аналітычныя даведкі, фактаграфічныя дасье, параўнальныя фактаграфічныя табліцы, праводзіцца бібліяграфічнае інфармаванне з выкарыстаннем такіх формаў, як выбіральнае распаўсюджанне інфармацыі, дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва і інш.). Цэнтры НТІ арганізуюць доступ спажыўцоў да інфармацыйных рэсурсаў свету з дапамогай тэлекамунікацыйных сродкаў, прадастаўляюць паслугі аўтаматызаваных інфармацыйных сетак – карыстанне электроннай поштай, электроннай дошкай аб'яў, удзел у тэлеканферэнцыях.

Бібліяграфічная дзейнасць службаў НТІ па сваім змесце і характары займае прамежкавае становішча паміж бібліятэч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-бібліяграфічнай дзейнасцю, ажыццяўляемай у бібліятэках, і інфармацыйнай, якой займаюцца інжынеры інфармацыйных службаў. Яна патрабуе высокай прафесійнай кваліфікацыі, дастаткова глыбокага пранікнення ў спецыфіку адпаведнай галіны, умення бібліёграфа сінтэзаваць прыёмы, якія выкарыстоўваюцца ў сумежных галінах дзейнасці (бібліятэчнай, бібліяграфічнай, інфармацыйнай).

Імкліва заваёўваюць інфармацыйную прастору краіны і прапаноўваюць шырокі спектр інфармацыйных паслуг камерцыйныя інфармацыйныя структуры. Сярод іх – навукова-інфармацыйны цэнтр "ПН-Компасс", БелФАКТА, Агенцтва Уладзіміра Граўцова, Агенцтва фінансавых навін, Інстытут эканоміка-прававых праблем прадпрымальніцтва, фірма "Рэтмас", кампаніі Таір, БелХард, Белсофт і інш. Асноўныя намаганні інфармацыйных службаў засяроджаны на прадастаўленні фінансава-біржавай, рэкламнай, адрасна-даведачнай, камерцыйнай, рэйтынгавай інфармацыі. Яны ствараюць інфармацыйныя каталогі на папяровых і электронных носьбітах, ажыццяўляюць пошук звестак у БД, даюць карыстальнікам адказы ў выглядзе даведак або фірменных дасье, ажыццяўляюць пошукавыя функцыі з прадастаўленнем інфармацыйных прадуктаў у электроннай форме – баз даных у адпаведнасці з канкрэтнымі запытамі спажыўцоў.

Бібліяграфічная дзейнасць *сродкаў масавай інфармацыі* таксама мае свае асаблівасці, абумоўленыя спецыфікай дадзеных сродкаў. Бібліяграфічнай інфармацыі ў перыёдыцы, на радыё і тэлебачанні ўласцівы высокая аператыўнасць, масавасць, шырыня ахопу аўдыторыі чытачоў і гледачоў, магчымасць даваць перспектыўную інфармацыю аб рыхтуемых да выхаду выданнях. Асобае значэнне мае і такая асаблівасць, як сінтэзаванне бібліяграфічных формаў і метадаў работы з журналісцкімі. Разнастайныя формы, якія выкарыстоўваюцца ў СМІ для інфармавання аб дакументах, можна падзяліць на прамыя і ўскосныя. Прамыя формы маюць чыста бібліяграфічны характар, іх мэтавая накіраванасць – непасрэднае давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах да карыстальнікаў. Ускосныя формы маюць іншыя задачы, але і яны здольны выклікаць цікавасць спажыўцоў да кнігі, іншых дакументаў. Найбольшы эфект уздзеяння на чытача, слухача,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледача аказваюць сінтэтычныя формы, да якіх можна аднесці літаратурна-крытычныя матэрыялы (рэцэнзіі, агляды, літаратурныя нарысы і інш.), у якіх рэалізуюцца аднachасова і ацэначная функцыя бібліяграфічнай інфармацыі і функцыя садзейнічання развіццю літаратурнага працэсу. Бібліяграфічная дзейнасць, ажыццяўляемая па каналах масавай інфармацыі, мае ярка выражаны ацэначны характар. Нават некаменціраванае бібліяграфічнае абвяшчэнне набывае актуальнае публіцыстычнае гучанне, сам факт выбару з вялікага дакументальнага патоку пэўных выданняў сведчыць аб іх высокай грамадскай значнасці. Дадзеныя абставіны накладваюць асобую адказнасць на бібліёграфаў і журналістаў.

Бібліяграфічная дзейнасць у перыядычных выданнях ажыццяўляецца бібліёграфамі бібліятэк, кніжных магазінаў, а таксама журналістамі. Высокая бібліяграфічная культура журналістаў разглядаецца як неабходная ўмова іх паспяховай прафесійнай дзейнасці. Сярод кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці вылучаюцца бібліяграфаванне і давядзенне да чытачоў бібліяграфічнай інфармацыі з выкарыстаннем такіх формаў, як кароткія анатацыі (у журналістыцы іх называюць) бібліяграфічнымі нататкамі), разгорнутыя анатацыі на кнігі, якія часта набліжаюцца да рэцэнзій; спісы літаратуры на старонках газет і часопісаў (некаменціраваныя абвяшчэнні); літаратурна-крытычныя матэрыялы ў выглядзе рэцэнзій, аглядаў. Да ўскосных формаў бібліяграфічнай дзейнасці ў перыёдыцы адносяцца хранікальныя заметкі (інфармацыя аб выхадзе кніг у свет, справаздачы аб чытацкіх канферэнцыях, сустрэчах чытачоў з аўтарамі кніг; рэпартажы з бібліятэк, кніжных магазінаў, кніжных выстаў, выстаў-кірмашоў па продажы кніг; творчыя партрэты аўтараў кніг; водгукі чытачоў на кнігі). Інфармаванне аб літаратуры ў перыёдыцы дыферэнцыравана ў адпаведнасці з профілем выдання. Існуюць спецыяльныя рэкламна-інфармацыйныя і галіновыя кнігазнаўчыя газеты і часопісы, дзе прадстаўлены ўсе вышэйпералічаныя жанры бібліяграфічных матэрыялаў. У Беларусі да такіх выданняў адносяцца “Книжный мир”, часопіс “Книжный калейдоскоп”, у Расіі – газеты “Книжное обозрение”, “Книга в Москве”, часопісы “В мире книг”, “Книжный бизнес”, “Книжное дело”, “Витрина”, “Полиграфист и издатель”, “Университетская книга”, “Деловая книга”, “Новая деловая книга”, электрон-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя часопісы (напрыклад, “Book-Мекка” гандлёвага дома “Библиоглобус”).

Бібліяграфічная дзейнасць на радыё мае асаблівую выразнасць, паколькі тут выкарыстоўваецца жывое слова, хаця ў пэўнай ступені яна блізкая да газетна-часопіснай бібліяграфічнай дзейнасці. Сярод асноўных вылучаюцца формы інфармацыйнага характару аб выхадзе кніг, аналітычнага характару – агляды, мастацка-публіцыстычныя – чытанне твораў, журналісцкія жанры – хранікальныя матэрыялы, справаздачы, рэпартажы, інтэрв’ю, рэклама.

Кірункі бібліяграфічнай дзейнасці на тэлебачанні тыя ж, што і на радыё, але яны маюць сваю спецыфіку. Бібліяграфічнае інфармаванне ажыццяўляецца на трох узроўнях. Першы – гэта спецыяльныя бібліяграфічныя перадачы, такія як “Кніжная лаўка”, “Кола чытання”, «“Чытай” – горад для дзяцей», дзе бібліяграфічная інфармацыя выступае як асноўны элемент рэкламы кнігі, твораў друку. Другі ўзровень складаюць бібліяграфічныя паведамленні, уключаныя ў перадачы рознай тэматыкі, напрыклад: “Что? Где? Когда?”, “Клуб кинопутешественников” і інш. На трэцім узроўні ажыццяўляецца ўскосная прапаганда твораў друку праз выкарыстанне крытыкі і журналістыкі, экранізацыю мастацкіх твораў, тэлеспектаклі. Назіраецца сінтэз бібліяграфічных метадаў і журналісцкіх, што ўзбагачае магчымасці ўздзеяння на чытачоў, карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Сярод цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці адзначаюцца *архівы і музеі*. Іх бібліяграфічная дзейнасць мае дапаможны характар і падпарадкавана задачы гэтых устаноў – садзейнічаць захоўванню і выкарыстанню фондаў, калекцый, экспазіцый. Гэтая задача вырашаецца праз рэалізацыю такіх кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, як вядзенне каталогаў, картатэк, бібліяграфічных БД, складанне бібліяграфічных дапаможнікаў, бібліяграфічнае абслугоўванне. Так, музеі ажыццяўляюць бібліяграфаванне аб’ектаў захоўвання ў каталогах, прычым вядуць каталогі на асобныя аб’екты захоўвання, калекцыі пэўных сховішчаў, экспазіцый; выставачныя каталогі, зводныя каталогі. Праз выданне каталогаў і даведнікаў яны інфармуюць спажыўцоў аб мастацкіх фондах музеяў, выстаў, экспазіцый; ажыццяўляюць падрыхтоўку і выданне даведнікаў аб выставах, біяграфічных і біябібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічных слоўнікаў, прысвечаных мастакам, скульптарам, графікам і іншым дзеячам мастацтва.

Архівы вядуць даведачна-бібліяграфічны апарат на свае фонды, прымаюць удзел у стварэнні зводных каталогаў, выданні даведнікаў поўных тэкстаў дакументаў па пэўных галінах ведаў, тэмах, ажыццяўляюць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне спажыўцоў інфармацыі.

Бібліяграфічная дзейнасць ажыццяўляецца рознымі сацыяльнымі інстытутамі і кожны раз трансфармуецца, пераплятаючыся са спецыфічнымі з'явамі тых сфер грамадскага жыцця, якія яна адлюстроўвае. Усе інстытуцыяльныя віды бібліяграфічнай дзейнасці дапаўняюць адзін аднаго; для дасягнення лепшых вынікаў неабходна іх больш актыўнае ўзаемадзеянне.

### *1.5. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь*

Аб'ектыўная неабходнасць узаемадзеяння бібліяграфічных цэнтраў абумоўлена наступнымі фактарамі:

– неабходнасцю поўнага і аператыўнага задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей кожнага карыстальніка любога цэнтра бібліяграфічнай дзейнасці, у тым ліку праз выкарыстанне бібліяграфічных крыніц іншых цэнтраў;

– неабходнасцю бібліяграфічнага адлюстравання наяўнасці розных дакументальных і электронных носьбітаў інфармацыі, у тым ліку праз стварэнне агульных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі;

– пашырэннем інфармацыйнага патэнцыялу кожнага суб'екта сістэмы дакументных камунікацый за кошт выкарыстання разнастайных бібліяграфічных крыніц інфармацыі;

– скарачэннем затрат на падрыхтоўку бібліяграфічных крыніц дзякуючы кааперацыі намаганняў па аднаразовай бібліяграфічнай апрацоўцы дакументаў і дэцэнтралізаванаму выкарыстанню яе вынікаў;

– удасканаленнем уласных формаў і метадаў бібліяграфічнай дзейнасці за кошт выкарыстання вопыту работы іншых суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый;

– фарміраваннем такога інфармацыйнага асяроддзя, дзе карыстальнік будзе здольны і для яго будуць створаны ўмовы выкарыстоўваць і ўспрымаць інфармацыйныя прадукты і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паслугі ў найбольш камфортных для сябе умовах, незалежна ад таго, хто ажыццявіў іх вытворчасць.

У пачатку 80-х гг. XX ст. была зроблена спроба на ўсесаюзным узроўні стварэння дакумента, які б рэгламентаваў асноўныя арганізацыйныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці і ўзаемадзеянне суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый. Але ведамасная раз'яднанасць, адсутнасць адзінага органа дзяржаўнага кіравання не спрыялі распрацоўцы такога нарматыўнага дакумента.

Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці да сённяшняга часу ажыццяўляецца ў межах дзейнасці бібліяграфічных цэнтраў адной сістэмы (бібліятэк; органаў НТІ); на двухбаковай аснове (паміж органамі НТІ і бібліятэкамі, музеямі і бібліятэкамі адной ведамасна-галіновай прыналежнасці, выдавецтвамі і кніжнымі магазінамі); у межах пэўных тэрытарыяльных, рэгіянальных аб'яднанняў.

Разгледзім узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці на прыкладзе ўзаемадзеяння бібліятэк, якія маюць розную ведамасную падпарадкаванасць.

Неабходнымі ўмовамі для ўзаемадзеяння бібліятэк з'яўляюцца:

– наяўнасць адзінага каардынацыйнага цэнтра ўзаемадзеяння;

– наяўнасць нарматыўных дакументаў аб узаемадзеянні;

– спецыялізацыя ў дзейнасці бібліятэк.

Сёння функцыі каардынацыйнага цэнтра ўзаемадзеяння выконвае Рэспубліканскі бібліятэчны савет, створаны ў 1999 г. пры Міністэрстве культуры РБ, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі бібліятэк рознай ведамаснай прыналежнасці. Вялікую ролю ў вырашэнні агульных праблем узаемадзеяння адыгрывае і грамадскае фарміраванне – Беларуская бібліятэчная асацыяцыя.

Значную ролю ў развіцці ўзаемадзеяння бібліятэк мелі два палажэнні: «Положение о координации деятельности библиотек Белорусской ССР в области научно-вспомогательной библиографии и информационно-библиографической работы» (1974), зацверджанае Міністэрствам культуры БССР і ўзгодненае з Міжведамаснай камісіяй па каардынацыі дзейнасці навуковых, спецыяльных і тэхнічных бібліятэк пры Дзяржплане БССР, і «Положение об участии библиотек Бе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лорусской ССР в создании системы пособий рекомендательной библиографии» (1974), зацверджанае Міністэрствам культуры БССР. Згодна з першым «Палажэннем…» былі зацверджаны ў якасці галіновых бібліяграфічных цэнтраў наступныя бібліятэкі: Нацыянальная бібліятэка Беларусі (былая Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І.Леніна) – у галіне грамадска-палітычных, філалагічных, мастацтвазнаўчых навук і краязнаўства; Прэзідэнцкая бібліятэка (былая Урадавая бібліятэка імя А.М.Горкага) – у галіне тэхнікі і эканомікі; Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН РБ (былая Фундаментальная бібліятэка Акадэміі навук БССР) – у галіне прыродазнаўчых навук; Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка – у галіне медыцынскіх навук; Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка – у галіне сельскагаспадарчых навук; Рэспубліканская навукова-метадычная бібліятэка па фізічнай культуры і спорту – у сферы фізічнай культуры і спорту; Рэспубліканская навукова-педагагічная бібліятэка – у галіне педагагічных навук і народнай адукацыі. Абласныя бібліятэкі былі вызначаны як цэнтры краязнаўчай бібліяграфіі. Такім чынам, прынятыя палажэнні замацавалі сферы спецыялізацыі ў дзейнасці бібліятэк, якой прытрымліваюцца ў асноўным у сваёй дзейнасці бібліятэкі краіны і сёння, хаця адбыліся і пэўныя змены. У 1977 г. у Беларусі была арганізавана Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка і ёй перададзены функцыі галіновага цэнтра каардынацыі бібліяграфічнай работы па тэхніцы; Прэзідэнцкая бібліятэка ў дадатак да названых, стала выконваць функцыі галіновага цэнтра па пытаннях дзяржавы і права; Рэспубліканская навукова-метадычная бібліятэка па фізічнай культуры і спорту з 2002 г. аб’яднана з бібліятэкай Беларускага універсітэта фізічнай культуры; Рэспубліканская навукова-педагагічная бібліятэка аб’яднана з бібліятэкай Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Была пэўным чынам вызначана і функцыянальная спецыялізацыя ў дзейнасці бібліятэк: за Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі замацаваны функцыі арганізацыйнага і навукова-метадычнага цэнтра бібліяграфіі ў краіне; абласныя бібліятэкі адказваюць за арганізацыйную і метадычную частку ўсёй бібліяграфічнай работы ў вобласці.

Пасля прыняцця ўказаных дакументаў былі выпрацаваны і асноўныя кірунікі ўзаемадзеяння бібліятэк у галіне бібліяграфічнай дзейнасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сумесная падрыхтоўка нарматыўных дакументаў у галіне бібліяграфічнай дзейнасці. Сумеснымі намаганнямі шляхам арганізацыі часовых творчых калектываў былі падрыхтаваны “Закон аб бібліятэчнай справе РБ” (першая і другая рэдакцыі); стандарт нацыянальнага фармату прадстаўлення і абмену бібліяграфічнымі данымі – BELMARC; “Концепция информационного взаимодействия библиотек” і інш.;

– зводнае перспектыўнае і бягучае планаванне падрыхтоўкі і выпуску бібліяграфічных дапаможнікаў. Штогод навукова-бібліяграфічны аддзел НББ рыхтуе бягучы тэматычны план падрыхтоўкі і выпуску бібліяграфічных дапаможнікаў буйнымі бібліятэкамі краіны, аналізуе яго выкананне;

– на міжведамаснай аснове ствараецца шэраг навукова-дапаможных і рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў. Так, сумеснымі намаганнямі НКП, навукова-бібліяграфічнага аддзела НББ, рэспубліканскіх галіновых бібліятэк рыхтуюцца паказальнік “Беларусь у сусветным друку” (адзін з выпускаў “Летапісу друку Беларусі”); бібліяграфічная БД і навукова-дапаможны паказальнік “Чарнобыль”; рэспубліканскія галіновыя, абласныя бібліятэкі прымаюць удзел у падрыхтоўцы матэрыялаў да бюлетэня “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, выдаваемага НББ, сумесна рыхтуюць рэкамендацыйныя дапаможнікі, якія друкуюцца як дадаткі да бюлетэня;

– на аснове каардынацыі і кааперацыі дзейнасці бібліятэк краіны ствараецца сістэма зводных каталогаў як важнейшая передумова для найбольш поўнага выкарыстання інфармацыйнага патэнцыялу краіны і эфектыўнага функцыянавання МБА і электроннай дастаўкі дакументаў (ЭДД). Стварэнне гэтай сістэмы вядзецца ўжо шмат гадоў шляхам адлюстравання ў першую чаргу найбольш каштоўных дакументаў, а таксама прадстаўленых найменшай колькасцю экзэмпляраў у сукупным фондзе краіны. Гэта нацыянальныя дакументы, беларусіка, замежныя перыядычныя і неперыядычныя выданні і інш. Апрача падрыхтоўкі крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў выглядзе зводных каталогаў, выпускаюцца і бягучыя зводныя каталогі: з 1956 г. штогоднік “Зводны паказальнік замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі РБ у ... г.”, з 1969 г. штоквартальнік “Зводны каталог новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі РБ у ... г.”.

Значным дасягненнем стаў пачатак работы па стварэнні зводнага электроннага каталога буйнейшых бібліятэк краіны;

– з мэтай скарачэння дубліравання ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні і забеспячэння рацыянальнага выкарыстання бібліяграфічных рэсурсаў бібліятэк НББ выдавала з 1972 г. “Паказальнік неапублікаваных спісаў і картатэк, складзеных бібліятэкамі Беларусі ў ... г.”, карыстаючыся інфармацыяй, якую атрымлівала ад буйнейшых бібліятэк рэспублікі. З 2000 г. выпуск паказальніка спыніўся ;

– з гэтай жа мэтай (найбольш эфектыўнага выкарыстання наяўных бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў) Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў супрацоўніцтве з іншымі бібліятэкамі быў выдадзены даведнік “Бібліяграфічныя рэсурсы буйнейшых бібліятэк г. Мінска ў дапамогу абслугоўванню навукі, прамысловасці, адукацыі, культуры і мастацтва”;

– правядзенне міжведамасных навуковых даследаванняў, штогадовае сумеснае правядзенне навукова-практычных канферэнцый;

– сумесная работа па павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў бібліятэк розных сістэм і ведамстваў, у тым ліку і бібліяграфічнай, шляхам правядзення навукова-практычных канферэнцый, нарад-кансультацый, арганізацыі курсаў павышэння кваліфікацыі для бібліёграфаў бібліятэк усіх ведамстваў.

Указаныя кірункі ўзаемадзеяння не страчваюць сваёй актуальнасці і сёння, але яны павінны ажыццяўляцца ў новых інфармацыйных умовах.

Па ініцыятыве Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі была распрацавана “Канцэпцыя інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк Беларусі” (2000), дзе вызначана, што ўзаемадзеянне бібліятэк павінна ажыццяўляцца на аснове канцэпцыі сеткавых інфармацыйных тэхналогій і шматмэтавай кааперацыі паміж бібліятэкамі, бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі. У “Канцэпцыі ...” прадстаўлены вынікі аналізу тэндэнцый развіцця інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк свету, даецца аналіз сучаснага стану, праблем і перспектыў інфарматызацыі бібліятэчных сетак РБ, разглядаюцца прынцыпы, формы, функцыянальныя аспекты ўзаемадзеяння бібліятэк на ўзроўні першасных і другасных рэсурсаў. Адзначаецца, што ў краіне склалася не зусім спрыяльная сітуацыя для эфек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк у новых інфармацыйных умовах: адсутнічае Дзяржаўная праграма развіцця бібліятэчнай сеткі краіны як асновы нацыянальнай інфармацыйнай інфраструктуры з мэтавым фінансаваннем яе развіцця; інфарматызацыя бібліятэк Беларусі арганізацыйна і тэхнічна выконваецца ў межах праграм асобных міністэрстваў і ведамстваў без каардынацыі на дзяржаўным узроўні, што вядзе да несумяшчальнасці АБІС; адсутнічаюць метадычныя асновы, сістэма нарматыўных актаў і нацыянальных стандартаў у галіне бібліятэчнай аўтаматызацыі і дзейнасці бібліятэк; адсутнічае тэлекамунікацыйная інфраструктура, якая дазваляла б ажыццяўляць інфармацыйнае ўзаемадзеянне бібліятэк і доступ усіх карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў свету.

Сярод станоўчых умоў, накіраваных на вырашэнне праблемы ўзаемадзеяння бібліятэк на аснове выкарыстання сучасных камп’ютэрных тэхналогій і тэлекамунікацый, у “Канцэпцыі...” адзначаюцца такія, як стварэнне Міжведамаснага рэспубліканскага бібліятэчнага савета пры Міністэрстве культуры; прыняцце Міністэрствам культуры праграмы аўтаматызацыі бібліятэк сваёй сістэмы; фінансаванне Дзяржкамітэтам па навуцы і тэхналогіях у межах Дзяржаўнай праграмы па развіцці навукова-даследчай камп’ютэрнай сеткі праектаў па стварэнні нацыянальнага фармату абмену бібліяграфічнымі данымі BELMARC і зводнага электроннага каталога бібліятэк РБ. У канцы 1998 г. на базе НББ і ЦНБ НАН была створана эксперыментальная мадэль зводнага электроннага каталога з перспектывай падключэння да яго іншых бібліятэк РБ.

Сярод асноўных кірункаў інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк на ўзроўні другасных рэсурсаў у “Канцэпцыі...” вылучаюцца:

– стварэнне зводнага электроннага каталога бібліятэк краіны з мэтай атрымання адзінай даведачнай базы аб наяўнасці дакумента ў галаўных бібліятэках краіны і арганізацыі аддаленага доступу да яго; укараненне тэхналогіі аднаразовага бібліяграфавання і выкарыстанне гатовых бібліяграфічных запісаў усімі бібліятэкамі; стварэнне бібліяграфічнай базы нацыянальнага дакумента і прадастаўленне яе міжнароднай супольнасці. Удзельнікамі стварэння зводнага каталога з'яўляюцца галаўныя бібліятэкі краіны, але, улічваючы адсут-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць тэлекамунікацыйнай інфраструктуры бібліятэк, мэтазгодна ствараць зводныя каталогі і на ўзроўні абласцей. На першым этапе вызначана, што база можа ствараецца шляхам канвертавання каталогаў бібліятэк-удзельніц у фармат BELMARC і іх наступнага зліцця. На другім этапе работа са зводным каталогам бібліятэк-удзельніц павінна ажыццяўляцца ў інтэрактыўным рэжыме з выкарыстаннем адзінага праграмнага пакета стварэння бібліяграфічных запісаў у фармаце BELMARC. Абслугоўванне карыстальнікаў можа ажыццяўляцца шляхам рассылкі новых паступленняў па электроннай пошце. У складзе баз даных зводнага каталога павінна быць адлюстравана ў поўным аб'ёме бібліяграфія нацыянальнага дакумента, галоўная роля ў стварэнні такой базы належыць Нацыянальнай кніжнай палаце, якая першай павінна ствараць бібліяграфічныя запісы новых паступленняў і прысвойвае ідэнтыфікатар нацыянальнай бібліяграфіі. Для забеспячэння аператыўнасці магчыма каардынацыя выканання функцый бібліяграфавання паміж НКП і рэспубліканскімі бібліятэкамі;

– укараненне карпаратыўнай каталагізацыі, якая прадугледжвае аднаразовае стварэнне бібліяграфічнага запісу; сумесныя (НКП і бібліятэкамі-ўдзельніцамі) стварэнне і папаўненне зводнага каталога; цэнтралізаванае вядзенне сістэм класіфікацыі і кадзіравання; сумесная работа бібліятэк па стварэнні нацыянальных аўтарытэтных/нарматыўных запісаў і лінгвістычных баз і цэнтралізаванае іх вядзенне. Пры гэтым неабходна вырашыць, хто ў краіне будзе выконваць функцыі нацыянальнага цэнтра карпаратыўнай каталагізацыі; вызначыць пералік бібліятэк-удзельніц, якія маюць права ствараць бібліяграфічныя запісы, каб быў прадстаўлены найбольш поўны рэпертуар дакументаў, што маюцца ў бібліятэках краіны. Астатнія бібліятэкі будуць выкарыстоўваць гатовыя бібліяграфічныя запісы. Для каталагізацыі расійскага дакумента мэтазгодна выкарыстоўваць базу даных Расійскай кніжнай палаты з дапрацоўкай яе да інтэрактыўнага рэжыму. Такім чынам, эканоміцца значная колькасць матэрыяльных сродкаў і людскіх рэсурсаў, а электроныя каталогі бібліятэк становяцца больш якаснымі;

– рэтраканверсія каталогаў неабходна для поўнага адлюстравання фондаў бібліятэк і сукупнага фонду ў зводным каталогу. Улічваючы высокі працэнт супадзення рэпертуару ва

універсальных бібліятэках, для правядзення рэтраканверсіі неабходна кааперацыя выканання работ, каб выключыць дубліраванне ў працэсе падрыхтоўкі бібліяграфічных запісаў. Размеркаванне работ магло б ажыццяўляцца па раздзелах УДК з наступнай ідэнтыфікацыяй запісаў па ўласных каталогах. Падрыхтоўка бібліяграфічных запісаў павінна ажыццяўляцца ў фармаце BELMARC па адзіных узгодненых макетах уводу даных. Для арганізацыі работы па рэтраканверсіі патрэбна распрацоўка ўзгодненай з галаўнымі бібліятэкамі праграмы;

– стварэнне зводных тэматычных баз даных, якія б адлюстроўвалі інфармацыйныя рэсурсы ўсіх галіновых і рэгіянальных бібліятэк па дадзенай тэматыцы на аснове кааперацыі. Выкананне работ павінна рэгламентавацца ў адпаведнасці з каардынацыйным планам і замацаваннем адказнасці бібліятэк за стварэнне і вядзенне адпаведных баз даных;

– стварэнне аўтарытэтных/нарматыўных запісаў. Аўтарытэтныя файлы (authority files) выкарыстоўваюцца для уніфікацыі кропак доступу ў бібліяграфічных запісах і стандартызацыі іх напісання, аб’ядноўваючы з дапамогай выкарыстання спасылак усе разнавіднасці напісання адной і той жа назвы або імя, пры гэтым для ўсіх варыянтаў напісання даецца спасылка на стандартнае напісанне, якое служыць кропкай доступу і павышае эфектыўнасць пошуку неабходнага дакумента. Ствараюцца наступныя аўтарытэтныя файлы: імянны (уніфікаванае напісанне імён індывідуальных ці калектыўных аўтараў); загалоўкаў твораў без аўтара; прадметных і геаграфічных рубрык, якія ўключаюць тэрміны, што адносяцца да зместу дакумента, маюць геаграфічныя, храналагічныя і іншыя прыметы. Як вызначана ў “Канцэпцыі...”, стварэнне аўтарытэтных файлаў могуць узяць на сябе НКП, Нацыянальная і Прэзідэнцкая бібліятэкі, галаўныя галіновыя бібліятэкі, гэта значыць, што дадзеная работа павінна ажыццяўляцца на прынцыпах каардынацыі сумеснай дзейнасці і кааператыўных пачатках з неабходным падпарадкаваннем адзіным стандартам.

Забеспячэнне доступу да замежных баз даных таксама можа ажыццяўляцца шляхам стварэння цэнтраў калектыўнага карыстання базамі даных, у якіх аб’ядноўваліся б на парытэтных пачатках бібліятэкі, ажыццяўляючы калектыўную падпіску і выкарыстанне крыніц інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У “Канцэпцыі ...” адзначаецца неабходнасць дакладнага размежавання функцый бібліятэк і органаў НТІ, пры гэтым падкрэслена, што органы НТІ маглі б узяць на сябе функцыі па аналітычнай апрацоўцы інфармацыі. Але самі кірункі ўзаемадзеяння, больш дакладная канкрэтызацыя функцый, задач дзейнасці ўказаных суб’ектаў сістэмы дакументных камунікацый у межах узаемадзеяння адсутнічаюць.

З мэтай рэалізацыі ўказаных кірункаў інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк у сучасных умовах неабходна дзяржаўная праграма забеспячэння гэтага ўзаемадзеяння, у межах якой павінна быць вызначана арганізацыйная структура, што адказвае за каардынацыю праектаў нацыянальнага ўзроўню, адпаведнае нарматыўнае і метадычнае забеспячэнне работы, ажыццяўляемай на кааператыўных пачатках.

Практыка работы бібліятэк краіны ў сувязі з развіццём сродкаў тэлекамунікацыйнай сувязі сведчыць аб з’яўленні новых формаў супрацоўніцтва – развіваюцца карпаратыўныя сістэмы, сеткі бібліятэк, карпаратыўныя праекты па зборы, захоўванні, перапрацоўцы і забеспячэнні доступу да інфармацыі; ствараюцца бібліятэчныя кансорцыумы, якія вызначаюцца як аб'яднанні бібліятэк і іншых інфармацыйных службаў для сумеснай падрыхтоўкі, фарміравання, закупкі і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў і праграмных сродкаў.

У глабальных камп’ютэрных сетках налічваецца каля 10 000 электронных версій навуковых часопісаў. Калі ў 1997 г. са 100 навуковых часопісаў, якія маюць самы высокі рэйтынг, паводле даных “Journal Citation Report“, у інтэрнет былі прадстаўлены поўнымі тэкстамі не больш за 10 %, то ў канцы 1999 г. гэтая лічба ўзрасла да 70%. Існуючыя тэндэнцыі дазваляюць меркаваць, што ў бліжэйшыя гады абсалютная большасць навуковых часопісаў будзе даступна праз інтэрнет у паўнатэкставай форме. Аднак доступ да электронных часопісаў, як правіла, платны. У сувязі з гэтым важнае значэнне набываюць такія формы атрымання навуковай інфармацыі, як арганізацыя кансорцыумаў, якія забяспечваюць сумесны доступ да электронных, у тым ліку і бібліяграфічных, навуковых рэсурсаў, стварэнне сістэмы размеркаваных бібліятэчных фондаў сумеснага карыстання. Безумоўна, што пры такой тэхналогіі галоўным сродкам інфармавання аб наяўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і магчымасцях доступу да размеркаваных бібліятэчных фондаў будуць выступаць зводныя каталогі або ў электроннай форме, або ў традыцыйнай і электроннай. У 2001 г. у Рэспубліцы Беларусь быў створаны кансорцыум навуковых і бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў па доступу да баз даных EBSCO, які ўзначаліла ЦНБ НАН Беларусі.

Бібліятэкі ВНУ краіны ўдзельнічаюць у рэалізацыі карпаратыўнага праекта па стварэнні зводнай анатаванай бібліяграфічнай базы артыкулаў бягучых перыядычных выданняў.

Задача па стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёна (вобласці) шляхам узаемадзеяння бібліятэк, іншых бібліяграфічных цэнтраў па падрыхтоўцы і эфектыўным абмене электроннымі рэсурсамі таксама мае прыклады актыўнай рэалізацыі. Станоўчы вопыт стварэння зводных электронных рэсурсаў ужо ёсць у розных рэгіёнах: рыхтуюцца зводныя бюлетэні падпіскі бібліятэк; зводныя каталогі электронных рэсурсаў; вэб-каталогі рэсурсаў інтэрнет, створаных у рэгіёне; паўнатэкставыя БД.

### *1.6. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці Беларусі з замежнымі ўстановамі і арганізацыямі*

Дзякуючы ўзаемадзеянню цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў межах краіны бібліятэкі маюць магчымасць выкарыстоўваць нацыянальныя інфармацыйныя рэсурсы, але сёння перад бібліятэкамі стаіць задача забеспячэння доступу да замежных бібліяграфічных рэсурсаў. Рэалізацыя гэтай задачы вырашаецца праз міжнароднае бібліяграфічнае супрацоўніцтва, праз узаемадзеянне бібліятэк, бібліяграфічных цэнтраў краіны з аналагічнымі замежнымі ўстановамі. Прычым у працэсе гэтага ўзаемадзеяння павінны вырашацца дзве звязаныя паміж сабой задачы: па-першае, забяспечыць максімальна магчымы доступ карыстальнікам краіны да інфармацыйных рэсурсаў свету без усялякіх абмежаванняў; па-другое, інтэграваць нацыянальную бібліяграфічную інфармацыю ў міжнародную інфармацыйную прастору, зрабіць яе даступнай супольнасці свету і стварыць перадумовы для яе канкурэнтаздольнасці. Гэтыя дзве задачы па пераадоленні інфармацыйных бар'ераў узаемазвязаны і накіраваны на арганізацыю ўсеагульнага доступу да глабальнай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнароднае бібліяграфічнае супрацоўніцтва рэалізуецца па лініі міжнародных арганізацый, такіх як ЮНЕСКА, ІФЛА, ФІД, ІСА. Удзел у рабоце гэтых арганізацый дазваляе выкарыстоўваць замежны вопыт, міжнародныя навуковыя распрацоўкі, прымаць удзел у абмеркаванні і вырашэнні разнастайных праблем, у тым ліку фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў свету, у рэалізацыі распрацаваных імі і прынятых на міжурадавым узроўні міжнародных праграм, у прыватнасці ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці, такіх як УБУ/MARC, Памяць свету, НАЦІС, Інфармацыя для ўсіх, Усеагульная даступнасць выданняў і інш.*

Міжнароднае бібліяграфічнае супрацоўніцтва сёння актыўна развіваецца і па лініі галінова-ведамасных сістэм. Абагульняючы вопыт работы бібліятэк розных сістэм па міжнародным супрацоўніцтве, можна вылучыць наступныя тэндэнцыі і кірункі:

– супрацоўніцтва ў рамках міжнародных асацыяцый (Бібліятэчная асацыяцыя Еўразіі, Асацыяцыя спецыялістаў НТБ, Аб'яднанне цэнтральных сельскагаспадарчых бібліятэк краін СНД, Міжнародная асацыяцыя спецыялістаў па сельскагаспадарчай інфармацыі IAALD, Міжнародная асацыяцыя карыстальнікаў CDS/ISIS і інш.), што дазваляе бібліятэкам прымаць удзел у вырашэнні праблем узаемадзеяння бібліятэк пэўных сістэм, у міжнародных праектах па стварэнні нарматыўных дакументаў (напрыклад, мадэлей нарматыўных дакументаў у межах Бібліятэчнай асацыяцыі Еўразіі), вырашэнні агульных праблем, якія тычацца розных кірункаў дзейнасці;

– стварэнне сумеснымі намаганнямі інфармацыйных прадуктаў для дэцэнтралізаванага выкарыстання (напрыклад, "Сводный каталог научно-технической литературы" ў межах Асацыяцыі спецыялістаў НТБ краін СНД; міжнародны праект "Віртуальная электронная бібліятэка – VirLib" бібліятэк ВНУ краіны і Вышэйшай спецыяльнай школы ў г.Аснабрук (Германія), накіраваны на інтэграцыю электронных паўнатэкставых дакументаў і інтэрнэт-рэсурсаў для інфармацыйнага забеспячэння навуковых даследаванняў і навучальнага працэсу; сумесная работа бібліятэк ВНУ Беларусі з біблія-

---

*Дзейнасць гэтых арганізацый і змест названых праграм разглядаюцца ў курсе "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэкамі ВНУ Расіі па стварэнні базы даных аналітычных матэрыялаў і інш.); ажыццяўленне абмену рознымі відамі інфармацыі;

– абмен праграмнымі прадуктамі працы з інфармацыйнымі крыніцамі. Сёння шэраг бібліятэк краіны выкарыстоўваюць праграмнае забеспячэнне, распрацаванае бібліятэкамі іншых краін. Так, БелСГБ не толькі выкарыстоўвае сама праграму ІРБІС ДПНТБ Расіі, але і з'яўляецца афіцыйным дыстрыб'ютэрам гэтага прадукту;

– стварэнне электронных даведнікаў па бібліятэках, інфармацыйных цэнтрах. З 1998 г. БелСГБ удзельнічае ў міжнародным праекце па стварэнні стандартызаваных сайтаў-навігатараў па міжнародных і нацыянальных вэб-рэсурсах па сельскай гаспадарцы, якія дазваляюць карыстальнікам атрымаць простую і зручную навігацыю, даведацца аб вядучых міжнародных інфармацыйных сістэмах, нацыянальных, рэгіянальных, нізавых структурах па сельскай гаспадарцы і знайсці адрасы іх сайтаў. БелСГБ падрыхтавала нацыянальную частку праекта – сайт AgroWebBelarus, на якім прадстаўлены адрасы сайтаў беларускіх кіруючых, навуковых, вучэбных структур, няўрадавых арганізацый сельскагаспадарчага профілю. У сувязі з тым, што не ўсе сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны маюць свой сайт у інтэрнэце, БелСГБ змясціла падрабязную даведачную інфармацыю аб астатніх (назва арганізацыі, адрас, тэлефон, факс, электронная пошта, прозвішча кіраўніка, а таксама кароткая даведка аб дзейнасці і паслугах, якія характарызуюць дадзеную арганізацыю). Тым самым беларускія аграрныя ўстановы атрымалі міні-homepage ў інтэрнэце і сталі часткай агульнаеўрапейскай інфармацыйнай сістэмы. Такім чынам, напрыклад, любы аграрны каледж, размешчаны ў цяжкадаступным раёне беларускага Палесся стаў таксама даступны праз інтэрнэт, як і, напрыклад, Нацыянальны аграрны універсітэт Венгрыі, размешчаны ў цэнтры Еўропы;

– рэалізацыя адукацыйных праграм для супрацоўнікаў бібліятэк і розных формаў павышэння кваліфікацыі. Сёння добра вядомы крымскія міжнародныя канферэнцыі, арганізуемыя ДПНТБ Расіі; канферэнцыі ў Краснадары па пытаннях фарміравання інфармацыйнай культуры грамадства, удзел у якіх прымаюць і спецыялісты нашай краіны, і інш.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– удзел у міжнародных праграмах па забеспячэнні доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў, да размеркаваных, у тым ліку і бібліяграфічных, банкаў даных. На працягу некалькіх гадоў ЦНБ НАН Беларусі ўдзельнічае ў міжнароднай праграме INTAS па бясплатным забеспячэнні вучоных навуковай інфармацыяй з замежных часопісаў. У 2000 г. больш за 30 бібліятэк краіны атрымлівалі бясплатна базы даных кампаніі “EBSCO Publishing“ на СД-ROM. З 2001 г. Гановерскі універсітэт і Міжнародная сетка доступу да навуковых публікацый (INASP) пачала новы этап работы, які прадугледжвае тры ўзроўні доступу да навуковай і тэхнічнай інфармацыі: бібліяграфічныя і паўнатэкставыя базы даных PASCAL in Science, Technology and Medicine, FRANCIS, MEDLINE, CABI, EBSCO; поўныя тэксты электронных часопісаў выдавецтваў “Academic Press”, “Blackwell Publishers”, EBSCO, “Kluwer” і інш.; забеспячэнне вучоных копіямі навуковых артыкулаў праз службу дастаўкі дакументаў Брытанскай бібліятэкі.

Мяняецца і тэхналогія доступу да знешніх інфармацыйных рэсурсаў. ЦНБ НАН Беларусі атрымала доступ да Навуковай электроннай бібліятэкі, створанай пры Расійскім фондзе фундаментальных даследаванняў (РФФД). РФФД забяспечвае магчымасць доступу да электронных часопісаў шматлікіх замежных і расійскіх выдавецтваў, навуковых інстытутаў і арганізацый. Карыстальнікі, якія маюць доступ у інтэрнет, самастойна ажыццяўляюць пошук артыкулаў у Навуковай электроннай бібліятэцы і для атрымання поўнага тэксту артыкула перадаюць заяўку ўстаноўленага ўзору ў ЦНБ НАН Беларусі па электроннай пошце або ў пісьмовым выглядзе. Заяўкі выконваюцца супрацоўнікамі бібліятэкі. Распрацаваная аўтаматызаваная сістэма выканання заказаў праз інтэрнет дазваляе выключыць дубліраванне пры звяртанні да знешніх крыніц інфармацыі, павялічыць хуткасць выканання заявак. У бібліятэках, дзе створаны службы электроннай дастаўкі дакументаў, як і пры функцыянаванні МБА, вялікае значэнне маюць праверка правільнасці бібліяграфічнага запісу, удакладненне неабходных звестак.

Некаторыя спецыялісты вылучаюць міжнародную інфармацыйную прастору ў межах пэўнай галіны ведаў, якая складаецца з міжнародных, нацыянальных і лакальных інфарма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйных цэнтраў гэтай галіны. Доступ да розных відаў міжнароднай інфармацыі рэалізуецца ў асноўным шляхам стварэння і выкарыстання транснацыянальных БД, якія адлюстроўваюць з максімальнай паўнатой сусветны інфармацыйны паток і даступны кожнаму карыстальніку. Вытворцамі такіх БД з’яўляюцца спецыялізаваныя міжнародныя інфармацыйныя цэнтры, якія абапіраюцца на кааперацыю з нацыянальнымі інфармацыйнымі цэнтрамі.

Вопыт такога міжнароднага супрацоўніцтва можна разгледзець на прыкладзе ўдзелу ў міжнародных інфармацыйных карпарацыях і сістэмах Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі. Сёння ў галіне сельскай гаспадаркі дзейнічаюць пяць інфармацыйных цэнтраў, якія ствараюць БД з сусветным ахопам дакументаў. БелСГБ актыўна з імі супрацоўнічае. Так, дзякуючы намаганням кіраўніцтва бібліятэкі, БелСГБ была прызначана Нацыянальным цэнтрам Міжнароднай інфармацыйнай сістэмы Камісіі ААН па харчаванні і сельскай гаспадарцы, якая генерыруе БД па публікацыях – AGRIS. БелСГБ апрацоўвае нацыянальныя публікацыі, стварае транслітэрыраваныя запісы, рыхтуе рэфераты на англійскай мове, індэксуе дакументы па міжнародным тэзаўрусе AGROVOC і перадае запісы праз інтэрнет у БД AGRIS. Узамен бібліятэка бясплатна атрымлівае БД на кампакт-дысках з міжнародным ахопам дакументаў і штоквартальным аднаўленнем, у якой змяшчаецца больш за 3 млн. запісаў пачынаючы з 1975 г.

З 1997 г. БелСГБ стала нацыянальным цэнтрам міжнароднай сістэмы па сельскагаспадарчых праектах CARIS. Яна адказвае за збор і апрацоўку звестак аб пачатых, бягучых і завершаных у краіне НДР і ВКР па праблематыцы АПК. Адпаведна бібліятэка атрымлівае БД CARIS.

БелСГБ мае дагавор з Нацыянальнай сельскагаспадарчай бібліятэкай ЗША і перадае ёй па кнігаабмене кантрольны экзэмпляр сельскагаспадарчай літаратуры Беларусі. Гэтая літаратура апрацоўваецца для ўключэння ў міжнародную БД AGRICOLA, якая набываецца БелСГБ. Таксама ўся сельскагаспадарчая літаратура Беларусі перадаецца ў ЦНСГБ Расіі, дзе апрацоўваецца для БД AGROS, якая паступае ў БелСГБ з 1992 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БелСГБ (разам з такімі беларускімі бібліятэкамі, як НББ, бібліятэка БНТУ, РНТБ) прымае ўдзел у фарміраванні “Сводного каталога научно-технической литературы», які генеруецца і вядзецца ДПНТБ Расіі, дасылае туды звесткі аб атрыманых у фонд бібліятэкі выданнях, у тым ліку і замежных.

Такім чынам, калі ўласныя рэсурсы бібліятэкі – калекцыя дакументаў па сельскай гаспадарцы і харчаванні – налічваюць больш за 500 тыс. назваў, то ў камп’ютэрах бібліятэкі падтрымліваецца і папаўняецца больш за 30 бібліяграфічных, рэфератыўных, фактаграфічных, паўнатэкставых і экспертных БД, у якіх змяшчаецца звыш 10 млн. запісаў і сотні тысяч старонак поўных тэкстаў.

У працэсе міжнароднага супрацоўніцтва БелСГБ рэалізуе і такую задачу, як дастаўка карыстальнікам дакументаў-першакрыніц з інфармацыйнага патоку свету. З 1996 г. бібліятэка стала членам сістэмы AGLINET, работа якой накіравана на гарантаванасць бясплатнага прадастаўлення інфармацыі членам карпарацыі ў прыярытэтным выкананні; як правіла, адказ на запыт выконваецца ў дзень яго атрымання. Так, БелСГБ атрымлівае па запытах 3 тыс. дакументаў у год з 40 краін, накіроўвае ім у адказ толькі адзінкі нацыянальных дакументаў, хаця праз удзел БелСГБ у AGLINET сусветная супольнасць мае гарантаваную магчымасць атрымання беларускіх дакументаў.

Адметнасцю міжнароднага бібліяграфічнага супрацоўніцтва з’яўляецца падтрымка цесных сувязей нашых бібліятэк з расійскімі. Гэтыя сувязі існавалі ў вытворчасці і выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі паміж краінамі па лініі “рэспубліка – цэнтр” у часы былога СССР. Пераважна ў Маскве існавалі агульнасаюзныя цэнтры, якія з’яўляліся суб’ектамі міжнароднага бібліяграфічнага супрацоўніцтва, праз іх бібліятэкі рэспублікі атрымлівалі замежную бібліяграфічную інфармацыю, 90% інфармацыйных выданняў, здзяйснялі міжнароднае бібліяграфічнае супрацоўніцтва па тэарэтычных, арганізацыйна-метадычных і іншых пытаннях. Цяпер былыя ўсесаюзныя бібліяграфічныя цэнтры ў большасці сваёй выконваюць функцыі расійскіх і маюць для беларускіх бібліятэк статус замежных. Асаблівая роля іх у тым, што яны з’яўляюцца буйнейшымі бібліяграфічнымі ўстанова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі, якія прадстаўляюць бібліяграфічную інфармацыю на рускай мове (найбольш даступнай карыстальнікам нашых бібліятэк), апрацоўваюць велізарныя патокі дакументаў з многіх краін свету, прапануючы шырокі асартымент бібліяграфічных і інфармацыйных прадуктаў; выступаюць ініцыятарамі стварэння міжнародных арганізацый у межах краін СНД па інфармацыйным узаемадзеянні.

Інтэграцыя нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў у міжнародныя і транснацыянальныя інфармацыйныя сістэмы патрабуе добрай інфармацыйнай інфраструктуры бібліятэкі, да якой можна аднесці ўсё тое, што забяспечвае ім доступ да інфармацыі без пэўных абмежаванняў: аснашчанасць бібліятэк камп'ютэрамі; сеткавыя магчымасці для інфармацыйнага абмену ў бібліятэках; наяўнасць, разнастайнасць і якасць прыкладных праграм кіравання інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэк; выкарыстоўваемыя камунікатыўныя фарматы і іх адпаведнасць міжнародным стандартам прадастаўлення і перадачы інфармацыі; наяўнасць каналаў доступу і дастаўкі інфармацыі. На жаль, можна канстатаваць, што абсалютная большасць беларускіх бібліятэк не валодаюць добрай інфармацыйнай інфраструктурай, якая б з'яўлялася базай для арганізацыі доступу да міжнароднай і нацыянальнай інфармацыі.

### *Пытанні і заданні*

1. Якія існуюць перспектывы развіцця розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці ў інфармацыйным грамадстве?
2. Як і ў чым праяўляецца ўзаемаўплыў арганізацыі, тэхналогіі і методыкі бібліяграфічнай дзейнасці?
3. Якія прынцыпы дыферэнцыяцыі бібліяграфічных цэнтраў існуюць і як выяўляюцца ў арганізацыйнай структуры бібліяграфічнай дзейнасці?
4. Параўнайце бібліяграфічную дзейнасць кніжных магазінаў і бібліятэк; органаў НТІ і бібліятэк; СМІ і бібліятэк. Вызначце іх асаблівасці.
5. Па якіх кірунках ажыццяўляецца ўзаемадзеянне ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці паміж НКП і бібліятэкамі; бібліятэкамі і органамі інфармацыі; бібліятэкамі і архівамі; выдавецтвамі і кнігагандлёвымі арганізацыямі; бібліятэкамі і СМІ?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Якія Вы бачыце перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці нашай краіны з замежнымі ўстановамі і праблемы ў гэтым узаемадзеянні?

# Глава 2. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы

## *2.1. Агульныя пытанні арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы*

Бібліяграфічная дзейнасць ажыццяўляецца ў бібліятэках усіх тыпаў, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці, складу карыстальнікаў, аб'ёму і профілю работы. Патрабаванні да бібліяграфічнай дзейнасці ва ўсіх тыпах бібліятэк, асабліва ў буйных навуковых, пастаянна ўскладняюцца. Гэта выклікана агульнымі працэсамі інфарматызацыі дзейнасці ўсіх суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый, узрастаннем ролі інфармацыйнай функцыі бібліятэк, зменамі ў сістэме дакументных камунікацый, функцыянаваннем бібліятэк ва ўмовах рынкавых адносін.

У цяперашні час сярод асноўных задач, якія стаяць перад бібліяграфічнымі службамі бібліятэк, выдзяляюцца наступныя:

– стварэнне аптымальных умоў і роўных магчымасцей для поўнага задавальнення прафесійных і агульнакультурных патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі без усялякіх забарон на інфармацыю і ў незалежнасці ад тэрытарыяльных асаблівасцей развіцця асобных бібліятэчных сетак;

– усебаковая інтэнсіфікацыя бібліяграфічных працэсаў, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій, рацыянальнае выкарыстанне з улікам аптымальнага ўзаемадзеяння аўтаматызаваных і традыцыйных сродкаў падрыхтоўкі і давядзення інфармацыі да спажыўцоў;

– павышэнне эфектыўнасці і якасці бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, ствараемых бібліяграфічнымі службамі; гарантаванне дыферэнцыраванасці, паўнаты, дакладнасці і аператыўнасці бібліяграфавання і абслугоўвання;

– павышэнне камфортнасці абслугоўвання спажыўцоў за кошт комплекснага прадастаўлення бібліяграфічнай інфармацыі і першаснага дакумента;

– вызначэнне свайго месца на інфармацыйным рынку рэгіёна, распрацоўка асартыменту бібліяграфічных прадуктаў і паслуг у адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбамі спажыўцоў інфармацыі і магчымасцямі бібліятэк;

– укараненне элементаў эканамічнага гаспадарання ў практыку работы бібліятэк, пераарыентацыя бібліяграфічных напрамкаў дзейнасці на канчатковыя вынікі працы – вытворчасць бібліяграфічных прадуктаў і паслуг з мэтай задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей, адмаўленне ад ацэнкі якасці і эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці толькі ў колькасных паказчыках, укараненне эканамічных метадаў кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю.

Вырашэнне ўказаных задач залежыць ад арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці як цалкам па краіне, так і ў кожнай бібліятэцы. Пад арганізацыяй бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі разумеецца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне пасяховага выканання бібліятэкай сваіх задач з выкарыстаннем усяго арсенала бібліяграфічных сродкаў, і ў першую чаргу вызначэнне арганізацыйных структур і канкрэтных супрацоўнікаў, якія будуць выконваць бібліяграфічныя функцыі і рэалізоўваць названыя задачы. Дзеля гэтага ў кожнай бібліятэцы вызначаецца бібліяграфічная служба.

Да азначэння паняцця “бібліяграфічная служба” існуюць некалькі падыходаў. Так, І.Р.Маргенштэрн лічыць, што бібліяграфічная служба – гэта падсістэма бібліятэкі, якая забяспечвае яе бібліяграфічную дзейнасць. У склад бібліяграфічнай службы ўваходзяць інфармацыйныя рэсурсы, прадстаўленыя бібліяграфічнымі і даведачнымі крыніцамі розных відаў і месцаў захоўвання; персанал або суб’екты бібліяграфічнай дзейнасці; арганізацыйныя формы бібліяграфічнай дзейнасці; матэрыяльна-тэхнічная база (МТБ) і эканамічная. Ядро гэтай службы – бібліяграфічнае падраздзяленне (аддзел, сектар) бібліятэкі, якое з’яўляецца цэнтрам арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Суб’ектамі бібліяграфічнай службы выступаюць бібліёграфы і бібліятэкары – супрацоўнікі бібліяграфічных аддзелаў, а таксама іншых падраздзяленняў, якія выконваюць бібліяграфічную работу. МТБ бібліяграфічнай службы звязана з памяшканнямі для бібліяграфічнай работы, набыццём ўстройстваў для захоўвання і выкарыстання носьбітаў другаснай дакументнай інфармацыі, сродкаў пад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтоўкі і тыражавання бібліяграфічнай інфармацыі, сродкаў сувязі і інш. Эканамічную базу бібліяграфічнай дзейнасці складаюць сродкі з бюджэту бібліятэкі, а таксама прыбытак ад рэалізацыі бібліяграфічнай прадукцыі і дадатковых паслуг.

Разгледзім арганізацыйныя формы бібліяграфічнай дзейнасці і яе суб’ектаў.

Бібліяграфічная служба ўключае як спецыяльныя падраздзяленні бібліятэкі, за якімі функцыянальна замацоўваецца выкананне бібліяграфічных працэсаў (бібліяграфічны аддзел, сектар, група), так і іншыя падраздзяленні бібліятэкі (аддзел камплектавання, аддзел апрацоўкі дакументаў і каталогаў, аддзел абслугоўвання, аддзел мастацтва і інш.), якія ажыццяўляюць бібліяграфічныя кірункі дзейнасці ў выпадку, калі бібліятэка мае разгорнутую арганізацыйную структуру. Калі бібліятэка не мае разгорнутай стуктуры і па штату абмяжоўваецца некалькімі, а то і адным супрацоўнікам, то бібліяграфічныя функцыі выконвае бібліёграф ці бібліятэкар. Правільная арганізацыя бібліяграфічнай службы прадугледжвае таксама дакладнае вызначэнне функцый і ўзаемадзеянне розных падраздзяленняў бібліятэкі, якія выконваюць бібліяграфічныя працэсы.

Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы залежыць ад шэрага знешніх і ўнутраных фактараў. Да знешніх адносяцца статус, тып бібліятэкі, яе галоўныя функцыі, задачы, ведамасная прыналежнасць, склад карыстальнікаў бібліятэкі, віды склад і аб'ём фондаў, месца ў інфармацыйнай структуры рэгіёна. Унутраныя фактары – гэта колькасць падраздзяленняў бібліятэкі, штатных супрацоўнікаў, матэрыяльна-тэхнічная база і ступень аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, асаблівасці арганізацыйнай сістэмы кіравання ў бібліятэцы.

У аснове арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі любога тыпу ляжаць наступныя прынцыпы:

– накіраванасць на рашэнне прыярытэтных у дадзеных умовах задач, якія стаяць перад бібліятэкай;

– даступнасць бібліяграфічнага абслугоўвання для ўсіх груп карыстальнікаў бібліятэкі;

– рацыянальнае спалучэнне цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі ў арганізацыі бібліяграфічнай службы бібліятэкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навуковасць (удасканаленне арганізацыі бібліяграфічнай работы павінна адбывацца з улікам навуковых дасягненняў як у галіне менеджменту бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, так і ў агульнай тэорыі кіравання);

– бесперапыннасць (імкненне да пастаяннай адпаведнасці формаў арганізацыі бібліяграфічнай працы ўзроўню развіцця тэхнікі і тэхналогіі);

– планавасць (удасканаленне арганізацыі бібліяграфічнай працы павінна адбывацца пастулова, планава, з адпаведнай падрыхтоўчай работай, нарматыўным абгрунтаваннем);

– эканамічнасць (арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці павінна выключаць дубліраванне, а забяспечваць дакладнасць, бесперапыннасць пры выкананні бібліяграфічных працэсаў у бібліятэцы).

Аптымальная арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці прадугледжвае яе адпаведнасць наступным патрабаванням:

– дэмакратызацыі кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю;

– навукова абгрунтаванаму планаванню і дакладнаму, поўнаму ўліку ўсіх кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці;

– рацыянальнаму размеркаванню функцый паміж падраздзяленнямі бібліятэкі, якія вядуць бібліяграфічную работу;

– навукова абгрунтаванаму падбору, расстаноўцы кадраў, пастаяннаму павышэнню іх бібліяграфічнай кваліфікацыі;

– рацыянальнай тэхналагічнай пабудове бібліяграфічных працэсаў, іх нарміраванню, укараненню новых прагрэсіўных тэхналогій, метадаў працы, інавацыйнага вопыту;

– развіццю разнастайных арганізацыйных формаў супрацоўніцтва з бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі і іншымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый.

## *2.2. Асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў*

Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў залежыць ад шэрага як знешніх, так і ўнутраных фактараў. Рэалізацыя асноўных функцый, вырашэнне пастаўленых перад бібліятэкай задач ажыццяўляюцца шляхам фарміравання ў ёй арганізацыйнай структуры (сукупнасці падраздзяленняў – аддзелаў, сектараў, груп), якія выдзяляюцца па розных прыметах: выконваемых функцыях (аддзелы камплектавання, абслугоўвання і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галіновых, ці змястоўных (аддзелы мастацтва, сельскагаспадарчай літаратуры і інш.); моўных (аддзел замежнай літаратуры); відах дакументаў (аддзел нарматыўных дакументаў па стандартызацыі, аддзел патэнтных дакументаў) і інш. Чым вышэй статус бібліятэкі, тым складаней яе арганізацыйная структура і адпаведна структура бібліяграфічнай службы. Так, для вырашэння пастаўленых задач у НББ (па стану на 2006 г.) створаны і функцыянуюць 42 аддзелы і больш за 80 сектараў і груп, два самастойныя бібліяграфічныя аддзелы, у той час як у абласных універсальных навуковых бібліятэках выдзяляюцца ад 12 (Магілёўская АУНБ) да 19 аддзелаў і сектараў (Віцебская, Мінская АУНБ) з самастойным бібліяграфічным аддзелам; у цэнтральнай бібліятэцы ЦБС – ад трох да пяці аддзелаў, у большасці бібліятэк няма самастойнага бібліяграфічнага аддзела, а бібліёграфы працуюць у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі. Арганізацыйная структура бібліятэкі можа дапаўняцца новымі аддзеламі і сектарамі, аддзелы могуць аб'ядноўвацца, раз'ядноўвацца па прычыне ўкаранення новых аўтаматызаваных тэхналогій, з'яўлення новых катэгорый спажыўцоў інфармацыі, неабходнасці рэалізацыі новых функцый, задач і інш. Большасць бібліятэк вырашаюць пытанні сваёй арганізацыйнай структуры самастойна.

Бібліяграфічная служба бібліятэк можа мець цэнтралізаваны і дэцэнтралізаваны характар. Пры цэнтралізаванай службе штатныя бібліёграфы сканцэнтраваны ў бібліяграфічным аддзеле, хаця іх рабочыя месцы могуць быць у галіновых ці іншых аддзелах, і яны выконваюць увесь аб'ём бібліяграфічнай работы. Бібліятэкары аддзелаў абслугоўвання аказваюць чытачам толькі першасную бібліяграфічную дапамогу: удзельнічаюць у падрыхтоўцы і выкарыстанні недыферэнцыраваных формаў бібліяграфічнага інфармавання (напрыклад, арганізуюць выставы новых паступленняў), выконваюць нескладаныя даведкі, выдаюць даведачныя, інфармацыйныя выданні з падсобных фондаў аддзела, праводзяць бібліяграфічныя агляды, удзельнічаюць у фарміраванні інфармацыйнай культуры спажыўцоў.

Цэнтралізаваная бібліяграфічная служба дазваляе забяспечыць адзінства бібліяграфічнага абслугоўвання і даведачна-бібліяграфічнага апарату (ДБА); захаваць бібліяграфічны аддзел як асноўнае звяно ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі; аператыўна вырашаць арганізацыйныя праблемы; рацыянальна размяркоўваць абавязкі паміж усімі бібліёграфамі; выключаць дубліраванне, укараняць новыя прагрэсіўныя тэхналогіі, інавацыйныя формы і метады бібліяграфічнай работы, уніфікаваць асобныя бібліяграфічныя працэсы; ствараць перадумовы для эфектыўнага міжведамаснага ўзаемадзеяння бібліятэкі з іншымі бібліятэкамі, органамі інфармацыі.

Пры дэцэнтралізаванай бібліяграфічнай службе штатныя бібліёграфы працуюць не толькі ў бібліяграфічным, але і ў іншых аддзелах бібліятэкі (функцыянальных; галіновых; аддзелах, якія спецыялізуюцца на рабоце з асобнымі відамі выданняў). Таму ў бібліяграфічным аддзеле застаюцца бібліёграфы па тых галінах, якія не знайшлі адлюстравання (не прадстаўлены) у структуры галіновых ці іншых аддзелах абслугоўвання. Так, напрыклад, у абласных бібліятэках краіны ўсе працэсы, звязаныя з краязнаўчым напрамкам бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі, выконваюць аддзелы краязнаўчай літаратуры: вядуць краязнаўчы ДБА, рыхтуюць краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі і БД, праводзяць бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў, ажыццяўляюць зводнае планаванне краязнаўчай работы ў бібліятэцы і інш. Аналагічную работу ажыццяўляюць і бібліёграфы галіновых аддзелаў: вядуць адпаведныя раздзелы сістэматычнага каталога і сістэматычнай картатэкі артыкулаў, тэматычныя картатэкі і БД, камплектуюць падсобны фонд галіновага аддзела даведачнымі і інфармацыйнымі выданнямі, выконваюць даведкі і бібліяграфічнае інфармаванне ў галіне, рыхтуюць бібліяграфічныя дапаможнікі адпаведнай галіновай тэматыкі і інш.

Як прыклад дэцэнтралізацыі бібліяграфічнай службы можна прывесці НББ. З агульнага штата бібліятэкі (на 2006 г.) 821 чалавек тут 160 бібліёграфаў, якія працуюць, акрамя бібліяграфічных аддзелаў, у аддзеле абменна-рэзервовых фондаў; ва ўсіх сектарах і групах аддзелаў апрацоўкі дакументаў, індэксавання дакументаў; рукапісаў, рэдкай кнігі і старадрукаваных выданняў; мастацтва; навуковай інфармацыі па праблемах культуры і інш. У абласных бібліятэках, акрамя бібліяграфічнага аддзела, бібліёграфы працуюць, як правіла, у аддзелах краязнаўчай літаратуры, літаратуры па мастацтве, тэхнічнай, эканамічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, апрацоўкі дакументаў і арганізацыі каталогаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існаванне дэцэнтралізаванай бібліяграфічнай службы мае аб’ектыўныя падставы: бібліяграфічныя працэсы з’яўляюцца неад’емнай функцыяй дзейнасці розных структурных падраздзяленняў бібліятэкі; стварэнне ў абласных бібліятэках галіновых і комплексных аддзелаў, накіраваных на задавальненне разнастайных па мэтавым прызначэнні, у тым ліку звязаных з навуковай, прафесійнай дзейнасцю, інфармацыйных патрэбнасцей спажыўцоў інфармацыі; размяшчэнне аддзелаў АУНБ у розных будынках па прычыне арганізацыйных і матэрыяльна-тэхналагічных праблем.

Дэцэнтралізаваны характар бібліяграфічнай службы мае як станоўчыя, так і негатыўныя моманты. Станоўчыя моманты заключаюцца ў тым, што, працуючы ў галіновых, комплексных аддзелах, бібліёграфы спецыялізуюцца на рабоце з пэўнай літаратурай і могуць больш якасна праводзіць бібліяграфаванне дакументаў, бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў. Бібліяграфічнае абслугоўванне павінна быць арганізавана ў першую чаргу там, дзе ажыццяўляецца непасрэднае абслугоўванне карыстальнікаў першаснымі дакументамі, таму перавагі бібліяграфічнага абслугоўвання чытачоў-спецыялістаў галіновымі аддзеламі відавочныя. Сярод негатыўных момантаў дэцэнтралізацыі адзначаюцца наступныя: шматкратнае дубліраванне працэсаў і аперацый; раздробленасць ДБА бібліятэкі; нізкая тэхналагічная дысцыпліна; большую частку рабочага часу бібліёграфы галіновых аддзелаў заняты бібліятэчным абслугоўваннем чытачоў; маюцца цяжкасці ў абмене вопытам, прафесійных зносінах бібліёграфаў і інш.

Павелічэнне колькасці бібліёграфаў у штаце бібліятэкі і неабходнасць іх у рабоце аддзелаў абслугоўвання прагназуюць сёння многія даследчыкі па прычыне змянення тэхналогіі абслугоўвання і выкарыстання аўтаматызаваных сродкаў доступу ў самаабслугоўванні карыстальнікаў. З укараненнем аўтаматызаваных сродкаў пераразмяркоўваюцца работнікі ў бібліятэцы: змяншаецца колькасць супрацоўнікаў, занятых канцылярскімі работамі, і тых, хто ажыццяўляе бібліяграфічную апрацоўку выданняў; адначасова пашыраецца склад службаў, занятых даведачна-бібліяграфічным абслугоўваннем і кансультацыйнай дапамогай чытачам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыка работы АУНБ сведчыць аб дастатковай кансерватыўнасці бібліятэк у дачыненні да пытанняў арганізацыйнай структуры, хаця пэўныя змены адбываюцца. За апошні час у АУНБ створаны новыя аддзелы, напрыклад аддзел аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў (аддзел інфармацыйных тэхналогій), рэарганізаваны навукова-метадычны аддзел у аддзел бібліятэказнаўства, аб'ядноўваюцца аддзелы камплектавання, апрацоўкі літаратуры і арганізацыі каталогаў, у Брэсцкай бібліятэцы арганізаваны чытальныя залы па гуманітарных навуках, прыродазнаўчых і дакладных навуках, у Віцебскай – чытальная зала нямецкай літаратуры, у Мінскай – франка-беларуская зала інфармацыі аб сучаснай Францыі, уводзяцца або рэарганізуюцца асобныя сектары – сектар каталогаў (Віцебская, Мінская), створаны інфармацыйны сектар па абслугоўванні супрацоўнікаў дзяржаўнага апарату (Брэсцкая АУНБ). Між тым арганізацыйная структура іх бібліяграфічнай службы застаецца дэцэнтралізаванай.

Каб скасаваць негатыўныя моманты дэцэнтралізацыі бібліяграфічнай службы ў бібліятэках, прымяняюцца пэўныя арганізацыйныя меры, сярод якіх – дакладнае размеркаванне бібліяграфічных функцый як паміж аддзеламі, так і ўнутры іх з абавязковым іх замацаваннем у нарматыўных дакументах – палажэннях аб аддзелах, аб узаемадзеянні ў бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі; наданне бібліяграфічнаму аддзелу функцый арганізатара і каардынатара бібліяграфічнай дзейнасці, што заключаецца ў зводным планаванні бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі, распрацоўцы адзіных формаў уліку бібліяграфічнай работы, арганізацыі ўзаемадзеяння пры выкананні пэўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, кансультацыйна-метадычнай дапамогі бібліёграфам небібліяграфічных падраздзяленняў; стварэнне адзінага універсальнага ДБА бібліятэкі, у фарміраванні якога прымаюць удзел усе штатныя бібліёграфы. Пры вядзенні ДБА ў традыцыйнай форме яго цэласнасць у многім залежыць ад размяшчэння аддзелаў бібліятэкі. Пераход на аўтаматызаваныя тэхналогіі і стварэнне ў бібліятэцы лакальнай сеткі даюць магчымасць вырашыць гэтую праблему і з любога рабочага месца карыстацца электроннымі рэсурсамі ДБА бібліятэкі. У асобных бібліятэках ствараюцца спецыяльныя саветы, якія ажыц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цяўляюць каардынацыю дзейнасці бібліятэкі па яе кірунках, у тым ліку і бібліяграфічным.

Асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай работы ў цэнтралізаваных сістэмах дзяржаўных масавых бібліятэк абумоўлены спецыфікай іх структуры, якая характарызуецца наяўнасцю бібліятэк-філіялаў, тэрытарыяльна аддаленых ад цэнтральнай бібліятэкі; увядзеннем у штат ЦБС штатных адзінак бібліёграфаў пасля цэнтралізацыі публічных бібліятэк; вядучай роляй цэнтральнай бібліятэкі ў арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці і наяўнасцю бібліёграфаў у ЦБ, у той час як у большасці бібліятэк-філіялаў адсутнічаюць пасады бібліёграфаў.

Бібліяграфічная служба ЦБС уключае бібліяграфічную службу цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэк-філіялаў, у якіх бібліяграфічныя працэсы выконваюць бібліятэкары. У структуры большасці ЦБС адсутнічаюць бібліяграфічныя аддзелы як самастойныя падраздзяленні бібліятэкі. Да 1996 г. бібліёграфы працавалі ў аб'яднаных методыка-бібліяграфічных аддзелах бібліятэкі. Пасля прыняцця Міністэрствам культуры РБ “Тыпавых штатаў ЦБС” (снежань 1995 г.) бібліёграфы працуюць у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі. Ва ўсіх бібліятэках у штаце прадугледжаны бібліёграф, у бібліятэках першай, другой і трэцяй груп па аплаце працы супрацоўнікаў (вызначаецца колькаснымі паказчыкамі чытачоў і кнігавыдачы) – галоўны бібліёграф, а ў бібліятэках першай і другой груп – загадчык інфармацыйна-бібліяграфічнага сектара. У інфармацыйна-бібліяграфічным сектары цэнтральнай бібліятэкі пры колькасці чытачоў у сістэме звыш 45 тыс. і 800 тыс. кнігавыдач у год, апрача адзінак, якія прадугледжаны тыпавымі штатамі, дадаткова ўводзіцца адна адзінка бібліёграфа на кожныя 20 тыс. чытачоў.

Бібліяграфічны аддзел або інфармацыйна-бібліяграфічны сектар цэнтральнай бібліятэкі выступае ініцыятарам бібліяграфічнай дзейнасці ўсёй ЦБС, бібліяграфічныя функцыі выконваюць таксама бібліятэкары структурных падраздзяленняў ЦБ – аддзела абслугоўвання і інфармацыі (чытальнай залы, абанемента, МБА). Яны ўдзельнічаюць у вядзенні картатэк, выконваюць нескладаныя бібліяграфічныя даведкі, прымаюць удзел у падрыхтоўцы і арганізацыі недыферэнцыраваных формаў бібліяграфічнага інфармавання, удзельнічаюць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванні бібліяграфічнай культуры чытачоў бібліятэкі. Супрацоўнікі аддзела камлектавання і апрацоўкі літаратуры вядуць зводныя каталогі на фонд ЦБС, фарміруюць ДБФ бібліятэкі, прымаюць удзел у падрыхтоўцы бюлетэняў новых паступленняў у фонд ЦБС. Супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу рэкламуюць бібліяграфічныя прадукты і паслугі бібліятэкі, вывучаюць попыт на іх, праводзяць маркетынгавыя даследаванні, вынікі якіх выкарыстоўваюцца для ўдасканалення бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі. Бібліятэкары бібліятэк-філіялаў ажыццяўляюць усе кірункі бібліяграфічнай дзейнасці.

Да асаблівасцей арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў ЦБС трэба аднесці цэнтралізаванае выкананне асобных бібліяграфічных працэсаў з боку ЦБ; выкарыстанне уніфікаванай нарматыўнай і тэхналагічнай дакументацыі на бібліяграфічныя працэсы ва ўсіх структурных падраздзяленнях ЦБС; устойлівыя вытворчыя сувязі паміж цэнтральнай бібліятэкай і бібліятэкамі-філіяламі, што дазваляе ім выкарыстоўваць аб’яднаны інфармацыйны і інтэлектуальны бібліяграфічны патэнцыял ЦБС.

Арганізацыйныя асаблівасці бібліяграфічнай работы спецыяльных бібліятэк таксама абумоўлены раней азначанымі знешнімі і ўнутранымі фактарамі, на якія значны ўплыў аказваюць задачы бібліятэк, статус і месца ў ведамаснай бібліятэчнай сетцы, састаў фонду і склад карыстальнікаў бібліятэкі. У структуры рэспубліканскіх навуковых бібліятэк, бібліятэк сістэмы НАН РБ, вышэйшых навучальных устаноў маюцца звычайна самастойныя бібліяграфічныя падраздзяленні (аддзел, сектар). Так, у ЦНБ НАН РБ сярод 15 функцыянальных аддзелаў і 6 галіновых і спецыялізаваных чытальных залаў існуюць самастойныя бібліяграфічныя аддзелы (аддзел даведачна-інфармацыйнай работы, які забяспечвае доступ карыстальнікаў да сусветных інфармацыйных рэсурсаў, і аддзел інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння НДР, які займаецца генерыраваннем бібліяграфічных, дакументна-фактаграфічных і рэфератыўных БД) і спецыялізаваная чытальная зала даведачнай літаратуры. У Прэзідэнцкай бібліятэцы існуюць два бібліяграфічныя аддзелы: аддзел інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання, які ажыццяўляе інфармацыйнае абслугоўванне органаў кіравання краіны, пад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтоўку бібліяграфічных паказальнікаў, і аддзел бібліяграфічных рэсурсаў, які фарміруе ДБФ бібліятэкі, ажыццяўляе доступ карыстальнікаў бібліятэкі да бібліяграфічных рэсурсаў бібліятэкі, знешніх БД, рэсурсаў інтэрнета. У РНТБ функцыянуюць 14 аддзелаў і сектараў, якія вылучаюцца па функцыянальнай прымеце (камлектавання фонду; каталагізацыі дакументаў; дэпазітарнага захоўвання фонду; бібліятэчнага маркетынгу; навукова-арганізацыйнай і метадычнай работы), відах дакументаў (тэхнічнай літаратуры і прамкаталогаў; нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі; патэнтных дакументаў). Існуюць два бібліяграфічныя аддзелы: інфармацыйна-даведачны і навукова-бібліяграфічны, функцыі паміж якімі размежаваны ў адпаведнасці з функцыянальнай спецыялізацыяй. Аддзелы, спецыялізаваныя на рабоце з асобнымі відамі дакументаў, выконваюць бібліяграфічныя функцыі адпаведна сваёй спецыялізацыі.

Асаблівасцю работы РНМБ з'яўляецца цеснае супрацоўніцтва з БелЦНМІ, таму паміж імі размеркаваны функцыі па інфармацыйным забеспячэнні галіны, і гэта ўлічваецца пры вызначэнні функцый аддзела даведачнай і нарматыўна-прававой інфармацыі і навукова-інфармацыйнага аддзела бібліятэкі.

Найбольш простую арганізацыйную структуру і адпаведна арганізацыйную структуру бібліяграфічнай службы мае БелСГБ, у якой функцыянуюць тры аддзелы: бібліятэчных рэсурсаў, абслугоўвання і аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў. Бібліёграфы працуюць у даведачна-інфармацыйным сектары аддзела абслугоўвання.

Бібліятэкі ВНУ маюць даволі разгорнутую арганізацыйную структуру. Спецыялізаваныя аддзелы і сектары вылучаюцца ў іх у адпаведнасці з задачамі бібліятэк, у рамках арганізацыйнай структуры выдзяляецца самастойны бібліяграфічны аддзел. У бібліятэцы БДПА ў межах бібліяграфічнага аддзела выдзелены асобныя сектары.

У нізавых навукова-тэхнічных бібліятэках прадпрыемстваў і арганізацый штат невялікі, бібліяграфічныя функцыі размеркаваны паміж бібліятэкарамі, якія асноўную ўвагу надаюць стварэнню і вядзенню ДБА (пераважна каталогам), даведачна-бібліяграфічнаму абслугоўванню і бібліяграфічнаму інфармаванню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падключэнне рэспубліканскіх і абласных навуковых бібліятэк, бібліятэк ВНУ да сеткі інтэрнета вымушае адкрываць інтэрнет-цэнтры, цэнтры інтэрнет-доступу да электронных рэсурсаў, класы калектыўнага карыстання інтэрнетам, якія выконваюць комплекс інфармацыйных і сервісных паслуг, сярод якіх і паслугі бібліяграфічнага характару – абслугоўванне карыстальнікаў праз інтэрнет, кансультаванне па пытаннях пошуку інфармацыі, доступу да электронных каталогаў бібліятэкі і лакальных баз даных. У асобных бібліятэках такія цэнтры ствараюцца ў межах аддзела аўтаматызацыі, абслугоўвання карыстальнікаў або ў структуры інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела. У некаторых бібліятэках яны выступаюць як самастойныя структурныя адзінкі.

Уплыў на арганізацыйную структуру бібліяграфічнай службы аказвае і спецыялізацыя ў дзейнасці бібліятэк: стварэнне медыятэк, цэнтраў адукацыйных паслуг, цэнтраў прававой інфармацыі, дзелавой інфармацыі, інфармацыйных цэнтраў па краязнаўстве і інш. Часта дзейнасць такіх цэнтраў у арганізацыйным плане выклікае стварэнне сектараў, у тым ліку і ў структуры бібліяграфічнага аддзела, або пашырэнне функцый бібліяграфічнага аддзела. Так, для стварэння публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) у краіне згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Аб парадку распаўсюджвання прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь” ад 01.12.1998 г. (№ 565) была выкарыстана сетка бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры. Сёння ў Беларусі функцыянуе звыш 100 ПЦПІ, якія дзейнічаюць ва ўсіх абласных бібліятэках, у 75% цэнтральных гарадскіх і 35% раённых. У ЦБС Брэсцкай і Гродзенскай абласцей адкрыты ПЦПІ. Як самастойнае падраздзяленне ПЦПІ адкрыўся толькі пры Віцебскай абласной бібліятэцы. Ва ўсіх іншых абласных бібліятэках яны працуюць у рамках інфармацыйна-бібліяграфічных аддзелаў, у большасці публічных бібліятэк – на базе аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі і іх штатаў.

### *2.3. Бібліяграфічнае падраздзяленне бібліятэкі і яго асноўныя функцыі*

Галоўнае звяно бібліяграфічнай службы бібліятэкі – самастойнае бібліяграфічнае падраздзяленне. У буйных навуковых бібліятэках такім падраздзяленнем з’яўляецца бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічны аддзел, у іншых тыпах бібліятэк – бібліяграфічны сектар. У невялікіх бібліятэках, якія не маюць структурных падраздзяленняў, функцыі такога звяна выконвае бібліёграф. Пры адсутнасці ў штатным раскладзе пасады бібліёграфа адказнасць за арганізацыю бібліяграфічнай работы ўскладаецца на аднаго з супрацоўнікаў бібліятэкі, або абавязкі па выкананні бібліяграфічных функцый размяркоўваюцца паміж супрацоўнікамі. Безумоўна, структура, задачы, функцыі бібліяграфічнага падраздзялення розных тыпаў бібліятэк, масштаб іх работы адрозніваюцца.

Структура бібліяграфічнага аддзела вызначаецца зместам выконваемай работы, залежыць ад штата – колькасці бібліёграфаў. Згодна з палажэннем 1983 г., якое вызначала прыкладную структуру універсальных навуковых бібліятэк, прадугледжвалася вылучэнне ў бібліяграфічным аддзеле трох сектараў: даведачна-бібліяграфічнага, краязнаўчай бібліяграфіі, інфармацыі па культуры і мастацтве. Спецыфіка арганізацыйнай структуры універсальных навуковых бібліятэк нашай краіны звязана з выдзяленнем самастойных аддзелаў беларускай літаратуры ў НББ, краязнаўчай літаратуры – у АУНБ, якія выконваюць і бібліяграфічныя функцыі; таксама ў НББ у якасці самастойнага існуе аддзел навуковай інфармацыі па праблемах культуры, адпаведна ў АУНБ – сектары інфармацыі па культуры і мастацтве.

У арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы НББ існуюць два самастойныя бібліяграфічныя аддзелы, якія маюць уласную структуру. Так, даведачна-інфармацыйны аддзел складаецца з трох сектараў: даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання; інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання; цэнтра прававой інфармацыі. Навукова-бібліяграфічны аддзел уключае сектары навукова-дапаможнай бібліяграфіі; рэкамендацыйнай бібліяграфіі; стварэння аналітычных запісаў; стварэння фактаграфічных і паўнатэкставых БД. Задачы аддзелаў і іх функцыі вызначаюцца палажэннем аб аддзеле, якое распрацоўваецца кожнай бібліятэкай з улікам мясцовых умоў. Адпаведныя палажэнні ствараюцца і для кожнага сектара.

Галоўнымі задачамі даведачна-інфармацыйнага аддзела НББ з’яўляюцца аператыўнае і якаснае забеспячэнне доступу карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі і су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

светнай супольнасці; навучанне асновам сучасных інфармацыйных тэхналогій і фарміраванне бібліяграфічнай культуры чытачоў; навукова-даследчая і метадычная работа па профілі дзейнасці аддзела.

Сярод асноўных функцый згодна з унутранымі нарматыўнымі дакументамі вызначаны наступныя: даведачна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне абанентаў бібліятэкі пры дапамозе традыцыйных каталогаў і картатэк, электроннага каталога, баз даных на электронных носьбітах і даведачна-бібліяграфічнаму фонду аддзела; выкананне пісьмовых бібліяграфічных даведак; бібліяграфічная дапрацоўка патрабаванняў, якія паступілі ад чытачоў і абанентаў; фарміраванне даведачна-бібліяграфічнага фонду аддзела; фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў.

Задачы навукова-бібліяграфічнага аддзела НББ наступныя: стварэнне крыніц спецыяльнай бібліяграфіі, фактаграфічных, паўнатэкставых рэсурсаў беларусазнаўчай тэматыкі ў друкаванай і электроннай формах; забеспячэнне інфармацыйных патрэбнасцей спажыўцоў у бягучай аналітычнай бібліяграфічнай інфармацыі сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі; каардынацыя і каапeрацыя дзейнасці бібліятэк па стварэнні крыніц спецыяльнай бібліяграфіі беларусазнаўчай і краязнаўчай тэматыкі; навукова-метадычнае кансультаванне бібліятэк краіны па названай тэматыцы; навуковая дзейнасць у галіне бібліяграфазнаўства.

Асноўнымі функцыямі аддзела з'яўляюцца стварэнне крыніц бягучай, рэтраспектыўнай бібліяграфіі беларусазнаўчай тэматыкі; выпуск друкаваных рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку” (штомесячна) і “Дзіцячая літаратура Беларусі” (раз у пяць гадоў); фарміраванне і вядзенне бібліяграфічных БД “Гісторыя Беларусі” і “Чарнобыль”, стварэнне на іх аснове бібліяграфічных паказальнікаў; удзел у фарміраванні і вядзенні БД “Артыкулы” і стварэнне на яе аснове бібліяграфічнага паказальніка “Грамадскія навукі”; фарміраванне і вядзенне фактаграфічнай БД “Беларусь у асобах і падзеях” і матэрыялаў на яе аснове – спіса “Беларускі каляндар” у электроннай і друкаванай форме ў выглядзе дадатку да бюлетэня “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”; падрыхтоўка штогадовага тэматычнага плана выдання бібліяграфічных па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казальнікаў навуковымі бібліятэкамі Беларусі і НКП, кантроль і аналіз выканання плана, рэдагаванне бібліяграфічных крыніц розных структур па іх запытах; правядзенне навуковых даследаванняў у галіне бібліяграфазнаўства.

Асобае становішча бібліяграфічнага аддзела ў структуры АУНБ вызначаецца, па-першае, яго роляй як арганізацыйна-кіруючага звяна ў бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі і вобласці ў цэлым, па-другое, яго роляй як функцыянальнага падраздзялення, якое бярэ на сябе асноўную нагрузку ў бібліяграфічным абслугоўванні і бібліяграфаванні літаратуры. Колькасць штатных бібліёграфаў і структура аддзела залежаць ад аб'ёму бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, якія прапаноўвае бібліятэка сваім карыстальнікам. Сярод асноўных задач бібліяграфічнага аддзела абласных універсальных навуковых бібліятэк –актыўны ўдзел яго ў стварэнні даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі. Бібліёграфы аддзела вядуць каталог фонду свайго аддзела, некаторыя бібліятэкі вядуць каталог даведачна-бібліяграфічнага фонду, фарміруюць разнастайныя картатэкі – сістэматычную артыкулаў, рэцэнзій; па заканадаўстве; перыядычных выданняў; генерыруюць БД "Артыкулы"; прымаюць удзел у камплектаванні ДБФ бібліятэкі і арганізуюць даведачна-бібліяграфічны фонд аддзела; вядуць фонд выкананых даведак. Бібліёграфы аддзела, акрамя фарміравання канкрэтнай часткі ДБА, аказваюць дапамогу іншым аддзелам у арганізацыі лакальных ДБА, што спрыяе захаванню цэласнасці ДБА бібліятэкі.

Бібліяграфічны аддзел ажыццяўляе бібліяграфічнае інфармаванне групавых і індывідуальных абанентаў (трэба адзначыць, што ў апошні час гэтая работа зменшылася, некаторыя бібліятэкі пачалі ажыццяўляць яе на падставе дагавораў на абслугоўванне); прымае ўдзел у правядзенні масавых формаў бібліяграфічнага інфармавання: арганізацыі дзён інфармацыі, выстаў новых паступленняў у бібліяграфічны аддзел, падрыхтоўцы спісаў новых паступленняў у аддзел (інфармацыйна-бібліяграфічны аддзел Мінскай АУНБ сумесна з метадычным аддзелам рыхтуе і выдае "Новыя паступленні даведачных, бібліяграфічных і метадычных дапаможнікаў у бібліятэку за ... квартал"). Вялікі аб'ём работы выконвае аддзел па даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, супрацоўнікі яго выконваюць самыя разнастайныя запыты, у тым ліку і па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжгаліновай, комплекснай праблематыцы з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў на розных носьбітах.

Бібліяграфічны аддзел вядзе работу таксама па стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў. Ён сумесна з аддзелам краязнаўчай літаратуры рыхтуе бягучыя паказальнікі (“Літаратура аб ... вобласці”), рэтраспектыўныя паказальнікі (“Што чытаць аб краі”), рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

Аддзел узначальвае работу бібліятэкі па фарміраванні бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі, праводзіць бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі для школьнікаў, кансультацыі, рыхтуе друкаваныя матэрыялы.

Акрамя названых функцыянальных кірункаў, бібліяграфічны аддзел выконвае каардынацыйную і метадычную работу як унутры бібліятэкі, так і ў адносінах да цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм вобласці па пытаннях бібліяграфічнай работы. Супрацоўнікі бібліяграфічнага аддзела прымаюць удзел і ў навуковых даследаваннях, якія праводзяцца бібліятэкай.

Паспяховай рэалізацыі названых функцый бібліяграфічнага аддзела спрыяюць распрацоўка і выкарыстанне рэгламентуючых дакументаў, да ліку якіх адносяцца “Палажэнне аб бібліяграфічным аддзеле”; палажэнні аб розных кірунках бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы, што садзейнічаюць узаемадзеянню розных структурных падраздзяленняў бібліятэкі; тэхналагічныя карты і інструкцыі на асобныя бібліяграфічныя працэсы, а таксама службовыя інструкцыі, у якіх акрэсліваюцца асноўныя абавязкі кожнага супрацоўніка і замацоўваецца размеркаванне абавязкаў паміж бібліёграфамі ў аддзеле.

У штатным раскладзе бібліяграфічнага аддзела ёсць наступныя пасады: бібліёграф, бібліёграф першай, другой катэгорыі, вядучы, галоўны бібліёграф. Іх колькасць залежыць ад групы, да якой адносіцца бібліятэка па аплаце працы кіруючых работнікаў і спецыялістаў, а таксама ад агульнай колькасці супрацоўнікаў бібліятэкі. У бібліяграфічных аддзелах АУНБ краіны колькасць бібліёграфаў невялікая – ад 5 да 7. У межах аддзела можа выкарыстоўвацца прынцып спецыялізацыі пры размеркаванні абавязкаў паміж бібліёграфамі. Спецыялізацыя можа быць функцыянальнай, пры якой за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобнымі супрацоўнікамі замацоўваюцца функцыі па вядзенні даведачна-бібліяграфічнага апарату або па даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, або па вядзенні БД і падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў (такі падыход выкарыстоўваецца пры стварэнні сектараў у аддзелах НББ). Яна можа быць змястоўнай, пры якой бібліёграфы спецыялізуюцца на рабоце з пэўным комплексам літаратуры сацыяльна-эканамічнай, прыродазнаўчай, гуманітарнай і іншай тэматыкі, а таксама пры выдзяленні ў бібліяграфічным аддзеле сектара інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва або цэнтра прававой інфармацыі і замацаванні абавязкаў па рабоце гэтых структурных адзінак аддзела за асобным супрацоўнікам. Спецыялізацыя можа быць кваліфікацыйнай, калі на пасады бібліёграфа, вядучага, галоўнага бібліёграфа прызначаюцца спецыялісты ў адпаведнасці з узроўнем адукацыі, вопыту, стажу і дзелавых якасцей, складаючых узровень кваліфікацыі; адпаведна размяркоўваюцца віды бібліяграфічнай працы. Так, бібліёграфам, якія маюць вышэйшую спецыяльную адукацыю, даручаюць весці ДБА, праглядаць і распісваць часопісы, зборнікі і газеты, удзельнічаць у бібліяграфічным абслугоўванні. Вядучыя бібліёграфы вядуць і рэдагуюць ДБА, выконваюць пісьмовыя і складаныя вусныя даведкі, рыхтуюць бібліяграфічныя дапаможнікі, удзельнічаюць у бібліяграфічным навучанні спажыўцоў, рэдагуюць бібліяграфічныя дапаможнікі. Галоўныя бібліёграфы займаюцца пытаннямі каардынацыі бібліяграфічнай работы, навукова-даследчай работай, рэдагаваннем бібліяграфічных дапаможнікаў, падрыхтоўкай і рэдагаваннем метадычных матэрыялаў. У абласных бібліятэках пераважным з'яўляецца кваліфікацыйнае размеркаванне абавязкаў, аднак гэта не выключае магчымасцей частковага прымянення іншых відаў спецыялізацыі.

За размеркаванне функцый паміж супрацоўнікамі адказвае загадчык бібліяграфічнага аддзела. Ён прызначаецца дырэктарам бібліятэкі, плануе і арганізуе работу аддзела, кантралюе выкананне планаў, трымае справаздачу перад дырэктарам, падбірае кадры і прадстаўляе іх на зацвярджэнне дырэктару. Акрамя кіраўніцтва аддзелам, загадчык адказвае за каардынацыю бібліяграфічнай работы як унутры бібліятэкі, так і за яе межамі з бібліятэкамі іншых сістэм і ведамстваў, нясе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасць за стан уліку бібліяграфічнай работы ва ўсіх падраздзяленнях АУНБ. У яго абавязкі ўваходзяць таксама аналіз бібліяграфічнай работы, складанне планаў і справаздач, вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне інавацый у бібліяграфічнай дзейнасці, пытанні павышэння кваліфікацыі работнікаў аддзела і падраздзяленняў бібліятэкі. У залежнасці ад колькасці супрацоўнікаў у аддзеле і агульнага аб'ёму работы загадчык аддзела (разам з арганізацыйна-кіруючай дзейнасцю) можа выконваць асобныя віды работ як бібліёграф-прафесіянал: складаць і рэдагаваць бібліяграфічныя дапаможнікі, удзельнічаць у даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні і інш. Усе абавязкі адлюстроўваюцца ў службовай інструкцыі.

Калі разглядаць асаблівасці дзейнасці бібліяграфічнага падраздзялення ЦБС, то трэба мець на ўвазе, што ў структуры большасці ЦБС няма самастойнага бібліяграфічнага аддзела, а бібліёграфы працуюць у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ЦБ с адным – двума бібліёграфамі ў штаце, што значна ўплывае на аб'ём і арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці. У буйных ЦБС, якія маюць бібліяграфічны аддзел з трыма і больш бібліёграфамі, магчыма пры размеркаванні абавязкаў замацоўваць за канкрэтнымі супрацоўнікамі функцыі, звязаныя з краязнаўчым кірункам работы, з функцыянаваннем цэнтраў прававой інфармацыі на базе публічнай бібліятэкі.

Бібліяграфічнае падраздзяленне ЦБ ЦБС выконвае разнастайныя функцыі:

– ажыццяўляе арганізацыю і вядзенне ДБА ЦБС (некаторыя бібліяграфічныя аддзелы, акрамя вядзення ДБА ўласнай бібліятэкі, цэнтралізавана рыхтуюць і рассылаюць карткі ў бібліятэкі-філіялы для вядзення сістэматычнай картатэкі артыкулаў, удзельнічаюць у фарміраванні ДБФ бібліятэк-філіялаў);

– праводзіць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў бібліятэкі, а таксама задавальненне запытаў, якія паступаюць ад бібліятэк-філіялаў і патрабуюць значнага часу для выканання і выкарыстання адзінага ДБА сістэмы;

– арганізуе масавае, групавое і індывідуальнае бібліяграфічнае інфармаванне карыстальнікаў бібліятэкі з дапамогай выпуску бюлетэня новых паступленняў у фонд сістэмы, пад-

рыхтоўкі разнастайных па змесце і мэтавым прызначэнні бібліяграфічных дапаможнікаў краязнаўчага характару, правядзення бібліяграфічных аглядаў, выстаў, дзён інфармацыі і інш.;

– сумесна з аддзелам абслугоўвання вядзе работу па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі;

– ажыццяўляе планаванне бібліяграфічнай дзейнасці ўсёй ЦБС і рыхтуе зводную справаздачу;

– аказвае метадычную дапамогу бібліятэкарам іншых аддзелаў, а таксама бібліятэк-філіялаў па пытаннях арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці, павышэння бібліяграфічнай кваліфікацыі;

– ажыццяўляе каардынацыю і кааперацыю бібліяграфічнай работы з іншымі бібліятэкамі рэгіёна па выпуску зводных каталогаў, сумесным правядзенні бібліятэчных мерапрыемстваў.

Функцыі бібліяграфічных падраздзяленняў спецыяльных бібліятэк залежаць ад тыпу бібліятэкі і асаблівасцей яе бібліяграфічнай службы. Уплывае на іх і такая асаблівасць, як месца спецыяльнай навуковай або навукова-тэхнічнай бібліятэкі ў сістэме НТІ краіны. Асноўнымі задачамі бібліяграфічных падраздзяленняў гэтых бібліятэк з'яўляюцца бібліяграфічнае забеспячэнне кіруючай дзейнасці адпаведных структур, навуковай, вытворчай дзейнасці спецыялістаў пэўнай галіны або міністэрства, ведамства, установы; садзейнічанне бібліяграфічнымі сродкамі павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў, рабочых, развіццю інавацыйнай дзейнасці, укараненню новых тэхналогій, дасягненняў навукі, тэхнікі, перадавога вопыту ў вытворчасць.

РНТБ пры правядзенні даследавання "Вызначэнне прыярытэтных кірункаў развіцця і функцыянавання навукова-тэхнічных бібліятэк па задавальненні інфармацыйных патрэбнасцей спецыялістаў навукі і тэхнікі" (1999) вызначыла асноўныя кірункі дзейнасці навукова-тэхнічных бібліятэк і органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі, а таксама кірункі іх ўзаемадзеяння. Да асноўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці навукова-тэхнічных бібліятэк аднесены наступныя:

– фарміраванне профільнага ДБА бібліятэкі, вядзенне як традыцыйных, так і электронных каталогаў, стварэнне і развіццё аўтаматызаваных інфармацыйна-бібліятэчных сістэм, стварэнне баз даных уласнай генерацыі і набыццё рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных баз даных;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ажыццяўленне даведачна-бібліяграфічнага і інфармацыйнага абслугоўвання спецыялістаў як непасрэдна ў структурных падраздзяленнях бібліятэкі, так і шляхам выкарыстання электронных каталогаў, баз даных, кампакт-дыскаў у рэжымах лакальнага і аддаленага доступу, інфармаванне аб дакументах шляхам правядзення выстаў дакументаў, падрыхтоўкі бібліяграфічных спісаў, тэматычных падборак, выкарыстання такіх формаў інфармавання, як дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва, выбіральнае распаўсюджванне інфармацыі, дні патэнтнай інфармацыі, дні спецыяліста, канферэнцый, семінараў;

– вывучэнне і ўкараненне новых формаў і метадаў бібліяграфічнай работы;

– правядзенне маркетынгавай дзейнасці з мэтай вывучэння рэальных і патэнцыяльных спажыўцоў інфармацыі, рэкламы бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, пашырэння асартыменту бібліяграфічных і інфармацыйных паслуг;

– аказанне метадычнай і практычнай дапамогі спецыялістам НТБ, інфармацыйных, патэнтных службаў, службаў стандартызацыі шляхам правядзення семінараў, групавых і індывідуальных кансультацый;

– правядзенне навукова-даследчых работ, у тым ліку і па пытаннях бібліяграфічнай дзейнасці, і ўкараненне іх вынікаў у практыку работы НТБ.

### *2.4. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі*

Бібліяграфічнай дзейнасцю ў розных аб’ёмах, акрамя бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі, займаюцца і небібліяграфічныя падраздзяленні. Бібліяграфічныя працэсы з’яўляюцца скразной функцыяй бібліятэкі: усім аддзелам бібліятэкі – функцыянальным, галіновым, комплексным, выдзеленым па іншых прыметах, – уласцівы тыя ці іншыя напрамкі бібліяграфічнай дзейнасці. Разгледзім на прыкладзе абласной універсальнай навуковай бібліятэкі асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці небібліяграфічных падраздзяленняў.

У аддзеле камплектавання ствараюцца і выкарыстоўваюцца бібліяграфічныя сродкі бягучага камплектавання і дакамплектавання фонду бібліятэкі, вядуцца картатэкі папярэдняга заказу, картатэка дакамплектавання фонду або база



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даных заказанай літаратуры. Супрацоўнікі аддзела ўдзельнічаюць у фарміраванні даведачна-бібліяграфічнага фонду бібліятэкі, у даведачна-бібліяграфічнай рабоце бібліятэкі, выконваючы запыты спажыўцоў аб паступленнях у фонд бібліятэкі дакументаў, іх месцазнаходжанні, удакладняюць бібліяграфічныя звесткі аб дакументах.

Аддзел апрацоўкі літаратуры і арганізацыі каталогаў ажыццяўляе аналітыка-сінтэтычную апрацоўку паступаючых дакументаў, вынікам чаго з'яўляецца бібліяграфічны запіс на дакумент у традыцыйнай або ў электроннай формах, арганізуюцца і вядуцца каталогі на фонд бібліятэкі як у традыцыйнай, так і электроннай форме.

У комплексным аддзеле краязнаўчай літаратуры бібліяграфічная дзейнасць ажыццяўляецца па наступных кірунках: арганізацыя і вядзенне краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату; падрыхтоўка і выданне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і паказальнікаў мясцовых дакументаў; выкананне вусных і пісьмовых разавых запытаў спажыўцоў па пытаннях краязнаўства; сістэматычнае бібліяграфічнае інфармаванне аб краязнаўчых дакументах арганізацый, спажыўцоў праз арганізацыю выстаў, падрыхтоўку аглядаў, выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі; распаўсюджванне краязнаўчых, у тым ліку і бібліяграфічных, ведаў; аказанне метадычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам вобласці ў арганізацыі краязнаўчай работы.

Вялікі аб'ём бібліяграфічнай работы прыпадае на галіновыя аддзелы, у штаце якіх працуюць і бібліёграфы. Супрацоўнікі гэтых аддзелаў (і менавіта бібліёграфы) арганізуюць і вядуць галіновую частку ДБА, ажыццяўляюць на яго аснове даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне. Галіновыя аддзелы займаюцца бібліяграфічным інфармаваннем спецыялістаў адпаведнага профілю, ствараюць бягучыя і рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, прымаюць актыўны ўдзел у бібліяграфічным навучанні чытачоў. Гэтая работа праводзіцца па плану, які ўзгадняецца з бібліяграфічным аддзелам, а асобныя кірункі ажыццяўляюцца шляхам кааперацыі намаганняў галіновых і бібліяграфічных аддзелаў.

У чытальных залах, на абанеменце аддзелаў абслугоўвання ажыццяўляецца пераважна даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, прычым выконваюцца, як правіла, простыя запыты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія не патрабуюць доўгага часу на пошук, праводзіцца работа па пашырэнні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Супрацоўнікі аддзела могуць прымаць удзел і ў вядзенні лакальных частак ДБА на свой фонд, выкарыстоўваюць асобныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання.

У нязначных аб'ёмах бібліяграфічныя функцыі выконвае і аддзел фондасховішча. Супрацоўнікі гэтага аддзела вядуць неабходныя картатэкі, каталогі індыкатараў або БД, якія дазваляюць мець інфармацыю аб наяўнасці ці выдачы з фонду дакументаў, выконваць адрасна-бібліяграфічныя даведкі, прымаюць удзел у бібліяграфічным інфармаванні.

Навукова-метадычны аддзел (зараз ён у большасці універсальных навуковых бібліятэк краіны пераўтвораны ў аддзел бібліятэказнаўства) сумесна з бібліяграфічным аддзелам аналізуюць і абагульняюць вопыт бібліяграфічнай работы публічных бібліятэк вобласці, распаўсюджваюць інавацыйны вопыт, прымаюць удзел у павышэнні бібліяграфічнай кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк вобласці, рыхтуюць методыка-бібліяграфічныя матэрыялы ў дапамогу рабоце публічных бібліятэк, праводзяць навуковыя даследаванні.

Усе асноўныя бібліяграфічныя працэсы, якія выконваюцца ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі, адлюстроўваюцца ў палажэннях аб аддзелах і інструкцыях.

### *Пытанні і заданні*

1. Бібліяграфічная служба як падсістэма бібліятэкі: якія прынцыпы і падыходы ляжаць у аснове яе фарміравання?
2. У чым асаблівасці бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў?
3. Якія тэндэнцыі характэрны для развіцця бібліяграфічнай службы бібліятэк?
4. Як уплывае на арганізацыйна-функцыянальную структуру бібліяграфічнай службы працэс інфарматызацыі дзейнасці бібліятэк?
5. Ці адрозніваюцца функцыі бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэк розных тыпаў?
6. Якія дакументы вызначаюць бібліяграфічныя функцыі розных падраздзяленняў бібліятэкі і яе супрацоўнікаў?
7. Прааналізуйце на прыкладзе канкрэтнай бібліятэкі асаблівасці рэалізацыі ў ёй бібліяграфічных функцый рознымі структурнымі падраздзяленнямі бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел II. ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ БІБЛІЯТЭКІ

## Глава 3. Агульныя пытанні арганізацыі ДБА бібліятэкі

### *3.1. Азначэнне, функцыі, уласцівасці, прынцыпы і метадычныя патрабаванні да арганізацыі ДБА*

*Азначэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату.* Да гэтага часу няма адзінага азначэння ДБА, якое б задавальняла і даследчыкаў, і выкладчыкаў, і практыкаў бібліятэчна-бібліяграфічнай сферы. Упершыню азначэнне тэрміна “даведачна-бібліяграфічны апарат” дадзена ў ГОСТ 7.26 – 80 “Библиотечное дело. Основные термины и определения», згодна з якім «даведачна-бібліяграфічны апарат – гэта сукупнасць даведачных і бібліяграфічных выданняў, бібліятэчных каталогаў і картатэк, прызначаных для прапаганды твораў друку і іншых дакументаў і мэтанакіраванага кіравання чытаннем». Да гэтага азначэння адсылае і ГОСТ 7.0 – 84 «Библиографическая деятельность.Основные термины и определения». Безумоўна, што ў гэтым азначэнні адчуваецца ўплыў часу. Сёння тэрмін «дакумент», што абазначае інфармацыю, зафіксаваную на якім-небудзь матэрыяльным носьбіце, не выклікае пярэчанняў, і няма неабходнасці ў выкарыстанні тэрміна «твор друку». Адышла ў мінулае абавязковая ідэалагізацыя работы бібліятэкі, у тым ліку і ДБА, па-іншаму асэнсоўваюцца «прапаганда і кіраванне чытаннем».

У той жа час у органах НТІ і навукова-тэхнічных бібліятэках атрымаў распаўсюджванне і афіцыйнае прызнанне іншы тэрмін – «даведачна-пошукавы апарат» (ДПА). У ГОСТ 7.27 – 80 «Научно-информационная деятельность. Основные термины и определения» ДПА вызначаны як “сукупнасць упарадкаваных масіваў другасных дакументаў, прызначаных для пошуку навукова-тэхнічнай інфармацыі”.

Новы міждзяржаўны тэрміналагічны стандарт 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография» дае наступнае азначэнне: “Даведачна-бібліяграфічны апарат – гэта даведачна-пошукавы апарат, які ўключае бібліяграфічныя дапаможнікі”. Такім чынам, падкрэсліваецца раўназначнасць тэрмінаў ДБА і ДПА, між тым азначэнне тэрміна ДПА ў ГОСТ не прыводзіцца, і ў самім нарматыўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакуменце выкарыстоўваюцца разнастайныя тэрміны, у тым ліку і інфармацыйна-пошукавы апарат. У азначэнні не раскрыты і складаная структура ДБА, яго функцыі.

Бібліяграфазнаўцы, многія даследчыкамі даюць свае азначэнні тэрміна ДБА. Найбольш грунтоўна тэрмін “даведачна-бібліяграфічны апарат” і яго функцыі вывучаў І.Р.Маргенштэрн. Ім даецца наступная дэфініцыя тэрміна: “ДБА – гэта ІПС у дакументнай і/або электроннай формах, якая мае на мэце аптымізацыю пошуку бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, арыентацыю ў інфармацыйных рэсурсах”. Заслуга І.Р.Маргенштэрна ў тым, што ён першым зрабіў спробу вызначэння сутнасці ДБА праз паняцце “інфармацыйна-пошукавая сістэма”. Гэта збліжае тэрміналогію, якая выкарыстоўваецца ў бібліяграфічнай навуцы і інфарматыцы і адлюстроўвае рэальна існуючыя тэндэнцыі інтэграцыі бібліятэчнай справы, бібліяграфіі і навукова-інфармацыйнай дзейнасці, вызначае сутнасць ДБА праз асноўныя функцыі, падкрэслівае разнастайнасць формаў існавання частак ДБА.

Некаторых сучасных вучоных і практыкаў не задавальняе не толькі азначэнне ДБА, але і сам тэрмін “даведачна-бібліяграфічны апарат”. Укараненне новых інфармацыйных тэхналогій у значнай ступені змяніла бібліятэчную практыку. Шмат з’яў перасталі ўкладвацца ў рамкі звычайных тэрмінаў, таму з’яўляюцца новыя тэрміны без дастатковага тэарэтычнага абгрунтавання. Прывядзём некалькі прыкладаў. Як сінонім тэрміна ДБА і раней (насуперак ГОСТ 7.26 – 80 і 7.0 – 84) выкарыстоўваліся такія словазлучэнні, як даведачна-інфармацыйны, інфармацыйна-бібліяграфічны, інфармацыйна-пошукавы апарат. Сёння з’явіліся такія тэрміны, як “даведачна-інфармацыйны банк”, “віртуальны ДБА”. Так, В.К.Сцяпанаў вызначае віртуальны ДБА як сукупнасць даведачных і бібліяграфічных крыніц, якія знаходзяцца за межамі бібліятэк і выкарыстоўваюцца ў рэжыме аддаленага доступу.

Супраць тэрміна “віртуальны ДБА” дастаткова матывавана выказаўся Ю.М.Сталяроў. Слова “віртуальны” ў перакладзе з лацінскага азначае “ілюзорны, ірэальны, уяўны, дапусцімы”. Таму Ю.М.Сталяроў указвае на метафарычнасць гэтага тэрміна і прапаноўвае ў якасці сіноніма “аўтаматызаваная, электронная, камп’ютэрная, онлайнавая бібліятэка і адпаведна такі ж і яе ДБА”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін “даведачна-інфармацыйны банк” можа ўвесці ў зман спажыўцоў, таму што паняцце “банк” не ўключае традыцыйныя (папяровыя) крыніцы пошуку. А ў нашых бібліятэках яны застануцца ў агляднай будучыні абавязковай часткай інфармацыйных рэсурсаў.

Замяніць тэрмін «даведачна-бібліяграфічны апарат» на тэрмін «даведачна-бібліяграфічны фонд» прапанаваў У.І.Ярошын. Ён лічыць, што ўсе бібліяграфічныя крыніцы (у тым ліку каталогі, картатэкі, прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры) з'яўляюцца даведачна-бібліяграфічным фондам. У ДБФ ён не ўключае даведачныя выданні, таму што яны змяшчаюць перш за ўсё фактаграфічную інфармацыю. Але ж даведачныя выданні часта змяшчаюць і бібліяграфічную інфармацыю. Акрамя таго, у ДБФ уключаюцца не толькі крыніцы другаснай, бібліяграфічнай інфармацыі, але і даведачныя, і афіцыйныя выданні, і выдзяляюцца яны ў спецыяльны лакальны фонд з мэтай аператыўнага выканання разнастайных запытаў спажыўцоў інфармацыі.

Некаторыя спецыялісты прапануюць выкарыстоўваць тэрмін «даведачны апарат». Аднак гэтае словазлучэнне вельмі часта выкарыстоўваецца ў значэнні «апарат выдання».

Т.Ф.Берастава лічыць, што замест тэрміна “даведачна-бібліяграфічны апарат” больш удалым з’яўляецца тэрмін “пошукавы апарат”, таму што ён супадае з назвай галоўнай функцыі ДБА. Гэты тэрмін, на яе думку, павінен задаволіць прадстаўнікоў усіх суб’ектаў сістэмы дакументных камунікацый, бо па аналогіі з інфарматыкай сродкі пошуку па інфармацыйных рэсурсах сетак і БД называюць пошукавымі машынамі. І нарэшце, таму, што ў сучасных умовах развіццё традыцыйнага ДБА і тым больш камп’ютэрнага пошукавага апарату паказваюць павелічэнне ў ім долі фактаграфічнай, паўнатэкставай інфармацыі і змяншэнне бібліяграфічнай, усе большае выкарыстанне электронных рэсурсаў для пошуку аддаленых дакументаў.

Такім чынам, дыскусіі наконт тэрміна “даведачна-бібліяграфічны апарат” не скончыліся. Мы будзем прытрымлівацца тэрміна “даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі”, таму што ён атрымаў шырокае распаўсюджанне ў бібліятэчна-бібліяграфічнай навуцы і практыцы і замацаваны сёння ў дзеючым тэрміналагічным стандарце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Функцыі ДБА*. Згодна азначэнню, якое прапанаваў І.Р.Маргенштэрн, функцыянальнае прызначэнне ДБА ў тым, каб даць бібліятэчную інфармацыю – звесткі аб наяўнасці і месцазнаходжанні дакумента; бібліяграфічную – звесткі аб дакуменце, неабходныя для яго ідэнтыфікацыі і выкарыстання; фактаграфічную – прывесці канкрэтныя факты, лічбы і г.д.

Паколькі бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца асноўным складаючым элементам ДБА, натуральна, што яму ўласцівы і аналагічныя функцыі: пошукавая, камунікатыўная і ацэначная. У бібліятэцы ДБА – ключ да фонду першасных дакументаў, які раскрывае яго ў розных аспектах (аўтарскім, персанальным, па відах выданняў, па змесце) і такім чынам забяспечвае пошук інфармацыі. ДБА дае спажыўцу інфармацыю аб існаванні і змесце дакументаў, якія маюцца ў бібліятэцы і не толькі, падае іх у пэўнай сістэме і тым самым забяспечвае арыентацыю ў дакументальных патоках і масівах, камунікацыю ў сістэме «дакумент – спажывец інфармацыі». Ацэначная функцыя ДБА рэалізуецца пры адборы, адлюстраванні інфармацыі ў ДБА аб дакументах, якія трансліруюць (прапагандуюць) агульначалавечыя каштоўнасці, дэмакратычныя свабоды. Акрамя таго, зместавая напаўняльнасць ацэначнай функцыі ДБА найбольш цесна звязана з тыпам бібліятэкі і інфармацыйнымі патрэбнасцямі яе карыстальнікаў: функцыі ДБА канкрэтызуюцца зыходзячы з мэт і задач, якія стаяць перад дадзенай установай, вынікаюць з ролі дадзенага сацыяльнага інстытута, таму гэтым мэтам і задачам падпарадкаваны адбор і характарыстыка дакументаў, якія адлюстроўваюцца ў ДБА.

*Уласцівасці ДБА*. Якасць арганізацыі і вядзення ДБА залежыць ад такіх уласцівасцей, як сістэмнасць, пластычнасць, надзейнасць, даступнасць і эканамічнасць.

Сістэмнасць ДБА азначае, што ён складаецца з узаемазвязаных элементаў, якія забяспечваюць яго цэласнасць. Структурныя часткі ДБА ўзаемна дапаўняюць адна адну, кампенсуючы сваім складам і структурай арганічную або штучную абмежаванасць зместу і пошукавых якасцей іншых элементаў. Захаванасць цэласнасці ДБА бібліятэкі патрабуе, каб так званыя падсобныя даведачна-бібліяграфічныя апараты яе падраздзяленняў па меры неабходнасці былі уніфікаваны, а іх аўтаномнасць заставалася адноснай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пластычнасць выяўляе здольнасць ДБА змяняцца ў залежнасці ад змены запытаў карыстальнікаў, іх зместу, саставу запытваемых дакументаў і фактаў. Элементы ДБА часам змяняюцца пры ўмове прадбачання будучых верагодных запытаў: фарміруюцца новыя раздзелы каталогаў, картатэк ці нават новыя тэматычныя картатэкі, бібліёграфы складаюць бібліяграфічныя спісы, мяняюць змест частак ДБА, пераводзяць у архіўную форму працяглы час незапатрабаваныя элементы. Такім шляхам забяспечваецца магчымасць аператыўнага пошуку і выдачы рэлевантнай інфармацыі. У ДБА ўносяцца змены і ў працэсе яго выкарыстання.

Надзейнасць ДБА заключаецца ў яго здольнасці задавальняць тыповыя для дадзенай бібліятэкі ці яе падраздзяленняў разавыя запыты. Тыповасць вызначаецца ў адносінах да рэальных і патэнцыяльных, профільных для бібліятэкі ці яе падраздзяленняў, запытаў. Такім чынам, ДБА змяшчае пэўны запас інфармацыі, рэгулярна не запытваемай, але значнай і адпаведнай верагодным запытам і інфармацыйным патрэбнасцям карыстальнікаў. Надзейнасць гарантуе адлюстраванне ў ДБА найбольш каштоўнай інфармацыі, рэтраспектыўнай і навейшай.

Даступнасць ДБА паказвае зручнасць яго выкарыстання карыстальнікамі. ДБА становіцца даступным дзякуючы прадуманаму размяшчэнню яго частак і элементаў, адпаведнаму іх афармленню, падтрыманню ў рабочым стане (своечасоваму выдзяленню тэматычных рубрык у картатэках, выключэнню ўстарэлага матэрыялу і інш.).

Эканамічнасць адлюстроўвае вымушанае матэрыяльна-фінансавымі рэсурсамі бібліятэкі абмежаванне складу і паўнаты ДБА. Гэтая ўласцівасць засцерагае ДБА ад лішняга зместу, празмернага аб’ёму, але ўступае ў супярэчнасць з патрабаваннем надзейнасці.

Пры фарміраванні ДБА трэба ўлічваць наступныя *асноўныя прынцыпы:*

– навуковы падыход пры вызначэнні складу асноўных структурных частак ДБА, кірункаў яго развіцця, абгрунтаванасці прымаемых метадычных рашэнняў і сродкаў вядзення;

– адпаведнасць структуры, аб’ёму, складу ДБА тыпу і зместу работы бібліятэкі, інфармацыйным патрэбнасцям асноўных груп карыстальнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– эканамічнасць, якая патрабуе змяншэння затрат на вядзенне ДБА за кошт рацыяналізацыі працы;

– дэмакратызм, даступнасць, нагляднасць, камфортнасць для спажыўцоў інфармацыі пры яго выкарыстанні.

Найбольш агульныя *метадычныя патрабаванні* да фарміравання ДБА асобнай бібліятэкі зводзяцца да таго, што ён павінен:

– фарміравацца пастаянна і планамерна, г.зн. падаваць інфармацыю без прабелаў, максімальна поўна і шматаспектна раскрываючы фонд бібліятэкі і змест дакументаў;

– аператыўна папаўняцца новымі матэрыяламі і пазбаўляцца ад устарэлых, спрыяць аператыўнаму пошуку інфармацыі;

– прафіляваццa ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі аб ўзаемадзеянні з іншымі бібліятэкамі і органамі НТІ;

– захоўваць адзінства, удасканальваць свае сістэмныя якасці на падставе развіцця спецыфічных функцый складаючых яго частак і разам з тым узмацнення ўзаемадзеяння паміж імі;

– весціся паралельна як у традыцыйных формах, так і электронных;

– мець рацыянальныя суадносіны паміж вядзеннем уласнага ДБА і выкарыстаннем аддаленых інфармацыйных рэсурсаў (аддаленага ДБА).

Для падтрымання ДБА, забеспячэння яго якасці неабходна кіраваць яго развіццём. Кіруючыя рашэнні аб саставе, арганізацыі і тэхналогіі вядзення ДБА адлюстроўваюцца ў дакументацыі рэгламентуючага і інфармацыйнага характару: у палажэнні аб ДБА канкрэтнай бібліятэкі, у пашпартах усіх каталогаў і картатэк, баз даных, а таксама ДБФ, у тэхналагічных інструкцыях, вопісе каталогаў і картатэк. Дакументацыя рэгулярна (звычайна штогод) пераглядаецца з мэтай адлюстравання змен стану элементаў ДБА.

Сярод метадаў кіравання прымяняюць прагназаванне і планаванне развіцця ДБА ў цэлым і асобных яго частак. Прадбачанне цяжкасцей пошуку, перавышэнне аб’ёму працоўных і матэрыяльных затрат над рэальнымі магчымасцямі бібліятэкі дапамагаюць устанавіць і захаваць рацыянальныя параметры ДБА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *3.2. Структура ДБА і задачы бібліятэк па яго развіцці*

ДБА любой бібліятэкі складаецца з наступных асноўных частак:

– сістэмы каталогаў і картатэк (баз даных);

– даведачна-бібліяграфічнага фонду;

– фонду выкананых даведак. (Фонд выкананых даведак можна разглядаць як састаўную частку даведачна-бібліяграфічнага фонду, які ўключае неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі.)

Такі склад даведачна-бібліяграфічнага апарату – вынік яго працяглага гістарычнага развіцця. Першапачаткова ў ДБА ўключаліся каталогі, якія раскрывалі састаў і змест дакументнага фонду бібліятэкі. Затым у ДБА пачалі ўключацца розныя даведачныя выданні, бібліяграфічныя дапаможнікі, у тым ліку ствараемыя ў бібліятэцы бібліяграфічныя картатэкі, а таксама копіі найбольш значных, раней выкананых пісьмовых бібліяграфічных даведак як у дадзенай бібліятэцы, так і ў іншых. Шырокае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій і магчымасці выкарыстання камп'ютэрных сетак сувязі значна мяняюць склад кожнага з пералічаных элементаў ДБА і ўзаемаадносіны паміж імі.

Тэхналагічныя асаблівасці дзейнасці сучасных бібліятэк дазваляюць навукоўцам вызначаць іх як "гібрыдныя", г.зн. бібліятэкі, што спалучаюць традыцыйныя і камп'ютэрныя тэхналогіі і адпаведна прадастаўляюць сваім карыстальнікам інфармацыйныя рэсурсы трох узроўняў: традыцыйныя друкаваныя выданні; электронныя рэсурсы на CD-ROM, DVD-ROM і іншых матэрыяльных носьбітах, якія згодна з «Руководством по UNIMARC №6 для электронных ресурсов" прапануюцца называць лакальнымі; сеткавыя або аддаленыя электронныя рэсурсы. Гэта ж тычыцца і асаблівасцей існавання ДБА: па-першае, у бібліятэках існуюць усе названыя часткі ДБА ў традыцыйным выглядзе, а таксама каталогі, картатэкі пераводзяцца на новыя формы вядзення і існавання – электронныя, у ДБФ уключаюцца выданні на электронных носьбітах, нарэшце, для пошуку неабходнай інфармацыі выкарыстоўваюцца электронныя каталогі, бібліяграфічныя і фактаграфічныя БД, электронныя даведачныя выданні, прадстаўленыя ў сусветных камп'ютэрных сетках. Другая асаблівасць звязана з тым, што актыўна выкарыстоўваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для пошуку інфармацыі ДБА, які створаны і існуе ў розных формах як у самой бібліятэцы, так і ў рэжыме аддаленага доступу (віртуальны ДБА). Таму, разглядаючы асноўныя часткі ДБА, мы і будзем даваць ім характарыстыку з улікам гэтых тэндэнцый.

Некаторыя спецыялісты, у прыватнасці Т.Ф.Берастава, лічаць, што па прычыне змен у структуры ДБА лепш было б структураваць пошукавы апарат, выкарыстоўваючы для назвы яго частак характарыстыку відаў інфармацыі: бібліяграфічная (адсылачная) і паўнатэкставая. Да бібліяграфічных (адсылачных) крыніц прапануецца аднесці бібліятэчныя каталогі і бібліяграфічныя картатэкі, да паўнатэкставых – фактаграфічныя, адрасныя картатэкі і картатэкі цытат, тэрмінаў і інш. Такое дзяленне, на думку Т.Ф.Берастава́й, не толькі адлюстроўвае сутнасныя адрозненні традыцыйных крыніц пошуку інфармацыі, але і аб'ядноўвае іх з камп'ютэрнымі базамі даных. Гэта яшчэ адзін з падыходаў структуравання ДБА, які мае права на існаванне, хаця і нельга сказаць, што ён адпавядае прынятай класіфікацыі БД, як нельга пагадзіцца з выдзяленнем такой часткі, як паўнатэкставая, і аднясеннем да яе фактаграфічных картатэк.

ДБА можа размяшчацца канцэнтравана (на цэнтральным даведачным пункце ці ў бібліяграфічным аддзеле) або разгрупавана, у розных падраздзяленнях, што абумоўлівае складанасць яго арганізацыі і кіравання ім. У такім выпадку абавязковым элементам ДБА з'яўляецца ключ да размеркаваных крыніц бібліяграфічнага пошуку. Ключ уключае наступныя элементы:

– раздзелы сістэматычнага ці прадметнага каталогаў, якія змяшчаюць апісанні бібліяграфічных выданняў ці спецыяльныя каталогі/картатэкі такіх дапаможнікаў;

– універсальныя і галіновыя паказальнікі (спісы, агляды) бібліяграфічных дапаможнікаў;

– сістэматызаваныя пералікі (вопісы) каталогаў і картатэк;

– дапаможныя паказальнікі да каталогаў і картатэк;

– агульны прадметна-імянны паказальнік, асноўныя раздзелы якога адпавядаюць тыпам бібліяграфічнага пошуку.

Ва ўмовах выкарыстання камп'ютэрных тэхналогій ключ можа весціся ў электроннай форме шляхам стварэння метабазы з уніфікаваным апісаннем генерыруемых, набываемых баз даных і баз даных, да якіх маецца аддалены доступ.

Увогуле ДБА бібліятэкі ўяўляе сабой не толькі сродак бібліяграфічнага і фактаграфічнага пошуку, ажыццяўляемага з рознымі мэтамі, але і аснову ўсіх кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, камплектавання і дакамплектавання фондаў бібліятэкі, усёй работы з чытачамі.

Сёння перад бібліятэкамі стаяць надзвычай важныя задачы па фарміраванні і развіцці ДБА. Дынаміка паказчыкаў дзейнасці бібліятэк сведчыць аб тым, што перыяд экстэнсіўнага нарошчвання бібліятэчных рэсурсаў скончыўся. Ва ўмовах выкарыстання электронных дакументаў інфармацыйная функцыя бібліятэк накіравана на пераход ад стратэгіі валодання інфармацыйнымі рэсурсамі да стратэгіі забеспячэння доступу да іх, таму значна ўскладняюцца задачы бібліятэк як па фарміраванні ўласнага ДБА, так і забеспячэнні карыстальнікаў інфармацыяй па тэлекамунікацыйных каналах.

Пераход на новыя інфармацыйныя тэхналогіі выклікае неабходнасць пераводу бібліяграфічнай інфармацыі, генерыруемай у бібліятэцы, у новую форму – электронную спачатку праз стварэнне электроннага каталога на новыя паступленні, а потым праз рэтраканверсію фонду да фарміравання адзінага электроннага каталога, стварэння баз даных рознага зместу, якія б адпавядалі спецыялізацыі бібліятэк. Актуальнай з’яўляецца таксама задача фарміравання лакальнай бібліятэчнай сеткі, якая б давала магчымасць забяспечыць доступ любому супрацоўніку ці карыстальніку з яго рабочага месца да ўсіх БД, якія маюцца ў бібліятэцы. Наступны крок у развіцці ДБА – уключэнне ўласных інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку электроннага каталога, БД у сусветныя камп’ютэрныя сеткі з мэтай забеспячэння агульнадаступнасці гэтых інфармацыйных рэсурсаў, павышэння камфортнасці звароту да іх у рэжыме аддаленага доступу.

Надзённай з’яўляецца задача даць магчымасць спажыўцам карыстацца не толькі ўласнымі каталогамі, але і каталогамі іншых бібліятэк, якія выстаўлены ў інтэрнет, а іх на сёння прадстаўлена больш за 500 – ад буйнейшых кнігасховішчаў свету да гарадскіх публічных бібліятэк, па сутнасці ў іх адлюстраваны сусветны бібліяграфічны рэпертуар выданняў. Асаблівасцю каталогаў заходніх бібліятэк з’яўляецца тое, што яны змяшчаюць звесткі аб выданнях у цэлым, таму атрымаць інфармацыю аб аналітычных матэрыялах значна скла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даней. З улікам гэтага важнай для бібліятэк з’яўляецца не толькі і не проста аўтаматызацыя бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, а развіццё сродкаў тэлекамунікацыі – сродкаў доступу да сеткавых тэлекамунікацыйных інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку і да сусветна размеркаванага ДБА розных суб’ектаў сістэмы інфармацыйных камунікацый. Вырашэнне гэтай задачы патрабуе навучання персаналу бібліятэкі рабоце з сеткавымі рэсурсамі, авалодання новымі тэхналогіямі і вывучэння магчымасцей выкарыстання “аддаленага (віртуальнага) ДБА”; навучання і пастаяннага кансультавання спажыўцоў па засваенні тэхналогіі працы з нетрадыцыйнымі носьбітамі інфармацыі, а таксама развіцця ўласнага ДБА за кошт стварэння такіх новых частак, як БД (навігатар, паказальнік) электронных рэсурсаў інтэрнета.

Вырашэнне задач па развіцці ДБА, звязаных з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій, будзе ажыццяўляцца пэўны час з паралельным вядзеннем ДБА ў традыцыйнай форме.

### *Пытанні і заданні*

1. Параўнайце азначэнні тэрмінаў ДБА, якія прыводзіліся ў розных ГОСТ на бібліятэчна-бібліяграфічную тэрміналогію (ГОСТ 7.26 – 80, ГОСТ 7.0 – 84, ГОСТ 7.27 – 80), з сучасным нарматыўным азначэннем. Паспрабуйце сфармуляваць сваё азначэнне ДБА.

2. Як Вы мяркуеце, ці мае права на існаванне тэрмін “віртуальны ДБА”?

3. Якія функцыі выконвае кожная структурная частка ДБА?

4. Якія формы існавання розных частак ДБА?

5. У чым выяўляецца супярэчнасць асноўных уласцівасцей ДБА і якія прымаюцца меры, каб іх пазбегнуць?

6. Сфармулюйце значэнне ДБА для работы бібліятэкі, для спажыўцоў інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Глава 4. Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі

У складзе ДБА бібліятэкі сістэма каталогаў і картатэк займае важнае месца.

Згодна з ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения” “бібліяграфічны каталог – гэта бібліяграфічны дапаможнік, які раскрывае склад і (або) змест фондаў дакументаў (бібліятэк, кнігагандлёвых устаноў)”. Згодна з тым жа ГОСТ “бібліяграфічная картатэка – гэта бібліяграфічны дапаможнік, рэалізаваны ў карткавай форме і не звязаны жорстка з пэўным фондам дакументаў”. Аналіз гэтых азначэнняў дае магчымасць устанавіць адрозненні каталога і картатэкі: картатэка існуе толькі ў карткавай форме, а для бібліяграфічнага каталога характэрны разнастайныя формы існавання – карткавая, друкаваная, машыначытальная (электронная). У картатэцы можа знаходзіцца інфармацыя аб выданнях, якія адсутнічаюць у фондзе бібліятэкі, што не характэрна для каталога. Картатэка ўключае пераважна бібліяграфічнае апісанне аналітычных матэрыялаў, у той час як каталог уключае бібліяграфічныя звесткі аб асобных выданнях (кнігах, брашурах, перыядычных выданнях і інш.).

Перад каталогамі і картатэкамі ставяцца задачы адлюстраваць на другасным узроўні фонд бібліятэкі; раскрыць па магчымасці поўна і шматаспектна змест канкрэтных выданняў; інфармаваць аб рэсурсах, да якіх бібліятэка мае доступ з дапамогай выкарыстання тэлекамунікацыйных сродкаў сувязі.

Агульнымі прынцыпамі фарміравання сістэмы каталогаў і картатэк з’яўляюцца цэласнасць і адзінства, што знаходзіць выражэнне ў дыферэнцыяцыі каталогаў і картатэк, г.зн. складанні іх з такім разлікам, каб каталог і картатэка не дубліравалі адно аднаго, але кожны з іх раскрываў фонд пасвойму; ва ўзаемасувязі і каардынацыі каталогаў і картатэк, зафіксаваных у профілі каталогаў і картатэк, іх структуры; узаемасувязі з іншымі часткамі ДБА і ДБА іншых бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

Сістэмнае адзінства каталогаў і картатэк забяспечваецца выкарыстаннем адзінай або сумяшчальнымі інфармацыйнапошукавымі мовамі; стандартызаванымі формамі, фарматамі бібліяграфічных запісаў; комплексам адзіных праграмных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічных сродкаў падрыхтоўкі, захоўвання і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі; агульнымі дапаможнымі пошукавымі сістэмамі (у традыцыйным варыянце – гэта адзіны алфавітна-прадметны паказальнік); адзінымі сістэмамі інфармавання аб складзе і асаблівасцях сістэмы каталогаў і картатэк у дадзенай бібліятэцы; перакрыжаванай сістэмай спасылак і адсылак унутры сістэмы каталогаў і картатэк; класіфікацыйнымі індэксамі і шыфрамі захоўвання на фонд бібліятэкі, якія пераносяцца ў найбольш актыўна выкарыстоўваемыя картатэкі і бібліяграфічныя дапаможнікі.

Неабходны набор каталогаў і картатэк у канкрэтнай бібліятэцы вызначаецца фондам бібліятэкі; структурай бібліятэкі (наяўнасцю спецыялізаваных аддзелаў, сектараў, чытальных залаў, іх тэрытарыяльным размяшчэннем); задачамі бібліяграфічнага абслугоўвання і асаблівасцямі інфармацыйных патрэбнасцей асноўных груп карыстальнікаў; профілем і традыцыямі бібліятэкі; наяўнасцю бібліятэк і інфармацыйных органаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі абслугоўваемай зоны.

Пры вызначэнні канкрэтнага саставу каталогаў і картатэк, каб пазбегнуць дубліравання пры іх арганізацыі, бібліёграфы кіруюцца паняццем “самастойны каталог/ картатэка”. Для яго характэрны акрэсленасць відаў адлюстроўваемых дакументаў (кнігі і брашуры, артыкулы і іншыя матэрыялы ў выданнях, ноты, карты і інш.); пэўны спосаб арганізацыі інфармацыі, які вызначаны ў якасці асноўнага (сістэматычны, прадметны, алфавітны); дакладна азначаныя змястоўныя межы (галіна ведаў, тэма, прадмет). Пры арганізацыі картатэкі пэўнага віду кіруюцца таксама прынцыпам тыповасці пошукавых сітуацый, напрыклад вядзенне картатэкі загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *4.1. Каталогі бібліятэкі*

У сувязі з тым, што каталогі з’яўляюцца прадметам спецыяльнага вывучэння ў курсе “Каталагізацыя дакументаў”, метадычныя пытанні іх вядзення мы разглядаць не будзем, а засяродзім увагу на тэндэнцыях іх развіцця як састаўной часткі ДБА.

Каталогі ствараюцца як на фонд бібліятэкі у цэлым (генеральныя), так і на яго асобныя часткі (фонды аддзелаў, філіялаў, калекцый, краязнаўчай літаратуры і г.д.), на фонды не-

калькіх бібліятэк (зводныя), на асобныя віды выданняў (каталогі кніг, перыядычных выданняў, карт, нот, спецвідаў тэхнічнай літаратуры, аўдыёвізуальных матэрыялаў і інш.).

Па назначэнні бібліятэчныя каталогі бываюць генеральнымі (службовымі) і чытацкімі.

Па спосабе групоўкі бібліяграфічных запісаў каталогі падзяляюцца на алфавітныя, сістэматычныя, прадметныя, нумарацыйныя, храналагічныя, тапаграфічныя і інш. Сярод названых найбольш распаўсюджаны першыя тры разнавіднасці.

У сувязі з укараненнем інфармацыйных тэхналогій у бібліятэках ідзе актыўны працэс пераходу ад традыцыйных сродкаў каталагізацыі да аўтаматызаванай апрацоўкі бягучых паступленняў і стварэння электроннага каталога, які з цягам часу стане галоўным элементам ДБА.

Перавагі электроннага каталога звязаны з тым, што, па-першае, ён аб’ядноўвае пошукавыя магчымасці і функцыі ўсіх каталогаў, вылучаемых па розных прыметах. Па-другое, дзякуючы электроннаму каталогу можна весці шматаспектны, камбінаваны пошук, прычым праводзіць пошук інфармацыі па любым элеменце бібліяграфічнага запісу, у тым ліку па тым, які не можа быць выкарыстаны пры пошуку ў традыцыйных каталогах: па індэксах ISBN, ISSN, па годзе выдання, па аснове слова (або “ўсячэннем слова”). Па-трэцяе, павышаецца аператыўнасць пошуку. Пошук для спажыўцоў спрошчваецца дзякуючы выкарыстанню слоўнікаў, інтэграваных у БД.

Электронны каталог забяспечвае доступ да рэсурсаў каталога не толькі карыстальнікам дадзенай бібліятэкі, але і аддаленым спажыўцам інфармацыі. Ён забяспечвае як пошук інфармацыі па разавых запытах, так і задавальненне доўгатэрміновых запытаў, друкаванне бібліяграфічных даных у выглядзе каталожных картак, бібліяграфічных паказальнікаў, магчымасць абмену інфармацыяй з іншымі бібліяграфічнымі базамі даных, у тым ліку і падключэнне да сеткі інтэрнет.

Паралельна з электронным каталогам на працягу пэўнага часу (у ДПНТБ лічаць – 5–6 гадоў) для падстрахоўвання будуць папаўняцца традыцыйныя карткавыя каталогі. Толькі пасля поўнай гарантыі надзейнасці электроннага каталога (пры ўмове забеспячэння адначасовага масавага доступу да яго) традыцыйныя каталогі будуць закансерваваны і паступо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ва пераведзены ў кампактную форму. Для вызначэння пытанняў паслядоўнасці кансервацыі каталогаў і картатэк бібліятэкі праводзяць спецыяльныя даследаванні. Так, у 2002 г. НББ правяла даследаванне на тэму “Вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання карткавых каталогаў і картатэк чытачамі НББ”. У выніку было вызначана, што пераважная колькасць чытачоў карыстаецца традыцыйнымі каталогамі і картатэкамі ў сувязі з тым, што ў бібліятэцы яшчэ недастаткова персанальных камп’ютэраў, існуюць абмежаванні ў часе пры рабоце з электронным каталогам (ЭК), у ЭК адсутнічае неабходная інфармацыя (ЭК у НББ пачалі весці з 1993 г.), карыстальнікі больш сталага ўзросту прывыклі традыцыйна звяртацца да карткавых каталогаў. Рэйтынг выкарыстання карткавых каталогаў і картатэк у розных аддзелах, напрыклад у даведачна-інфармацыйным аддзеле і аддзеле беларускай літаратуры, розны. Таму прымаць рашэнне аб кансервацыі карткавых каталогаў у аддзелах можна толькі пры наяўнасці дастатковай колькасці аўтаматызаваных месцаў карыстальнікаў, надзейнасці іх работы, прадастаўленні магчымасці ў электронным выглядзе атрымаць неабходную інфармацыю. Што ж тычыцца карыстальнікаў, то на сёння 84% апытаных гатовы працаваць з электронным каталогам.

Яскравай тэндэнцыяй у развіцці каталогаў бібліятэк з’яўляецца актывізацыя работы па стварэнні зводных каталогаў. Роля зводных каталогаў павышаецца ў сувязі са зменай самой ідэалогіі фарміравання фондаў бібліятэк; з’яўленнем новых формаў супрацоўніцтва – бібліятэчных кансорцыумаў. Такія зводныя каталогі ствараюцца і ў выглядзе навігатараў па інфармацыйных рэсурсах інтэрнет або ў выглядзе БД, якую могуць весці бібліятэка-арганізатар і каардынатар такога супрацоўніцтва самастойна або на кааператыўных пачатках.

Прыкладамі стварэння зводных каталогаў у рэспубліцы з’яўляецца фарміраванне зводнага электроннага каталога краіны, фарміруемага на базе НББ, які будзе аб’ядноўваць на першым этапе рэсурсы вядучых бібліятэк; зводных каталогаў новых замежных кніг і перыядычных выданняў, што паступаюць у бібліятэкі краіны; зводнага электроннага каталога на фонды РНТБ і абласных НТБ; зводных электронных каталогаў ЦБС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павялічваюцца магчымасці выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў за кошт звароту да каталогаў, прадстаўленых у сусветных камп'ютэрных сетках як асобных бібліятэк, так і зводных. Буйныя навуковыя бібліятэкі Беларусі размясцілі таксама свае электронныя каталогі ў інтэрнеце, забяспечыўшы тым самым аддалены доступ да іх*.

З фарміраваннем электронных каталогаў у іх пачалі ўключаць і аналітычны роспіс выданняў, у сувязі з чым адбываюцца размыванне меж паміж каталогамі і картатэкамі, аб'яднанне іх пошукавых магчымасцей.

### *4.2. Картатэкі і базы даных бібліятэкі*

У адрозненне ад бібліятэчных каталогаў картатэкі адлюстроўваюць звесткі аб дакументах (або выбраных з іх фактах) незалежна ад наяўнасці гэтых матэрыялаў у фондзе дадзенай бібліятэкі, гэта значыць, што яны арыентаваны на адлюстраванне ўсяго сукупнага дакументнага патоку.

Сёння ў бібліятэках картатэкі вядуцца ў традыцыйнай і адзіна магчымай для іх форме – карткавай. Выкарыстанне электронных сродкаў пры арганізацыі такіх пошукавых сістэм вядзе да змены назвы – фарміравання баз даных, хаця можна яшчэ сустрэць такія некарэктныя назвы, як "электронная картатэка", "электронны каталог артыкулаў".

Да ліку найбольш распаўсюджаных у практыцы работы бібліятэк картатэк адносяцца сістэматычная картатэка артыкулаў (СКА); краязнаўчыя картатэкі; тэматычныя картатэкі; спецыяльныя картатэкі; фактаграфічныя картатэкі.

Цэнтральнае месца сярод картатэк займае сістэматычная картатэка артыкулаў. Па тэматыцы адлюстроўваемых дакументаў яна з'яўляецца універсальнай, аднак у канкрэтных бібліятэках яе змястоўныя межы вызначаюцца з улікам эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця абслугоўваемага бібліятэкай рэгіёна (раёна), профілю бібліятэкі і сістэматычнага вывучэння патрэбнасцей карыстальнікаў. Па назначэнні СКА адносіцца да крыніц агульнай бібліяграфіі і выконвае функцыю ядра ўсёй сістэмы картатэк бібліятэкі. Яе структура аналагічная структуры сістэматычнага каталога. Асаблівасці гэтай картатэкі, якія адрозніваюць яе ад сістэ-

* Характарыстыку бібліятэчных каталогаў, прадстаўленых у інтэрнеце, гл. у параграфе 5.12 "Бібліяграфічныя рэсурсы ў інтэрнеце".



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матычнага каталога, звязаны з аператыўным адлюстраваннем у ёй новых матэрыялаў з часопісаў, газет, перыядычных выданняў і зборнікаў, якія працягваюцца; пастаянным увядзеннем новых і актуалізацыяй фармуліровак старых рубрык.

Асноўнымі крыніцамі папаўнення СКА раней з'яўляліся друкаваныя карткі цэнтралізаванай каталагізацыі, але з 1992 г. Нацыянальная кніжная палата Беларусі іх перастала выпускаць, а набыццё картак Расійскай кніжнай палаты звязана з фінансавымі цяжкасцямі. Таму ў цяперашні час аналітычны роспіс ажыццяўляецца, як правіла, сіламі супрацоўнікаў бібліятэкі – бібліёграфамі, што прыводзіць да шматкратнага дубліравання гэтага працэсу і яго падаражання. У СКА адлюстроўваюцца аналітычныя матэрыялы незалежна ад іх наяўнасці ў бібліятэцы. Галоўнымі крытэрыямі для адбору з'яўляюцца профільнасць бібліятэкі, актуальнасць, навізна, арыгінальнасць, навуковая, мастацкая значнасць матэрыялаў.

У аснове сістэматызацыі матэрыялаў у сістэматычнай картатэцы артыкулаў ляжыць тая ж схема класіфікацыі, што і ў сістэматычным каталогу (ББК – ва універсальных бібліятэках; УДК – у навуковых і навукова-тэхнічных бібліятэках; рубрыкатары, распрацаваныя ў апошнія гады буйнейшымі бібліятэкамі). Але для СКА характэрна больш дробная дэталізацыя матэрыялу ўнутры рубрык у сувязі з тым, што па новых і перспектыўных тэмах картатэка адлюстроўвае больш аб'ём матэрыялу, чым СК. Унутры рубрык картатэкі матэрыял размяшчаецца ў адваротным храналагічным парадку, што забяспечвае карыстальніку магчымасць знаёмства з навейшымі публікацыямі, а бібліёграфу – аператыўна ўключаць новыя карткі і выключаць устарэлыя.

Матэрыялы ў СКА захоўваюцца, пакуль яны актуальныя і на іх ёсць попыт, а ў СК – да тых часоў, пакуль дакумент знаходзіцца ў фондзе. Картатэку пастаянна аднаўляюць у адпаведнасці з устаноўленымі тэрмінамі захоўвання картак: тры – чатыры гады (для грамадскіх навук), чатыры – пяць гадоў (для прыродазнаўчых і тэхнічных навук), сем і болей гадоў (для літаратуразнаўства, мастацтва).

Бібліёграфы пастаянна праводзяць рэдагаванне СКА, якое заключаецца ў праверцы адпаведнасці структуры, зместу і афармлення картатэкі патрабаванням, якія да іх прад'яўляюцца, і ў выпраўленні выяўленых недахопаў. Адроз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніваюць планавае і бягучае рэдагаванне, поўнае і выбарачнае, метадычнае і тэхнічнае. Рэдагаванне называюць планавым, калі работа плануецца ў гадавым плане. Бягучае рэдагаванне вядзецца ў працэсе работы з СКА адначасова з расстаноўкай картак. Поўнае рэдагаванне тычыцца картатэкі цалкам, выбарачнае – аднаго або некалькіх загадзя вызначаных раздзелаў. Метадычнае рэдагаванне накіравана на ўдасканаленне картатэкі шляхам перапрацоўкі зместу, паляпшэння яе структуры за кошт уводу новых дзяленняў, унясення выпраўленняў у яе афармленне. Тэхнічнае рэдагаванне звязана з праверкай правільнасці ўнутранага афармлення картатэкі – расстаноўкі картак, афармлення раздзяляльнікаў, выяўлення арфаграфічных памылак, замены зношаных картак. У выніку рэдагавання паляпшаюцца інфармацыйныя якасці картатэк і іх пошукавыя магчымасці, што робіць бібліяграфічныя картатэкі надзейным сродкам абслугоўвання карыстальнікаў.

Бібліяграфічныя аддзелы вядуць СКА з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі, фарміруючы базу даных “Артыкулы” і адначасова раздрукоўваючы каталожныя карткі для паралельнага вядзення традыцыйнай СКА.

Для вядзення бібліяграфічнай базы даных “Артыкулы” ў бібліятэцы выкарыстоўваюцца, як і для вядзення ЭК, тыя ж тэхнічныя сродкі (персанальны камп’ютэр, тэрмінал, з дапамогай якога ажыццяўляюцца ўвод даных і далейшае выкарыстанне масіву інфармацыі, якая знаходзіцца ў базе даных, сістэма сувязі са знешнімі базамі даных), праграмнае забеспячэнне (спецыяльна распрацаваныя алгарытмы і праграмы, якія дазваляюць весці аўтаматызаваную апрацоўку дакументаў), лінгвістычныя сродкі (комплекс інфармацыйна-пошукавых моў – ІПМ рознага тыпу, методыка індэксавання і пошуку інфармацыі), а таксама нарматыўна-метадычныя дакументы, якія рэгламентуюць стварэнне і падтрыманне ў рабочым стане лінгвістычных сродкаў і забяспечваюць магчымасць абмену БД. У аўтаматызаванай тэхналогіі выкарыстоўваюцца як традыцыйныя ІПМ (напрыклад, ББК, УДК, іншыя класіфікацыйныя ІПМ, мова прадметных рубрык), так і нетрадыцыйныя (дыскрыптарныя, мова ключавых слоў і інш.). Падтрымка лінгвістычнага забеспячэння ў рабочым стане ажыццяўляецца службай вядзення ІПМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увод бібліяграфічнай інфармацыі ў бібліяграфічную БД “Артыкулы” ажыццяўляецца з дапамогай фарматаў каталагізацыі, прызначаных для пераўтварэння бібліяграфічнага запісу ў форму, зручную для апрацоўкі на ЭВМ. Фармат вызначае правілы запісу ў камп’ютэры, унутраную структуру даных, а таксама знакі і коды, пры дапамозе якіх бібліяграфічныя запісы раздзяляюцца і ідэнтыфікуюцца. У камп’ютэрнай тэхналогіі фармат выконвае тыя ж функцыі, што і ГОСТ 7.1 – 2003 “Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления” пры падрыхтоўцы бібліяграфічных запісаў для традыцыйных картатэк. Найбольш часта выкарыстоўваецца міжнародны камунікатыўны фармат UNIMARC, у Беларусі на аснове гэтага фармату распрацаваны камунікатыўны фармат BELMARC для каталагізацыі розных відаў выданняў, у тым ліку і аналітычных матэрыялаў, які адлюстраваў асаблівасці нацыянальных правіл каталагізацыі.

Увод інфармацыі ў бібліяграфічную базу даных “Артыкулы” заключаецца ў вылучэнні элементаў бібліяграфічнага запісу і занясенні іх у адпаведныя палі і падпалі фармату, пазначаныя меткамі, якія дазваляюць камп’ютэру ідэнтыфікаваць уводзімую інфармацыю аб дакуменце. Палі і падпалі высвечваюцца на экране, пасля чаго адбываецца іх запаўненне бібліёграфам. Акрамя бібліяграфічнага апісання, бібліёграфам з дапамогай выкарыстоўваемай ІПМ – індэксаў класіфікацыі, прадметных рубрык – адлюстроўваецца змест дакументаў. Для фарміравання слоўнікаў у фармаце бібліяграфічнага запісу могуць выдзяляцца прозвішчы аўтараў, назвы калектываў, ключавыя словы і інш., і машына сфарміруе асобныя слоўнікі, якія значна палегчаць пошук неабходнай інфармацыі.

Пошук інфармацыі ў бібліяграфічнай БД “Артыкулы” можа ажыццяўляцца з дапамогай меню і масак. Меню – гэта сфарміраваныя машынай слоўнікі або базы ведаў, якія знаходзяцца ў памяці БД. Яны ўяўляюць сабой пералік лексічных адзінак, што выводзяцца на экран дысплея і дапамагаюць выбраць кірунак пошуку з варыянтаў. Напрыклад, меню тэм можа прадставіць спісак дзяленняў табліцы класіфікацыі або слоўнік прадметных рубрык. Маскі – гэта фарматы, якія маюць пустыя палі, што павінны быць запоўнены спажыўцамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыклад, маска “Увядзіце загаловак” падказвае карыстальніку шлях адшукання артыкула па загалоўку, які ён запісвае ў фармат.

Асноўнымі носьбітамі інфармацыі пры фарміраванні бібліяграфічнай БД “Артыкулы” з’яўляюцца жорсткія дыскі (вінчэсцеры), дыскеты, кампакт-дыскі. Кампакт-дыскі валодаюць вялікай інфармацыйнай ёмістасцю, сумяшчальнасцю з персанальнымі камп’ютэрамі і з’яўляюцца надзейным даўгачасным сродкам захоўвання і пошуку інфармацыі.

Перыядычныя выданні выступаюць для бібліятэк вельмі важнай і значнай крыніцай для абслугоўвання карыстальнікаў, таму што змяшчаюць найбольш актуальную інфармацыю, аператыўна адлюстроўваюць інфармацыю аб новых навуковых даследаваннях і атрыманых выніках, падзеях навуковага і культурнага жыцця, часта з’яўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі па пэўнай праблеме. Таму навуковыя бібліятэкі лічаць прыярытэтным камплектаванне сваіх фондаў часопісамі і ў апошнія гады ў сярэднім больш паловы выдзеленых на камплектаванне сродкаў затрачваюць на іх падпіску. Між тым сёння бібліёграфам трэба ведаць змены, якія характарызуюць выданне перыядычных крыніц, і ствараць адпаведныя сродкі для работы з імі, прымаць адпаведныя метадычныя рашэнні пры вядзенні спецыялізаваных частак ДБА, якія адлюстроўваюць як самі перыядычныя выданні, так і аналітычныя матэрыялы з іх.

На інфармацыйным рынку з’явіліся электронныя версіі перыядычных выданняў, інтэрнет-версіі, стужкі навін, дайджэсты дзелавых навін, а таксама спецыялізаваныя серверы, што даюць інфармацыю як аб бягучых падзеях, так і электронныя архівы газет. Рэдакцыі перыядычных выданняў, якія выдаюць электронныя версіі, могуць прадастаўляць іх карыстальнікам раней выхаду ў свет выдання на папяровым носьбіце, яны могуць быць паўней, чым іх цвёрдыя копіі. Найбольшую складанасць пры пошуку профільных публікацый у бібліёграфа ўяўляюць часопісы, якія выходзяць толькі ў электронным выглядзе, прадстаўлены ў інтэрнеце ў самых розныхварыянтах – ад кароткай апісальнай формы да поўных тэкстаў усіх выпускаў з рэтраспектывай за некалькі гадоў. Электронныя часопісы ў сістэме бягучага бібліяграфічнага інфармавання не распісваюцца. Таму бібліёграфы павінны ведаць магчымыя пошукавыя сродкі такой інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іх прагляд ажыццяўляецца праз дамашнія (персанальныя) старонкі рэдакцый гэтых перыядычных выданняў; інфармацыйныя фірмы ствараюць дайджэсты і прэс-агляды вядучых цэнтральных і рэгіянальных перыядычных выданняў па сваім профілі і ў адпаведнасці з запытамі карыстальнікаў; рэдакцыі асобных выданняў ствараюць каталог сваіх публікацый; рэдакцыі перыядычных выданняў выдаюць паўнатэкставыя БД газет, часопісаў. Значным дасягненнем апошняга дзесяцігоддзя з'яўляецца стварэнне паўнатэкставай БД з сусветным ахопам перыядычных выданняў. У цяперашні час інстытут "Адкрытае грамадства" прыступіў да рэалізацыі шырокамаштабнай праграмы "Электронная інфармацыя для бібліятэк". Яна накіравана на забеспячэнне бясплатнага доступу да поўных электронных версій 4550 замежных часопісаў у галіне гуманітарных і негуманітарных навук. Праз сеткавы доступ або на аснове кампактных аптычных дыскаў чытачы, у тым ліку і беларускіх бібліятэк (НББ, ЦНБ НАН РБ, РНТБ і інш.), атрымалі магчымасць з 2001 г. працаваць з БД фірмы EBSCO, буйнейшага ў свеце пастаўшчыка часопісаў у электроннай форме.

Інфармацыя аб наяўнасці ў інтэрнеце электронных часопісаў і асаблівасцях іх прадстаўлення размяшчаецца на спецыялізаваных сайтах – тэматычных парталах і службах інфармавання аб перыёдыцы: Ulrich's International Periodicals Directory (http: // www. ulrichsweb. com), Publish (http: // www. publish. com), Periodicals (http: // periodicals. net) і інш. Звярнуўшыся да гэтых сайтаў, бібліёграф і карыстальнік могуць атрымаць важнейшую інфармацыю: ці маецца часопіс, які яго цікавіць у інтэрнеце; у якім аб'ёме там прадстаўлены яго матэрыялы; за які перыяд і на якіх умовах (бясплатна ці за плату). Акрамя таго, на некаторых сайтах можна даведацца і аб тым, у якія базы даных уключаюцца і індэксуюцца артыкулы з часопіса. У Рунеце, як і ў Байнеце, такіх службаў, што прадстаўляюць увесь комплекс інфармацыі па расійскіх часопісах і адпаведна па беларускіх, няма. У Расіі калектыў супрацоўнікаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі пачаў з 2002 г. рэалізацыю праекта "Стварэнне партала расійскіх часопісаў гуманітарнай тэматыкі, размешчаных у інтэрнеце, на серверы РДБ". Галоўным кампанентам партала стане агульнадаступная БД структураваных апісанняў расійскіх навуковых і на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вукова-папулярных часопісаў гуманітарнай тэматыкі, даступных праз інтэрнет. Апісанні будуць адлюстроўваць важныя характарыстыкі часопісаў: назву; ISSN; тэматыку; арганізацыю, якая выдае часопіс; наяўнасць у адкрытым доступе анатацый (рэфератаў) і /або поўных тэкстаў артыкулаў; уключэнне артыкулаў з часопіса ў розныя БД і інш.

Цікавым у метадычным плане з'яўляецца рашэнне па вядзенні базы даных Бібліятэкай па прыродазнаўчых навуках РАН, у якой комплексна прадстаўлена інфармацыя як аб перыядычных выданнях, так і аб матэрыялах з іх. Бібліятэка вядзе БД перыядычных выданняў, з апісання якіх створана сістэма адсылак да зместу часопісаў, размешчаных на сайтах рэдакцый выдавецтваў, што выпускаюць гэты часопіс. Рашэнне гэтай задачы было немагчымым для традыцыйных часопісаў і традыцыйных формаў работы бібліятэк без стварэння аналітычнага роспісу паступаючых часопісаў. У дадзеным выпадку працаёмкасць вядзення такой БД значна змяншаецца за кошт выкарыстання свабодна даступнай выдавецкай інфармацыі.

Рост у апошнія гады цікавасці да гісторыі, і ў прыватнасці да гісторыі свайго краю, прывяла да актывізацыі краязнаўчай работы ў бібліятэцы, у тым ліку да вядзення краязнаўчых картатэк, якія пашыраюць магчымасці краязнаўчага каталога, адлюстроўваючы дакументы па шырокім коле пытанняў, што тычацца розных аспектаў гісторыі і сучаснага жыцця рэгіёна. Распрацавана спецыяльная схема групоўкі матэрыялу ў картатэцы. Крыніцамі яе фарміравання выступае ўвесь даступны бібліёграфу дакументны паток. Асаблівая ўвага звяртаецца на кнігі, перыядычныя выданні і выданні, што працягваюца, якія выходзяць на тэрыторыі рэгіёна.

З пераходам на інфармацыйныя тэхналогіі (па аналогіі з вядзеннем СКА) у бібліятэках ажыццяўляецца перавод традыцыйных краязнаўчых картатэк у электронную або сеткавую форму. Улічваючы, што яны ўяўляюць унікальную па тэматыцы бібліяграфічную прадукцыю, для іх распаўсюджвання ў сусветнай інфармацыйнай прасторы імкнуцца прытрымлівацца наступных прынцыпаў: магчымасці канвертацыі і абмену з іншымі базамі даных; першачарговага роспісу мясцовых, малатыражных і нетыражуемых выданняў. Асаблівасцю развіцця краязнаўчага ДБА ў выпадку яго рэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

алізацыі ў электронным варыянце з'яўляецца генерыраванне комплексу БД: адначасова паўнатэкставых, бібліяграфічных і фактаграфічных. У гэтым выпадку ў яго ўключаюць не толькі тэкставую інфармацыю, але і іканаграфічную, аўдыё- і відэаматэрыялы. Трэба адзначыць і такую тэндэнцыю: агульнадаступныя бібліятэкі пачалі прымаць на захоўванне і адлюстроўваць у краязнаўчых картатэках, БД сямейныя архівы жыхароў дадзенага рэгіёна, што робіць іх яшчэ больш каштоўнымі.

Вядуцца ў бібліятэцы і тэматычныя картатэкі, прызначэннем якіх з'яўляецца адлюстраванне дакументаў па найбольш актуальнай або профільнай і таму запатрабаванай чытачамі праблематыцы. Калі тэматычныя картатэкі ствараюцца па актуальнай тэматыцы, то часта яны носяць часовы характар і вядуцца да тых пор, пакуль тэма захоўвае актуальнасць і не забяспечана друкаванымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі.

У публічных, дзіцячых бібліятэках тэматычныя картатэкі прызначаюцца ў асноўным для задавальнення агульнаадукацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў. У іх адлюстроўваюцца ўсе віды выданняў па структуры і ў асноўным навукова-папулярнага, масава-палітычнага, вучэбнага, даведачнага характару. У залежнасці ад прызначэння картатэкі выкарыстоўваюцца розныя спосабы групоўкі матэрыялу: у картатэках рэкамендацыйнага прызначэння – тэматычная або лагічная (рэкамендацыйная) групоўка; пры фармулёўцы рубрык могуць выкарыстоўвацца раздзелы з праграм вучэбных дысцыплін, назвы раздзелаў афіцыйных выданняў, загалоўкі артыкулаў і інш.

У спецыяльных бібліятэках тэматычныя картатэкі звычайна маюць профільны характар (або міжгаліновы), па якім складана знайсці матэрыялы на базе універсальнай часткі ДБА. Яны аб'ядноўваюць усе віды выданняў, што адлюстроўваюцца ў розных частках універсальнага ДБА, а таксама адсутнічаюць у дадзенай бібліятэцы, дапамагаюць мець дастаткова поўнае ўяўленне аб дакументнай забяспечанасці пэўнай галіны ведаў, тэмы. Іх напаўненне патрабуе прагляду вялікай колькасці крыніц: не толькі новых паступленняў у фонд бібліятэкі, а і прагляду крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, рэфератыўных і аглядных матэрыялаў, іншых бібліяграфічных крыніц па сумежных галінах. Для ар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ганізацыі матэрыялу ў іх распрацоўваюцца спецыяльныя галіновыя або праблемна арыентаваныя рубрыкатары. Картатэкі маюць доўгатэрміновы характар, пераводзяцца ў электронную форму і працягваюць весціся ў выглядзе баз даных. Методыка вядзення іх у электроннай форме аналагічная стварэнню тэматычных бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі. На іх базе могуць рыхтавацца бібліяграфічныя дапаможнікі. Прыкладамі такіх картатэк і БД з'яўляюцца «Рацыяналізатарства і вынаходніцтва ў Беларусі» (вядзе РНТБ), «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (вядзе бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў) і інш.

Спецыяльныя картатэкі ствараюцца для задавальнення чытацкіх запытаў, якія не могуць быць паспяхова рэалізаваны на базе універсальнай часткі ДБА (патрэбны працаёмкі шматаспектны пошук, дадзены від дакументаў не адлюстроўваецца ў іншых частках ДБА). Да іх адносяць картатэку загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры, рэцэнзій, персаналій, ілюстрацыйных матэрыялаў, бібліяграфічных дапаможнікаў і інш. У спецыяльных навуковых бібліятэках распаўсюджаны картатэкі работ супрацоўнікаў, абароненых дысертацый.

У сувязі з тым, што да гэтага часу ў большасці публічных бібліятэк спецыяльныя картатэкі вядуцца ў традыцыйнай карткавай форме, разгледзім методыку іх вядзення, хаця трэба адзначыць, што пры генерыраванні баз даных патрэбнасць у некаторых з іх знікае (напрыклад, картатэкі загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры, рэцэнзій і інш.), некаторыя картатэкі (работ супрацоўнікаў навуковых калектываў, персаналій, перыядычных выданняў) з бібліяграфічных пераўтвараюцца ў пошукавыя сістэмы змешанага тыпу – бібліяграфічныя і паўнатэкставыя.

Картатэка загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры забяспечвае пошук літаратуры па прымеце, часцей за ўсё вядомай чытачу, – загалоўку. Карткі гэтай картатэкі змяшчаюць мінімум звестак – назву твора, яго жанр, прозвішча аўтара. Гэтую картатэку часта разглядаюць як дапаможны пошукавы апарат да алфавітнага каталога. Для матэрыялаў, апублікаваных у перыядычных выданнях, на картцы прыводзіцца бібліяграфічнае апісанне крыніцы публікацыі. У картатэцы адлюстроўваюцца творы, якія маюць індывідуальныя загалоўкі, не адлюстроўваюцца вершы, п’есы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Картатэка рэцэнзій уключае карткі, якія змяшчаюць апісанні рэцэнзуемага твора і самой рэцэнзіі (рэцэнзій), размешчаных па алфавіце прозвішчаў аўтараў і загалоўкаў рэцэнзуемых твораў. Картатэка рэцэнзій можа быць невялікай і аператыўна аднаўляемай (напрыклад, уключаць матэрыялы бягучага года ў тым выпадку, калі бібліятэка атрымлівае «Летапіс рэцэнзій»). Штоквартальны выхад «Летапісу рэцэнзій», наяўнасць у ім дапаможных паказальнікаў дазваляюць адмовіцца ад доўгатэрміновага захоўвання матэрыялаў у картатэцы. Такім чынам, у дадзенай картатэцы ніжняя хparty храналагічная мяжа захоўвання матэрыялаў можа вызначацца інфармацыйным інтэрвалам для «Летапісу рэцэнзій». Гэта забяспечвае актуальнасць картатэкі. У тых бібліятэках, дзе чытачы праяўляюць павышаную цікавасць да крытычных матэрыялаў, вядзенне картатэкі рэцэнзій, якая будзе адлюстроўваць матэрыялы за некалькі гадоў, больш мэтазгодная, чым выкарыстанне «Летапісу рэцэнзій». У картатэцы ўсе артыкулы, прысвечаныя аднаму твору, сабраны разам, і таму пошук матэрыялу пры алфавітнай групоўцы праводзіцца больш аператыўна.

Картатэка персаналій ствараецца з улікам значнай колькасці запытаў аб дзеячах навукі, культуры, дзяржаўных і грамадскіх асобах. Матэрыял групуецца ў алфавіце персанальных рубрык. На раздзяляльніках прыводзяцца асноўныя звесткі аб жыцці і дзейнасці асобы. Спачатку прыводзяцца бібліяграфічныя апісанні прац самой персоны, а потым біяграфічны, крытычны матэрыял аб ёй і яе творчасці. Вядзенне картатэкі персаналій працаёмкае: распісваецца вялікая колькасць розных дакументаў (кніг, зборнікаў, перыядычных выданняў).

Сістэматычная картатэка бібліяграфічных матэрыялаў вядзецца звычайна бібліёграфам для службовых мэт і адлюстроўвае асобна выдадзеныя бібліяграфічныя дапаможнікі, а таксама прыкніжныя і ўнутрычасопісныя спісы. Матэрыял размяшчаецца ў сістэматычным парадку па той жа схеме класіфікацыі, што і ў СК і СКА. Ва ўмовах аўтаматызацыі ў вядзенні дадзенай картатэкі адбываюцца пэўныя змены, яна пераўтвараецца ў электронны даведнік, «навігатар» інфармацыйных рэсурсаў, які раскрывае змест традыцыйных і электронных бібліяграфічных пошукавых сістэм, розных фармаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даведачных выданняў, ствараемых і набываемых бібліятэкай. Важнейшай яе часткай становяцца адрасы электронных бібліятэк, каталогаў, БД, вэб-сайтаў розных арганізацый, размешчаных у інтэрнеце, якія ўяўляюць цікавасць для бібліёграфаў, бібліятэкараў і карыстальнікаў бібліятэкі. Папаўненню гэтай часткі БД дапамагае выкарыстанне даведнікаў па рэсурсах інтэрнета як замежных краін, у тым ліку расійскіх, так і беларускіх. Аднак трэба ўлічваць, што ў сувязі з вялікай дынамічнасцю сеткавых рэсурсаў звесткі аб іх, уключаныя ў такія даведнікі, хутка старэюць.

Да ліку спецыяльных картатэк адносяцца картатэка ілюстрацый, у якой аналітычна распісаны ілюстрацыйныя матэрыялы з розных выданняў; картатэка ілюстрацыйна-метадычных матэрыялаў, ствараемая па кірунках бібліятэчна-бібліяграфічнай работы, і інш.

Павелічэнне колькасці фактаграфічных запытаў чытачоў пры хуткім старэнні даведачных выданняў і разгрупаванасці матэрыялаў, высокі кошт паслуг, якія прадастаўляюць аналітычныя інфармацыйныя цэнтры, прымушаюць бібліятэкі ствараць уласныя фактаграфічныя пошукавыя сістэмы. Фактаграфічныя картатэкі і БД ствараюцца сёння не толькі спецыяльнымі навуковымі і навукова-тэхнічнымі бібліятэкамі, але і універсальнымі навуковымі і публічнымі бібліятэкамі. Найбольш распаўсюджанымі ў дзейнасці публічных бібліятэк з'яўляюцца картатэкі сацыяльна-эканамічнага профілю рэгіёна, адрасныя БД арганізацый і прадпрыемстваў рэгіёна, наменклатуры тавараў і паслуг бытавога прызначэння; адукацыйных паслуг і арганізацый, якія іх прадастаўляюць; службаў сацыяльнай падтрымкі і дапамогі асобе; паслуг бірж працы і інш.

Рэспубліканскія навуковыя бібліятэкі таксама генерыруюць разнастайныя фактаграфічныя БД. Так, НББ вядзе БД «Беларусь у падзеях і асобах», дзе адлюстроўваюцца звесткі аб асобах, што маюць дачыненне да Беларусі па прафесійнай дзейнасці, месцы нараджэння, якія жылі і ўнеслі свой уклад у яе гісторыю, навуку, культуру; звесткі аб падзеях, што ўвайшлі ў гісторыю Беларусі; звесткі аб арганізацыях, установах, прадпрыемствах Беларусі. БД уключае інфармацыю з энцыклапедый і іншых даведачных выданняў. Пошук у раздзеле БД «Персаналіі» можа ажыццяўляцца па розных крытэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыях: прозвішчы, саслоўі, родзе заняткаў, галіне, тэрытарыяльнай і храналагічнай прыметах; у раздзеле «Падзеі» – па галіне, храналогіі, прозвішчах удзельнікаў, кіраўнікоў, тэрытарыяльных і іншых прыметах. Акрамя выкарыстання БД пры выкананні разавых запытаў, яна з’яўляецца асновай і для стварэння яе друкаванага аналага – «Беларускі каляндар”. ЦНБ вядзе дзве фактаграфічныя БД “Біяграфістыка” і “Біяграфіі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі”. Навуковая бібліятэка па фізкультуры і спорту генерыруе БД «Беларускія алімпійцы», “Параалімпійцы”, крыніцамі папаўнення іх з'яўляюцца розныя даведачныя выданні, інтэрв’ю са спартсменамі. АУНБ генерыруюць БД, якія адлюстроўваюць звесткі ў маштабах рэгіёна, – «Хроніка культурных падзей вобласці» і інш.

Ключавым пытаннем методыкі стварэння фактаграфічных картатэк і БД з'яўляецца распрацоўка тыпавых макетаў апісання аб'ектаў, якія даюць дастаткова поўную і шматаспектную іх характарыстыку. Так, калі ствараецца арганізацыйна-фірменная картатэка, а гэта на сёння адна з самых распаўсюджаных фактаграфічных картатэк і БД, то макет апісання можа ўключаць наступныя звесткі: назву арганізацыі; адрасныя даныя; наяўнасць філіялаў; тып арганізацыі і форму ўласнасці; звесткі аб першых асобах; асноўныя кірункі дзейнасці; прадукцыю, паслугі і ўмовы іх прадастаўлення; рэйтынг арганізацыі; членства ў міжнародных прафесійных аб'яднаннях; адлюстраванне дзейнасці арганізацыі ў друку; выданні самой арганізацыі.

Асноўныя характарыстыкі картатэк і БД замацоўваюцца ў пашпартах, дзе ўказваюцца: назва картатэкі (БД); яе тэматыка; год стварэння картатэкі (БД); крыніцы камплектавання; храналагічны ахоп, яе аб'ём, штогадовы прырост; аператыўнасць уключэння новых звестак (актуалізацыя даных); віды адлюстроўваемых дакументаў; спосаб бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў; арганізацыя матэрыялаў у межах картатэкі і раздзелаў; выкарыстоўваемая ІПМ; дапаможны апарат; прозвішча адказнага за вядзенне картатэкі (БД).

Да нядаўняга часу пашпарты картатэк з'яўляліся ўнутранай дакументацыяй бібліятэкі. Нягледзячы на тое, што распрацоўваліся уніфікаваныя формы, паўната і парадак адлюстравання звестак залежалі ад прафесійных якасцей бібліёграфаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказных за вядзенне картатэк. Сітуацыя змянілася, калі бібліятэкі пачалі генерыраваць бібліяграфічныя і фактаграфічныя БД, прызначаныя для знешняга карыстання (абмену, продажу, размяшчэнню ў інтэрнеце). Спатрэбілася выкарыстанне уніфікаваных формаў характарыстыкі гэтай прадукцыі, абавязковых для апісання БД, ствараемых любымі ўстановамі і прэтэндуючых на адлюстраванне ў розных каталогах і паказальніках БД. Схема характарыстыкі замацавана ў ГОСТ 7.70 – 96 «Описание баз данных и машиночитаемых информационных массивов. Термины и определения».

### *4.3. Пошукавыя сістэмы ў інтэрнеце*

Для задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэкі выкарыстоўваюць разнастайныя крыніцы інфармацыі, сярод якіх усё большае месца займаюць рэсурсы інтэрнета.

З мэтай дапамогі ў пошуку інфармацыі быў прапанаваны новы дапаможны сервіс – “пошукавыя сістэмы” (іх яшчэ называюць пошукавыя сродкі, web-індэксы або машыны web-пошуку). Аналагічна традыцыйнаму бібліятэчна-інфармацыйнаму пошуку, які прадугледжвае наяўнасць каталогаў і веданне методыкі пошуку па бібліятэчна-бібліяграфічных класіфікацыях або прадметных рубрыках, пошукавыя сістэмы інтэрнета даюць магчымасць для знаходжання самых розных звестак у WWW. Таму для бібліёграфаў, бібліятэкараў вельмі важным з’яўляецца не толькі веданне традыцыйных каталогаў і картатэк як крыніц пошуку інфармацыі, але і веданне онлайнавых інфармацыйных рэсурсаў існуючых пошукавых сістэм, іх асаблівасцей, методыкі выкарыстання.

Умоўна інструменты пошуку ў інтэрнеце дзеляцца на каталогі інтэрнет-рэсурсаў; пошукавыя сістэмы (ПС); метапошукавыя сістэмы; парталы. Паміж сабой яны адрозніваюцца наборам функцый, тэхналогіяй работы, сэрвіснымі магчымасцямі.

*Каталогі інтэрнет-рэсурсаў*. Каталогі інтэрнет-рэсурсаў (можна сустрэць і такія іх назвы, як пошукавыя сродкі даведачнага тыпу directories або электронныя даведнікі) па сваёй пабудове аналагічныя сістэматычным каталогам бібліятэк. Яны маюць іерархічную структуру, верхні ўзровень якой утвараюць 10–15 самых агульных прадметных або тэматычных катэгорый. Гэтыя катэгорыі падзяляюцца на рубрыкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ў сваю чаргу могуць мець яшчэ больш дробнае дзяленне. Галоўнае адрозненне каталогаў ад ПС заключаецца ў тым, як яны фарміруюць свае ўласныя інфармацыйныя масівы. Стварэнне БД ПС поўнасцю аўтаматызавана і ажыццяўляецца пры дапамозе праграмы-робата, які працуе па заданых алгарытмах. Напаўненне каталогаў інтэрнет-рэсурсаў ажыццяўляецца ўручную. Над гэтым працуюць калектывы вопытных рэдактараў і праграмістаў, у абавязкі якіх уваходзяць анатаванне матэрыялаў, а таксама рэдагаванне і падтрыманне каталога ў актуальным стане. Ручная апрацоўка інфармацыі значна абмяжоўвае аб'ём каталогаў, але і значна павышае эфектыўнасць пошуку, зводзіць да мінімуму колькасць дакументаў, якія не маюць адносін да тэмы запыту. Па аб'ёме праіндэксаваных дакументаў каталогі інтэрнет-рэсурсаў значна ўступаюць ПС.

Нягледзячы на тое, што над стварэннем каталогаў інтэрнет-рэсурсаў працуюць калектывы бібліятэкараў-прафесіяналаў, схемы іерархічнай класіфікацыі гэтых каталогаў разлічаны, як правіла, на запыты сярэднестатыстычнага карыстальніка сеткі інтэрнет. Гэтыя схемы маюць лёгкую для ўспрымання структуру (асабліва катэгорыі першага ўзроўню) і грунтуюцца на спрошчаных версіях бібліятэчных класіфікацый або будуюцца эмпірычным, вопытным шляхам, па магчымасці імкнучыся ахапіць у самым агульным выглядзе ўсе сферы чалавечай дзейнасці (адукацыя, мастацтва, бізнес, сям'я і інш.).

Працуючы з каталогам інтэрнет-рэсурсаў, карыстальнік мае магчымасць не толькі паслядоўна праглядаць змест раздзелаў і рубрык у пошуку патрэбных яму дакументаў, але і ажыццяўляць яго па ключавых словах. Практычна ўсе буйныя каталогі падтрымліваюць убудаваныя пошукавыя сістэмы, якія даюць магчымасць выкарыстання пошукавых лагічных аператараў і пошук па фразе.

Многія каталогі інтэрнет-рэсурсаў інтэграваны з буйнымі пошукавымі сістэмамі. Калі рэлевантныя запыту дакументы не знаходзяцца ў каталогу, то пошук аўтаматычна пераадрасуецца ў базу ПС.

Сярод найбольш вядомых каталогаў сусветнага маштабу выдзяляюцца Yahoo! (http://www.yahoo.com), LookSmart (http://www.looksmart.com), NBCi (http://www.nbci.com), Open

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Directory Project (http: // dmoz. org), Magellan (http: // www / mckinley. com), Galaxy (http: // galaxy. einet. net).

Рэгулярная работа па пошуку інфармацыі ў сетках патрабуе ведання асаблівасцей пошукавых сродкаў і выбару групы пошукавых машын для пастаяннага карыстання. Не ставячы задачу характарыстыкі ўсіх пошукавых сістэм, каталогаў інтэрнет-рэсурсаў, паспрабуем на прыкладзе найбольш аўтарытэтных разгледзець асаблівасці розных сродкаў пошуку сеткавай інфармацыі.

Каталог інтэрнет-рэсурсаў Yahoo! з'яўляецца старэйшым і найбольш вядомым каталогам. Ён быў створаны ў 1994 г. і да цяперашняга часу займае першае месца па колькасці наведванняў. Аб'ём яго БД складае больш за 1,8 млн. праіндэксаваных дакументаў. Іерархічная структура Yahoo! грунтуецца на скарочанай версіі спіса прадметных рубрык Бібліятэкі Кангрэса ЗША і налічвае больш за 100 000 катэгорый. Работа над каталогам вядзецца калектывам вопытных рэдактараў, многія з якіх маюць прафесійную бібліятэчную падрыхтоўку. У штаце лічацца больш за 100 рэдактараў. Акрамя таго, каталог пастаянна папаўняецца спасылкамі, якія дасылаюць радавыя карыстальнікі сеткі інтэрнет.

Каталог з'яўляецца незаменным інструментам для першапачатковага азнаямлення з інфармацыйным напаўненнем тых ці іншых галін ведаў. Пры загрузцы на экран выводзіцца іх агульны пералік: мастацтва, адукацыя, бізнес, прыродазнаўчыя навукі, сацыяльныя навукі і інш. Наведваючы любы раздзел, карыстальнік бачыць яго дробную дэталізацыю аж да канкрэтных установоў або асоб. Іерархічная структура каталога дае магчымасць крок за крокам прагледзець прадметныя вобласці, якія цікавяць карыстальніка. На кожнай ступеньцы іерархіі пасля назваў раздзелаў у дужках указваецца колькасць адлюстраваных у ім рэсурсаў. Yahoo! дазваляе весці пошук і па ключавых словах. У пошукавы радок могуць быць уведзены ключавыя словы, у адказ на іх будуць выданы звесткі аб тым, у якім з раздзелаў каталога адлюстравана дадзеная інфармацыя. Як і іншыя пошукавыя сістэмы, Yahoo! выдае на запыт назвы і анатацыі web-старонак. Пераважна ў каталогу раскрываюцца амерыканскія рэсурсы, еўрапейскія адлюстраваны ў меншай ступені.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод расійскіх каталогаў, якія арыентаваны ў асноўным на апісанне інфармацыйных рэсурсаў расійскіх сервераў, можна назваць List.ru (http: // www. list. ru), “Ау” (http: // www. au. ru), «Созвездие интернет» (http: // www. stars. ru).

Сярод беларускіх каталогаў можна назваць Белрэсурс (http: // belresource. com. by), “Белорусский рейтинг” (http: // br. by).

Каталог “Беларускія рэсурсы” адлюстроўвае як беларускія, так і расійскія рэсурсы. Рэсурсы ў каталогу падзелены на катэгорыі і падкатэгорыі. Кожная падкатэгорыя ўяўляе мінірэйтынг па адпаведнай тэматыцы. Пры выдачы адказу на запыт спачатку прыводзяцца рэсурсы, якія маюць максімальную колькасць наведванняў за гэты дзень. Прыярытэты вываду вынікаў пошуку наступныя: хосты за сёння, хіты за сёння і ў апошнюю чаргу хіты за ўвесь перыяд. Катэгорыі і падкатэгорыі могуць мець спасылкі і перакрыжоўвацца, як гэта зроблена ў каталогу Yahoo! Усе спасылкі-падкатэгорыі, як і ў каталогу Yahoo!, маюць у сваім імені знак@.Рэсурс можа мець неабмежаваную колькасць спасылак у некалькіх падкатэгорыях, калі гэты рэсурс адносіцца да адпаведных падкатэгорый. За гэтым пільна сочаць адміністратары каталога. Па кожнай катэгорыі і падкатэгорыі ў каталогу прыводзіцца колькасць адлюстраваных сайтаў і старонак web-рэсурсаў. Белрэсурс мае поўную падтрымку англійскай мовы і дае апісанне на англійскай, рускай і беларускай мовах. Магчымасць пашыранага пошуку па каталогу адсутнічае.

Сучасныя тэндэнцыі развіцця каталогаў інтэрнет-рэсурсаў характарызуюцца нарошчваннем дадатковага сэрвісу і розных інтэрактыўных службаў. Карыстальнікі атрымліваюць магчымасць непасрэдных зносін з рэдактарамі, экспертамі і іншымі спецыялістамі па інфармацыйным пошуку. Гэты працэс ажыццяўляецца як у рэжыме рэальнага часу з выкарыстаннем дыялогавых формаў, так і ў выглядзе запытаў па электроннай пошце.

Даследаванні, праведзеныя службай New Media Services, паказалі, што палова карыстальнікаў складаюць запыты з некалькіх ключавых слоў, толькі 19% могуць перафармуляваць запыт у залежнасці ад атрыманых вынікаў. Даволі рэдка выкарыстоўваюцца пашыраныя пошукавыя інтэрфейсы. Гэта значыць, што радавы карыстальнік аддае перавагу каталогам інтэрнет-рэсурсаў. Але ж прафесіяналам-бібліёграфам трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памятаць, што асноўнае прызначэнне каталогаў заключаецца ў першапачатковым азнаямленні з рэсурсамі глабальных сетак па пэўнай галіне ведаў. Ажыццяўляць жа пошук па вузкай тэматыцы (менавіта такая задача стаіць перад бібліёграфамі ў 90 % выпадкаў) неабходна шляхам звароту да пошукавых сістэм.

*Пошукавыя сістэмы*. Пошукавая сістэма ў інтэрнеце – спецыяльны web-сайт, на якім карыстальнік па заданым запыце можа атрымаць спасылкі на сайты, што адпавядаюць гэтаму запыту.

Асноўная функцыя пошукавых сістэм заключаецца ў бесперапынным сканіраванні прасторы WWW з дапамогай спецыяльных праграм-робатаў, якія заносяць звесткі аб знойдзеных дакументах, словах з указаннем спасылак (індэксаў, адрасоў) у базу ПС і забяспечваюць аналіз і выбар даных, што апісваюць змест дакумента, па запыту карыстальніка.

Пошукавыя сістэмы па ахопу індэксуемых дакументаў дзеляцца на глабальныя, якія пры індэксаванні дакументаў не абмяжоўваюцца змястоўнымі або тэрытарыяльнымі межамі; рэгіянальныя, якія ажыццяўляюць фільтрацыю дакументаў па дамену верхняга ўзроўню, напрыклад, DE – Германія, RU і SU – Расія, UK – Вялікабрытанія, BY – Беларусь і г.д.; лакальныя, якія індэксуюць дакументы ў межах пэўнай лакальнай сеткі. Спецыялізацыя пошукавых сістэм можа ажыццяўляцца па змесце індэксуемых дакументаў, па адборы розных тыпаў файлаў.

У сувязі з тым, што пошукавых сістэм, якія можна аднесці толькі да універсальных, налічваецца больш сотні, паўстае пытанне выбару ПС. Асноўнымі крытэрамі пры адборы ПС можна назваць наступныя: аб’ём базы ПС; хуткасць аднаўлення базы; прынцыпы індэксавання дакументаў і магчымасць састаўлення розных варыянтаў запыту (пошукавыя функцыі); надзейнасць і якасць прадастаўлення інфармацыі.

Аб’ём з’яўляецца важнейшай характарыстыкай ПС. Ён вымяраецца колькасцю праіндэксаваных у базе html-дакументаў. Для глабальнага пошуку інфармацыі лепш выкарыстоўваць ПС, якія маюць аб’ём не менш за 100 млн. web-старонак. Самыя магутныя цяпер ПС – Google, FastSearch, iWon, Northern light. Яны прадастаўляюць доступ сваім карыстальнікам да цэлай сукупнасці БД і іншых інфармацыйных масіваў як уласнай генерацыі, так і БД, што належаць іншым ПС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйная прастора WWW характарызуецца высокай ступенню дынамічнасці. Гэта азначае не толькі бесперапыннае паступленне новых дакументаў, але і знікненне існуючых. Таму сярод асноўных задач ПС – своечасовая індэксацыя новых рэсурсаў і выдаленне з базы “мёртвых спасылак”. Як правіла, чым “маладзейшая” ПС, тым больш у ёй праіндэксавана дакументаў, якія з’явіліся за апошні час, і менш непрацуючых спасылак, хаця і не першы год існуючыя ў сетцы ПС таксама актыўна працуюць над падтрыманнем сваёй базы ў актуальным стане.

Хуткасць аднаўлення базы залежыць ад частаты, з якой праграма–робат можа зноў вярнуцца да web-сайта. Гэтая частата вымяраецца ў межах ад аднаго дня да некалькіх месяцаў. Пры гэтым старонкі з больш высокай ступенню наведвання (трафікам) абследуюцца праграмай часцей. Важнымі для характарыстыкі ПС з’яўляюцца прынцыпы індэксавання. Мяркуецца, што універсальныя пошукавыя сістэмы павінны індэксаваць дакументы незалежна ад іх геаграфічнай прыналежнасці і мовы. На самай справе праграмныя сродкі той ці іншай ПС маюць сваю спецыфіку. Пры адборы дакументаў у базу ПС выкарыстоўваюцца дадатковыя крытэрыі, звесткі аб якіх не заўсёды даступныя. Тым не менш практыка паказвае, што пошукавыя сістэмы, створаныя, напрыклад, у ЗША, арыентуюцца пераважна на англамоўныя web-старонкі. Дакументы на еўрапейскіх і іншых мовах свету прадстаўлены ў іх у меншай ступені. Адна з буйнейшых пошукавых сістэм FastSearch, створаная нарвежскай кампаніяй, імкнецца, наадварот, да еўрапейскай прасторы WWW. Старэйшая пошукавая сістэма Alta Vista паспяхова знаходзіць дакументы на кірыліцы, аднак яе магчымасці не могуць параўнацца з магчымасцямі буйных расійскіх пошукавых сістэм (Апорт, Яндекс, Рамблер), якія ажыццяўляюць індэксаванне рускамоўнай вобласці прасторы WWW.

Акрамя таго, пошукавыя сістэмы могуць адрозніваццa па глыбіні індэксавання: гэта значыць могуць індэксаваць усе старонкі web-сайта або толькі тыя, што адносяцца да першых узроўняў (дамашняя старонка). Большасць ПС індэксуюць ад 50 да 100 старонак з аднаго сайта. Буйнейшыя глабальныя ПС універсальнага зместу ажыццяўляюць вычарпальнае індэксаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнай з’яўляецца і такая характарыстыка, як карэктнасць сістэмы па значнасці паняццяў і вызначэнні іх адпаведнасці (рэлевантнасці) паступіўшаму запыту. Не апошнюю ролю адыгрываюць прастата і інфарматыўнасць інтэрфейса, магчымасць выкарыстоўваць булевыя аператары і аператары адлегласці, а таксама наяўнасць дадатковых сэрвісных функцый.

Статыстычныя даследаванні магчымасцей самых магутных пошукавых сістэм паказваюць: нягледзячы на тое, што кожная ПС выкарыстоўвае свае алгарытмы індэксавання web-старонак, змест іх БД часта дубліруецца. Па розных ацэнках колькасць дубліравання інфармацыі складае ад 5 да 30 %. Рэальная паўната ахопу рэсурсаў WWW асобнай пошукавай сістэмы не перавышае 30 %. Таму спажыўцам пры пошуку інфармацыі неабходна выкарыстоўваць як мінімум 2–3 пошукавыя сістэмы, выбраныя па розных крытэрыях.

Доступ да БД універсальных пошукавых сістэм свабодны. Карыстальнік фармулюе запыт у межах адпаведнага пошукавага інтэрфейса і атрымлівае вынік у выглядзе спіса спасылак на html-дакументы, якія адпавядаюць крытэрыям запыту.

Сярод замежных ПС, якія найбольш прызнаны ў свеце і дазваляюць выяўляць інфармацыю з высокай ступенню паўнаты і надзейнасці, наступныя: Alta Vista, HotBot, Google, iWon, InfoSeek, Lycos, FastSearch і інш.

*Alta Vista* (http://www.altavista.com) належыць да ліку самых папулярных пошукавых сродкаў. Яна была адкрыта ў снежні 1995 г., займае адно з першых месцаў па аб’ёме праіндэксаваных html-дакументаў (больш за 350 млн.) і дазваляе ажыццяўляць пошук па любому слову з тэксту web-старонкі або артыкула ў тэлеканферэнцыі. Гэта адна з нямногіх сістэм, якая працягвае паўнатэкставую апрацоўку ўсёй сеткі інтэрнета.

Alta Vista дазваляе ажыццяўляць просты і пашыраны пошук. У ёй выкарыстоўваецца самы вялікі і, мабыць, самы складаны механізм састаўлення запыту, які ўключае камбінацыі асобных слоў, словазлучэнняў і знакаў пунктуацыі (коску, кропку з коскай, двукроп’е, дужкі, плюс і мінус), а таксама булевыя аператары і шаблоны. Іх спалучэнне дазваляе максімальна дакладна скласці пошукавае прадпісанне, ажыццяўляць пошук у тым ліку і па ключавых словах на рус-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кай мове. Ключавыя словы запыту выдзяляюцца ў адказе тлустым шрыфтам. Усе старонкі інтэрфейса карыстальніка маюць спасылку на спецыяльны раздзел “Help” (дапамога), што дазваляе нават непадрыхтаванаму карыстальніку правільна складаць простыя і складаныя запыты. Камфортнасць для карыстальніка звязана і з такімі сэрвіснымі магчымасцямі сістэмы, як прадастаўленне ім уводу запыту ў выглядзе звычайнай англійскай фразы. Маецца магчымасць абмежаваць пошук асобнымі фрагментамі web-старонкі – загалоўкам, электронным адрасам, асноўным тэкстам; праводзіць пошук матэрыялаў толькі на пэўнай мове; захоўваць вынікі пошуку ў выглядзе закладак. Пры вывядзенні вынікаў прапануецца карыстацца сістэмай камп’ютэрнага перакладу атрыманага дакумента з асноўных еўрапейскіх моў. Недахопамі сістэмы, на думку экспертаў, з’яўляюцца абмежаваныя магчымасці сарціроўкі вынікаў пошуку (сістэма не ажыццяўляе сарціроўку атрыманых адрасоў) і недастаткова дакладная апрацоўка запытаў, уведзеных малымі і вялікімі літарамі. Пры выкарыстанні вялікіх літар пошук будзе весціся толькі тых тэрмінаў, якія пачынаюцца або складаюцца з вялікіх літар.

Адной з найбольш карысных англамоўных ПС з’яўляецца Google (http://www.google.com), якая была адкрыта ў верасні 1999 г., але на сучасны момант ахоплівае найбольшую колькасць рэсурсаў. Адметнай яе асаблівасцю з’яўляецца тэхналогія вызначэння ступені рэлевантнасці дакумента шляхам аналізу спасылак іншых крыніц на дадзены рэсурс. Гэтая тэхналогія называецца PageRankTM. Чым больш спасылак на якую-небудзь web-старонку маецца на іншых старонках, тым вышэйшы яе рэйтынг у базе Google. Пры выдачы вынікаў пошуку ў пачатку спіса аказваюцца старонкі з больш высокім рэйтынгам.

Асаблівасцю расійскіх пошукавых сістэм з’яўляецца іх арыентацыя на выяўленне і індэксаванне дакументаў на рускай мове. Да лідзіруючай групы пошукавых сістэм адносяцца сістэмы Апорт, Рамблер, Яндекс.

*Апорт* (http://www.aport.ru) уваходзіць у лік вядучых ПС. Аб’ём яе базы складае больш за 20 млн. праіндэксаваных дакументаў. Сістэма валодае шырокім спектрам пошукавых магчымасцей. Яна дазваляе ажыццяўляць просты і пашыраны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукі і з'яўляецца адзінай ПС з інтэграваным каталогам інтэрнет-рэсурсаў. Апорт валодае функцыяй убудаванага перакладчыка, што дае магчымасць карыстальніку фармуляваць запыты як на рускай, так і на англійскай мовах. У дадзены момант Апорт уяўляе сабой партал, які аб'ядноўвае пошукавую сістэму, каталог інтэрнет-рэсурсаў @Rus, а таксама шэраг бясплатных паслуг і інфармацыйных праектаў.

Доступ да пошукавай сістэмы *Рамблер* (http: // www. rambler. ru) быў адкрыты ў 1996 г. Гэта адна з першых расійскіх ПС, якая да цяперашняга часу захоўвае свае пазіцыі лідэра і актыўна развіваецца, прадастаўляючы карыстальнікам новыя інфармацыйныя паслугі. У базе ПС Rambler праіндэксавана больш за 12 млн. дакументаў, размешчаных на серверах Расіі і краін СНД. Колькасць праіндэксаваных старонак штодзённа павялічваецца. Сістэма мае дружалюбны інтэрфейс, дазваляе лёгка складаць пошукавае прадпісанне з дапамогай выкарыстання лагічных аператараў і шаблонаў. Знойдзеныя дакументы сартуюцца па ступені рэлевантнасці. Кожная старонка можа змяшчаць ад 15 да 50 спасылак на знойдзеныя дакументы. Поўны фармат выдачы вынікаў пошуку складаецца з наступных элементаў: URL-адрас сайта, загаловак дакумента, вытрымка з тэксту з выдзеленымі тлустым шрыфтам ключавымі словамі, датай стварэння або апошняга аднаўлення дакумента, размер у кілабайтах, указанне на від кадзіроўкі і спасылка “Найти похожие” для пошуку дакументаў, найбольш рэлевантных дадзенаму. Акрамя таго, указваюцца звесткі аб тым, колькі ўсяго знойдзеных дакументаў змяшчаецца на дадзеным сайце, даюцца спасылкі на першыя тры з іх і спіс астатніх дакументаў.

Доступ да ПС *Яндэкс* ((http://www.yandex.ru) быў адкрыты ў 1997 г. Яндэкс індэксуе разам з расійскімі даменамі замежныя рускамоўныя web-вузлы. Пошук ажыццяўляецца не толькі па web-старонках, але і па спецыялізаваных масівах даных, сярод якіх навіны вядучых інфармацыйных агенцтваў, тавары інтэрнет-магазінаў, рэсурсы WAP-сервераў, а таксама каталог інтэрнет-рэсурсаў List.ru. ПС падтрымлівае ўласны каталог інтернет-рэсурсаў, які фарміруецца на падставе індэкса цытавання Yandex a CY (CY – Citation Yndex). Індэкс цытавання якой-небудзь web-старонкі вымяраецца колькасцю іншых старонак, якія змяшчаюць спасылкі на гэтую старонку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такі метад ацэнкі рэсурсаў прынцыпова адрозніваецца ад простага ўліку колькасці наведванняў старонкі. ПС мае просты і пашыраны пошукавыя інтэрфейсы, а таксама старонку настройкі фармату выдачы вынікаў пошуку, выкарыстоўвае ўласную сістэму азначэнняў лагічных аператараў, а таксама падтрымлівае вялікую колькасць пошукавых функцый, якія дазваляюць складаць запыты рознай ступені складанасці.

Сярод беларускіх пошукавых сістэм можна назваць open.by (http: // www. open. by), akavita.com.by (http: // www. akavita. com. by), poisk.com ((http: // poisk. com) і інш.

Пошукавая сістэма *open.by* спецыяльна прызначана для пошуку інфармацыі ў беларускіх рэсурсах сеткі інтэрнет. У ёй сабраны ўсе беларускія інтэрнет-рэсурсы з by-даменамі і большая частка з не by-даменамі, можа ажыццяўляцца просты і пашыраны пошук інфармацыі. Просты пошук можа ажыццяўляцца па каталогу або па ключавых словах з выкарыстаннем лагічных аператараў. Сістэма каталога open.by пабудавана па прынцыпе знакамітага каталога Yahoo! Асноўныя раздзелы каталога: “Інтэрнет”, “Вытворчасць. Фінансы. Тавары. Паслугі”, “Палітыка. Грамадства. Права” і інш. Выбраўшы раздзел, які цікавіць карыстальніка, можна адразу атрымаць доступ да рэсурсаў, якія ён змяшчае. Пашыраны пошук прадугледжвае магчымасці пошуку па ключавых словах у беларускай частцы інтэрнета па назвах web-сервераў і старонак, па загалоўках, тэкставай частцы дакумента і па ўсіх магчымых абласцях пошуку. У прасцейшым выпадку запыт можа складацца з аднаго або некалькіх слоў, раздзеленых прабеламі. У такім выпадку будуць знойдзены ўсе дакументы, у якіх прысутнічаюць усе словы запыту. Прадугледжана магчымасць пошуку з выкарыстаннем сімвалаў, якія абазначаюць замену аднаго “?” або любой колькасці любых сімвалаў “*”. Пошукавая машына дае магчымасць пры састаўленні складанага запыту выкарыстоўваць лагічныя аператары.

Пры пашыраным пошуку можна задаць крытэрыі вываду машынай вынікаў пошуку і іх прагляду. Машына можа паказаць вынікі пошуку, ажыццявіць сартаванне па даце, прадставіць вынікі пошуку ў кароткай і дэталёвай (поўнай) форме, можа выдаць вынікі пошуку на старонцы ў колькасці, якую закажа карыстальнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыяльная сістэма рэйтынгаў забяспечвае першачарговы паказ найбольш папулярных і наведваемых сервераў. Інфармацыя пошукавай сістэмай аднаўляецца штодзённа. Сістэма рэйтынгаў open.by забяспечвае першачарговы паказ найбольш папулярных і наведваемых сервераў, што дазваляе ў першую чаргу звярнуцца да інфармацыі, якая карыстаецца найбольшым попытам у іншых карыстальнікаў сеткі. У сістэме працуюць наступныя рэйтынгі: "Сённяшні", "Учарашні", "Сярэдні за тыдзень", "Сярэдні за месяц", "Усяго". Калі звярнуцца з галоўнай старонкі пошукавай сістэмы open.by да рубрыкі "Статыстыка", можна прагледзець яе вынікі: колькасць зарэгістраваных ПС рэсурсаў; колькасць файлаў, па якіх машына вядзе пошук; колькасць паступіўшых запытаў на пошук сёння, учора; прагледзець 20 апошніх запытаў, 20 самых папулярных раздзелаў (катэгорый) каталога і колькасць запытаў па ім; новыя зарэгістраваныя рэсурсы за 30 дзён.

Развіваюцца таксама і рэгіянальныя пошукавыя сістэмы, якія адлюстроўваюць сеткавыя рэсурсы пэўнага рэгіёна. Сярод іх – Магілёўская павуціна (http: // www. paukan.pp.ru / mogilevweb), якая дазваляе весці пошук па рэсурсах горада Магілёва і Магілёўскай вобласці; каталог рэсурсаў Гомельскай вобласці ((http: // www.catalog.gomel.by) і інш.

Спецыялізаваныя каталогі інтэрнет-рэсурсаў адлюстроўваюць галіновыя сеткавыя рэсурсы: каталог медыцынскіх рэсурсаў (http://www.belmednet.com), каталог творчых рэсурсаў ART NET (http://www.art-net.by.ru), каталог каталіцкіх сайтаў Беларусі і навіны каталіцкага байнета (http: // www. catholic. by), інтэрнет-каталог прамысловых прадпрыемстваў Беларусі (http // www. belprom. com). Асобныя віды рэсурсаў – каталог рэсурсаў электроннай прэсы Беларусі (http // press. net. by), каталог камерцыйных праектаў РБ (http: // kprb. da.ru) і інш.

Можна зрабіць вывад, што беларускія пошукавыя сістэмы вельмі падобныя па зместу і функцыянальнасці, а адпаведна і па методыцы пошуку па іх. Розніца заключаецца толькі ў якасці пошуку, гэта значыць у колькасці прагледжаных у ходзе пошуку старонак і ў стабільнасці работы. Бясспрэчным лідэрам з'яўляецца рэсурс open.by, мабыць, за кошт таго, што ён створаны на базе аднаго з буйнейшых у краіне інтэрнэт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правайдэраў “Адкрыты кантакт”. Рэсурс стабільны ў працы, гэта значыць вельмі рэдка бывае недаступным, забяспечвае добрую якасць пошуку па беларускіх рэсурсах.

*Метапошукавыя сістэмы* ўяўляюць сабой асобы від ПС. Яны не маюць уласнай базы праіндэксаваных дакументаў і базіруюцца на інфармацыйных масівах іншых пошукавых сістэм і каталогаў інтэрнет-рэсурсаў. Да іх ліку адносяцца ПС MetaCrawler (http://www.metacrawler.com), Cyber 411 (http: // www. Cyber 411. com), DogPile (http: // www. dogpile. com), MetaFind (http: // www. metafind. com), SavvySearch (http: // www. savvysearch.com), Inference Find (http: // www. infind. com). Іх галоўная вартасць заключаецца ва ўменні рассылаць уводзімыя ў іх запыты па іншых сістэмах, а затым суміраваць вынікі. Такім чынам, карыстальнік пасля ўводу пошукавага прадпісання ў MetaCrawler фактычна аднačасова звяртаецца да больш чым дзесяці розных пошукавых сістэм. Набор пошукавых сістэм у кожнай метапошукавай сістэме розны.

Такія асаблівасці выкарыстання метапошукавых сістэм даюць магчымасць карыстальнікам эканоміць час і пазбаўляюць неабходнасці вывучаць сінтаксіс ІПМ розных ПС. Але ж яны маюць і шэраг істотных недахопаў у працы. Па-першае, трэба адзначыць абмежаваную колькасць вынікаў, якая можа быць атрымана па запыту ад кожнага выкарыстоўваемага інфармацыйнага масіву. Па-другое, спрошчаныя пошукавыя функцыі метапошукавых сістэм не дазваляюць фармуляваць запыты такой складанасці, якой можна было б дасягнуць, звяртаючыся да канкрэтнай ПС. Па-трэцяе, абмежаванне па часе апрацоўкі запыту часта прыводзіць да таго, што не ўсе выкарыстоўваемыя ПС паспяваюць адказаць на запыт. Гэта істотна адбіваецца на паўнаце вынікаў пошуку.

Метапошукавыя сістэмы мэтазгодна выкарыстоўваць у тых выпадках, напрыклад, калі пошук па каталогу інтэрнет-рэсурсаў дае адмоўны вынік, а тэматыка запыту дастаткова шырокая і патрабуе дадатковай фільтрацыі дакументаў, знойдзеных асобнай ПС. Алгарытмы працы метапошукавых сістэм дазваляюць атрымаць ад кожнай ПС ад 10 да 50 найбольш рэлевантных запыту дакументаў, ліквідаваць дубліруючыя спасылкі і выдаць карыстальніку адсартаваны такім чынам спіс дакументаў.

*Парталы*. Новым узроўнем падачы інфармацыі ў асяроддзі WWW з’яўляюцца парталы. Тэрмінам “партал” абазначаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шматфункцыянальны сервер, які прадастаўляе карыстальніку разнастайныя пошукавыя і інфармацыйныя магчымасці. Папярэднікамі парталаў былі буйныя, добра структураваныя web-сайты або цэлыя групы сайтаў, якія аб'ядноўваліся адным адрасам, агульнымі элементамі дызайну і структуры; адрозніваліся высокай наведвальнасцю і пастаянна пашыралі дыяпазон інфармацыйных і камунікатыўных паслуг.

Тэндэнцыя пераўтварэння ў парталы ахоплівае пераважную большасць пошукавых сістэм, якія мы разглядалі вышэй. Яны актыўна інтэгруюцца з каталогамі інтэрнет-рэсурсаў, спецыялізаванымі БД, якія збіраюць мультымедыйную інфармацыю, прапаноўваюць карыстальнікам доступ да навін, даведнікаў, інтэрнет-магазінаў, развіваюць камунікатыўныя сэрвісныя паслугі (бясплатныя паштовыя скрынкі, магчымасць зносін у рэжыме рэальнага часу, дыялогавыя службы з далучэннем экспертаў па інфармацыйным пошуку і інш.).

Спецыялісты адзначаюць, што каля 30% запытаў, з якімі звяртаюцца карыстальнікі да ПС, з'яўляюцца фактаграфічнымі (навіны, надвор'е, праграмы тэлеперадач, звесткі аб людзях, падзеях), таму стваральнікі парталаў імкнуцца інтэграваць у іх структуру онлайнавыя даведачныя выданні.

Прыкладамі функцыянавання такіх парталаў з'яўляюцца Rambler і Апорт, створаныя на падставе пошукавых сістэм. Інтэрнет-холдзінг Rambler аб'ядноўвае пошукавую сістэму, рэйтынг-класіфікатар Rambler:s Top100, а таксама шэраг бясплатных паслуг і інфармацыйных праектаў: праект Rambler – Навука, які прадугледжвае, што размешчаная на сайце навукова-адукацыйная інфармацыя ў выглядзе тэкстаў кніг, анонсаў канферэнцый, біяграфій вучоных, дыпломных работ, дысертацый, курсаў лекцый, навуковых аглядных і папулярных артыкулаў, падрыхтаваных спецыялістамі МДУ імя М.В.Ламаносава, будзе садзейнічаць міжпрадметнаму навуковаму абмену, навучанню і папулярызацыі ведаў; такі ж змест і мэту – стварэнне вучэбна-навуковай ІПС на базе выкарыстання web-тэхналогій – мае праект дадзенай ПС – "Nature"; праект "Интерактивные карты" разлічаны на прадастаўленне паслуг інтэрактыўнага картаграфічнага сэрвісу; праект " Словари" прапануе карыстальнікам доступ да слоўнікаў выдавецтва "Русский язык".

У якасці спецыялізаваных гарызантальных парталаў выступаюць даведачныя парталы "Britannica", «Кирилл и Ме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фодий», галіновыя замежныя парталы ADAM (мастацтва і музеязнаўства), SOSIG (грамадскія навукі), EEVL (тэхнічныя навукі) і шмат інш.

Першы беларускі партал і каталог – Дзед Талаш (http: // dt. home. by) са штодзённым аднаўленнем і падачай інфармацыі на беларускай мове, хаця прадастаўляемы аб’ём матэрыялу значна саступае іншым пошукавым сістэмам, дазваляе ажыццяўляць просты пошук.

Пошукавая сістэма zubr.com уяўляе сабой “Рэгістр беларускіх www-рэсурсаў”, а таксама прадастаўляе навіны эканомікі, палітыкі, культуры, спорту і інш., з'яўляючыся шматфункцыянальным парталам. Пошукавая сістэма прапануе рад іншых магчымасцей: атрыманне фактаграфічнай інфармацыі па такіх кірунках, як “Работа”, “Адпачынак у Беларусі”, “Знаёмства”, “Рэклама”, “Навіны” і інш. Падавацца інфармацыя можа ў іншамоўных версіях: рускай, англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай. Структура пошукавай сістэмы абсалютна ідэнтычная структуры open.by. Яна таксама прапануе пошук па каталогу і аўтаматычны пошук па ключавых словах.

Беларускі партал tut.by (http: // tut. by) уключае каталог, які змяшчае ўручную адабраныя і індывідуальна апісаныя рэсурсы, дабаўляюцца ўсе сайты, якія адносяцца да беларускага інтэрнета. Пошук па каталогу можа весціся ў рэжыме простага і пашыранага пошуку аналагічна пошукавай сістэме open.by.

Спіс навігацыйных сістэм далёка не вычэрпваецца разгледжанымі прыкладамі. Карыстальнікі internet Explorer могуць звярнуцца да іх пераліку, выбраўшы ў меню браўзера паслядоўна Directory і Search Internet. Разам з развіццём універсальных пошукавых сродкаў, якія мы разглядалі, пачынаюць ствараецца пошукавыя сродкі галіновай накіраванасці, тэрытарыяльнай, моўнай абмежаванасці. Некаторыя з іх пераходзяць у лік платных.

Трэба таксама ўлічваць, што ажыццяўляецца пастаяннае ўдасканаленне пошукавых сродкаў, і кожная новая сістэма будзе ў чымсьці пераўзыходзіць папярэднія (па праграмнай магутнасці, штучна-інтэлектуальных здольнасцях, доступе да розных відаў інфармацыі, якасных крытэрыях прадастаўлення інфармацыі і інш.). Таму трэба пастаянна сачыць за іх з’яўленнем і вывучаць іх магчымасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Пытанні і заданні*

1. У чым заключаюцца адрозненні каталога і картатэкі? Ці захоўваюцца гэтыя адрозненні пры пераводзе каталогаў і картатэк у электронную форму?

2. На прыкладзе бібліятэкі, якой Вы карыстаецеся, абгрунтуйце, зыходзячы з асноўных прынцыпаў фарміравання сістэмы каталогаў і картатэк, рацыянальнасць (або нерацыянальнасць) вядзення ў бібліятэцы разнастайных каталогаў і картатэк.

3. Якія сродкі і метадычныя прыёмы прымяняюцца ў бібліятэках, што забяспечваюць сістэмнае адзінства каталогаў і картатэк?

4. Вылучыце асноўная тэндэнцыі ў развіцці каталогаў бібліятэк на сучасным этапе.

5. Як дыферэнцыруюцца картатэкі бібліятэк? Якія віды картатэк існуюць у бібліятэках?

6. Якія тэндэнцыі характэрныя для арганізацыі і вядзення розных відаў картатэк бібліятэк на сучасным этапе?

7. Раскажыце, якім чынам можна весці пошук артыкулаў электронных часопісаў?

8. Якія віды пошукавых сродкаў інтэрнет-рэсурсаў выдзяляюцца? Чым яны адрозніваюцца паміж сабой?

9. Якія б метадычныя прыёмы Вы выкарысталі і параілі сваім карыстальнікам для работы з пошукавымі сістэмамі інтэрнет-рэсурсаў ва ўмовах іх значнай колькасці і разнастайнасці?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Глава 5. Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі

### *5.1. Азначэнне, структура, камплектаванне і арганізацыя ДБФ у бібліятэках*

Азначэння даведачна-бібліяграфічнага фонду (ДБФ) у міждзяржаўным стандарце ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография» няма, але патрэбнасць у ім існуе. Мы прапануем наступнае. Даведачна-бібліяграфічны фонд – гэта частка ДБА бібліятэкі, якая ўключае афіцыйныя дакументы, даведачныя і бібліяграфічныя крыніцы, неабходныя для ажыццяўлення ўсіх працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці. У сувязі з трансфармацыямі ў

носьбітах інфармацыі ў склад ДБФ сёння ўваходзяць афіцыйныя выданні і матэрыялы, прававыя БД; даведачныя выданні і фактаграфічныя БД; бібліяграфічныя выданні і бібліяграфічныя БД. Паступова адбываецца перавод картатэк у электронную форму, і яны ў выглядзе бібліяграфічных і фактаграфічных БД папаўняюць даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі.

Значэнне ДБФ заключаецца ў тым, што ён пашырае інфармацыйныя магчымасці бібліятэкі. Калі каталогі арыентаваны на раскрыццё фонду бібліятэкі, то ДБФ дапамагае арыентавацца ў дакументальных патоках і масівах. Ён з'яўляецца значнай крыніцай для выканання фактаграфічных запытаў, садзейнічае міжбібліятэчнаму ўзаемадзеянню і рацыянальнаму выкарыстанню бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў.

Перад кожнай бібліятэкай стаіць задача сфарміраваць аптымальны па змястоўным і відавым складзе ДБФ. Пры фарміраванні гэтага фонду неабходна ўлічваць тыпалагічныя асаблівасці бібліятэкі; профіль яе работы; склад чытачоў і асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей, а таксама прафесійныя патрэбнасці саміх бібліятэкараў і бібліёграфаў, неабходнасць інфармацыйнага забеспячэння рознымі крыніцамі разнастайных кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці; асаблівасці інфармацыйнай сітуацыі ў рэгіёне, звязаныя з наяўнасцю іншых бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў. Змест ДБФ у цэлым адпавядае профілю камплектавання агульнага фонду бібліятэкі.

*Камплектаванне ДБФ.* Калі на этапе ідэнтыфікацыі і камплектавання традыцыйных выданняў, электронных выданняў на кампакт-дысках выкарыстоўваецца сістэма абвяшчэння аб выдадзеных або плануемых да выхаду выданняў (тэмпланы і БД выдавецтваў, друкаваныя каталогі і прайс-лісты кнігагандлёвых фірмаў, каталогі “Books in Print”, сайты вядучых выдавецтваў і кнігагандлёвых арганізацый), то пры ідэнтыфікацыі онлайнавых рэсурсаў часта даводзіцца спадзявацца на вопыт спецыялістаў бібліяграфічных аддзелаў. Крыніцамі камплектавання онлайнавай рэсурснай базы ДБФ выступаюць пошукавыя сродкі інтэрнета, пробныя падпіскі, дырэкторыі рэсурсаў і прагляд шматлікіх web-сайтаў. Пры пачатковым камплектаванні ДБФ часта ў якасці крыніц яго кам-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плектавання кампакт-дыскамі выступаюць падарункі, атрыманыя ў час рэкламных кампаній, міжнародны і іншы міжбібліятэчны абмен.

Асноўным працэсам камплектавання дакументальных фондаў заўжды быў адбор літаратуры, які абумоўлівае якасць фонду і яго інфармацыйную ёмістасць, што можа быць поўнасцю аднесена і да сферы фарміравання онлайнавай рэсурснай базы.

У ДБФ уваходзяць як бясплатныя рэсурсы ў інтэрнеце, так і камерцыйныя. Асноўнай праблемай на этапе камплектавання камерцыйных онлайнавых рэсурсаў з’яўляецца неабходнасць прыняцця рашэння па пытаннях, ці будзе адабраны рэсурс набывацца і стане ўласнасцю бібліятэкі, ці будзе больш пераважным варыянтам набыццё правоў на часовы абмежаваны доступ. Перавагай камплектавання онлайнавых рэсурсаў з’яўляецца магчымасць падпіскі на эксперыментальнае тэсціраванне рэсурсу для вывучэння магчымасці выкарыстання ў працэсах абслугоўвання. Калі маецца некалькі формаў існавання інфармацыйнага рэсурсу (друкаваная, на электронных носьбітах і прадстаўленая ў рэжыме аддаленага доступу), то ўлічваюцца перавагі розных формаў разглядаемага рэсурсу; профільнасць яго для бібліятэкі і прагназіруемая актыўнасць звароту да гэтай крыніцы з боку бібліятэчных супрацоўнікаў і спажыўцоў інфармацыі; эканамічныя затраты (лічыцца эканамічна больш эфектыўным набываць БД на кампактных аптычных дысках, калі інфармацыя, якая ў іх змяшчаецца, заведама ўяўляе ўстойлівую цікавасць для карыстальнікаў; онлайнавы рэжым для камерцыйных крыніц больш дарагі).

Перавагі электронных дакументаў перад друкаванымі на сёння вызначаны дастаткова поўна і па розных крытэрыях. Бібліяграфічныя, даведачныя выданні больш зручна выкарыстоўваць у электронным выглядзе, таму што яны валодаюць большай інфармацыйнай ёмістасцю, дазваляюць ажыццяўляць аператыўны пошук інфармацыі, валодаюць сродкамі пошуку ўнутры дакумента – гіпертэкставымі спасылкамі; дазваляюць весці шматаспектны пошук; электронныя выданні адзначаюцца больш высокай аператыўнасцю выхаду, чым традыцыйныя; наяўнасцю ў электронных выданнях розных відаў інфармацыі, некаторыя з якіх прынцыпова не мо-

гуць быць адлюстраваны ў друкаваным выглядзе; эканамічныя затраты на вытворчасць і распаўсюджванне электронных выданняў меншыя, чым для традыцыйных. Ліцэнзаваныя кампакт-дыскі могуць мець сеткавы доступ, які дазваляе працаваць з імі з розных рабочых месцаў.

Пры адсутнасці сеткавай тэхналогіі ў бібліятэцы бібліёграфы могуць паралельна камплектаваць ДБФ і друкаванымі выданнямі, і кампакт-дыскамі, каб не знізіць аператыўнасць абслугоўвання карыстальнікаў. Што тычыцца паўнатэкставых БД, напрыклад прававой інфармацыі, практыкамі адзначаецца, што і бібліёграфы, і карыстальнікі аддаюць перавагу пры пошуку неабходнай інфармацыі базам даных, але працаваць з тэкстамі дакументаў лепш у друкаванай форме.

Пры вызначэнні рэсурсаў, да якіх бібліятэка будзе арганізоўваць доступ у онлайнавым рэжыме, перад тым як заплаціць за электронны доступ да таго ці іншага сервера, што змяшчае неабходныя бібліяграфічныя або фактаграфічныя БД, бібліёграф павінен пераканацца ў якасці інфармацыі і доступу да яго. Для гэтага рацыянальным з'яўляецца выкарыстанне магчымасці, якую прадастаўляюць вытворцы і распаўсюджвальнікі электронных прадуктаў – часовы бясплатны доступ да сервераў, каб бібліятэка магла ацаніць магчымасці работы з электронным прадуктам. Трэба таксама ўлічваць комплекс агульнапрынятых крытэрыяў ацэнкі і адбору онлайнавых рэсурсаў. Гэта крытэрыі якасці рэсурсаў (іх змест, аднаўляльнасць, моўная прыналежнасць, краіна-вытворца), тэхналагічна абумоўленыя крытэрыі (аператыўнасць і лёгкасць доступу да web-сервера, крытэрыі камфортнасці выкарыстання, наяўнасць навучальных праграм для карыстальнікаў, магчымасці захоўвання вынікаў пошуку і інш.), бюджэтна-каштоўнасныя крытэрыі (разнастайнасць у цанавой палітыцы вытворцаў і распаўсюджвальнікаў, магчымасці фінансавання бібліятэкай закупкі рэсурсу, адпаведнага абсталявання і праграмнага забеспячэння). Дадатковымі лічацца ліцэнзійныя і арганізацыйныя крытэрыі.

Перавагі выкарыстання онлайнавага доступу – меншая патрэбнасць з боку карыстальнікаў у абслугоўванні іх непасрэдна бібліёграфамі; клопат аб інфармацыйных рэсурсах онлайнавых сервераў, іх стварэнні, аднаўленні тычыцца пастаўшчыкоў інфармацыі; не патрабуе свайго вырашэння праб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лема экзэмплярнасці, дадатковых копій, таму што онлайнавыя рэсурсы даступныя для ўсіх і з любога тэрмінала. Трэба таксама ўлічваць тэндэнцыю паступовага пераходу ад CD-ROM тэхналогій да онлайнавага прадастаўлення інфармацыі.

*Задачы супрацоўнікаў бібліяграфічнага аддзела па фарміраванні ДБФ* у сучасных умовах наступныя: сістэматычна выяўляць найбольш каштоўныя і неабходныя для работы бібліяграфічныя, інфармацыйныя рэсурсы; правяраць іх існаванне ў розных формах; ацэньваць якасць розных формаў інфармацыйных рэсурсаў; выкарыстоўваць аптымальныя метады стварэння архіўных эквівалентаў даступных рэсурсаў; арганізоўваць і весці ўласную БД даведачна-бібліяграфічнага фонду, БД з адрасамі web-сервераў, БД, якая б адлюстроўвала аналітычны роспіс набываемых электронных бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных, даведачных электронных выданняў. Што тычыцца апошняй БД, то яе актуальнасць выклікана наступнымі фактарамі: па меры развіцця інфармацыйных тэхналогій нарошчваецца аб’ём памяці носьбітаў інфармацыі, з’яўляецца магчымасць размяшчэння на адным носьбіце мноства аб’ёмных тэкстаў розных дакументаў. Бібліёграф можа фіксаваць іх у якасці адной крыніцы інфармацыі, а можа выкарыстоўваць аналітычны роспіс зместу дыска, як раней аналітычна распісваўся змест нумара часопіса, зборніка. Што датычыццца апісання і рэгістрацыі онлайнавых рэсурсаў, то назапашаны вопыт замежных і айчынных бібліятэк паказаў, што асноўныя працэдуры каталагізацыі (стварэнне бібліяграфічнага апісання, вызначэнне кропак доступу да пошуку ў аўтаматызаваным рэжыме, унясенне шыфраў захоўвання) прымянімы і для каталагізацыйнай апрацоўкі электронных дакументаў, у тым ліку і онлайнавых.

Актуальнай праблемай для краіны, рэгіёна з'яўляецца стварэнне пры фарміраванні размеркаванага фонду бібліяграфічных, даведачных выданняў зводнага каталога гэтых рэсурсаў на web-серверы адной з бібліятэк ці выстаўленне гэтых БД на ўласных сайтах кожнай бібліятэкай.

*Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках.* На практыцы склалася некалькі формаў арганізацыі ДБФ: вылучэнне яго ў спецыялізаваную частку бібліятэчнага фонду; размеркаванне даведачных і бібліяграфічных выданняў па структурных падраздзяленнях бібліятэкі ў адпаведнасці з іх галіновай спецы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізацыяй і камплектаванне існуючай пры бібліяграфічным аддзеле падсобнай бібліятэкі абмежаваным колам выданняў пераважна універсальнага і гуманітарнага зместу; стварэнне шматпрофільнага ДБФ з шырокім дубліраваннем даведачных і бібліяграфічных матэрыялаў у галіновых аддзелах і фондзе асноўнага кнігасховішча.

Лепшым з'яўляецца варыянт стварэння ў бібліятэцы адзінага фонду ў бібліяграфічным аддзеле, дапоўненага дублетамі даведачных і бібліяграфічных выданняў, якія знаходзяцца ў фондах іншых аддзелаў. Гэта дазволіць забяспечыць карыстальнікаў дыферэнцыраваным абслугоўваннем, захоўваючы універсальны ДБФ. Але ў такім варыянце павялічваецца экзэмплярнасць выданняў і даводзіцца прымаць асобныя рашэнні для адзіных экзэмпляраў. Ва ўмовах дэцэнтралізацыі бібліяграфічнай службы ДБФ можа фарміравацца як размеркаваны фонд, і тады яго цэласнасць будзе забяспечвацца стварэннем адзінага (агульнабібліятэчнага) каталога або БД даведачных і бібліяграфічных выданняў. Бібліяграфічны аддзел арганізуе і вядзе гэты каталог (БД) на аснове паступаючых з іншых аддзелаў звестак.

Выдзяляюцца актыўная і пасіўная часткі ДБФ. У сувязі з устарэласцю або заменай рэтраспектыўнымі і іншымі дапаможнікамі выданні з ДБФ перанакіроўваюць у фонд асноўнага захоўвання (пасіўная частка). Не выключаюцца з ДБФ паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў, энцыклапедыі і іншыя арыгінальныя даведачныя выданні, навукова-дапаможныя рэтраспектыўныя паказальнікі. Каштоўнасць іншых выданняў ацэньваецца індывідуальна. Так, мэтазгодна захоўваць у складзе ДБФ даведачныя тамы збораў твораў і іншых шматтомных выданняў. Камплекты “Кніжнага летапісу” пераводзяць у кнігасховішча з прычыны замены іх штогоднікам “Кнігі Беларусі”. “Летапісы часопісных артыкулаў” і “Летапісы газетных артыкулаў” захоўваюцца за апошнія два–тры гады. Больш працяглы тэрмін захоўвання ў ДБФ павінен быць летапісаў рэцэнзій, нот, выяўленчага мастацтва, карт.

Пачатак работы па камплектаванні ДБФ электроннымі выданнямі характарызуецца і тым, што ў асобных бібліятэках іх фонд ствараецца ў аддзеле аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў (аддзеле новых інфармацыйных тэхналогій), што не на карысць фарміраванню адзінага ДБА, які б

аб'ядноўваў неабходныя крыніцы незалежна ад носьбітаў інфармацыі.

З якімі ж праблемамі сутыкаюцца бібліятэкі пры фарміраванні ДБФ? Многія бібліятэкі краіны адмаўляюцца ад выпуску бібліяграфічных крыніц у традыцыйнай форме. Для выдавецтваў гэта таксама нерэнтабельная прадукцыя. Між тым інфармацыйны рынак бібліяграфічных, фактаграфічных БД у краіне яшчэ не сфарміраваны, поўнага інфармавання аб генерыруемых БД не вядзецца. Многія бібліятэкі не маюць добрай матэрыяльна-тэхнічнай базы, каб выкарыстоўваць аптычныя кампакт-дыскі, тэлекамунікацыйны доступ да рэспубліканскіх і замежных інфармацыйных рэсурсаў; няма дастатковых эканамічных сродкаў для паўнацэннага камплектавання даведачнымі выданнямі, значна падаражэлі замежныя інфармацыйныя, асабліва рэфератыўныя, выданні, доступ да абсалютнай большасці БД, размешчаных у інтэрнеце, прадастаўляецца на камерцыйнай аснове.

Такая сітуацыя вымушае весці работу па каардынацыі камплектавання ДБФ бібліятэк рэгіёна, краіны; ствараць уласную бібліяграфічную прадукцыю; аналізаваць выніковасць, эфектыўнасць звароту да БД установ, якія прадастаўляюць свае інфармацыйныя прадукты і паслугі на платнай аснове.

### *Пытанні і заданні*

1. Выкананню якіх функцый садзейнічае ДБФ бібліятэкі? Чым ён адрозніваецца ад сістэмы каталогаў і картатэк?
2. Якія падыходы і крытэрыі ляжаць у аснове фарміравання ДБФ, як ён суадносіцца з профілем камплектавання асноўнага фонду бібліятэкі?
3. Раскрыйце асаблівасці камплектавання ДБФ бібліятэк розных тыпаў?
4. Прааналізуйце даведачна-бібліяграфічны фонд канкрэтнай бібліятэкі і вызначце яго адпаведнасць функцыям і задачам, якія стаяць перад бібліятэкай.
5. Які ўплыў на камплектаванне ДБФ аказвае выкарыстанне ў бібліятэках новых інфармацыйных тэхналогій?
6. Як Вы разумееце паняцце “размеркаваны даведачна-бібліяграфічны фонд” бібліятэкі, рэгіёна; чым выклікана яго існаванне; якія сродкі для яго больш эфектыўнага выкарыстання павінны стварацца?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *5.2. Афіцыйныя дакументы і БД прававой інфармацыі ў ДБФ бібліятэкі*

Афіцыйныя дакументы – гэта дакументы, якія прымаюцца органамі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады і маюць заканадаўчы, нарматыўны, дырэктыўны або інфарматыўны характар. СТБ 7.60 – 93 «Выданні. Асноўныя віды. Тэрміны і азначэнні» дае наступнае азначэнне афіцыйнага выдання. Гэта «выданне, якое змяшчае матэрыялы заканадаўчага, нарматыўна-прававога ці інфармацыйна-дырэктыўнага характару, апублікаваныя ад імя дзяржаўных органаў, устаноў, ведамстваў або грамадскіх арганізацый».

Асноўныя характарыстыкі афіцыйнага дакумента – яго нарматыўны характар, абавязковае прымяненне ў жыцці. Адсюль вынікае спецыфіка работы бібліятэкі з выданнямі такога тыпу: карыстальнік павінен атрымліваць поўную і дакладную інфармацыю аб існуючых дакументах, бібліятэкар павінен гарантаваць карэктнасць і адэкватнасць інфармацыі. Усё гэта абумоўлівае асаблівыя адносіны бібліятэкі да афіцыйных выданняў і ўключэнне іх у актыўную частку ДБФ.

У ДБФ уключаюцца розныя віды выданняў афіцыйных дакументаў*.

Найбольш аператыўна афіцыйныя дакументы друкуюцца ў сродках масавай інфармацыі; выходзяць самастойнымі выданнямі; у выглядзе бягучых і рэтраспектыўных выданняў як універсальнага, так і тэматычнага зместу. Сярод бягучых універсальных выданняў, якія абавязкова набываюцца ў ДБФ бібліятэк розных тыпаў, – «Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь», што выдаецца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі (НЦПІ) з 1999 г. замест такіх выданняў, як “Ведамасці Нацыянальнага сходу РБ» і «Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта, пастаноў урада РБ». Сёння перыядычнасць выхаду «Национального реестра правовых актов Республики Беларусь» узрасла да 17 нумароў у месяц, ён адлюстроўвае ў кожным раздзеле афіцыйныя дакументы, прынятыя рознымі суб’ектамі сістэмы заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады, прававыя акты мясцовых (на ўзроўні абласных) Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распараджальных органаў, міжнародныя дагаворы РБ.

---

* Падрабязней віды выданняў афіцыйных дакументаў разглядаюцца ў курсе «Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне сацыягуманітарнага комплексу».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод універсальных выданняў, якія набываюцца ў ДБФ бібліятэк, можна назваць “Бюллетень нормативно-правовой информации», які выдаецца з 1991 г. штотыднёва Міністэрствам юстыцыі РБ і Беларускім рэспубліканскім саюзам юрыстаў. У бюлетэні, акрамя загадаў, пастаноў розных міністэрстваў, рашэнняў мясцовых органаў выканаўчай улады, друкуюцца каментарыі да заканадаўства, тэарэтычныя артыкулы.

Бягучыя выданні друкуюць таксама галіновыя міністэрствы, ведамствы, у якіх адлюстроўваюцца пастановы, загады, рашэнні і іншыя дакументы пэўнага зместу (напрыклад, “Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі РБ”, “Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства культуры РБ” і інш.), якія набываюцца ў ДБФ бібліятэк у адпаведнасці з профілем іх работы і патрэбнасцямі спажыўцоў.

Публічныя бібліятэкі пры фарміраванні свайго ДБФ уключаюць у яго як апублікаваныя ў мясцовым друку афіцыйныя дакументы, так і неапублікаваныя афіцыйныя матэрыялы мясцовых органаў улады. Гэта інфармацыя адлюстроўвае той пласт жыцця грамадства, дзе вырашаецца 90% усіх праблем, з якімі сутыкаецца насельніцтва кожнага рэгіёна. Але механізм паступлення такой інфармацыі ў бібліятэкі патрабуе ўдасканалення з мэтай забеспячэння паўнаты і своечасовасці папаўнення фондаў ПБ як публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў краіне.

Дакументы замежных органаў заканадаўчай і выканаўчай улады збіраюцца некалькімі бібліятэкамі краіны з рознай ступенню паўнаты. Больш поўна яны камплектуюцца ў фонды Прэзідэнцкай бібліятэкі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; апошняя выконвае функцыі дэпазітарыя для дакументаў міжнародных арганізацый, у тым ліку ААН і Савета Еўропы.

Паралельна з друкаваным патокам нарматыўных прававых актаў бібліятэкі набываюць паўнатэкставыя БД, якія адлюстроўваюць афіцыйныя дакументы. Асабліва каштоўныя яны тым, што даюць шырокія магчымасці для вядзення шматаспектнага пошуку інфармацыі. Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі прапануе бібліятэкам у якасці прадукту электронную копію эталоннага банка даных прававой інфармацыі – БД “ЭТАЛОН”, якая складаецца з трох частак: БД “Эталон – Беларусь” (заканадаўства Рэспублікі Беларусь), адлюст-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роўвае прававыя акты, прымаемыя рознымі суб'ектамі ўлады рэспубліканскага ўзроўню; БД "Эталон – рэгіён" (рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання); БД "Эталон – міжнародныя дагаворы". Базы даных пастаўляюцца на кампакт-дысках са штотыднёвай, штомесячнай або штоквартальнай актуалізацыяй і адлюстроўваюць увесь масіў прававой інфармацыі, фарміруемы рознымі суб'ектамі ўлады, у тым ліку і розных узроўняў. Праграмныя сродкі выкарыстання БД забяспечваюць хуткі пошук прававых актаў па любым з іх рэквізітаў (нумары, даце і органе прыняцця, відзе акта і інш.); па рубрыках Адзінага прававога класіфікатара РБ; ключавых словах; па заданым слове (частцы слова) з назвы акта; па любым слове або частцы слова з тэкстаў дакументаў у межах усёй БД (кантэкстны пошук); па любым спалучэнні вышэйпералічаных пошукавых рэквізітаў.

Згодна з Пагадненнем паміж Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі і Міністэрствам культуры аб стварэнні публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў РБ кожны цэнтр прававой інфармацыі забяспечваецца эталонным банкам даных прававой інфармацыі (ЭБДПІ) РБ і іншымі афіцыйнымі выданнямі НЦПІ. Але актуальнай для гэтых цэнтраў застаецца праблема папаўнення ЭБДПІ. Часцей за ўсё эталонны банк даных у бібліятэках абнаўляецца раз у квартал. Публічныя бібліятэкі краіны па тэхнічных умовах яшчэ не могуць выкарыстоўваць інтэрнэт для актуалізацыі ЭБДПІ і выканання складаных запытаў прававой тэматыкі, што дало б магчымасць даваць штодзённа інфармацыю аб усіх прынятых у краіне прававых актах.

Выкарыстоўваюцца ў рабоце бібліятэк і першая паўнатэкставая БД прававой інфармацыі "ЮСИАС", генерыруемая рэспубліканскім камерцыйным інфармацыйна-прававым агенцтвам "Рэгістр"; «ГорИнформ», якая змяшчае тэксты нарматыўных дакументаў, прынятых Мінскім выканаўчым камітэтам, што рыхтуе фірма ЮрСпектр і інш.

З замежных БД прававой інфармацыі набываюцца бібліятэкамі банк даных прававой інфармацыі Эталон–Расія (заканадаўства Расійскай Федэрацыі), які адлюстроўвае поўныя тэксты 73 000 прававых актаў РФ са штомесячнай актуалізацыяй і выступае як сумесны праект НЦПІ РБ і Навуковага цэнтра прававой інфармацыі пры Міністэрстве юстыцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РФ; інфармацыйныя прадукты расійскіх фірмаў «Консультант Плюс» (АО «Консультант Плюс»), «Гарант» (НПП «Гарант-Сэрвіс»), «Кодекс» (інфармацыйна-прававы кансорцыум «Кодэкс» РФ), «ЮСИС» (фірма «Інтралекс»), дзяржаўная БД афіцыйнай прававой інфармацыі «Система» (генерыруецца НТЦ «Сістэма» пры ФАУСІ), CD-ROM – версіі прававых БД «Юридический вестник» і «Юридический справочник для всех», вытворцам якіх з'яўляецца прадпрыемства "Цэнтр камп'ютэрных распрацовак".

У беларускіх бібліятэк ёсць магчымасць атрымліваць неабходную інфармацыю афіцыйнага характару і праз тэлекамунікацыйныя сродкі сувязі. З 1998 г. адкрыты вузел НЦПІ ў інтэрнеце (зараз гэта магутны партал прававой інфармацыі краіны), што дае магчымасць атрымаць доступ да тэкстаў нарматыўных актаў РБ. НЦПІ штодзённа дае інфармацыю аб усіх прымаемых у РБ прававых актах. БД прававой інфармацыі замежных краін таксама прадстаўлены ў глабальнай камп'ютэрнай сетцы, акрамя БД вядучых расійскіх фірмаў і арганізацый, можна выкарыстоўваць і замежныя БД "West-law", "Lexis-Nexis" і інш.

Такім чынам, сённяшняму карыстальніку інфармацыі бібліятэка дае выбар – друкаванае выданне або паўнатэкставая БД з шырокім шматаспектным дыяпазонам пошуку. Паводле вынікаў расійскіх даследаванняў выбар карыстальнікамі друкаваных крыніц суадносіцца з БД, як 3:2. Паводле беларускіх афіцыйных крыніц прыводзяцца наступныя даныя: у цэлым па краіне агульная колькасць запытаў па прававой інфармацыі, выкананых з дапамогай ЭБДПІ, складае 60,6%, што сведчыць аб інфармацыйнай ёмістасці ЭБДПІ і перавазе, якая аддаецца электронным рэсурсам з боку бібліятэк і іх карыстальнікаў. Тым не менш значны аб'ём (39,4%) запытаў выконваецца на аснове інфармацыі, змешчанай на папяровых носьбітах. Часта выкарыстоўваюцца адначасова абодва віды носьбітаў. Звычайна да электроннай прававой базы звяртаюцца на першым этапе пошуку для ўдакладнення бібліяграфічных звестак аб асобным нарматыўным акце, а ўдакладніўшы месца апублікавання акта, чытачы выкарыстоўваюць папяровы варыянт для дэталёвага вывучэння тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Захоўваюцца выданні, а таксама неапублікаваныя афіцыйныя дакументы ў ДБФ бібліяграфічнага аддзела, у структуры якога і функцыянуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі.

### *5.3. Даведачныя выданні і фактаграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі*

У складзе ДБФ бібліятэкі адметная роля належыць даведачным выданням. Як і афіцыйныя дакументы, яны прадстаўлены на розных носьбітах інфармацыі, у розных формах – друкаванай і электроннай, могуць быць даступныя праз тэлекамунікацыйныя сродкі сувязі.

Даведачнае выданне – гэта выданне, якое змяшчае звесткі навуковага або прыкладнога характару, размешчаныя ў зручным для хуткага адшукання парадку, не прызначаныя, як правіла, для суцэльнага чытання. Асноўны змест даведачных выданняў ствараюць дакладныя новыя навуковыя ці практычныя даныя. Прадстаўленне гэтых даных у даведачным выданні павінна адпавядаць патрабаванням навуковасці і наратыўнасці, сістэмнасці арганізацыі матэрыялу, хуткага і шматаспектнага пошуку інфармацыі, аўтарская інтэрпрэтацыя якой зведзена да мінімуму. Даведачныя выданні выконваюць функцыю ўшчыльнення ведаў, навуковага згортвання інфармацыі для дасягнення навуковай ёмістасці і магчымасці хуткага знаходжання неабходных фактаў, апісанняў разнастайных прадметаў і з'яў і інш. Узровень паўнаты даведачнай інфармацыі залежыць ад непасрэднага чытацкага і мэтавага прызначэння. Асноўным структурным элементам даведачных выданняў з'яўляецца даведачны артыкул, які змяшчае кароткі і дакладны адказ на канкрэтнае пытанне. Галоўнымі ў даведачным артыкуле з'яўляюцца фактычныя даныя. У энцыклапедыях, слоўніках артыкулы размяшчаюцца пераважна ў алфавітным парадку, у даведніках звычайна выкарыстоўваецца пэўная лагічная структура. Пошукавыя магчымасці даведачных выданняў пашыраюць элементы даведачнага апарату: змест, прадмова, пералік умоўных скарачэнняў, спісы літаратуры, дапаможныя паказальнікі.

Сярод відаў даведачных выданняў выдзяляюць энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі. Да даведачных выданняў адносяць таксама календары знамянальных і памятных дат, хронікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзей, статыстычныя, юрыдычныя, краіназнаўчыя атласы, музейныя, наменклатурныя каталогі, каталогі выставы і інш.

*Энцыклапедыі* – даведачныя выданні, якія змяшчаюць у абагульненым выглядзе асноўныя звесткі па адной ці ўсіх галінах ведаў і практычнай дзейнасці, выкладзеныя ў выглядзе кароткіх артыкулаў, размешчаных у алфавітным ці іншым парадку. У залежнасці ад зместу ўключаемых звестак вылучаюцца універсальныя (агульныя), спецыялізаваныя (шматгаліновыя, галіновыя, тэматычныя, персанальныя), рэгіянальныя (універсальныя ці спецыялізаваныя) энцыклапедыі.

Энцыклапедыі адрозніваюцца таксама па мэтавым прызначэнні, яны бываюць навуковага ці навукова-папулярнага характару. Паводле чытацкага прызначэння энцыклапедыі часцей за ўсё арыентаваны на спецыялістаў і шырокія колы карыстальнікаў. Галіновыя энцыклапедыі пераважна разлічаны на спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Існуюць энцыклапедыі, разлічаныя на чытацкія катэгорыі пэўнага ўзросту; улічваюцца таксама прыметы полу, інтарэсы і захапленні (напрыклад, энцыклапедыі для жанчын, паляўнічых, сабакаводаў і інш.).

Вылучаюцца таксама энцыклапедычныя слоўнікі – даведачныя выданні, матэрыял у якіх сабраны ў адпаведнасці з патрабаваннямі да энцыклапедычных выданняў, але пададзены больш сцісла і размешчаны ў алфавітным парадку.

У энцыклапедыях шырока распаўсюджаны прыартыкульныя спісы літаратуры, з дапамогай якіх карыстальнік можа атрымаць інфармацыю, звярнуўшыся да найбольш аўтарытэтных і даступных выданняў, а ў бібліяграфічнай дзейнасці яны шырока выкарыстоўваюцца не толькі з мэтай фактаграфічнага пошуку, але і тэматычнага.

У складзе ДБФ усіх бібліятэк неабходна мець універсальныя энцыклапедычныя выданні, шматтомныя галіновыя энцыклапедычныя выданні. У бібліяграфічнай рабоце буйнейшых бібліятэк выкарыстоўваюцца таксама замежныя энцыклапедычныя выданні, энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі ранейшых гадоў выданняў.

Галіновыя і тэматычныя энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі маюць канкрэтнае мэтавае і чытацкае прызначэнне і таму адносяцца да ліку тых спецыялізаваных даведачных выданняў, якія павінны быць прадстаўлены ў ДБФ галіновых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аддзелаў УНБ, у філіялах ЦБС, якія маюць карыстальнікаў – спецыялістаў у дадзенай галіне, у ДБФ спецыяльных навуковых і навукова-тэхнічных бібліятэк. Галіновыя, тэматычныя энцыклапедыі, прызначаныя больш шырокаму колу чытачоў, уключаюцца ў ДБФ бібліяграфічнага аддзела.

*Слоўнікі* складаюць вялікую, разнастайную па характары і прызначэнні, важную для ДБФ групу даведачных выданняў. Слоўнікі – гэта даведачныя выданні, якія змяшчаюць упарадкаваны паводле пэўных прымет пералік моўных адзінак (слоў, словазлучэнняў, фраз, тэрмінаў, імён, знакаў). Існуюць моўныя і тэрміналагічныя віды слоўнікаў.

Моўныя слоўнікі змяшчаюць пералік моўных адзінак з іх характарыстыкамі або перакладамі на іншую мову. Яны апісваюць лексіка-семантычную структуру мовы, падтрымліваюць нормы літаратурнай мовы. Паводле мэтавага прызначэння моўныя слоўнікі падзяляюцца на навуковыя (адлюстроўваюць вынікі лінгвістычных даследаванняў, уключаюць не толькі словы літаратурнай мовы, але і дыялекты, лексіку ранейшых часоў); нарматыўныя (арфаграфічныя – прыводзяць нарматыўнае напісанне слоў); тлумачальныя і фразеалагічныя (уключаюць тлумачэнні слоў, словазлучэнняў, прыклады ўжывання і іншыя звесткі); вучэбныя; папулярныя.

Значную даведачную ролю ў дзейнасці бібліёграфаў адыгрываюць моўныя слоўнікі, дыферэнцыраваныя па зместу, характару інфармацыі: арфаэпічныя (створаныя з мэтай нармалізацыі вуснай мовы, удакладнення вымаўлення і націску); этымалагічныя (накіраваныя на раскрыццё паходжання слова); мовы пісьменніка; замежных слоў (адлюстроўваюць працэсы моўнага ўзаемадзеяння і растлумачваюць значэнне замежных слоў); сінонімаў; антонімаў; амонімаў; неалагізмаў; архаізмаў; размоўнікі (папулярныя двух- ці шматмоўныя, якія змяшчаюць агульнаўжывальную ці спецыяльную лексіку і фразеалогію і служаць дапаможнікам для зносін).

Тэрміналагічныя слоўнікі – гэта слоўнікі, якія адлюстроўваюць тэрміны якой-небудзь галіны ведаў або тэмы і тлумачаць паняцці. Выдзяляюцца нарматыўныя, вучэбныя і папулярныя тэрміналагічныя слоўнікі; паводле зместу адлюстроўваемай інфармацыі – шматгаліновыя, галіновыя, па вузкіх спецыяльнасцях. Галоўная частка артыкулаў у гэтых выданнях – азначэнне паняццяў. Тэрміналагічныя слоўнікі выкары-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стоўваюцца не толькі спецыялістамі. Так, да філасофскага слоўніка, слоўніка па этыцы і іншых могуць звяртацца розныя групы чытачоў, якія займаюцца самаадукацыяй, навучэнцы. Шмат выдаецца слоўнікаў, якія маюць канкрэтны чытацкі адрас.

Моўныя і тэрміналагічныя слоўнікі знаходзяцца ў ДБФ бібліяграфічнага аддзела або галіновых аддзелаў. Пры наяўнасці спецыялізаваных чытальных залаў яны ўваходзяць у іх ДБФ і выстаўляюцца на полках для адкрытага доступу. Для чытачоў, якія працуюць з замежнай літаратурай і вывучаюць замежныя мовы, створана вялікая колькасць двухмоўных і шматмоўных слоўнікаў. Яны павінны быць сканцэнтраваны ў аддзелах абслугоўвання, а таксама ў аддзелах літаратуры на замежных мовах.

*Даведнік* – гэта выданне, у якім адлюстроўваецца комплекс звестак па пэўнай галіне ведаў, дзейнасці, тэме. Даведнікі вызначаюцца практычным характарам. Яны даволі разнастайныя па тэматыцы, аб'ёме, структуры і прызначэнні. Паводле мэтавага прызначэння вылучаюцца навуковыя, вытворча-практычныя, вучэбныя, навукова-папулярныя, даведнікі па арганізацыі вольнага часу, даведнікі-хронікі і інш.

Навуковыя даведнікі арыентаваны галоўным чынам на навукоўцаў, спецыялістаў і тых, хто навучаецца па спецыяльнасці. Асобным тыпам навуковых даведнікаў з'яўляюцца біяграфічныя даведнікі (слоўнікі), якія змяшчаюць звесткі аб жыцці і дзейнасці асоб; біябібліяграфічныя даведнікі (слоўнікі), што змяшчаюць біяграфічныя звесткі аб асобах, спісы іх прац і літаратуры, якая асвятляе іх жыццё і дзейнасць; даведнікі-вызначальнікі змяшчаюць даныя аб якіх-небудзь аб'ектах і спрыяюць іх ідэнтыфікацыі.

Вытворча-практычныя даведнікі змяшчаюць даныя, неабходныя ў рабоце спецыялістаў пэўнай прафесіі.

Навукова-папулярныя даведнікі садзейнічаюць папулярызацыі ведаў, маюць спрошчаную пабудову, даступны, лаканічны характар выкладання матэрыялу.

Вучэбныя даведнікі змяшчаюць звесткі ў дапамогу вучэбнай дзейнасці школьнікаў, студэнтаў па пэўным прадмеце, вучэбнай дысцыпліне.

Статыстычныя даведнікі змяшчаюць лічбавую інфармацыю, якая характарызуе стан, развіццё розных сфер грамадства, галін, кірункаў дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адрасныя, арганізацыйна-фірменныя даведнікі змяшчаюць алфавітныя або сістэматычныя пералікі адміністрацыйных органаў, грамадскіх арганізацый, фірмаў, прадпрыемстваў з указаннем іх адрасоў, тэлефонаў, выпускаемай прадукцыі, аказваемых паслуг і іншай інфармацыі.

Даведнікі-хронікі – выданні, якія змяшчаюць паслядоўны (па гадах, месяцах, датах) запіс фактаў і падзей па той ці іншай тэме, праблеме.

Праспекты–даведнікі або рэкламныя выданні, якія змяшчаюць сістэматызаваны пералік паслуг, прадметаў, прызначаных да выпуску, на продаж ці да экспанавання.

Каталогі – нарматыўныя, вытворча-практычныя, даведачныя або рэкламныя выданні, якія змяшчаюць сістэматызаваны пералік прадметаў ці паслуг, што маюцца ў наяўнасці. Каталогі бываюць музейныя, выстаў, прамысловыя, наменклатурныя і інш.

Існуюць даведнікі, дзе ўтрымліваюцца звесткі аб якім-небудзь геаграфічным аб'екце ці культурна-асветнай установе, выставе, экспазіцыі, размешчаныя ў парадку, зручным для наведвальнікаў і агляду.

Аналіз дакументальнага патоку выдання даведачнай літаратуры ў краіне дазваляе вылучыць пэўныя асаблівасці, якія трэба ўлічваць пры камплектаванні даведачна-бібліяграфічных фондаў бібліятэк: назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя росту выпуску даведачных выданняў (для параўнання: у 1990 г. былі выпушчаны 72 назвы даведачных выданняў, у 2000 г. – 276, у 2004 – 482 назвы); значную ролю ў гэтай рабоце адыгрываюць недзяржаўныя выдавецтвы, якія выпускаюць каля 50% даведачнай літаратуры (на долю дзяржаўных выдавецтваў прыпадае каля 25%). Актыўнасць беларускіх дзяржаўных і камерцыйных выдавецтваў сведчыць аб тым, што яны самі пачынаюць забяспечваць краіну даведачнымі выданнямі. Гэта важна для бібліятэк, калі ўлічваць, што з-за фінансавых умоў яны не маюць магчымасці набываць выданні замежных краін. Адбываецца значнае пашырэнне тэматыкі, актывізаваўся выпуск фундаментальных энцыклапедычных выданняў, выданняў беларусазнаўчай тэматыкі. Значнай падзеяй у беларускім кнігавыданні з'явіліся выхад у 18 тамах «Беларускай энцыклапедыі», энцыклапедычнага даведніка «Беларусь», шасцітомнай «Энцыклапедыі гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі», энцыклапедычных выданняў «Археалогія і нумізматыка Беларусі», «Беларускія пісьменнікі», «Мысліцелі і асветнікі Беларусі», «Блакітная кніга Беларусі», даведніка «Чырвоная кніга Беларусі» і інш. У апошнія гады ў Беларусі з'явіліся новыя віды выданняў: энцыклапедыя «Беларуская мова: А–Я», «Гістарычны слоўнік беларускай мовы», «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы», «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (перавыданне), «Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Я.Коласа», слоўнікі беларускай навуковай тэрміналогіі ў розных галінах ведаў, размоўнікі. Даволі вялікая колькасць даведачных выданняў розных відаў выпускаецца па папулярнай праблематыцы, такой як дамаводства, сям'я, адпачынак, здаровы лад жыцця; выданняў, адрасаваных розным чытацкім катэгорыям. Назіраецца тэндэнцыя перавыдання нашымі выдавецтвамі замежных даведачных выданняў.

У сучасных умовах усё больш увагі бібліятэкі надаюць камплектаванню сваіх ДБФ даведачнымі выданнямі на машыначытальных носьбітах, у выглядзе кампакт-дыскаў. Класіфікацыя гэтых выданняў аналагічная класіфікацыі даведачных выданняў на папяровых носьбітах. Сёння беларускія бібліятэкі працуюць з універсальнымі выданнямі на CD-ROM-дысках, такімі як універсальныя Брытанская мультымедыйная энцыклапедыя, Большая энциклопедия Кирилла и Мефодия, галіновымі энцыклапедыямі па медыцыне, музыцы, выяўленчым мастацтве, кіно, спорце і інш., моўнымі электроннымі слоўнікамі, бізнес-даведнікамі, біяграфічнымі даведнікамі, даведнікамі па гарадах і музеях. Перавагі гэтых выданняў перад традыцыйнымі заключаюцца ў выкарыстанні максімальнага спектра мультымедыйных магчымасцей (як правіла, тэксты артыкулаў суправаджаюцца відэапаказам, гукавымі каментарыямі, анімацыйнымі схемамі), што дазваляе іх выкарыстоўваць у масавых, групавых мерапрыемствах, якія праводзяцца бібліятэкай. Наяўнасць гіпертэкставых спасылак дазваляе хутка пераходзіць ад аднаго артыкула да другога з улікам асноўнай тэматыкі запыту; вырашаецца праблема экзэмплярнасці камплектавання даведачнымі выданнямі – да аднаго CD-ROM-дыска можна арганізаваць доступ адразу некалькіх карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры рабоце з электроннымі даведачнымі выданнямі важнай з'яўляецца праблема іх камплектавання. Хуткае развіццё камп'ютэрных тэхналогій прыводзіць да з'яўлення больш якасных электронных выданняў, а папярэднія становяцца менш цікавымі (што не адбываецца з кнігамі). Акрамя таго, назвы дыскаў мала аб чым сведчаць, таму што вартасці і недахопы канкрэтнага CD-ROM-дыска праяўляюцца толькі ў рабоце і ў параўнанні з аналагічнымі выданнямі. Па гэтай прычыне спецыялісты раяць пры адборы даведачных выданняў у ДБФ карыстацца наступнымі крытэрыямі: звяртаць увагу на актуальнасць прадстаўленага матэрыялу, паўнату слоўніка, зручны і зразумелы карыстальніцкі інтэрфейс, наяўнасць максімальнага набору пошукавых магчымасцей.

### *5. 4. Даведачныя рэсурсы ў інтэрнеце*

Да даведачных рэсурсаў у інтэрнеце адносяцца шматлікія энцыклапедычныя і даведачныя электронныя выданні і слоўнікі, размешчаныя ў "сусветнай павуціне" на шматлікіх серверах. Як правіла, усе гэтыя выданні былі папярэдне выпушчаны на кампакт-дысках, у прыватнасці на CD-ROM.

Да ліку найбольш аўтарытэтных адносяцца вядомыя электронныя энцыклапедыі універсальнага характару, такія як Britannica, якая з'яўляецца састаўной часткай спецыялізаванага партала Britannica.com, змяшчае больш за 72 тыс. артыкулаў са штогадовай актуалізацыяй, пошук можа весціся па любому слову з тэксту, артыкулы энцыклапедыі забяспечаны гіперспасылкамі, вынікі пошуку змяшчаюць указанні не толькі на артыкулы з самой энцыклапедыі, але і на адпаведныя запыту рэсурсы інтэрнета і публікацыі электронных перыядычных выданняў; Encarta (штогод выпускаецца кампаніяй Microsoft на CD-ROM), яе віртуальны варыянт змяшчае больш за 42 тыс. артыкулаў са штотыднёвым дапаўненнем новых, а таксама аўдыё- і відэафайлы.

У рускамоўнай частцы буйнейшым энцыклапедычным парталам не толькі Расіі, але і свету з'яўляецца партал Рубрыкон. У цяперашні час на яго старонках прадстаўлена звыш 50 найбольш вядомых расійскіх энцыклапедый, слоўнікаў, даведнікаў. Сярод іх поўнае выданне «Большой советской энциклопедии» (1969–1979), выбарачныя артыкулы з «Энциклопедического словаря» Брокгауза и Эфрона (1890–1906),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Иллюстрированный энциклопедический словарь», «Малая медицинская энциклопедия», энциклопедические словари «История Отечества» и «Всемирная история», «Толковый словарь живого великорусского языка» Владимира Даля і інш. Усе крыніцы прадстаўлены ў паўнатэкставым выглядзе з пералікам ілюстрацый і прыартыкульных спісаў літаратуры. Унутраныя спасылкі паміж артыкуламі пераўтвораны ў гіпертэкставыя, што дазваляе лёгка пераходзіць ад аднаго артыкула да другога.

Мультыпарталам з’яўляецца сёння і сайт кампаніі «Кирилл и Мефодий», на якім прадстаўлены мегаэнцыклапедыя Кірыла і Мяфодзія, 15 галіновых і тэматычных энцыклапедый па музыцы, выяўленчым мастацтве, кіно, спорце і інш., а таксама даведнікі і слоўнікі па рускай і англійскай мовах. Універсальная энцыклапедыя ўключае больш за 80 000 артыкулаў і звыш 10 000 ілюстрацый. Убудаваныя пошукавыя механізмы партала забяспечваюць паўнатэкставы пошук па ўсіх артыкулах энцыклапедыі.

Групу віртуальных лінгвістычных слоўнікаў складаюць некалькі вельмі вядомых у свеце крыніц, сярод якіх поўны варыянт знакамітага Вэбстэраўскага тлумачальнага слоўніка і Тэзаўрус Ражэ. Першы слоўнік дазваляе атрымаць значэнне ўводзімага англійскага тэрміна з мноствам асаблівасцей і прыкладаў яго ўжывання, акрамя таго, дае магчымасць праслухоўвання знойдзенага як асноўнага тэрміна, так і яго вытворных. Тэзаўрус Ражэ прапаноўвае розныя варыянты англійскіх слоў, якія абазначаюць адзінае паняцце і звязаны з ім па сэнсе, з'яўляецца значным рэсурсам для прафесійных лінгвістаў і перакладчыкаў. Абедзве крыніцы вельмі лёгкія і хуткія ў выкарыстанні і наглядна дэманструюць перавагі электронных слоўнікаў над традыцыйнымі.

Вялікую групу электронных даведачных выданняў складаюць двухмоўныя слоўнікі. Прынцып работы з імі даволі просты: у спецыяльны радок уводзіцца тэрмін і пасля націску клавішы «Увод» праграма адразу выдае значэнне слова на іншай мове. Онлайн-перакладчыкі шырока прадстаўлены на серверах кампаній «Промт», Рамблер, Яндэкс, Мультытран і інш.

Сярод даведнікаў, якія ўяўляюць цікавасць для бібліятэчных спецыялістаў, шматлікая колькасць біяграфічных да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веднікаў, даведнікаў тыпу “хто ёсць хто”. Сярод такіх даведнікаў на англійскай мове – даведнік на серверы Biografy, у якім адлюстраваны звесткі аб больш за 25 тыс. вядомых асобах, якія атрымалі прызнанне ў розных галінах дзейнасці, розных краінах і ў розныя эпохі – ад старажытнага свету да сучаснасці. На рускай мове прадстаўлены асабістыя даведнікі расійскіх палітыкаў, дзеячаў расійскай бібліятэчнай справы. У Беларусі такога ж роду звесткі прадстаўлены на серверы БелНЦМІ – “Хто ёсць хто ў медыцыне Беларусі”.

У беларускай частцы інтэрнета яшчэ не развіты гэты сегмент даведачных інфармацыйных рэсурсаў: няма электронных версій універсальных энцыклапедычных выданняў, беларускамоўных слоўнікаў, даведнікаў. Ёсць адзінкавыя прыклады тэматычных энцыклапедычных крыніц, даведачнай інфармацыі аб вытворцах тавараў і паслуг, даведачнай інфармацыі для турыстаў і даведнікаў персанальнага характару.

Акрамя пералічаных крыніц, трэба памятаць, што сам інтэрнет з'яўляецца гіганцкай энцыклапедыяй – шырокай крыніцай фактаграфічных і статыстычных даных. У ім ёсць магчымасці атрымаць звесткі аб раскладзе рэйсаў самалётаў і цягнікоў, цэнах на білеты, бягучых курсах валюты і інш. Для атрымання поўных і найноўшых звестак аб якой-небудзь арганізацыі аптымальнымі будуць зварот да сервера, які ўтрымлівае адрасную інфармацыю, выхад на «дамашнюю старонку» дадзенай арганізацыі і знаходжанне неабходных звестак.

З дапамогай інтэрнета можна выканаць фактаграфічныя запыты любой ступені складанасці нават у невялікіх бібліятэках.

### *5.5. Бібліяграфічныя крыніцы ў ДБФ бібліятэкі*

Значнае месца ў даведачна-бібліяграфічным фондзе любой бібліятэкі займаюць бібліяграфічныя дапаможнікі рознага зместу, прызначэння, формы, якія з’яўляюцца незаменным сродкам бібліяграфічнага пошуку, бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў.

Ядро бібліяграфічнай часткі даведачна-бібліяграфічнага фонду складаюць крыніцы агульнай бібліяграфіі, прызначэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нем якіх з’яўляюцца забеспячэнне пошуку любых дакументаў і інфармаванне аб іх шырокага кола спажыўцоў інфармацыі (грамадства ў цэлым).

Да крыніц агульнай бібліяграфічнай інфармацыі адносяцца:

– сістэма бягучых дзяржаўных бібліяграфічных дапаможнікаў;

– крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі;

– крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі.

Асаблівасцямі крыніц агульнай бібліяграфіі з’яўляюцца універсальнасць зместу, магчымасць выкарыстання ў розных бібліяграфічных працэсах і з рознымі мэтамі, забеспячэнне першаснай бібліяграфічнай апрацоўкі дакументальных патокаў і масіваў і стварэнне неабходнай базы для іншых напрамкаў бібліяграфічнай дзейнасці. Зыходзячы з вышэйазначанага, асноўнымі функцыямі крыніц агульнай бібліяграфіі з’яўляюцца рэгістрацыйная, камунікатыўная, пошукавая, базавая, кумулятыўная, гісторыка-культурная.

### *5.6. Крыніцы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі*

Самай аўтарытэтнай крыніцай аб апублікаваных у Беларусі дакументах па ўсіх галінах ведаў з’яўляюцца выданні бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, якія рыхтуе і выдае з 1924 г. Нацыянальная кніжная палата. Яна атрымлівае абавязковы экзэмпляр усіх выданняў у краіне і на яго базе складае і выдае бягучыя бібліяграфічныя дапаможнікі – “Летапіс друку Беларусі”, два штогоднікі “Кнігі Беларусі” і “Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі”.

“Летапіс друку Беларусі” аб’ядноўвае 11 тыпаў паказальнікаў, 10 з якіх пабудаваны з улікам дзяржаўна-тэрытарыяльнага прынцыпу адлюстравання розных відаў дакументаў і адзін летапіс – “Беларусь у сусветным друку” – адлюстроўвае дакументы, адабраныя па прынцыпу экстэрыёрыкі. З 1995 г. “Летапіс друку Беларусі” падзелены на чатыры самастойныя выданні – “Летапіс друку Беларусі» (аб’яднаны выпуск), “Летапіс часопісных артыкулаў”, “Летапіс газетных артыкулаў” і “Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца”. З 2005 г. у самастойнае выданне выдзелены паказальнік “Беларусь у сусветным друку”. “Летапіс друку Беларусі” (аб’яднаны выпуск) выходзіць штомесячна і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаецца з 7 тыпаў летапісаў па відах выданняў. Кожны з летапісаў мае сваю суцэльную нумарацыю на працягу года (паказваецца ў круглых дужках пасля назвы летапісу) і забяспечаны сістэмай дапаможных паказальнікаў, размешчаных непасрэдна за адпаведным летапісам.

Бібліяграфічны запіс складаецца ў адпаведнасці з міждзяржаўным ГОСТ 7.1 – 2003 «Библиографическая запись. Библиографическое описание документа. Общие требования и правила составления».

Бібліяграфічныя запісы ў выданнях НКП складаюцца на мове тэксту выдання, калі ў ім выкарыстана кірылічная ці лацінская графіка. Выданні на ідыш або з выкарыстаннем арабскай графікі апісваюцца ў перакладзе на беларускую мову з пазначэннем у вобласці заўваг мовы тэксту выдання. Бібліяграфічныя запісы на іншых, акрамя беларускай і рускай, мовах суправаджаюцца перакладам асноўных бібліяграфічных звестак (аўтар, загаловак) на беларускую мову.

Бібліяграфічныя запісы групуюцца згодна схеме «Размяшчэнне бібліяграфічных запісаў у "Летапісе друку Беларусі" на аснове Універсальнай дзесятковай (дэцымальнай) класіфікацыі». Поўны пералік значымых тэматычных рубрык УДК, выкарыстоўваемых пры афармленні раздзелаў зместу, прыводзіцца ў першых нумарах летапісаў за бягучы год. Пры размяшчэнні бібліяграфічных запісаў унутры раздзелаў і ў дапаможных паказальніках традыцыйна вытрымліваецца алфавітны прынцып размяшчэння па "радах": на беларускай, рускай і замежных мовах.

Старэйшым айчынным дзяржаўным бібліяграфічным паказальнікам з'яўляецца *"Кніжны летапіс"*, які выдаецца з 1924 г., выходзіць штомесячна ў аб'яднаным выпуску і інфармуе аб кнігах, брашурах і навуковых зборніках, якія прадаўжаюцца. Навуковыя зборнікі, якія прадаўжаюцца, а таксама неперыядычныя тэматычныя зборнікі дадаткова знаходзяць адлюстраванне ў "Летапісе часопісных артыкулаў", у якім ажыццяўляецца аналітычны роспіс гэтых выданняў. У "Кніжным летапісе" адлюстроўваюцца таксама замежныя выданні, якія выпушчаны з удзелам беларускіх выдаўцоў, бібліяграфічныя запісы на такія выданні пазначаны знакам астэрыск (*).

Бібліяграфічныя запісы на кнігі ўключаюць:

– парадкавы нумар запісу;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– загаловак бібліяграфічнага запісу;
– бібліяграфічнае апісанне;
– нумар дзяржаўнай рэгістрацыі, пад якім выданне зарэгістравана ў НКП (складаецца з апошніх лічбаў года і інвентарнага нумара, напрыклад: [97–60];
– індэксы УДК.

У кожным нумары “Кніжнага летапісу” размяшчаюцца дапаможныя паказальнікі.

“Імянны паказальнік” уключае імёны аўтараў, складальнікаў, рэдактараў, перакладчыкаў, аўтараў апрацовак, прадмоў і пасляслоўяў, мастакоў, каментатараў і іншых асоб, якія ўдзельнічалі ў стварэнні адлюстраваных у летапісе выданняў, і парадкавы нумар адпаведнага бібліяграфічнага запісу. Нумары, якія адносяцца да імён асоб, указаных па прымеце персаналіі, бяруцца ў круглыя дужкі. Аўтары з аднолькавымі прозвішчамі і ініцыяламі аб’ядноўваюцца ў адной рубрыцы. Роля некаторых асоб удакладняецца (пер., рэд., маст.).

“Прадметны паказальнік” раскрывае змест выданняў. Складаецца з алфавітнага пераліку прадметных рубрык і нумароў адпаведных бібліяграфічных запісаў.

“Паказальнік загалоўкаў” змяшчае алфавітны пералік загалоўкаў выданняў (за выключэннем выданняў, апісаных пад аўтарскім загалоўкам).

“Геаграфічны паказальнік” змяшчае назвы фізіка-геаграфічных аб’ектаў, палітыка-адміністрацыйных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія ўпамінаюцца ў бібліяграфічных запісах.

“Паказальнік серый” уключае назвы серый і звесткі аб усіх выданнях, якія выйшлі ў серыі, што дазваляе выкарыстоўваць паказальнік як самастойны бібліяграфічны даведнік.

“Паказальнік моў” (акрамя беларускай і рускай), на якіх надрукаваны кнігі, складаецца з алфавітнага пераліку назваў моў і нумароў адпаведных бібліяграфічных запісаў.

“Паказальнік памылковых ISBN” – нумарацыйны пералік памылковых нумароў ISBN. Памылкай лічыцца парушэнне структуры нумара; ранейшае выкарыстанне нумара ў іншым выданні; прыналежнасць нумара іншаму выдаўцу. У бібліяграфічных запісах такія нумары абазначаюцца словам “памылковы” ў круглых дужках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1984 г. штогод Нацыянальнай кніжнай палатай выдаецца дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік *“Кнігі Беларусі”*, які носіць кумулятыўны характар (з 1956 г. па 1980 г. паказальнік выходзіў у выглядзе пяцігоднікаў). У ім змяшчаецца інфармацыя аб кніжных выданнях, якія атрымалі адлюстраванне ў “Кніжным летапісе” за ўліковы перыяд. Адбор выданняў, бібліяграфічны запіс, групоўка матэрыялу, а таксама склад даведачна-метадычнага апарату ў штогодніку аналагічныя “Кніжнаму летапісу”. Галоўнае прызначэнне штогодніка – аператыўны пошук неабходных звестак аб кнігах і брашурах, выдадзеных за ўліковы перыяд.

З 1999 г. у якасці самастойнага друкуецца ў аб’яднаным выпуску *“Летапіс аўтарэфератаў дысертацый”* (да гэтага часу аўтарэфераты дысертацый адлюстроўваліся ў “Кніжным летапісе”). Дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік інфармуе карыстальнікаў аб аўтарэфератах дысертацый, якія абаронены ў ВНУ, акадэмічных і навуковых арганізацыях Беларусі суіскальнікамі вучоных ступеней доктара і кандыдата навук. Склад бібліяграфічнага запісу аналагічны выкарыстоўваемаму ў “Кніжным летапісе”. Асаблівасці бібліяграфічнага запісу наступныя: пасля загалоўка аўтарэферата паказваецца яго шыфр па наменклатуры спецыяльнасцей навуковых работнікаў, у нумары дзяржаўнай рэгістрацыі інвентарны нумар указваецца з абазначэннем “а”, напрыклад: [99-53а].

Бібліяграфічныя запісы групуюцца па комплексах навук згодна з УДК. Унутры кожнага раздзела запісы змяшчаюцца пад рубрыкамі: “На ступень доктара навук” і “На ступень кандыдата навук”, а ўнутры рубрык – па алфавіце імён аўтараў.

Да “Летапісу аўтарэфератаў дысертацый” дадаюцца дапаможныя паказальнікі: імянны і геаграфічны. Летапіс выходзіць штоквартальна і змяшчаецца ў 3-м, 6-м, 9-м і 12-м нумарах “Летапісу друку Беларусі”.

Састаўной часткай аб’яднанага выпуску з’яўляецца штомесячны *“Летапіс нарматыўна-тэхнічных, тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння”* (выдаецца з 1985 г.). Паказальнік інфармуе аб стандартах, цэнніках, прэйскурантах, тэхнічных апісаннях машын, прыбораў і інш. У летапіс уключаюцца таксама тэматычныя падборкі, справаздачныя дакументы дзяржаўных органаў і ўстаноў, інструкцыі, за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цверджаныя арганізацыямі ніжэй абласнога ўзроўню, праграмна-метадычныя распрацоўкі для студэнтаў ВНУ, рэкламныя выданні па тэхніцы, прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Да "Летапісу..." складаюцца імянны дапаможны паказальнік; паказальнікі загалоўкаў і моў.

З 1924 г. выдаецца *"Летапіс нот"*, які інфармуе аб нотных выданнях, а таксама аб музычных творах, надрукаваных у кнігах, часопісах і газетах. У летапіс уключаюцца замежныя выданні, якія падрыхтаваны або выдадзены з удзелам беларускіх выдаўцоў. З 2002 г. выходзіць штоквартальна і змяшчаецца ў 3-м, 6-м, 9-м і 12-м нумарах "Летапісу друку Беларусі". Пры апісанні зборнікаў музычных твораў, не прызначаных для вучэбных мэт, раскрываецца іх змест. Бібліяграфічныя запісы групуюцца па відах музыкі (вакальная, інструментальная, вакальна-сімфанічная, сцэнічная) і па сродках выканання (хор, аркестр і інш.).

Да "Летапісу нот" складаюцца дапаможныя паказальнікі. Імянны, напрыклад, уключае імёны кампазітараў, паэтаў, рэдактараў, аўтараў апрацовак, пералажэнняў, аранжыровак, гарманізацый, перакладчыкаў, складальнікаў і асоб, якім прысвечаны музычныя творы (персаналіі), і парадкавы нумар адпаведнага бібліяграфічнага запісу. Сярод дапаможных паказальнікаў – "Паказальнік загалоўкаў зборнікаў музычных твораў"; "Паказальнік загалоўкаў і першых слоў тэкстаў вакальных твораў"; "Паказальнік выданняў, у якіх апублікаваны ноты, адлюстраваныя ў "Летапісе нот"», №...

Штоквартальна з 2002 г. прадстаўлены ў аб'яднаным выпуску *"Летапіс выяўленчага мастацтва"* (з 1955 г. да 2002 г. выходзіў адзін раз у месяц). Летапіс інфармуе аб асобна выдадзеных творах выяўленчага мастацтва і рэпрадукцыях, змешчаных у часопісах, перыядычных зборніках і зборніках, якія працягваюцца. Інфармуе карыстальнікаў аб выяўленчых плакатах, партрэтах, рэпрадукцыях, эстампах, паштоўках, альбомах, кніжках-карцінках і альбомах для размалёўвання для дзяцей без літаратурнага тэксту, наглядных дапаможніках, календарах, уключаючы мініяцюрныя, і коміксах.

Бібліяграфічнае апісанне складаецца згодна з вышэйназваным ГОСТ. Пры апісанні камплектаў паштовак раскрываецца іх змест. Бібліяграфічныя запісы групуюцца па відах выданняў выяўленчага мастацтва (выяўленчыя плакаты,

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўленчыя паштоўкі і інш.). У раздзелах "Плакаты" і "Альбомы" бібліяграфічныя запісы групуюцца згодна агульнай схеме УДК.

Да летапісу створаны дапаможныя паказальнікі: імянны; загалоўкаў альбомаў і камплектаў паштовак; перыядычных выданняў, у якіх надрукаваны ілюстрацыйны матэрыял, змешчаны ў "Летапісе выяўленчага мастацтва", № ...

Дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік *"Летапіс рэцэнзій"* выдаецца з 1932 г., выходзіць штоквартальна, інфармуе чытачоў аб рэцэнзіях, аглядах кніг, часопісаў і іншых крытычных матэрыялах на творы друку. Паказальнік адлюстроўвае звесткі аб рэцэнзіях на творы, якія апублікаваны асобна або змешчаны ў перыядычных выданнях. Крытычныя матэрыялы, што змяшчаюць аналіз некалькіх твораў, распісваюцца адпаведна ў "Летапісе часопісных артыкулаў" і "Летапісе газетных артыкулаў". Бібліяграфічны запіс складаецца з дзвюх частак: першая ўключае запіс на твор, які рэцэнзуецца, другая – запіс на рэцэнзію.

Групоўка матэрыялу – сістэматычная (УДК). Пры наяўнасці некалькіх рэцэнзій на адзін твор звесткі аб іх групуюцца ў алфавіце прозвішчаў рэцэнзентаў або загалоўкаў рэцэнзій (калі прозвішча рэцэнзента не паказана). Бібліяграфічныя запісы на дакументы, выдадзеныя за мяжой або ў Беларусі на замежнай мове, змяшчаюцца ў канцы адпаведных раздзелаў.

Арыентацыі ў матэрыяле спрыяюць дапаможныя паказальнікі: імянны (уключае імёны аўтараў рэцэнзій і аўтараў твораў, на якія апублікаваны рэцэнзіі); загалоўкаў выданняў, на якія апублікаваны рэцэнзіі; перыядычных выданняў, рэцэнзіі з якіх адлюстраваны ў "Летапісе рэцэнзій", № ... (складаецца з дзвюх частак: часопісы, газеты).

*"Летапіс картаграфічных выданняў"* выдаецца з 1994 г. У 1994–2000 гг. паказальнік выходзіў два разы ў год. З 2001 г. выходзіць адзін раз у год і размяшчаецца ў № 12 "Летапісу друку Беларусі". Паказальнік інфармуе аб картаграфічных выданнях (картах, картах-схемах, планах, атласах), частках картаграфічных выданняў (картах-урэзках на асноўных картах), якія паступілі ў Нацыянальную кніжную палату ў бягучым годзе незалежна ад даты выпуску ў свет. Бібліяграфічныя запісы групуюцца на аснове УДК. Дапаможныя пака-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зальнікі да "Летапісу картаграфічных выданняў" наступныя: імянны, геаграфічны, прадметна-тэматычны, загалоўкаў.

Летапіс *"Беларусь у сусветным друку"* выдаецца з 1946 г. Бібліяграфічны паказальнік змяшчае інфармацыю аб творах беларускіх аўтараў і твораў пра Беларусь і беларусаў, якія апублікаваны ў друку замежных краін, а таксама аб выданнях і публікацыях на беларускай мове (незалежна ад зместу), выдадзеных за межамі Беларусі. Падрыхтоўка матэрыялу для паказальніка ажыццяўляецца ў выніку скаардынаванай працы бібліёграфаў Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, НББ, рэспубліканскіх галіновых бібліятэк Беларусі і грамадскай арганізацыі «Міжнародная арганізацыя беларусістаў».

У 1982–1991 гг. паказальнік выходзіў самастойным выданнем адзін раз у квартал пад назвай "Беларуская ССР у друку СССР і замежных сацыялістычных краін". З 1992 г. выходзіць у складзе "Летапісу друку Беларусі" штомесячна. З 2005 г. выходзіць самастойным выданнем штоквартальна. Матэрыял у паказальніку ўлічваецца за тры гады (за бягучы год і два мінулыя). Групоўка матэрыялу сістэматычная – УДК. Да летапісу дадаюцца дапаможныя паказальнікі: імянны; загалоўкаў; геаграфічны; моў (акрамя беларускай і рускай), на якіх надрукаваны дакументы; перыядычных выданняў і выданняў, што прадаўжаюцца, матэрыялы з якіх зарэгістраваны ў № ...; часовых тэматычных рубрык (зводны за год). Асобныя раздзелы – "Аўтарэфераты дысертацый", "Ноты", "Выяўленчае мастацтва" – змяшчаюцца ў 2-м і 4-м нумарах летапісу. Дапаможным паказальнікам да гэтых раздзелаў з'яўляецца паказальнік загалоўкаў і першых слоў тэкстаў вакальных твораў.

З 1994 г. у аб'яднаным выпуску два разы ў год у 6-м і 12-м нумарах летапісу друкуецца *"Спіс выданняў, што надрукаваны на паліграфічных прадпрыемствах Беларусі па заказах замежных выдаўцоў"*. Бібліяграфічныя запісы ў ім друкуюцца ў алфавіце аўтараў і назваў. Суправаджаецца спіс алфавітным паказальнікам імён і загалоўкаў выданняў.

*"Летапіс часопісных артыкулаў"* выдаецца з 1937 г.; з 1995 г. выходзіць самастойным выданнем штомесячна. Летапіс інфармуе аб артыкулах, дакументальных матэрыялах, творах мастацкай літаратуры з часопісаў, перыядычных зборнікаў, зборнікаў, якія прадаўжаюцца, неперыядычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэматычных зборнікаў, што выпускаюцца ў акадэміях, інстытутах, а таксама інфарматыўна-нарматыўных часопісаў і бюлетэняў дзяржаўных органаў, выданняў тыпу прац. Штогод (а дакладней – амаль штомесяц) павялічваецца кола распісваемых у «Летапісе…» перыядычных выданняў. Бібліяграфічныя запісы складаюцца з бібліяграфічнага апісання, якое выканана ў адпаведнасці з існуючымі стандартамі; на неінфарматыўныя загалоўкі ў квадратных дужках пасля назвы артыкула прыводзіцца даведачная анатацыя, якая раскрывае змест дакумента.

Бібліяграфічныя запісы ў «Летапісе…» групуюцца ў адпаведнасці з УДК (скарочаны варыянт). Каб вылучыць матэрыялы, прысвечаныя значным падзеям палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Беларусі і замежжа, юбілеям асоб, арганізацый, унутры галіновых раздзелаў прымяняюцца часовыя тэматычныя рубрыкі.

У кожным нумары «Летапісу часопісных артыкулаў» змяшчаюцца дапаможныя паказальнікі: імянны; геаграфічны; моў (акрамя беларускай і рускай); часопісаў і зборнікаў (перыядычных, неперыядычных і тых, што прадаўжаюцца), артыкулы з якіх распісаны ў «Летапісе…», №… . Штогод у № 12 «Летапісу…» даецца «Паказальнік часовых тэматычных рубрык».

*“Летапіс газетных артыкулаў”* выдаецца з 1937 г.; з 1995 г. выходзіць самастойным выданнем штомесячна. Летапіс інфармуе аб артыкулах, дакументальных матэрыялах, творах мастацкай літаратуры з міжрэгіянальных, рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх (цэнтральных) газет г.Мінска і абласных цэнтраў, а таксама газет таварыстваў, асацыяцый, аб'яднанняў, партый, рухаў, незалежных газет, газет прыватных заснавальнікаў, рэлігійных, дадаткаў да газет і спецыяльных выпускаў, якія з'яўляюцца профільнымі ці прысвячаюцца рэспубліканскім або міжнародным падзеям.

Бібліяграфічны запіс на газетныя артыкулы складаецца з бібліяграфічнага апісання і даведачнай анатацыі на неінфарматыўныя назвы, якая прыводзіцца ў квадратных дужках пасля назвы і ўдакладняе яе. Групоўка бібліяграфічных запісаў – сістэматычная, на аснове УДК, унутры раздзелаў традыцыйна вытрымліваецца алфавітны прынцып размяшчэння па «радах»: на беларускай, рускай і замежных мовах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прымяняюцца часовыя тэматычныя рубрыкі для вылучэння актуальнага матэрыялу, прысвечанага значным падзеям.

У кожным нумары «Летапісу…» змяшчаюцца наступныя дапаможныя паказальнікі: імянны; геаграфічны; моў; газет, матэрыялы з якіх адлюстраваны ў «Летапісе газетных артыкулаў», № … . У № 12 «Летапісу…» змяшчаецца паказальнік часовых тэматычных рубрык.

*"Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца"*, выдаецца з 1925 г. штогод. Да 1995 г. у розныя гады змяшчаўся ў № 1 або № 12 "Летапісу друку Беларусі". З 1995 г. выдаецца асобна самастойным выданнем. "Летапіс…" адлюстроўвае часопісы, бюлетэні, навуковыя зборнікі і газеты.

Апісанне на выданне даецца па апошняй назве. Змены назваў за ўліковы тэрмін пазначаны ў заўвагах. Пры апісанні выданняў, якія выходзяць на замежнай мове, у якасці паралельнага загалоўка пазначаецца назва выдання ў транслітэрацыі на беларускай мове.

"Летапіс…" складаецца з дзвюх частак. У першай частцы паказаны часопісы, бюлетэні, навуковыя зборнікі. Размяшчэнне бібліяграфічных запісаў – у адзіным (аб'яднаным) алфавіце назваў выданняў. Другую частку летапісу складаюць газеты. Яны размешчаны па тыпах газет, унутры – па алфавіце. Гэтая частка летапісу суправаджаецца паказальнікамі назваў газет і месцаў іх выдання.

Да крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі адносіцца таксама выдаваемы Нацыянальнай кніжнай палатай штогоднік *«Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі»*, які з'яўляецца важнейшай крыніцай аб бібліяграфічных дапаможніках па ўсіх галінах ведаў. (Падрабязную характарыстыку гэтага выдання гл. у параграфе 5.13 «Паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў у ДБФ бібліятэкі»).

Акрамя выдання бягучых крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі, НКП вядзе *электронны каталог "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі"*, які змяшчае бібліяграфічныя запісы на ўсе віды друкаваных выданняў, што паступілі ў НКП: кнігі і брашуры (з 1996 г.); аўтарэфераты дысертацый; нарматыўна-тэхнічныя, тэхнічныя дакументы і выданні вузкага прызначэння ( з 1999 г.); перыядычныя выданні і выданні, якія прадаўжаюцца; артыкулы з газет, часопісаў, зборнікаў (з 2004 г.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэцэнзіі, нотныя, картаграфічныя і выяўленчыя выданні; экстэрыёрыку (з 2005 г.).

Запісы ў каталогу прадстаўлены ў фармаце міжнароднага стандартнага бібліяграфічнага апісання (ISBD) і ў беларускай версіі фармату UNIMARC – BELMARC. Запісы ЭК дзеляцца на поўныя і кароткія. Поўны запіс складаецца з ідэнтыфікацыйнага нумара, нумара запісу ў нацыянальнай бібліяграфіі, нумара дзяржаўнай рэгістрацыі, шыфра захоўвання выдання ў Нацыянальным архіве друку, бібліяграфічнага апісання, загалоўкаў імён, найменняў арганізацый, абазначэнняў дакументаў, прадметных рубрык, класіфікацыйных індэксаў УДК. У поўных запісах прысутнічае поле нацыянальнага выкарыстання “900 – год і нумар летапісу”, у якім прыводзяцца даныя аб нумары друкаванай версіі нацыянальнай бібліяграфіі, што змяшчае дадзены запіс. Адсутнасць поля 900 сведчыць аб тым, што запіс з’яўляецца аператыўна-рэгістрацыйным і дакумент каталагізаваны часткова. Па меры апрацоўкі дакументаў кароткія запісы замяняюцца на поўныя.

Перыядычныя выданні, выданні, што прадаўжаюцца, і артыкулы з гэтых выданняў прадстаўлены многаўзроўневымі запісамі, што звязаны гіперспасылкамі: запіс першага ўзроўню – перыядычнае выданне цалкам; запіс другога ўзроўню – гадавы камплект перыядычнага выдання або выпуск выдання, што прадаўжаецца; запіс трэцяга ўзроўню – нумар у межах гадавога камплекта і аналітычная частка (артыкул).

Па каталогу магчымы базавы пошук – па аўтары, загалоўку, тэме; пашыраны – па даце публікацыі, бібліяграфічным узроўні апісання (манаграфічны, серыяльны або аналітычны), назве выдаўца, месцы выдання, мове публікацыі, віду дакумента. Для аблягчэння і павышэння аператыўнасці пошуку магчыма выкарыстанне слоўнікаў аўтараў, тэматычных рубрык, загалоўкаў, а таксама нумароў – міжнародных стандартных нумароў кніг (ISBN), міжнародных стандартных нумароў серыяльных выданняў (ISSN), індэксаў УДК, інвентарных нумароў, ідэнтыфікатараў запісу, нумароў дзяржаўнай рэгістрацыі выдання.

З 2006 г. аператыўную бібліяграфічную інфармацыю аб выпуску друкаваных выданняў у Беларусі за кожныя дзесяць дзён можна атрымаць ад НКП па электроннай пошце або на дыскеце.

Праводзімыя даследаванні па вывучэнні эфектыўнасці дзяржаўнай бібліяграфіі паказалі, што выкарыстанне гэтых крыніц у практыцы работы бібліятэк шматфункцыянальнае. Бібліятэкары-бібліёграфы іх выкарыстоўваюць пры бібліяграфічным інфармаванні спажыўцоў, азнаямленні з новымі выданнямі, афармленні заказаў па МБА, сістэматызацыі твораў друку, вядзенні бібліяграфічных картатэк, падрыхтоўцы крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі, дакамплектаванні фондаў, правядзенні заняткаў па бібліяграфічным навучанні бібліятэкараў-бібліёграфаў і спажыўцоў інфармацыі.

Зыходзячы з міжнародных патрабаванняў да развіцця нацыянальнай бібліяграфіі, нацыянальныя бібліяграфічныя цэнтры пры падрыхтоўцы дзяржаўных бібліяграфічных дапаможнікаў павінны прытрымлівацца наступных асноўных прынцыпаў і метадычных патрабаванняў: паўнаты адлюстравання дакументаў, аператыўнасці, універсальнасці, дзялення па відах і тыпах літаратуры, забеспячэння шматаспектнага пошуку, кумуліраванасці, магчымасці абмену данымі.

Але якасць крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі адпавядае не ўсім названым прынцыпам і патрабаванням. Паўната адлюстравання дакументаў забяспечваецца паўнатой атрымання абавязковага экзэмпляра. На жаль, сёння па-ранейшаму застаецца актуальнай праблемай для Беларусі прыняцця новага закона аб абавязковым экзэмпляры. Як вынік, у крыніцах дзяржаўнай бібліяграфіі нашай краіны не адлюстроўваюцца аўдыёвізуальныя выданні, электронныя выданні на разнастайных носьбітах.

«Летапіс друку Беларусі» выходзіць са спазненнем на два – тры месяцы, штогоднікі – на год, у выніку чаго інфармацыйны патэнцыял гэтых крыніц не заўсёды можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы крыніц іншых відаў бібліяграфіі, ажыццяўленні бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў. На 57-й сесіі ІФЛА (М., 1991 г.) адзначалася, што неаператыўнасць дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі (затрымка ў атрыманні абавязковага экзэмпляра, бібліяграфаванні і распаўсюджванні) вядзе да таго, што да паступлення дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі выданні ўжо распрададзены, іх немагчыма выкарыстоўваць для камплектавання фондаў бібліятэк. Вядзенне электроннага каталога "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі" і забеспячэнне доступу да яго рэсур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

саў праз інтэрнет пэўным чынам вырашаюць праблему павышэння аператыўнасці інфармавання карыстальнікаў, спрыяюць абмену данымі, паляпшаюць распаўсюджанне бібліяграфічнай інфармацыі на электронных носьбітах, іх выкарыстанне.

Да ліку крыніц агульнай бібліяграфіі, якія фарміруюць ядро ДБФ універсальных і спецыяльных навуковых бібліятэк, адносяцца выданні рэспубліканскіх органаў дзяржаўнай сістэмы навукова-тэхнічнай інфармацыі, якія адлюстроўваюць *спецыяльныя віды навукова-тэхнічнай літаратуры і дакументацыі*[*].

*Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці* краіны сістэматычна дае афіцыйную інфармацыю аб зарэгістраваных аб'ектах прамысловай уласнасці шляхам выдання афіцыйных бюлетэняў «Вынаходствы. Карысныя мадэлі. Прамысловыя ўзоры», «Таварныя знакі» (штокватальныя выданні), «Гатункі раслін» (штогоднік). Ва ўсіх бюлетэнях ёсць раздзел афіцыйных паведамленняў, дзе публікуюцца заканадаўчыя акты і нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць адносіны ў галіне аховы прамысловай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

У бюлетэні «Вынаходствы. Карысныя мадэлі. Прамысловыя ўзоры» публікуюцца звесткі аб рашэннях, што прымаюцца ў адносінах да заяўкі на вынаходніцтва ў ходзе працэдуры яе падачы, правядзення экспертызы, рэгістрацыі ў дзяржаўным рэестры. Сярод раздзелаў бюлетэня – інфармацыя аб заяўках на вынаходніцтвы, якія ўключаюць бібліяграфічныя даныя і асноўныя пункты формулы вынаходніцтва, сістэматычны і нумарацыйны паказальнікі заявак; інфармацыя аб патэнтах на вынаходніцтвы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры.

У афіцыйным бюлетэні «Таварныя знакі» друкуюцца звесткі аб кожным таварным знаку, які зарэгістраваны ў дзяржаўным рэестры, уключаючы бібліяграфічныя даныя таварнага знака, яго выяву, а таксама пералік класаў з указаннем тавараў і паслуг, у адносінах да якіх зарэгістраваны таварны знак. Маецца сістэматычны і нумарацыйны паказальнікі заявак і пасведчанняў на таварныя знакі і знакі абслугоўвання.

[*] Больш глыбока студэнты знаёмяцца з гэтымі рэсурсамі пры вывучэнні курса «Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне прыродазнаўчых, тэхнічных і медыцынскіх ведаў».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У афіцыйным бюлетэні “Гатункі раслін” публікуюцца звесткі аб паступіўшых заяўках, ліцэнзійных дагаворах, патэнтах на гатункі раслін. У бюлетэні друкуецца дзяржаўны рэестр ахоўных гатункаў раслін з іх афіцыйным апісаннем.

Інфармаванне аб стандартах ажыццяўляе *Беларускі дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь*.

У сістэме Дзяржстандарта ўведзена ў прамысловую эксплуатацыю інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) “Стандарт”, якая ўяўляе шматфункцыянальны праграмны комплекс, што дазваляе аўтаматызаваць усе асноўныя функцыі па рабоце з фондамі нарматыўных дакументаў і аказанні інфармацыйных паслуг. У састаў ІПС “Стандарт” уваходзіць банк даных нарматыўных дакументаў па стандартызацыі аб’ёмам 62 тыс. дакументаў. Банк даных уключае наступныя бібліяграфічныя базы даных: БД СТБ (Дзяржаўныя стандарты РБ), БД ГОСТ (Міждзяржаўныя нарматыўныя дакументы), БД ТУ (Тэхнічныя ўмовы прадпрыемстваў і арганізацый), БД ІСА (Стандарты міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі), БД МЭК (Стандарты міжнароднай электратэхнічнай камісіі), БД ДІН ЕН (Еўранормы, гарманізаваныя ў Германіі), а таксама БД санітарных нормаў, правіл, патрабаванняў да розных сфер дзейнасці.

Інфармаванне аб стандартах ажыццяўляецца і з дапамогай традыцыйных крыніц: штомесячнага «Бюллетеня новых поступлений» в Национальный фонд стандартов; інфармацыйнага паказальніка «ИУС РБ. Стандарты», які выходзіць адзін раз у два месяцы як дадатак да інфармацыйнага зборніка «Новости. Стандартизация и сертификация» і ўтрымлівае звесткі аб дзяржаўных стандартах РБ, міждзяржаўных стандартах; штогадовых выпускаў «Каталога нормативных документов по стандартизации», якія змяшчаюць інфармацыю аб усіх стандартах РБ (СТБ, РСТ БССР, РСТ Беларусі), нарматыўных дакументах і класіфікатарах, зацверджаных Белстандартам, а таксама аб міждзяржаўных стандартах і дзяржаўных стандартах РФ, прынятых у якасці дзяржаўных стандартаў РБ. Дзяржстандарт выдае ячшэ адно афіцыйнае выданне ў выглядзе інфармацыйнага паказальніка “ИУТУ. Технические условия Республики Беларусь”, які выходзіць адзін раз у два месяцы і адлюстроўвае адпаведны від

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі. Кумулятыўную інфармацыю аб тэхнічных умовах утрымлівае каталог “Технические условия”, які рыхтуецца ў двух тамах і адлюстроўвае інфармацыю аб дзеючых дакументах па стану на бягучы год.

Сярод універсальных па змесце і агульных па прызначэнні з'яўляюцца дапаможнікі *БелІСА*. Паказальнік «Бюллетень регистрации НИР, ОКР, ОТР» з'яўляецца перыядычным выданнем, якое ўтрымлівае пералік назваў зарэгістраваных у інстытуце работ. Сістэматызацыя матэрыялу ажыццяўляецца па рубрыках дзяржаўнага рубрыкатара навукова-тэхнічнай інфармацыі, а ўнутры рубрык – па нумарах дзяржаўнай рэгістрацыі. «Реферативный сборник непубликуемых работ. Отчёты о НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи» ўключае рэфераты завершаных навуковых і дэпаніраваных работ.

БелІСА вядзе паўнатэкставую БД «Каталог НДР і ВКР» са штотыднёвым аднаўленнем і забеспячэннем онлайнавага доступу да яе.

РНТБ генерыруе дакументаграфічную базу даных «Прамысловыя каталогі» са штотыднёвай актуалізацыяй.

### *5.7. Крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі*

Побач з бягучым улікам друкаванай прадукцыі ў краіне вядзецца значная работа па стварэнні крыніц рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі. Мэта іх адлюстраваць усё, што выйшла ў краіне з пачатку кнігавыдання да пачатку дзяржаўнай рэгістрацыі і да цяперашняга часу. Асноўныя функцыі крыніц разглядаемага віду наступныя: гісторыка-культурная, крыніцазнаўчая, пошукавая. Выкарыстоўваюцца яны ў рабоце бібліятэк для рэтраспектыўнага пошуку неабходных дакументаў; як непасрэдныя крыніцы для ўсебаковых даследаванняў па гісторыі кнігавыдання, гісторыі навук; як помнікі, якія сведчаць аб дасягненнях краіны ў развіцці культуры, навукі, розных сфер дзейнасці.

Пры фарміраванні сістэмы дапаможнікаў выкарыстоўваюцца розныя прыметы бібліяграфічнага ўліку: дзяржаўна-тэрытарыяльны (улік дакументаў, выпушчаных на тэрыторыі РБ); моўны (улік дакументаў на беларускай мове незалежна ад месца выдання); аўтарскі (улік дакументаў, ство-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раных ураджэнцамі Беларусі); краіназнаўчы (улік дакументаў аб Беларусі, выпушчаных за яе межамі). Пры стварэнні дапаможнікаў нацыянальнай бібліяграфіі ўлік дакументаў ажыццяўляецца зыходзячы з канкрэтна-гістарычных меж беларускай дзяржавы ў пэўны храналагічны перыяд.

Аб’ектамі бібліяграфічнага ўліку з’яўляюцца тыражыраваныя ці прызначаныя для тыражыравання дакументы на любых носьбітах інфармацыі. У якасці асноўных аб’ектаў бібліяграфічнага ўліку выступаюць кнігі і брашуры, аўтарэфераты дысертацый, лістоўкі, перыядычныя выданні і выданні, якія прадаўжаюцца, картаграфічныя, нотныя выданні, выданні выяўленчага мастацтва, бібліяграфічныя дапаможнікі, артыкулы, рэцэнзіі, выданні для сляпых, афіцыйныя дакументы, патэнтныя дакументы, стандарты, прамысловыя каталогі, справаздачы аб НДР і ВКР, дэпаніраваныя рукапісы, дысертацыі, АВД (грампласцінкі, лазерныя дыскі), электронныя выданні і праграмныя сродкі. Улік гэтых аб’ектаў бібліяграфавання ажыццяўляецца, як правіла, паасобна ў залежнасці ад носьбіта інфармацыі, яго знакавай прыроды, перыядычнасці, структуры і віду публікацыі, а таксама формы прадастаўлення інфармацыі.

На цяперашні час у нашай краіне ў дапаможніках агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі знайшлі адлюстраванне кнігі, перыядычныя выданні, музычная літаратура, артыкулы і рэцэнзіі, бібліяграфічныя дапаможнікі. Таму, безумоўна, наперадзе яшчэ вялікая работа па стварэнні паўнацэннай сістэмы рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі.

Асаблівасці крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі наступныя:

– базай складання рэтраспектыўных паказальнікаў у адрозненне ад бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, для якой базай з’яўляецца першасны паток новай друкаванай прадукцыі, выступаюць ужо назапашаны і сфарміраваны масіў першасных дакументаў і бібліяграфічныя выданні (фонды і каталогі буйнейшых бібліятэк, раней выдадзеныя бібліяграфічныя дапаможнікі);

– фундаментальнасць і паўната даных бібліяграфічнага запісу;

– абгрунтаванасць выбару ўліковага перыяду;

– храналагічная пераемнасць у выданні бібліяграфічных дапаможнікаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навуковая дасканаласць і дакладнасць сістэматызацыі і апрацоўкі бібліяграфуемага матэрыялу;

– абгрунтаванасць фармальных абмежаванняў у адборы дакументаў;

– развітая сістэма сродкаў, якая забяспечвае шматаспектны пошук.

Да асноўных тыпаў рэтраспектыўных дапаможнікаў нацыянальнай бібліяграфіі адносяцца бібліяграфічныя рэпертуары (паказальнікі, БД), бібліяграфічныя каталогі і зводныя каталогі-рэпертуары. Бібліяграфічны рэпертуар – гэта бібліяграфічны дапаможнік, які максімальна поўна адлюстроўвае дакументы краіны/нацыі, выдадзеныя за пэўны храналагічны перыяд незалежна ад месца іх захоўвання. Бібліяграфічны каталог – гэта бібліяграфічны дапаможнік, які максімальна поўна адлюстроўвае фонды некалькіх (зводны каталог) або аднаго нацыянальнага фондасховішча дакументаў. Зводны каталог-рэпертуар – гэта бібліяграфічны дапаможнік, які максімальна поўна адлюстроўвае дакументы краіны/нацыі і змяшчае звесткі аб наяўнасці іх у фондасховішчах.

Яны могуць быць уласна рэтраспектыўнымі, г. зн. прадстаўляць вынік рэтраспектыўнага бібліяграфавання дакументаў за пэўны храналагічны перыяд, а могуць мець кумулятыўны характар, назапашваць даныя па бягучых дзяржаўных бібліяграфічных паказальніках і/або шляхам вядзення каталогаў асобных нацыянальных сховішчаў дакументаў.

Суб’ектамі падрыхтоўкі крыніц нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі выступаюць Нацыянальная кніжная палата, а таксама буйнейшыя бібліятэкі краіны. Функцыі паміж імі размеркаваны такім чынам: кніжная палата стварае крыніцы, у якіх адлюстроўваюцца дакументы, выдадзеныя пасля пачатку дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў, а бібліятэкі, пераважна Нацыянальная бібліятэка Беларусі як цэнтр агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі, – ад пачатку кнігадрукавання да пачатку дзяржаўнай рэгістрацыі. Вельмі часта такія крыніцы складаюцца агульнымі намаганнямі розных суб’ектаў сістэмы дакументных камунікацый.

У ДБФ бібліятэк сярод крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі прысутнічаюць дапаможнікі, выпушчаныя ў Рэспубліцы Беларусь, якія адлюстроўваюць разнастайныя віды выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавасць для гісторыкаў бібліятэчна-бібліяграфічнай справы ўяўляюць падрыхтаваныя аддзелам беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (зараз Нацыянальная бібліятэка Беларусі) выданні рэтраспектыўных паказальнікаў пад агульнай назвай "Летапіс беларускага друку", якія выходзілі ў 1927–1929 гг., у 1969 г. (Падрабязная характарыстыка гэтых выданняў дадзена ў падручніку В.Е.Лявончыкава "Беларуская бібліяграфія. Агульны курс".) Але тэарэтычная нераспрацаванасць у той час пытанняў падрыхтоўкі такіх крыніц, недакладнасць у вызначэнні метадычных падыходаў, непаўната адлюстравання некаторых відаў выданняў, а таксама абмежаванасць тыражу, спосаб друкавання прывялі да таго, што многія з іх былі "перакрыты" новымі крыніцамі рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі, некаторыя патрабуюць свайго перавыдання.

Работа над серыяй рэтраспектыўных выданняў зводнага каталога, аб'яднаных агульнай назвай "Кніга Беларусі", непасрэдна пачалася ў 1972 г., калі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі быў створаны сектар зводных каталогаў. Гэтая серыя павінна была ахапіць наступныя тэматычныя раздзелы:

– старадрукаваныя кірылічныя кнігі XVI – XVIII стст.;

– кнігі XIX – пачатку XX ст. на беларускай мове;

– кнігі XIX – пачатку XX ст. на рускай мове;

– кнігі XIX – пачатку XX ст. на іншых мовах народаў Расіі і замежных мовах.

Першыя тры раздзелы серыі былі ўключаны ў выданне "Кніга Беларусі. Зводны каталог", які падрыхтаваны Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У.І.Леніна і выпушчаны выдавецтвам "Беларуская савецкая энцыклапедыя" ў 1986 г. Каталог адлюстроўвае кніжныя выданні, выпушчаныя з 1517 г. па 1917 г., і складаецца з трох частак.

*Частка 1. Старадрукаваныя кірылічныя кнігіі XVI–XVIII стст.* (складальнік Г.Я.Галенчанка). У каталог уключаны старадрукаваныя кірылічныя кнігі, якія выйшлі з друкарняў, што дзейнічалі ў пэўны перыяд на тэрыторыі Беларусі, у Вільні, часткова ў Польшчы. Выдавецкая дзейнасць беларускіх друкароў, якія працавалі ў XVI–XVII стст. у Расіі і на Украіне дастаткова поўна ўлічана ў каталогах старадрукаваных кірылічных выданняў гэтых краін. Выданні апісаны de visu па фондах буйнейшых бібліятэк былога СССР. Выданні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія захоўваюцца за мяжой, апісаны паводле фотарэпрадукцыйных матэрыялаў.

Бібліяграфічны запіс складаецца з бібліяграфічнага апісання, якое адпавядае агульнапрынятай на сучасным этапе методыцы апісання старадрукаваных кірылічных выданняў; выбарачна прыводзяцца спасылкі на месцы захоўвання, месца захавання апісанага ў каталогу экзэмпляра стаіць першым у спасылках, пры гэтым адзначаецца бібліятэчны шыфр або інвентарны нумар кнігі; бібліяграфічныя спасылкі, у якіх скарочана паказаны асноўныя каталогі і апісанні старадрукаваных кніг, а таксама кнігазнаўчыя даследаванні прыводзяцца ў храналагічным парадку.

Групоўка матэрыялу ў гэтай частцы – храналагічная па гадах выхаду выданняў, унутры года матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку.

Дадаткам з'яўляецца "Спіс кірылічных кніг грамадзянскага друку". Грамадзянскае кнігадрукаванне ў канцы XVIII ст. адлюстроўвала новы этап у развіцці кнігавыдавецкай справы ў Беларусі пасля ўз'яднання яе з Расіяй. Кірылічныя выданні грамадзянскага друку друкаваліся ў мясцовых друкарнях на падставе расійскіх законаў. Таму кнігі грамадзянскага друку, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі, у большасці з'яўляюцца адначасова помнікамі беларускага і рускага друку. У дадзеным спісе ўлічаны кірылічныя выданні, якія выйшлі на тэрыторыі Беларусі і ў Вільні, скарочаныя апісанні гэтых выданняў запазычаны са "Сводного каталога русской книги гражданской печати XVIII века, 1725–1800".

Гэтая частка каталога забяспечана дапаможнымі паказальнікамі: імянным (акрамя аўтараў бібліяграфічных і краязнаўчых работ); назваў; выданняў паводле месца і часу выхаду, друкарняў, друкароў; геаграфічным.

*Частка 2. Выданні на беларускай мове. XIX – пачатак XX ст.* (складальнікі Т.В.Непарожная, Т.К.Радзевіч). Гэтая частка ўяўляе сабой і зводны каталог, і рэпертуар беларускіх кніг, надрукаваных кірыліцай і лацінскім шрыфтам, таму што ў ім улічаны і кнігі, якія не выяўлены ў фондах бібліятэк краіны, але вядомыя па бібліяграфічных, гістарычных і літаратурных крыніцах. У каталогу адлюстраваны кнігі, напісаныя на беларускай мове, а таксама рускія і польскія, у якіх апублікаваны беларускія тэксты ў арыгінале.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічны запіс складаецца з бібліяграфічнага апісання, анатацый даведачнага характару, звестак аб бібліятэках, дзе яны знаходзяцца (бібліятэкі пазначаны сігламі). Апісанне кніг прыводзіцца на мове арыгінала, а заўвагі і каментарыі – на беларускай мове.

У адрозненне ад папярэдняй часткі групоўка матэрыялу алфавітная паводле прозвішчаў аўтараў ці назваў для ўсіх кніг, незалежна ад шрыфту друкавання.

Асобна вылучаны спіс перыядычных выданняў, якія выходзілі ў дарэвалюцыйны перыяд на беларускай мове. Ён пабудаваны паводле тых жа прынцыпаў, што і асноўны тэкст каталога. Такім чынам, гэты выпуск адлюстроўвае ўвесь дарэвалюцыйны беларускі друк, акрамя лістовак.

Гэтая частка забяспечана шэрагам дапаможных паказальнікаў, сярод якіх імянны; месцаў выданняў і друкарняў; выдавецтваў; відаў літаратуры.

*Частка 3. Выданні на рускай мове. XIX – пачатак XX ст.* (складальнікі Т.В.Непарожная, Т.К.Радзевіч) уключае кнігі на рускай мове, выпушчаныя на тэрыторыі Беларусі ў дарэвалюцыйны час. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі дадзенай часткі адпавядаюць методыцы падрыхтоўкі другой часткі каталога. Паказальнікі да яе дапамагаюць у бібліяграфічным пошуку па імені (імянны); па змесце (прадметны); па геаграфічных аб'ектах (геаграфічны); па месцы выдання і друкарнях.

У даведачна-метадычным апараце выдання, акрамя ўводных артыкулаў да кожнай часткі, у якіх даюцца гісторыя кніжнага друку, характарыстыка больш значных выданняў, раскрываюцца метадычныя асаблівасці яе падрыхтоўкі, а таксама дапаможных паказальнікаў, даецца агульная да ўсяго выдання прадмова "Ад складальнікаў", у канцы каталога маюцца спіс бібліятэк і музеяў, іх адрасы і ўмоўныя абазначэнні, спіс скарачэнняў, змест. Усе ўводныя артыкулы і дадаткі даюцца паралельна на дзвюх мовах – беларускай і рускай.

Разгледжаны дапаможнік змяшчае багаты матэрыял па гісторыі беларускай культуры і значна аблягчае пошук патрэбных выданняў.

Да ліку крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі трэба аднесці і "*Сводный каталог нелегальной и запрещенной*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*печати XIX в., имеющейся в крупных библиотеках Беларуси»*, падрыхтаваны аддзелам рэдкай і старадрукаванай кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна і выпушчаны ў 1981 г. (складальнікі А.А.Анціпава, Н.Н.Кушнярова). Зводны каталог не поўны, але з'яўляецца важнай крыніцай вывучэння дэмакратычнага руху на тэрыторыі Беларусі для навуковых супрацоўнікаў, а таксама для работнікаў бібліятэк пры ажыццяўленні рэтраспектыўнага пошуку.

Каталог мае чатыры часткі і ўключае беларускія і рускія забароненыя выданні XIX ст., якія выходзілі як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі. Першая частка каталога адлюстроўвае беларускія нелегальныя і забароненыя выданні XIX ст., сярод якіх кнігі, перыядычныя выданні не толькі на беларускай мове, але і на рускай, якія былі выдадзены на тэрыторыі Беларусі або адносіліся да яе паводле зместу, пракламацыі. Дапаўняецца частка спісам матэрыялаў, апісаных па літаратурных крыніцах. Другая частка адлюстроўвае рускія нелегальныя і забароненыя выданні XIX ст., сярод якіх кнігі і перыядычныя выданні. У трэцюю частку ўключаны выданні (кнігі, перыядычныя выданні), забароненыя для публічных бібліятэк і грамадскіх чытальняў. У чацвёртай частцы адлюстроўваюцца замежныя творы, не дазволеныя для карыстання ў Расіі.

Размяшчэнне матэрыялу фармальнае, па алфавіце аўтараў і назваў твораў. Бібліяграфічнае апісанне даецца на мове арыгінала. У бібліяграфічным запісе прысутнічаюць сіглы фондатрымальнікаў гэтых выданняў, а таксама нумары, пад якімі яны зарэгістраваны ў “Сводном каталоге русской нелегальной и запрещенной печати ХХ века. Книги и периодические издания”, а таксама зводным каталозе “Кніга Беларусі”. Разглядаемы каталог мае два дапаможныя паказальнікі: храналагічны паказальнік беларускіх нелегальных і забароненых выданняў XIX ст.; храналагічны паказальнік рускіх нелегальных і забароненых выданняў XIX ст.

Складальнікі правялі значную даследчую работу па выяўленні і апісанні забароненых выданняў у фондах бібліятэк і архіваў Беларусі, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Львова, Вільнюса, Варшавы, Кракава. Яны ўлічылі і тыя выданні, якія адсутнічаюць у бібліятэках краіны, але вядомыя паводле літаратурных ці архіўных крыніц. У выніку гэтага ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рабоце прадстаўлены больш ці менш поўны рэпертуар беларускага, рускага, а ў асобных выпадках і замежнага нелегальнага і забароненага друку, які распаўсюджваўся на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.

Трэба адзначыць, што ў выдадзеных крыніцах не зусім вырашана задача поўнага адлюстравання кніжных выданняў: не адлюстраваны кнігі, выдадзеныя ў перыяд з 1917 г. па 1924 г.; кнігі, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі на іншых, акрамя рускай і беларускай, мовах. Звесткі аб гэтых выданнях можна атрымаць праз "Летапіс беларускага друку" (ч.3, вып.1; ч.3, сш. 2), карткавыя каталогі і БД, якія вядуць аддзелы беларускай літаратуры НББ, рэдкіх кніг буйнейшых бібліятэк Беларусі. Так, аддзел рукапісаў, старадрукаваных і рэдкіх выданняў НББ генерырые некалькі баз даных: «Кніга Беларусі» (вядзецца з 1994 г.) улічвае дакументы, выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. на замежных мовах (лацінскі шрыфт) і адлюстроўвае фонды вядучых бібліятэк Беларусі, СНД, Еўропы; аддзел беларускай літаратуры НББ вядзе работу па стварэнні БД беларускай кнігі і кніг пра Беларусь з другой паловы XIX ст. па 1993 г. (з 1993 г. гэтыя матэрыялы адлюстроўваюцца ў ЭК НББ).

Што тычыцца адлюстравання кніжных выданняў з 1924 г., то асновай для стварэння такіх выданняў з'яўляюцца каталогі Нацыянальнай кніжнай палаты. Акрамя таго, часткова звесткі аб гэтых выданнях можна атрымаць з пяцігоднікаў «Кнігі Беларускай ССР…», якія рыхтавала НКП з 1961 г. па 1981 г. і якія ўяўляюць сабой кумулятыўныя выпускі «Кніжнага летапісу» (асноўная частка) за 1956–1980 гг., (у іх не знайшлі адлюстравання кнігі і брашуры вузкага чытацкага прызначэння: праграмна-метадычныя матэрыялы, буклеты, даведачна-інфармацыйныя і ведамасныя выданні). Багаты дапаможны апарат гэтых выданняў, безумоўна, значна аблегчыць пошук патрэбных бібліяграфічных і фактаграфічных звестак аб кніжных выданнях нашай краіны.

У Рэспубліцы Беларусь выдадзены шэраг крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі, дзе знайшлі адлюстраванне перыядычныя выданні.

Сярод іх бібліяграфічны паказальнік *«Перыядычны друк Беларусі. 1817–1916»,* падрыхтаваны аддзелам беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У.І.Леніна і выдадзены ў 1960 г. (складальнік А.А.Сакольчык). У паказальніку прыводзяцца звесткі аб дарэвалюцыйных перыядычных выданнях, якія выходзілі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, а таксама ў гарадах былога Заходняга краю Расіі і ўтрымлівалі шмат звестак аб Беларусі, і перыядычных выданнях на беларускай мове незалежна ад месца выдання (гэта значыць, што тэрытарыяльныя граніцы пашыраны пры адборы дакументаў з прычыны гістарычных умоў; дакументы адбіраліся па дзяржаўна-тэрытарыяльным, моўным прынцыпах і прынцыпе экстэрыёрыкі). У канцы паказальніка пададзены спіс дарэвалюцыйных перыядычных выданняў на беларускай мове.

Для падрыхтоўкі дадзенага паказальніка былі выкарыстаны фонды буйных бібліятэк Беларусі, Расіі, а таксама агульныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі Расіі, СССР, у якіх адлюстроўваецца перыядычны друк. У бібліяграфічнай характарыстыцы выдання, якое складаецца з бібліяграфічнага апісання па першым нумары выдання, значком «х» адзначаны выданні, якія апісаны паводле бібліяграфічных крыніц.

Паказальнік уключае прадмову, два алфавітныя рады апісанняў, даведачны апарат. У адным з алфавітных радоў змяшчаецца апісанне перыядычных выданняў на рускай, у другім – на беларускай мове.

Да разглядаемага выдання быў падрыхтаваны шэраг дапаможных паказальнікаў, сярод якіх – імянны алфавітны рэдактараў і асоб, якія ўпамінаюцца ў апісанні; сістэматычны; месцаў выдання; арганізацый, што выпусцілі паказальнік; храналагічны. Яны дазваляюць ажыццяўляць разнастайны бібліяграфічны пошук як па змесце перыядычных выданняў, так і па іншых прыметах.

Працягам гэтага выдання сталі паказальнікі, якія адлюстроўвалі асобна часопісы і газеты краіны.

Бібліяграфічны паказальнік “Перыядычны друк Беларускай ССР: 1917–1958. Вып. 1. Часопісы”, складзены сумеснымі намаганнямі Кніжнай палаты БССР і Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна, ахоплівае часопісы і серыйныя выданні тыпу часопісаў (“Працы”, “Бюлетэні”, “Вучоныя запіскі”), якія выходзілі ў БССР у 1917–1958 гг. У паказальнік уключаны таксама асобныя часопісы, якія выходзілі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маскве і Ленінградзе, але па сваім змесце маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі або друкаваліся на беларускай мове. Крыніцамі выяўлення гэтых дакументаў з’яўляліся фонды бібліятэк, а таксама бібліяграфічныя крыніцы.

Часопісы апісаны пад іх апошняю назваю і размешчаны ў алфавітным парадку. Умоўнае абазначэнне – адна зорачка (*) указвае на тое, што не ўсе нумары апісаны de visu. Дзве зорачкі (**) абазначаюць, што звесткі ўзяты з бібліяграфічных крыніц. Цалкам жа бібліяграфічнае апісанне ўключае назву часопіса, падзагаловачныя даныя, звесткі аб перыядычнасці, месцы выдання, гадах выдання, табліцы выхаду нумароў, заўвагі, што датычылі ў асноўным пытанняў выхаду і распаўсюджвання выданняў. Часопісы апісаны на той мове, на якой яны выходзілі, за выключэннем часопісаў на яўрэйскай мове, якія апісаны на беларускай мове, а побач прыводзіцца назва на яўрэйскай мове ў беларускай транскрыпцыі. Часопісы, якія выходзілі і на беларускай, і на рускай мовах, апісаны на беларускай мове пад двума нумарамі.

Да выдання складзены дапаможныя паказальнікі: сістэматычны; установаў і арганізацый, ад імя якіх выдаваўся часопіс; месцаў выдання (акрамя Мінска); храналагічны.

Дзяржаўная кніжная палата РБ падрыхтавала ў дзвюх частках бібліяграфічны паказальнік *“Газеты Беларускай ССР. 1917–1975”* (складальнікі Л.К.Фарасценская, К.М.Калугіна, Д.М.Кацюшына). У паказальніку ўлічаны газеты па дзяржаўна-тэрытарыяльным прынцыпе незалежна ад мовы выдання. У першай частцы адлюстраваны рэспубліканскія, губернскія, абласныя, акруговыя, павятовыя, раённыя і гарадскія газеты. У другую частку ўключаны газеты МТС, фабрык, заводаў, калгасаў, саўгасаў, навуковых установаў, транспартныя, а таксама газеты таварыстваў, камітэтаў і арганізацый, якія выходзілі ў першыя гады савецкай улады.

Пры адборы газет улічвалася іх ідэйна-палітычная накіраванасць, не ўключаны газеты буржуазныя, нацыяналістычныя, якія выдаваліся толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (інфармацыю аб апошніх дае паказальнік В.С.Адамовіч “Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны”). Большасць газет прагледжаны de visu, а калі звесткі ўзяты з дакументальных крыніц, даюцца аб ёй звесткі пад рубрыкай “Крыніцы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічнае апісанне адпавядае ГОСТ і прыводзіцца пад апошняй назвай газеты ўліковага перыяду. За адзінку апісання прыняты ўсе нумары адной газеты з пачатку яе выхаду да канца года або да спынення яе выдання. Калі газета выходзіла на дзвюх мовах, то кожная з іх апісана самастойна. Апісанне газет, якія выдаваліся на беларускай і рускай мовах, складзена на мове арыгінала. Газеты на іншых мовах дадзены ў перакладзе на беларускую мову з указаннем мовы выдання. Для газет, якія выходзілі на польскай і літоўскай мовах, услед за перакладам загалоўка праз знак роўнасці ўказаны загаловак газеты на мове арыгінала.

Пошуку звестак аб газетах дапамагаюць разнастайныя дапаможныя паказальнікі, сярод якіх – адміністрацыйна-тэрытарыяльны месцаў выдання газет; алфавітны паказальнік месцаў выдання газет і раёнаў; устаноў і арганізацый, якія выдавалі газеты; газет спецыяльнай тэматыкі і для акрэсленых чытацкіх груп; падпольных газет перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Аб перыядычных выданнях дае інфармацыю таксама паказальнік, складзены В.С.Адамовіч "Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны". Выданне здзейснена Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У.І.Леніна і Кніжнай палатай у 1975 г. Паказальнік складаецца з двух раздзелаў у адпаведнасці з аб'ектам бібліяграфавання (газеты, часопісы). Пры выяўленні матэрыялаў выкарыстоўваліся фонды бібліятэк, архіваў, музеяў. Асноўная частка матэрыялаў была прагледжана аўтарам de visu, але выкарыстоўваліся і звесткі з іншых дакументальных крыніц. Усяго ў паказальнік уключаны звесткі аб 163 газетах і бюлетэнях, 80 часопісах.

У раздзелах матэрыял размешчаны па алфавіце назваў. У бібліяграфічным запісе, акрамя бібліяграфічнага апісання, змяшчаюцца звесткі аб месцах захоўвання камплектаў і асобных нумароў гэтых выданняў, таму яго можна лічыць зводным каталогам падпольных перыядычных выданняў. Да кожнага раздзела складзены асобныя дапаможныя паказальнікі. Да першага ("Газеты") – паказальнікі калектываў; імянны; паказальнік выдання газет па абласцях. Да другога ("Часопісы") – паказальнікі калектываў і імянны. У якасці дадатку прыводзіцца спіс літаратуры, у які ўключаны ўспаміны рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дактараў, літаратурных работнікаў і іншых удзельнікаў гэтых выданняў.

У 2003 г. НКП выдала рэтраспектыўны бібліяграфічны паказальнік *“Газеты Беларусі. 1776–1975”* (складальнікі Л.М.Няхайчык, В.Я.Бакуновіч, Ю.А.Ерашэвіч). Разгледжаныя вышэй паказальнікі, якія адлюстроўваюць газетныя выданні, не страчваюць свайго значэння для сучаснай бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі. Апошні дапаможнік уяўляе сапраўдны рэпертуар перыёдыкі, у якім беларускія газеты прадстаўлены найбольш поўна, без абмежаванняў па аспектах палітыка-ідэалагічнага характару, што было характэрным для папярэдніх рэтраспектыўных паказальнікаў падобнага тыпу.

Паказальнік змяшчае інфармацыю аб 2010 беларускіх газетах за перыяд выхаду першай газеты на тэрыторыі сучаснай Беларусі ("Gazeta Grodzienska", май 1776 г.) да 1975 г. уключна. У паказальніку вытрыманы тэрытарыяльныя і храналагічныя межы адносна Беларусі. Паказальнік змяшчае даныя аб газетах на беларускай мове, а таксама на іншых мовах (рускай, літоўскай, нямецкай, польскай, яўрэйскай), выдадзеных на тэрыторыі сучаснай Беларусі ці за яе межамі, калі яны мелі ў выхадных звестках прыналежнасць органа выдання да Беларусі. Значная частка газет прагледжана de visu. Інфармацыя да зводнага апісання адной газеты збіралася па крупінках у розных бібліяграфічных установах. Асноўнай базай для складання паказальніка паслужылі фонды і каталогі Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі, музея Вялікай Айчыннай вайны і інш. Частка інфармацыі па дарэвалюцыйнай перыёдыцы была атрымана з дзяржаўных абласных архіваў краіны.

Паказальнік складаецца з трох раздзелаў: газеты на беларускай і рускай мовах; газеты на замежных мовах; аднадзённыя газеты.

Дапамагаюць у аператыўным пошуку неабходных звестак дапаможныя паказальнікі: імянны; алфавітны назваў газет; месцаў выданняў; храналагічны; калектываў (арганізацый і ўстаноў, што выдавалі газеты; моў (акрамя беларускай і рускай) газет і тэкстаў газетных публікацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пошук звестак аб перыядычных выданнях, што выходзілі і выходзяць на сённяшні дзень на тэрыторыі Беларусі, можна ажыццяўляць па "Летапісе перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца" Нацыянальнай кніжнай палаты.

Сярод відаў выданняў, якія знайшлі адлюстраванне ў агульных рэтраспектыўных дапаможніках, акрамя кніг і перыядычных выданняў, вылучаюцца нотныя выданні. Нацыянальная кніжная палата выпусціла чатыры дапаможнікі, тры з іх пад назвай "Музычная літаратура БССР", чацвёрты – "Музычная літаратура Беларусі", якія ў сукупнасці адлюстравалі інфармацыю аб нотных творах з 1917 г. па 1990 г. Нягледзячы на адзіны аб'ект бібліяграфавання, кожны з гэтых выпускаў мае свае асаблівасці.

У першым дапаможніку *"Музычная літаратура БССР"* (складальнік Ф.А.Мерына) адлюстроўваюцца ноты, выдадзеныя ў Беларусі ў 1917–1961 гг., а таксама творы беларускіх кампазітараў, выдадзеныя ў цэнтральных выдавецтвах Масквы і Ленінграда. Выданне мае тры раздзелы, што адпавядае розным відам выданняў: ноты твораў беларускіх кампазітараў, выдадзеныя ў БССР; ноты беларускіх кампазітараў, выдадзеныя ў Маскве і Ленінградзе; ноты твораў небеларускіх кампазітараў, выдадзеныя ў БССР. У раздзелах матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку па прозвішчах кампазітараў, складальнікаў і назваў зборнікаў. У бібліяграфічных запісах раскрываецца змест твораў музычных зборнікаў. Да дапаможніка падрыхтавана вялікая колькасць дапаможных паказальнікаў: імён кампазітараў; аўтараў тэксту і перакладаў; алфавітны назваў твораў; назваў і першых слоў тэксту вакальных твораў; алфавітны паказальнік танцаў; сістэматычны паказальнік нот па раздзелах (музычны фальклор, вакальная музыка, вакальна-сімфанічная і спецыяльная музыка).

Другі дапаможнік *"Музычная літаратура БССР"* (складальнік М.С.Матусава) адлюстроўвае нотныя выданні за 1962–1970 гг. У ім у адрозненне ад папярэдняга побач з нотнымі творамі, што выйшлі асобнымі выданнямі, адлюстраваны ўнутрыкніжныя і ўнутрычасопісныя публікацыі, выдадзеныя не толькі ў БССР, але і ў іншых рэспубліках СССР. Па іншай прымеце зроблена і размяшчэнне літаратуры ў паказальніку. Групоўка матэрыялу аблягчае пошук па тыпах выданняў нотнай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У трэцім дапаможніку *“Музычная літаратура БССР”* (складальнік І.С.Колас) адлюстроўваюцца нотныя выданні, апублікаваныя ў рэспубліканскім перыядычным друку за 1945–1975 гг.

У апошні, чацвёрты дапаможнік, які выйшаў у 1997 г. пад назвай *“Музычная літаратура Беларусі, 1971–1990”* (складальнікі Л.А.Цітова, Э.А.Гурыновіч), уключаны асобныя выданні ўсіх твораў музычнай літаратуры, унутрыкніжныя публікацыі нот, ноты з перыёдыкі Беларусі, а таксама музычныя творы беларускага фальклору ці беларускіх кампазітараў, апублікаваныя за межамі ў перыяд з 1971 г. па 1990 г. Крыніцамі для складання паказальніка паслужылі дзяржаўныя бібліяграфічныя паказальнікі НКП. Нотны матэрыял згрупаваны па наступных раздзелах: музычны фальклор; творы асобных кампазітараў; зборнікі музычных твораў; падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Ноты апісаны пад прозвішчамі кампазітараў, якія стварылі ці апрацавалі твор. Апрацоўкі народных песень і танцаў прыводзяцца ў раздзеле “Музычны фальклор”. Пры апісанні зборнікаў музычных твораў раскрыты іх змест. Выданне забяспечана шэрагам дапаможных паказальнікаў: імянным; паказальнікам загалоўкаў і першых слоў тэксту вакальных твораў; паказальнікам інструментальнай музыкі; загалоўкаў выданняў, у якіх надрукаваны ноты; сістэматычным паказальнікам музычных твораў згодна схемы класіфікацыі нотных выданняў.

Да крыніц рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі адносіцца таксама паказальнік, у якім знайшлі адлюстраванне аналітычныя матэрыялы з выданняў, – часопісныя артыкулы і рэцэнзіі. Карыснасць гэтага выдання для пошуку інфармацыі вельмі значная, таму што пошук артыкулаў з перыядычных выданняў складаны, працаёмкі, не заўсёды забяспечаны патрэбнымі выданнямі ў пэўнай бібліятэцы. Таму выданне Нацыянальнай кніжнай палатай паказальніка “Летапіс часопісных артыкулаў. 1928–1933” (у дзвюх частках) – з’ява унікальная, хаця трэба адзначыць, што ён з'яўляецца працягам рэтраспектыўнага бібліяграфічнага паказальніка «Беларускі перыядычны друк. 1917–1927 гг.», які быў выдадзены аддзелам беларускай літаратуры Дзяржаўнай бібліятэкі БССР у 1928 г. як пятая частка «Летапісу беларускага друку».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У *“Летапіс часопісных артыкулаў. 1928–1933”* уключаны матэрыялы з часопісаў, дадаткаў да газет і серыяльных выданняў тыпу “Працы”, “Вучоныя запіскі”, “Бюлетэні” і інш. Адбор матэрыялаў ажыццяўляўся максімальна поўна. Выключэнне склалі матэрыялы эпізадычнага характару, перадрукаваныя артыкулы, рэфератыўныя матэрыялы, інфармацыйныя нататкі, правілы і ўмовы прыёму ў вучэбныя ўстановы і інш. Увесь матэрыял праглядаўся складальнікамі de visu.

Першая частка паказальніка “Летапіс часопісных артыкулаў”, другая – “Летапіс рэцэнзій”. Групоўка бібліяграфічных запісаў у паказальніку сістэматычная ў адпаведнасці з «Единой схемой классификации литературы для книгоиздания в СССР». Для выдзялення матэрыялаў, якія прысвечаны важным падзеям, юбілеям асобных дзеячаў і інш., у раздзелах і падраздзелах выкарыстоўваюцца тэматычныя рубрыкі. Унутры раздзелаў спачатку размешчаны афіцыйныя матэрыялы, а потым матэрыял падаецца ў алфавітным парадку з традыцыйным для летапісаў вылучэннем твораў па моўных радах: беларускай, рускай і інш. Выданне забяспечана дапаможнымі паказальнікамі: імянным, загалоўкаў, геаграфічным.

Такім чынам, «Летапіс часопісных артыкулаў. 1928–1933» ліквідуе лакуну паміж рэтраспектыўным (за 1917–1927 гг.) і бягучым улікам матэрыялу з перыядычных выданняў, які пачаўся ў 1934 г. у «Летапісе друку Беларусі».

Створаныя ў краіне крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі – гэта неабходны падмурак для ажыццяўлення даведачна-бібліяграфічнай работы. Разам з тым яны вырашаюць і праблему захавання пісьмовай спадчыны беларускай нацыі праз адлюстраванне фондаў розных суб’ектаў сістэмы дакументных камунікацый не толькі нашай краіны, садзейнічаюць забеспячэнню доступу да іх і больш шырокаму грамадскаму выкарыстанню.

У ДБФ універсальных навуковых і спецыяльных бібліятэк набываюцца таксама крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі іншых краін, асабліва Расіі, былога СССР, Польшчы, Літвы, Украіны і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *5.8. Крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі ў ДБФ бібліятэкі*

Спецыфічным відам агульнай бібліяграфіі з'яўляюцца крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі. Яны адрозніваюцца ад іншых крыніц разглядаемага віду больш дакладным адборам матэрыялу па фармальных і зместавых прыметах. Асноўная задача гэтых крыніц – аператыўнае інфармаванне работнікаў кнігагандлёвых арганізацый, бібліятэк, задавальненне патрэбнасцей шырокага кола карыстальнікаў у інфармацыі аб новай літаратуры па спецыяльных, сумежных і агульнацікавых тэмах, аб асноўнай грамадска значнай частцы новай літаратуры. У іх падрыхтоўцы прымаюць удзел выдавецтвы, рэдакцыі часопісаў і газет, кнігагандлёвыя арганізацыі, бібліятэкі, кніжныя палаты.

Функцыянальна-мэтавае прызначэнне крыніц масавай бібліяграфічнай інфармацыі ў залежнасці ад спецыфікі арганізацый, якія іх рыхтуюць, дыферэнцыруецца наступным чынам:

– інфармацыя аб плануемай да выпуску літаратуры (тэматычныя планы выдавецтваў і інш.);

– інфармацыя аб апублікаванай літаратуры (бібліяграфічныя перыядычныя выданні Міністэрства інфармацыі, спісы ў перыядычных выданнях);

– інфармацыя аб літаратуры, якая маецца ў кнігагандлёвых арганізацыях;

– інфармацыя аб новай літаратуры, якая паступіла ў фонды бібліятэк (бюлетэні новых паступленняў).

Выдавецкая і кнігагандлёвая бібліяграфічная інфармацыя – гэта звесткі аб выданнях, якія ёсць у наяўнасці або плануюцца да выпуску; ствараюцца і выкарыстоўваюцца выдаўцамі і кнігагандлёвымі арганізацыямі для рэалізацыі і маркетынгу выдавецкай прадукцыі. Выдавецкая і кнігагандлёвая бібліяграфічная інфармацыя рыхтуецца і распаўсюджваецца як на папяровых носьбітах, так і на машыначытальных, прадстаўлена ў форме сеткавай электроннай інфармацыі на сайтах адпаведных выдавецтваў, кніжных інтэрнет-магазінаў і іншых распаўсюджвальнікаў. На інфармацыйным рынку атрымалі распаўсюджанне перспектыўныя, бягучыя і рэтраспектыўныя выдавецкія і кнігагандлёвыя бібліяграфічныя дапаможнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да выданняў, у якіх друкуецца пераважна перспектыўная бібліяграфічная інфармацыя і якія маюць важнае значэнне для камплектавання фондаў бібліятэк, адносяцца гадавыя анатаваныя планы выдавецтваў; праспекты і планы выданняў буйнейшых інфармацыйных цэнтраў і бібліятэк; прайс-лісты, якія інфармуюць аб асартыменце і кошце распаўсюджваемых выданняў, тэрмінах выхаду кніг.

Перспектыўнае масавае бібліяграфічнае інфармаванне аб перыядычных выданнях ажыццяўляе Рэспубліканскім аддзяленнем распаўсюджвання друку (Белпошта) Міністэрства сувязі РБ, а таксама праз каталогі для падпіскі на выданні органаў НТІ.

Выпускаюцца таксама рэтраспектыўныя каталогі выдавецтваў з пералікам кніг, што выйшлі за пэўны перыяд. Характэрная асаблівасць выдавецкіх каталогаў – наяўнасць выпускаў, якія адлюстроўваюць выданні з года заснавання выдавецтва па цяперашні час. Могуць выпускацца таксама каталогі серый, якія змяшчаюць інфармацыю аб выданнях, што выйшлі ў складзе пэўнай выдавецкай серыі. Яны шырока выкарыстоўваюцца ў працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пошуку неабходных выданняў.

Бягучая бібліяграфічная інфармацыя аб новых выданнях друкуецца на старонках часопісаў і газет у выглядзе спісаў літаратуры, выдадзеных пэўным выдавецтвам, або якая паступіла ў продаж у кнігагандлёвую арганізацыю, або паступіла ў фонд бібліятэкі. З аднаго боку, гэтая інфармацыя можа мець эпізадычны характар, адрозніваецца выпадковым адборам літаратуры, а з другога боку, развіццё рэкламнаінфармацыйнай дзейнасці кожнага з суб’ектаў сістэмы дакументных камунікацый вядзе да стабільнасці выкарыстання для бібліяграфічнага інфармавання насельніцтва сродкаў масавай інфармацыі. Асабліва гэта характэрна для рэгіянальнага – гарадскога і раённага – узроўню. Рэкламная інфармацыя аб новых выданнях змяшчаецца таксама на вокладках кніг, часопісаў.

Бягучую інфармацыю аб выдадзеных у краіне кнігах можна было атрымаць і з дапамогай спецыяльнага перыядычнага выдання – газеты “Книжный мир” якая выходзіла з 1997 г. па 2002 г. і з'яўлялася аналагам расійскай газеты “Книжное обозрение”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бягучая бібліяграфічная інфармацыя агульнага характару прадстаўлена таксама ў такіх крыніцах, як бюлетэні, спісы новых паступленняў у бібліятэкі. Яны выдаюцца як буйнымі універсальнымі і спецыяльнымі навуковымі бібліятэкамі, так і нізавымі бібліятэкамі; носяць як зводны характар, так і раскрываюць фонд адной бібліятэкі; адлюстроўваюць як разнастайныя віды друкаванай прадукцыі, так і адзін від.

Сярод універсальных бібліяграфічных дапаможнікаў гэтага віду трэба назваць выпускаемыя штоквартальна Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з 1969 г. "Зводны каталог новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі Рэспублікі Беларусь", штогоднік "Зводны паказальнік замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь". Іх роля ў інфармацыйным забеспячэнні навукоўцаў, спецыялістаў, бібліятэкараў значная ў сувязі са скарачэннем камплектавання фондаў бібліятэк, асабліва замежнымі выданнямі. Але з 1998 г. падрыхтоўка і вядзенне гэтых выданняў ажыццяўляюцца НББ толькі ў электроннай форме, што робіць недаступным іх выкарыстанне для многіх бібліятэк і зніжае іх каштоўныя вартасці як крыніц пошуку інфармацыі і сродку міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння. Штоквартальна выдае бюлетэнь "Новыя паступленні даведачных, метадычных і бібліяграфічных выданняў" Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна. Аналагічнае выданне здзяйсняе з 1997 г. Віцебская абласная бібліятэка, вызначыўшы ў якасці аб'екта бібліяграфавання не толькі асобна выдадзеныя бібліяграфічныя і метадычныя выданні, але і аналітычныя матэрыялы гэтых відаў выданняў. Амаль кожная цэнтральная бібліятэка ЦБС краіны выдае бюлетэнь новых паступленняў у ЦБС. Паказальнікі або спісы новых паступленняў у фонд сваёй бібліятэкі выдаюць таксама бібліятэкі ВНУ, навукова-тэхнічныя бібліятэкі прадпрыемстваў. Асобныя бібліятэкі выстаўляюць спісы новых паступленняў за пэўны перыяд у сусветныя камп'ютэрныя сеткі для забеспячэння агульнадаступнасці выкарыстання інфармацыі аб фондах бібліятэкі.

Выкарыстанне гэтых бюлетэняў, спісаў новых паступленняў самае шырокае ў рабоце бібліятэк: у працэсах бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пры арганізацыі МБА, навучанні карыстальнікаў бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уяўляе цікавасць і такая крыніца масавай бібліяграфічнай інфармацыі, як каталог “Books in print”, які выдаецца ў многіх краінах як далёкага, так і блізкага замежжа. Па-першае, перспектывы развіцця выдавецка-кнігагандлёвай бібліяграфіі ў нашай краіне звязаны з развіццём аналагічнай нацыянальнай інфармацыйнай сістэмы; па-другое, гэтая крыніца, і ў прыватнасці расійскі каталог “Books in print”, адлюстроўвае не толькі кнігі, выдадзеныя ў Расіі, але і на Украіне, у Казахстане, іншых краінах СНД, у тым ліку і Беларусі; па-трэцяе, гэтая крыніца можа выкарыстоўвацца нашымі бібліятэкамі для камплектавання сваіх фондаў.

Мэта функцыянавання нацыянальнай інфармацыйнай сістэмы “Books in print” – садзейнічанне стабілізацыі і развіццю выдавецкай і кнігагандлёвай дзейнасці ў краіне праз аператыўнае інфармаванне аб стане кніжнага рынку; наладжванне сувязі выдаўцоў, кнігараспаўсюджвальнікаў і бібліятэк шляхам садзейнічання збору і задавальненню заказаў на кнігі праз выдаўцоў і тых, хто займаецца іх рэалізацыяй; наладжванне зваротнай сувязі ад рознічнага гандлю да выдаўцоў (з мэтай укаранення тэхналогіі пастаяннай дадрукоўкі кніг, якія карыстаюцца попытам); садзейнічанне выкарыстанню выдавецтвамі, кнігараспаўсюджвальнікамі і бібліятэкамі сумесных інфармацыйных тэхналогій на падставе ўзгодненых класіфікацыі, тыпалогіі, фарматаў і інш.

Расійскі каталог «Книги в наличии и печати» рыхтуе Расійская кніжная палата. Ён фарміруецца на падставе аднайменнай аўтаматызаванай базы даных, якая бесперапынна абнаўляецца інфармацыяй, якую прадстаўляюць самі выдавецтвы і кнігагандлёвыя арганізацыі. Каталог выпускаецца два разы ў год, але тыя карыстальнікі, якім патрэбна больш аператыўная інфармацыя, могуць атрымліваць электронны каталог 6 раз у год (на дыскетах або па электроннай пошце).

Каталог складаецца з некалькіх раздзелаў, да кожнага складаюцца дапаможныя паказальнікі. Першы раздзел «Книги в наличии и печати» змяшчае адсартаваную па тэматыцы інфармацыю аб кнігах, якія ёсць у наяўнасці з указаннем цаны і арганізацыі-распаўсюджвальніцы; звесткі аб кнігах, якія рыхтуюцца да выпуску і знаходзяцца на розных стадыях вытворчасці; а таксама тры дапаможныя паказальнікі: аўтараў, відаў выданняў, выдавецтваў. Бібліяграфічны запіс кніг

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уключае наступныя элементы: аўтар, загаловак, выдавецтва, год выпуску, аб'ём, цана (для кніг у наяўнасці), пераплёт, тыраж або астатак, кнігараспаўсюджвальнік, кароткая анатацыя, ISBN. Другі раздзел «Книги, планируемые к изданию» дае інфармацыю аб кнігах, запланаваных да выпуску ў пэўным годзе, і дапаможныя паказальнікі аўтараў, відаў выданняў, выдавецтваў. У трэцім раздзеле "Издающие и книготорговые организации" ў алфавітным парадку прадстаўлены асноўныя звесткі аб выдаўцах і кнігагандлёвых арганізацыях, што згадваюцца ў каталогу: адрас, тэлефон, факс, электронная пошта. Чацвёрты раздзел «Зарубежные издания в наличии и печати» змяшчае інфармацыю аб выданнях пэўнага выдавецтва, прычым не толькі друкаваных, але і электронных; выдзелены тэматычныя падраздзелы і віды выданняў. У першым падраздзеле прыводзіцца інфармацыя аб кнігах, якія выдадзены не толькі ў Расіі, але і ў Беларусі, Казахстане, на Украіне, прычым інфармацыя як дзяржаўных выдавецтваў, так і камерцыйных.

Дадзены каталог можа выкарыстоўвацца і бібліятэкамі нашай краіны для камплектавання сваіх фондаў як расійскімі выданнямі, так і выданнямі іншых краін.

### *5.9. Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі*

Важнае значэнне, асабліва ў ДБФ спецыяльных бібліятэк і галіновых аддзелаў універсальных навуковых бібліятэк, маюць бягучыя і рэтраспектыўныя шматгаліновыя, галіновыя, тэматычныя і іншыя навукова-дапаможныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Функцыянальнае прызначэнне крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі заключаецца ў садзейнічанні бібліяграфічнымі сродкамі навукова-даследчай дзейнасці ў пэўнай галіне ведаў або сферы навукі. Патэнцыяльнымі спажыўцамі ў дадзеным выпадку з'яўляюцца вучоныя акадэмічных і галіновых навукова-даследчых інстытутаў, выкладчыкі ВНУ адпаведнага профілю, кіраўнікі навуковых устаноў і ВНУ. У шэрагу выпадкаў да крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі звяртаюцца спецыялісты-практыкі, якія прымаюць удзел у навукова-даследчых распрацоўках.

Адрозненне навукова-дапаможнай бібліяграфіі ад дзяржаўнай звязана з рэалізацыяй ацэначнай функцыі, з аб'ектам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфавання, у якасці якога для навукова-дапаможнай бібліяграфіі выступаюць не толькі айчынныя, але і замежныя крыніцы інфармацыі, адабраныя на аснове аналізу і ацэнкі адпаведнымі спецыялістамі.

Гэты від бібліяграфіі з’яўляецца неад’емнай часткай рэспубліканскай сістэмы НТІ. Мэтамі функцыянавання гэтай сістэмы з’яўляюцца забеспячэнне фарміравання і эфектыўнага выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў навукова-тэхнічнай інфармацыі, іх інтэграцыя ў сусветную інфармацыйную прастору і садзейнічанне стварэнню рынка інфармацыйных прадуктаў і паслуг. У краіне вызначана арганізацыйная структура РСНТІ, якая складаецца з рэспубліканскіх, галіновых і рэгіянальных органаў інфармацыі, нізавых органаў інфармацыі універсальных і навуковых спецыяльных, навукова-тэхнічных бібліятэк, якія павінны забяспечваць не толькі збор, захаванне і апрацоўку айчынных і замежных крыніц НТІ, але і фарміраванне даведачна-інфармацыйных фондаў, баз і банкаў даных, што ўваходзяць у дзяржаўныя рэсурсы НТІ.

У краіне склалася пэўная сістэма навукова-дапаможных інфармацыйных выданняў. Для навуковых супрацоўнікаў важна як інфармацыя аб новай літаратуры, так і звесткі аб масіве дакументаў, якія выйшлі ў мінулыя гады. У сувязі з гэтым ствараюцца бягучыя і рэтраспектыўныя навукова-дапаможныя выданні.

Неабходнасць забеспячэння рознымі па аператыўнасці, глыбіні, аналітычнасці матэрыяламі абумовіла існаванне розных узроўняў сістэмы навукова-дапаможнай бібліяграфіі: сігнальнага, рэфератыўнага і агляднага.

Да сігнальнага ўзроўню адносяцца выданні бібліяграфічнай інфармацыі, прызначаныя для аператыўнага інфармавання спажыўцоў аб новых публікацыях па пэўных тэмах, галінах ведаў. Існуюць два віды сігнальных выданняў. Традыцыйныя паказальнікі (спісы) поўна адлюстроўваюць паток айчынных і замежных выданняў. Характарызуюцца яны тым, што бібліяграфічныя запісы ў іх абмежаваны загалоўкам і бібліяграфічным апісаннем. Другі від – паказальнік зместу новых замежных часопісаў.

Выданні рэфератыўнай інфармацыі (у адрозненне ад выданняў сігнальнай інфармацыі) пры бібліяграфічнай характа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстыцы дакументаў, акрамя бібліяграфічнага апісання, маюць рэферат, у сувязі з чым рэфератыўныя выданні выконваюць задачу сістэматызацыі, пошуку, ацэнкі, абагульнення і рэкамендацыі фактаграфічнай інфармацыі, якая змяшчаецца ў першакрыніцах. Асноўнымі відамі рэфератыўных выданняў з'яўляюцца рэфератыўны часопіс, экспрэс-інфармацыя (ЭІ), рэфератыўныя зборнікі (РЗ). Розніца паміж рэфератыўнымі часопісамі і экспрэс-інфармацыяй заключаецца ў колькасці рэферыруемых дакументаў і глыбіні раскрыцця іх зместу. Рэфератыўныя часопісы больш поўна ахопліваюць паток айчынных і замежных публікацый, бібліяграфічныя запісы ў іх складаюцца з бібліяграфічнага апісання і рэферата. Экспрэс-інфармацыя ўяўляе перыядычнае выданне часопіснай або ліставой формы, якое змяшчае пашыраныя рэфераты найбольш актуальных апублікаваных замежных матэрыялаў і неапублікаваных айчынных дакументаў, што патрабуюць аператыўнага асвятлення. У гэтым азначэнні падкрэслены асноўныя патрабаванні да ЭІ: пашыраны рэферат і аператыўнасць выдання; можна дадаць яшчэ невялікую колькасць рэферыруемых дакументаў у параўнані з рэфератыўным часопісам. Рэфератыўныя зборнікі маюць праблемна-тэматычны характар, часцей за ўсё спалучаюць глыбокі рэтраспектыўны аналіз з інфармацыяй аб навейшай літаратуры па тэме і маюць на мэце раскрыць карціну развіцця ідэй па пэўнай праблеме за той ці іншы прамежак часу, даць дастатковае ўяўленне вучоным-сумежнікам аб стане даследаванняў у суседняй навуковай галіне.

У навукова-дапаможных выданнях агляднага тыпу абагульняюцца і сістэматызуюцца звесткі аб дасягненнях, асноўных напрамках і тэндэнцыях развіцця пэўных галін навукі і тэхнікі. Тое ці іншае пытанне ў аглядзе раскрываецца не толькі на аснове выкарыстанай літаратуры, але і глыбокага ведання сутнасці праблемы, тэмы, таму рыхтуецца спецыялістам па пэўнай галіне. Агляд складаецца на аснове ўсебаковага аналізу і абагульнення інфармацыі, якая змяшчаецца ў першасных навуковых і тэхнічных дакументах, утрымлівае аргументаваную ацэнку матэрыялу і дае абгрунтаваныя рэкамендацыі адносна тэндэнцый, перспектыў развіцця і выкарыстання адлюстраваных у аглядзе дасягненняў навукі і тэхнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасных умовах у сістэму навукова-дапаможнай бібліяграфіі ўсё больш шырока і актыўна ўкараняюцца дасягненні сучаснай інфармацыйнай тэхналогіі. Вызначальнай тэндэнцыяй з’яўляецца паралельнае суіснаванне – вытворчасць, распаўсюджванне і выкарыстанне – бібліяграфічнай інфармацыі ў такіх формах (версіях), як паліграфічная і электронная. Асобныя бібліятэкі і органы НТІ генерыруюць базы даных і на іх падставе выпускаюць іх аналагі ў выглядзе друкаваных выданняў (напрыклад, НББ), у той жа час некаторыя бібліятэкі практыкуюць абслугоўванне спецыялістаў і распаўсюджванне інфармацыі толькі на электронных носьбітах (напрыклад, ЦНБ НАН, РНТБ). Ёсць прыклады, калі форма прадастаўлення інфармацыі вызначаецца самім спажыўцом (БелСГБ). Усё больш шырокае выкарыстанне АІС у сістэме навукова-дапаможнай бібліяграфіі і доступ да яе з дапамогай электронных сродкаў. Гэта і ёсць галоўная перспектыва для яе далейшага развіцця. Названая тэндэнцыя адкрывае новыя магчымасці выкарыстання крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі для індывідуалізацыі інфармацыйнага пошуку, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, бібліяграфічнага інфармавання. Не менш значнай перспектывай стварэння крыніц разглядаемага віду з’яўляецца падрыхтоўка электронных выданняў комплекснага характару, у якіх прадстаўляецца бібліяграфічная, фактаграфічная і паўнатэкставая інфармацыя. Менавіта да падрыхтоўкі такіх выданняў на CD-ROM прыступіла ў цяперашні час НББ. Напрыклад, ёю створаны CD-ROM “Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945)”, “Літаратурная спадчына Беларусі. XI – сярэдзіна XX ст.” і інш.

*Сігнальны ўзровень* бягучых навукова-дапаможных паказальнікаў, выдаваемых у РБ, складаюць некалькі груп дапаможнікаў, рыхтуемых універсальнымі і спецыяльнымі навуковымі бібліятэкамі, органамі НТІ ў адпаведнасці са спецыялізацыяй сваёй дзейнасці.

Да першай групы адносяцца крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі, што адлюстроўваюць новыя паступленні ў фонд бібліятэкі і разлічаны на навукоўцаў пэўных галін ведаў, кіраўнікоў, спецыялістаў. Сярод такіх выданняў штомесячны бюлетэнь “Грамадскія навукі” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у якім прадстаўлены новыя паступленні ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэку па пытаннях філасофіі, эканомікі, палітыкі, сацыялогіі, права і юрыдычных навук. Бібліяграфічныя апісанні ў бюлетэні забяспечаны шыфрамі НББ, што спрыяе аптымізацыі яго выкарыстання для заказу літаратуры па міжбібліятэчным абанеменце. Дадзены паказальнік рыхтуецца ў аўтаматызаваным рэжыме на падставе БД "Артыкулы", якая вядзецца навукова-бібліяграфічным аддзелам НББ.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь выдае некалькі бягучых паказальнікаў. Штомесячна выходзіць бібліяграфічны паказальнік "Дзяржава і права", які змяшчае інфармацыю аб кнігах і артыкулах з перыядычных выданняў на рускай і беларускай мовах па пытаннях стварэння прававой дзяржавы, дзяржаўным, адміністрацыйным, грамадзянскім, гаспадарчым, працоўным, крымінальным праве, а таксама па правах чалавека і міжнародным праве, заканадаўчыя акты краін СНД і іншых, якія паступілі ў фонд Прэзідэнцкай бібліятэкі. Паказальнік "Літаратура па пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання" ўключае звесткі аб кнігах і найбольш важных артыкулах з часопісаў і газет аб дзейнасці вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і тэрытарыяльных органаў кіравання, а паказальнік "Парламенцкая дзейнасць: тэорыя і практыка" адлюстроўвае літаратуру па актуальных пытаннях тэорыі і практыкі парламенцкай дзейнасці. Два разы ў месяц бібліятэка выдае спісы новых паступленняў.

Шэсць выпускаў у год бягучага паказальніка новых паступленняў галіновага зместу "Новые медицинские книги" выдае РНМБ. У асобным паказальніку адлюстроўваюцца "Новыя паступленні замежных перыядычных выданняў па медыцыне", які бібліятэка выдае штогод.

20 назваў штоквартальных спісаў новых паступленняў у электронным варыянце прапанавала сваім спажыўцам РНТБ. Сярод іх галіновыя і тэматычныя дапаможнікі па тэхніцы («Вычислительная техника», «Легкая промышленность», «Машиностроение», «Обработка металллов», «Радиоэлектроника. Связь», «Строительство. Строительные материалы», «Химическая промышленность», «Электротехника. Энергетика»), якія ўключаюць бібліяграфічнае апісанне кніг, нарматыўна-тэхнічных дакументаў і прамысловых каталогаў. Па эканоміцы прапануюцца тэматычныя спісы: «Бухгалтерский

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

учет», «Внешнеэкономическая деятельность», «Маркетинг», «Налогооблажение», «Техника рекламы», «Стандартизация. Метрология», «Управление качеством», «Финансовая система и финансовая политика», якія акрамя бібліяграфічных апісанняў кніг, нарматыўна-тэхнічных дакументаў, прамысловых каталогаў, уключаюць аналітычныя запісы з роспісам кніг, перыядычных выданняў.

Навукова-педагагічная бібліятэка друкуе анатаваныя спісы новых паступленняў у метадычных і агульнапедагагічных рэспубліканскіх перыядычных выданнях – часопісе “Адукацыя і выхаванне” і 19 тэматычных дадатках да яго, а таксама ў “Настаўніцкай газеце”.

Да другой групы бягучых сігнальных крыніц адносяцца навукова-дапаможныя паказальнікі рэспубліказнаўчага характару, якія выходзяць, як правіла, галіновымі выпускамі. НББ выпускае два такія паказальнікі: “Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках” і “Новая літаратура па культуры і мастацтве”.

Паказальнік “Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках” з 1990 г. па 1995 г. выходзіў у выглядзе штогодніка, прычым за 1990–1992 гг. як у традыцыйным, так і электронным варыянце. Выданні, якія адлюстроўваюць літаратуру з 1993 г., распаўсюджваюцца на электронных носьбітах, і з бягучага паказальніка ён пераўтвараецца ў рэтраспектыўны, што па сутнасці характэрна для вядзення падобнага роду бібліяграфічных баз даных, якія паступова кумулююць інфармацыю па галіне з дапаўненнямі яе інфармацыяй аб новых выданнях. Таму НББ прапаноўвае карыстальнікам разглядаемы бібліяграфічны паказальнік з рэтраспекцыяй за 1995–1999 гг. і працяг яго за 2000–2001 гг. Але нельга сказаць, што гэтае пераўтварэнне адпавядае запытам карыстальнікаў. Здавалася б, наадварот, аўтаматызацыя пры стварэнні і вядзенні бібліяграфічных баз даных павінна скараціць інфармацыйны інтэрвал падрыхтоўкі бібліяграфічных выданняў і даць магчымасць на іх падставе прапаноўваць разнастайныя бібліяграфічныя прадукты, у тым ліку і па тэрмінах адлюстравання дакументальнага патоку. Аналіз гэтых паказальнікаў, з метадычнага пункту гледжання, сведчыць, што ў ім адлюстроўваюцца ўсе віды выданняў – манаграфіі, аўтарэфераты дысертацый, тэзісы дакладаў, матэрыялы кан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцый і сімпозіумаў, бібліяграфічныя дапаможнікі, рэцэнзіі, часткі з асобных выданняў, артыкулы з часопісаў, картаграфічныя выданні, машыначытальныя носьбіты інфармацыі незалежна ад мовы і месца выдання. Гэта значыць, што ў паказальніку здзяйсняліся поўны агульнагаліновы ўлік і якаснае мадэліраванне гістарычнага дакументальнага потоку, неабходныя і для айчыннай гістарычнай навукі, і для айчыннай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі як асновы для стварэння іншых звёнаў сістэмы галіновай бібліяграфічнай інфармацыі. Да вартасцей паказальніка трэба аднесці і разгорнутую сістэму дапаможных паказальнікаў: імянны; геаграфічны; загалоўкаў зборнікаў, матэрыялаў сесій, канферэнцый, кангрэсаў, нарад, сімпозіумаў і інш; бібліяграфічных крыніц і баз даных.

Аддзел навуковай інфармацыі па культуры НББ штомесячна выдае паказальнік "Новая літаратура па культуры і мастацтве", які ўключае як асобныя віды выданняў, так і аналітычныя матэрыялы, незалежна ад мовы і месца выдання, па пытаннях гісторыі, сучаснага стану і перспектыў развіцця культуры і мастацтва нашай краіны. Паказальнік рыхтуецца ў аўтаматызаваным рэжыме, выходзіць як у выглядзе традыцыйнага выдання, так і прапануецца для карыстальнікаў электронны варыянт для выкарыстання на ЭВМ.

Штогадовы паказальнік «Природа Беларуси» рыхтуе Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Паказальнік адлюстроўвае літаратуру аб прыродных асаблівасцях Беларусі (геалагічная будова і каштоўныя выкапні, рэльеф, клімат, водныя рэсурсы, глебы, раслінны і жывёльны свет і іншыя аспекты). Уключана як інфармацыя аб асобна выдадзеных кнігах, аўтарэфератах дысертацый, так і аб артыкулах з серыяльных выданняў, тэматычных зборнікаў, выдадзеных на рускай і беларускай мовах у Беларусі і за яе межамі. Паказальнік мае дапаможныя паказальнікі: імянны, геаграфічны, назваў раслін, жывёл. Дадзены паказальнік падрыхтаваны ў аўтаматызаваным рэжыме на падставе аднайменнай БД. Штогоднік распаўсюджваецца на электронных носьбітах.

Трэцяя група – паказальнікі па актуальнай для краіны комплекснай праблематыцы, якія адлюстроўваюць літаратуру па змесце (незалежна ад месца выдання, мовы, геаграфічных вызначэнняў). Да такіх паказальнікаў можна аднесці біблія-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічны паказальнік “Чарнобыль”, які ствараецца сумеснымі намаганнямі буйнейшых універсальных і рэспубліканскіх галіновых навуковых бібліятэк пад арганізацыйна-метадычным кіраўніцтвам і на базе НББ. Паказальнік “Чарнобыль” выходзіў у выглядзе штогодніка, асобныя яго выпускі адлюстроўвалі літаратуру за 1991–1994 гг., 1995–1997 гг., 1998–2000 гг. Падрыхтаваны восьмы–дзесяты нумары паказальніка за 2001, 2002, 2003 гг., якія распаўсюджваюцца ў электроннай форме на носьбіце заказчыка, а таксама да іх забяспечваецца лакальны доступ у самой бібліятэцы – стваральніцы. Найбольш поўна ў ім адлюстраваны матэрыялы, што датычацца грамадскіх і гуманітарных навук (сацыялогія, статыстыка, дэмаграфія, эканоміка, палітыка, дзяржава і права, мастацкая літаратура і літаратуразнаўства, мастацтва і мастацтвазнаўства, рэлігія, псіхалогія). Іншыя аспекты чарнобыльскай катастрофы прадстаўлены літаратурай па агульных пытаннях, арганізацыйных праблемах, публікацыях аналітычнага і абагульняючага характару. У паказальніку падаюцца ўсе віды выданняў, у тым ліку ноты, картаграфічныя выданні, аўдыёвізуальныя матэрыялы, творы выяўленчага мастацтва, машыначытальныя носьбіты інфармацыі і аналітычныя матэрыялы. Сярод дапаможных паказальнікаў – імянны; геаграфічны; матэрыялаў сесій, канферэнцый, кангрэсаў, нарад, сімпозіумаў, семінараў; назваў зборнікаў і часопісаў; бібліяграфічных крыніц. Паказальнік «Чарнобыль» ствараецца на падставе аднайменнай БД.

На рэгіянальным узроўні абласныя бібліятэкі выдаюць бягучыя сігнальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя паказальнікі. Усе АУНБ выпускаюць паказальнікі новай літаратуры аб абласцях “Новая літаратура аб ... вобласці”, разлічаныя на краязнаўцаў-навукоўцаў, выкладчыкаў і навучэнцаў усіх звёнаў сістэмы агульнай і спецыяльнай адукацыі, галіновых спецыялістаў і кіраўнікоў, аматараў. Большасць абласных бібліятэк прытрымліваюцца аптымальнага штоквартальнага выпуску гэтых паказальнікаў, за выключэннем Гомельскай АУНБ, якая выдае іх у выглядзе штогоднікаў. Ва універсальных паказальніках адлюстроўваюцца розныя віды выданняў, але важна падкрэсліць, што найбольш поўна бібліяграфуюцца артыкулы з мясцовага перыядычнага друку, якія змяшчаюць унікальныя матэрыялы аб малых тэрыторыях. Штогадовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ём некаторых паказальнікаў вельмі значны і складае звыш трох тысяч бібліяграфічных запісаў. У бібліяграфічным тэксце шырока прымяняюцца даведачныя анатацыі да бібліяграфічнага апісання, якія канкрэтызуюць змест адлюстраваных матэрыялаў. Добра распрацаваны даведачна-метадычны апарат, у складзе якога асабліва важную ролю выконваюць дапаможныя імянны і геаграфічны паказальнікі, пералікі распісаных перыядычных выданняў.

*Рэфератыўны ўзровень* прадстаўлены наступнымі выданнямі.

Аддзел навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках НАН РБ з 1972 г. па 1990 г. выдаваў паказальнік пад назвай «Научно-реферативный бюллетень», які выходзіў асобнымі серыямі (гісторыя; філасофія, дзяржава і права; эканоміка; этнаграфія, фальклярыстыка, мастацтвазнаўства). З 1990 г. аддзел быў перайменаваны ў Аналітычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук, які выдаваў рэфератыўны зборнік «Беларусістыка. Гуманітарныя і сацыяльныя навукі», што выходзіў тэматычнымі выпускамі. У 1999 г. выйшлі рэфератыўныя зборнікі, прысвечаныя этнічным і канфесіянальным праблемам у сучасным свеце; правам чалавека; гуманітарным і сацыялагічным навукам; замежнаму грамадазнаўству і інш. Дадзеныя зборнікі не мелі пэўнай перыядычнасці, змяшчалі як рэфераты на дакументы, што выйшлі ў Беларусі і на беларускай мове, так і інфармацыю аб замежнай літаратуры; побач з рэфератыўнай інфармацыяй на старонках зборніка друкаваліся і бібліяграфічныя спісы.

Беларускі цэнтр навукова-медыцынскай інфармацыі друкуе рэфератыўную інфармацыю на выданні медыцынскага зместу на старонках перыядычнага часопіса “Медыцынскія навіны”.

*Аглядны ўзровень* выдання крыніц навукова-дапаможнага характару таксама прадстаўлены невялікай колькасцю выданняў. Аналітычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук выдае агляды літаратуры па актуальных праблемах гуманітарных і грамадскіх навук. Аддзел навуковай інфармацыі па праблемах культуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі выдае «Аператыўную інфармацыю па праблемах культуры і мастацтва», якая выходзіць з 1994 г. шэсць разоў у год і адлюстроўвае вынікі навуковых даследаванняў, агляды перыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дычнага друку, агляды дзейнасці бібліятэк, падрыхтаваныя ў выніку аналізу неапублікаваных крыніц і інш. Беларускі цэнтр навукова-медыцынскай інфармацыі рыхтуе выданне агляднага характару пад назвай «Достижения медицинской науки Беларуси», якое выходзіць штогод і інфармуе аб навуковых даследаваннях у галіне медыцыны, якія праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, аб выніках гэтых даследаванняў і аб прымяненні іх на практыцы.

*Рэтраспектыўныя крыніцы* навукова-дапаможнай бібліяграфіі выдаюцца як рэспубліканскімі навуковымі, так і абласнымі бібліятэкамі, бібліятэкамі ВНУ. Сярод іх можна вылзеліць некалькі груп.

Па-першае, у краіне актыўна выдаваліся агульнагаліновыя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі рэспублiказнаўчага характару, якія звычайна выходзілі як сукупнасць выданняў, працягваліся і ўлічвалі літаратуру за ўвесь савецкі перыяд. Сярод такіх выданняў пяць выпускаў падрыхтаванага РНМБ паказальніка «Здравоохранение Белорусской ССР», якія адлюстроўвалі літаратуру адпаведнага зместу з 1919 г. па 1992 г.; тры выпускі паказальнікаў па педагогіцы – фундаментальны бібліяграфічны паказальнік па гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі са старажытнасці да пачатку XX ст. у трох частках “Асвета і педагагічная думка на Беларусі”, падрыхтаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі, а таксама “Асвета ў Беларускай ССР за 50 гадоў Савецкай улады (1917–1967)” і “Педагагічная навука і народная асвета ў Беларусі (1968–1982 гг.)”, падрыхтаваныя РНПБ. Прэзідэнцкая бібліятэка таксама падрыхтавала некалькі выпускаў паказальнікаў, прысвечаных эканамічным праблемам рэспублікі («Народное хозяйство Белорусской ССР. 1917–1963»; «Развитие и размещение производительных сил БССР», шэсць выпускаў якога адлюстравалі літаратуру з 1964 г. па 1989 г.). ЦНБ НАН РБ выдала паказальнікі, якія адлюстравалі пытанні культуры і культурна-аветніцкай работы ў рэспубліцы (1946–1975), беларускага мовазнаўства (1986–1995).

Другая група дапаможнікаў – тэматычныя рэспублiказнаўчыя навукова-дапаможныя рэтраспектыўныя паказальнікі. Так, РНТБ падрыхтавала два выпускі паказальніка “Гісторыя развіцця вынаходніцтва на Беларусі”, якія ўлічылі літаратуру за перыяд з 1812 г. па 1995 г. (першы выпуск:

1812–1941 гг.; другі выпуск: 1945–1995 гг.). РНМБ падрыхтавала паказальнік літаратуры “Исторические аспекты медицины и здравоохранения Беларуси», які адлюстраваў літаратуру з 1994 г. па 1998 г. Фундаментальная бібліятэка БДУ у 2000 г. выпусціла паказальнік «Вадасховішчы Беларусі» і інш.

Трэцяя група дапаможнікаў – тэматычныя навукова-дапаможныя рэтраспектыўныя паказальнікі, якія выпускаюцца бібліятэкамі па самых разнастайных актуальных праблемах розных галін ведаў. Так, РНТБ выпусціла паказальнікі «Экономия материалов в машиностроении, 1993–1997» (анатаваны паказальнік кніг, артыкулаў, прамысловых каталогаў, нарматыўна-тэхнічных дакументаў, патэнтаў на рускай і замежных мовах), “Переработка и использование промышленных и бытовых отходов, 1998–2000»; РНМБ выпусціла за апошнія гады паказальнікі «Микрохирургия, 1979–1983», «Медицина катастроф, 1983–1992», «Генетика человека и радиация, 1990–1998», «Имунный статус человека и радиация, 1990–1998», «Влияние радиации на пищеварительную систему, 1986–1997»; РНМБФіС падрыхтавала паказальнік «Спорт для инвалидов» і інш.

Як станоўчую тэндэнцыю ў выданні рэтраспектыўных навукова-дапаможных крыніц трэба адзначыць актывізацыю фарміравання праблемна-тэматычных рэсурсаў дзякуючы падрыхтоўцы спісаў, паказальнікаў літаратуры па праблематыцы навуковых з'ездаў, сімпозіумаў, канферэнцый. Так, РНМБ у 1996–2000 гг. быў падрыхтаваны спіс літаратуры «Сахарный диабет и его осложнения» да рэспубліканскага семінара, паказальнік “Социально-экономические аспекты охраны здоровья населения» – да 4-га з’езда па сацыяльнай гігіене і арганізацыі аховы здароўя, а таксама “Проблемы реформирования системы здравоохранения» – да 1-га з’езда ўрачоў Беларусі. Такая практыка апераджальнага падбору матэрыялаў па праблеме дае магчымасць нарошчваць бібліяграфічны і навуковы патэнцыял пэўнай галіны.

Чацвёртая група – краязнаўчыя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, якія рыхтуюць абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі.

Бібліёграфы павінны таксама ўлічваць, што ва ўмовах скарачэння выпуску асобна выдадзеных дапаможнікаў вялікая колькасць несамастойных формаў бібліяграфічных дапа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можнікаў друкуецца ў выглядзе спісаў літаратуры да манаграфій, зборнікаў навуковых прац, навуковых артыкулаў. Безумоўна, гэтыя крыніцы не адносяцца да ядра бібліяграфічных рэсурсаў па пэўнай галіне, але могуць выкарыстоўвацца ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні пры пошуку інфармацыі па актуальных навуковых праблемах.

*Навукова-дапаможныя бібліяграфічныя крыніцы па навуцы і навукова-даследчай рабоце*. У краіне склалася асаблівая сістэма навукова-дапаможных паказальнікаў, якую можна выдзеліць у якасці самастойнай, аб'яднанай агульнай зместавай прыметай, – паказальнікі па навуцы, навуказнаўстве, навукова-даследчай рабоце. Разглядаюцца яны асобна ў сувязі з тым, што маюць універсальны характар, складаюць пэўную сістэму, з'яўляюцца важнымі пры задавальненні патрэбнасцей навукоўцаў, спецыялістаў, занятых навукова-даследчай дзейнасцю. Значнасць іх для работы бібліятэк вызначаецца наступнымі фактарамі. Па-першае, яны з'яўляюцца важнымі крыніцамі пошуку публікацый, якія ажыццяўляюцца вучонымі пэўных канкрэтных навуковых установ. Прычым, калі ўлічыць, што ў гэтых установах знаходзіцца большая колькасць вучоных-спецыялістаў па розных галінах ведаў, то, безумоўна, гэтыя паказальнікі дапамагаюць вызначыць стан, развіццё пэўных галін ведаў, асобных напрамкаў навукі. Разглядаемыя паказальнікі ствараюць таксама крыніцазнаўчую базу вывучэння пэўных цэнтраў як суб'ектаў навукова-даследчай дзейнасці і падрыхтоўкі навуковых кадраў. Па-другое, пры іх складанні ставіцца задача максімальна поўнага ўліку ўсіх відаў публікацый, у тым ліку ведамасных, малатыражных, замежных праспектаў, тэзісаў дакладаў, хранікальных заметак і інш. Таму яны з'яўляюцца незаменнай, а часам і адзінай крыніцай для пошуку і задавальнення патрэбнасцей вучоных, спецыялістаў. Па-трэцяе, сама методыка іх падрыхтоўкі робіць іх вельмі зручнымі для пошуку неабходнай інфармацыі.

Сістэму дапаможнікаў па навуцы, навукова-даследчай рабоце можна дыферэнцыраваць па розных прыметах. Так, у залежнасці ад зместу і відаў адлюстроўваемых дакументаў можна вылучыць наступныя паказальнікі:

– па навуцы і навукова-даследчай рабоце;
– асобных відаў выданняў і публікацый;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– матэрыялаў навуковых з'ездаў, канферэнцый, сходаў;
– кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый;
– зместу навуковых перыядычных выданняў і выданняў, якія працягваюцца;
– прац навуковых калектываў.

Вылучаюць таксама біябібліяграфічныя слоўнікі і персанальныя бібліяграфічныя паказальнікі, прысвечаныя вучоным.

Па функцыянальна-мэтавай прымеце бібліяграфічныя дапаможнікі ў гэтай сістэме прадстаўлены як бягучымі, так і рэтраспектыўнымі крыніцамі; па форме прадстаўлення інфармацыі бываюць карткавымі, друкаванымі і машыначыльнымі.

Спынімся на характарыстыцы асобных відаў гэтай сістэмы.

Паказальнікі па навуцы і навукова-даследчай рабоце ў рэспубліцы выдавала ЦНБ НАН РБ як у выглядзе бягучых, так і рэтраспектыўных выданняў. Так, з 1969 г. па 1991 г. выходзіў штогоднік пад назвай «Наука и научно-исследовательская работа в БССР», а з 1992 г. па 1994 г. – пад назвай «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі». Былі падрыхтаваны і рэтраспектыўныя паказальнікі. У 70-я гг. выйшаў рэтраспектыўны паказальнік у 5-ці тамах «Наука и научно-исследовательская работа в Белоруссии» (1918–1973 гг.). Першы том паказальніка быў прысвечаны развіццю навукі, гісторыі, сучаснаму стану і задачам асобных галін навукі; другі том – навуковым установам і таварыствам краіны; трэці – вышэйшым навучальным установам; чацвёрты – персаналіям; у пятым томе змяшчаліся дапаможныя паказальнікі. У 1994 г. ЦНБ НАН РБ выпусціла працяг першага тома «Развитие науки. История, состояние и задачи отдельных отраслей», у якім улічвалася літаратура за 1974–1990 гг. Асобнымі выданнямі былі выпушчаны таксама рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, якія з'явіліся працягам другога і трэцяга тамоў: «Научные учреждения и общества Белоруссии: библиогр. указ. 1974–1987 гг.» (Мн., 1990); «Академия наук БССР: библиогр. указ. 1974–1987 гг.» (Мн., 1988); «Высшие учебные заведения Белоруссии: библиогр. указ. 1974–1988 гг.» (Мн., 1991).

Зараз ЦНБ НАН РБ вядзе бібліяграфічную базу даных «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі», дзе адлю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

строўваюцца матэрыялы з 1995 г. па агульных пытаннях арганізацыі навукова-даследчай работы, гісторыі, развіцці і стане асобных галін навукі ў Беларусі, матэрыялы навуковых канферэнцый, якія праходзілі ў краіне, дзейнасць АН Беларусі, навукова-даследчых устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, навуковых таварыстваў і асобных устаноў Беларусі. Аб'ектам бібліяграфавання ў базе даных з'яўляюцца кнігі, артыкулы з серыяльных выданняў і тэматычных зборнікаў, аўтарэфераты дысертацый, матэрыялы канферэнцый, сімпозіумаў на рускай і беларускай мовах, выдадзеныя ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. Бібліяграфічнае апісанне дапоўнена даведачнай анатацыяй.

Паказальнікі, якія адлюстроўваюць матэрыялы навуковых з'ездаў, канферэнцый, нарад, выходзілі ў выглядзе рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў пад назвай «Научные съезды, конференции и совещания в БССР». Выйшлі тры паказальнікі, якія ўлічылі матэрыялы, звязаныя з падрыхтоўкай, правядзеннем або іх упамінаннем з 1919 г. па 1990 г. Сёння ЦНБ вядзе бібліяграфічную базу даных «Навуковыя з'езды, канферэнцыі Беларусі» з інфармацыяй аб матэрыялах навуковага і фактаграфічнага характару аб саміх мерапрыемствах. Гэтая ж бібліятэка генерыруе яшчэ адну БД «Матэрыялы сімпозіумаў, з'ездаў, канферэнцый, сходаў з удзелам вучоных НАН Беларусі», якая адлюстроўвае кнігі і артыкулы на беларускай і замежных мовах з рэтраспектывай пачынаючы з 1901 г.

Адлюстраванне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый ажыццяўляецца як у бягучых бібліяграфічных крыніцах, так і рэтраспектыўных. Да 1999 г. звесткі аб аўтарэфератах дысертацый змяшчаліся ў спецыяльным раздзеле «Кніжнага летапісу», з 1999 г. пачаў выходзіць самастойны летапіс «Аўтарэфераты дысертацый» у складзе «Летапісу друку Беларусі». Акрамя таго, Вышэйшая атэстацыйная камісія краіны ў кожным нумары свайго часопіса «Атэстацыя» (выходзіць штоквартальна) друкуе ў выглядзе ўнутрычасопісных спісы дысертацый на суісканне вучонай ступені. Рэтраспектыўныя крыніцы, якія адлюстроўваюць разглядаемы від навуковых прац, выдаюць пераважна навукова-даследчыя ўстановы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх працуюць спецыялізаваныя навуковыя саветы па абароне дысерта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цый. У краіне былі выдадзены два рэтраспектыўныя паказальнікі «Библиография диссертаций, защищенных в Белорусской ССР» за 1945–1955 гг. і за 1956–1965 гг. Выдаваліся таксама паказальнікі “Дысертацыі, якія абаронены ў БДУ” (1943–1956; 1957–1981; 1982–1994); “Кандыдацкія дысертацыі, якія абаронены ў Мінскім педагагічным інстытуце” (1967–1977; 1978–1985; 1986–1996). Спісы дысертацый, абароненых у Нацыянальным інстытуце адукацыі, друкаваліся ў часопісах псіхолага-педагагічнай тэматыкі.

Акрамя дысертацый, у бібліяграфічных крыніцах знаходзяць адлюстраванне і іншыя віды навуковых выданняў. У прыватнасці, спіс матэрыялаў навуковых канферэнцый, складзеных БДЭУ, быў надрукаваны на старонках “Весніка БДЭУ”.

Паказальнікі зместу навуковых перыядычных выданняў і выданняў, якія працягваюць выходзіць, вельмі карысныя ў тэматычным рэтраспектыўным пошуку, асабліва зводныя паказальнікі за некалькі гадоў, таму што пошук артыкулаў вельмі цяжкі, і пропускі іх бываюць часцей, чым кніг. Яны друкуюцца як асобнымі выданнямі, так і ў выглядзе дадаткаў да часопісаў або на іх старонках. Сярод такіх паказальнікаў – “Порошковая металлургия: систематический указатель содержания журнала за 1961–1987 гг.» (Мн., 1988); апублікаваны на старонках зборніка “Вопросы библиотековедения и библиографоведения» зводны паказальнік зместу зборніка з 1 па 10 нумары (Мн., 1990) і інш.

Паказальнікі прац навуковых калектыў атрымалі даволі вялікае развіццё ў краіне. Выдаюцца паказальнікі прац навукоўцаў НАН Беларусі, ведамасных галіновых навукова-даследчых устаноў, праектных арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, факультэтаў і нават асобных кафедраў, навучальных устаноў сістэмы паслядыпломнай адукацыі, бібліятэк. Каштоўнасць такіх паказальнікаў у тым, што яны ўключаюць друкаваныя працы супрацоўнікаў незалежна ад месца публікацыі. Гэта дазваляе выявіць за пэўны перыяд працы вучоных, якія арганізаваны ў калектывы, заняты распрацоўкай пэўнага кірунку навукі і даюць уяўленне аб навуковай школе. Так, з 1961 г. па 1986 г. выдаваўся бягучы паказальнік – штогоднік «Библиография трудов сотрудников учреждений Академии наук БССР». На старонках спецыяльных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часопісаў друкуюцца аналагічныя бібліяграфічныя спісы. Так, на старонках часопіса «Плодоводство» друкуецца штогод «Библиография работ сотрудников Белорусского НИИ плодоводства, опубликованных в … г.». Большасць жа паказальнікаў маюць рэтраспектыўны характар і прымеркаваны да юбілейных дат. Сярод іх «Библиографический указатель трудов сотрудников НИИ проблем криминологии, криминалистики и судебной экспертизы (1929–1999 гг.)» (Мн., 1999). «Библиографический указатель научных работ сотрудников кафедры акушерства и гинекологии Минского государственного медицинского института (1925–1996 гг.)» ( Мн., 1996) і інш. У большасці паказальнікаў гэтай групы прадстаўлены ўсе віды дакументаў, у якіх знайшлі адлюстраванне разнастайныя напрамкі дзейнасці ўстановы – манаграфіі, навукова-метадычныя дапаможнікі, артыкулы са зборнікаў, часопісаў, матэрыялаў навуковых канферэнцый і навукова-практычных семінараў. У паказальнікі выданняў адукацыйных устаноў, акрамя розных відаў навуковых выданняў, уключаецца інфармацыя аб вучэбных праграмах, падручніках, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможніках, хрэстаматыях, тэкстах лекцый, праграмах практыкі. Паказальнікі выданняў бібліятэк змяшчаюць розныя віды бібліяграфічных і навукова-метадычных матэрыялаў, а таксама публікацыі асобных супрацоўнікаў бібліятэк і літаратуру аб бібліятэцы.

Спецыяльныя навуковыя бібліятэкі і бібліятэкі ВНУ ў якасці абавязковых вялі картатэкі прац супрацоўнікаў сваіх устаноў, зараз такія картатэкі пераводзяцца для вядзення ў электроннай форме, у выглядзе баз даных, прычым баз даных, якія спалучаюць як бібліяграфічную, так і паўнатэкставую інфармацыю. ЦНБ генерыруе БД «Выданні НАН Беларусі».

Па колькасных паказчыках біябібліяграфічныя паказальнікі і персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі атрымалі значнае развіццё нават у перыяд агульнага скарачэння выдання традыцыйных бібліяграфічных крыніц. Галіновы спектр імён вельмі шырокі. Толькі за апошнія гады выйшлі паказальнікі, прысвечаныя гісторыкам (Р.П.Платонаву, А.П.Грыцкевічу), вучоным-педагогам (А.М.Пяткевічу, Л.М.Давыдзенку), мовазнаўцам (І.Я.Лепешаву, П.У.Сцяцко, Б.А.Плотнікаву), бібліятэказнаўцам і бібліяграфазнаўцам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(В.Е.Лявончыкаву, Л.А.Дзямешка), фізікам (Б.Б.Бойку, М.М.Сіраце, В.С.Буракову, М.А.Барысевічу), медыцынскім работнікам (Е.Б.Меве, І.П.Антонаву, З.К.Магілеўчыку), навукоўцам ў галіне лясной гаспадаркі (Н.І.Фёдараву, А.Д.Янушка), сельскай гаспадаркі (А.Р.Мядзведзеву, Я.М.Афанасьеву, В.В.Валуеву, В.Ф.Самерсаву), мастацтвазнаўцам (Ю.М.Чурко, Г.І.Барышаву) і інш. У краязнаўчым кантэксце раскрыты персаналіі мовазнаўцаў Магілёўшчыны, выпускнікоў і навучэнцаў Магілёўскай мужчынскай гімназіі. У гэтым аспекце неабходна адзначыць і наяўнасць бібліяграфічных дапаможнікаў аб пачынальніках кнігавыдавецкай справы ў Беларусі – Ф.Скарыне, В.Цяпінскім, паказальніка, прысвечанага знакамітаму асветніку, епіскапу Кірылу Тураўскаму, біябібліяграфічнага даведніка «Митрополит Филарет» і інш.

Рост колькасці персанальных бібліяграфічных дапаможнікаў выкліканы патрэбнасцямі гісторыка-навуковых даследаванняў. Яны прызначаны гісторыкам навукі, тэарэтыкам і практыкам пэўнай галіны ведаў, выкладчыкам і студэнтам адпаведных спецыяльнасцей. Падрыхтоўкай і выданнем персанальных і поліперсанальных бібліяграфічных выданняў займаюцца бібліятэкі (спецыяльныя навуковыя, вышэйшых навучальных установ, абласныя універсальныя), галіновыя інфармацыйныя цэнтры, навуковыя і грамадскія арганізацыі, калегі і вучні вядомых вучоных. Пераважная колькасць персанальных бібліяграфічных дапаможнікаў выходзіць у форме самастойных выданняў, хаця друкуюцца яны і ў форме ўнутрыкніжных і ўнутрычасопісных дапаможнікаў. Частка з іх выходзіць у серыях «Учёные Советской Белоруссии», "Біябібліяграфія вучоных Беларусі", «Учёные Республики Беларусь», «Выдающиеся педагоги и воспитанники БСХА (Белорусской сельскохозяйственной академии)». Біябібліяграфічныя паказальнікі будуюцца па класічнай схеме: прадмова, біяграфічны нарыс, асноўныя даты жыцця і дзейнасці, спіс прац вучонага (або агляд), літаратура аб яго жыцці і дзейнасці. Упершыню ў рэспубліцы пры стварэнні біябібліяграфічнага паказальніка, прысвечанага акадэміку Л.М.Сушчэні, аддзел даведачна-інфармацыйнай работы ЦНБ уключыў раздзел «Навуковыя работы, цытуемыя ў "Science Citation Index (Індэксе навуковых спасылак)"». Групоўка матэрыялу ў асноўным бібліяграфічным раздзеле розная: часцей



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за ўсё ў храналагічным парадку выпуску прац аўтара, унутры года – па відах дакументаў (манаграфіі, падручнікі, вучэбныя і метадычныя дапаможнікі, патэнтныя дакументы, навуковыя артыкулы, тэзісы дакладаў, выступленні на з'ездах, канферэнцыях, нарадах, рэцэнзіі, выданні і працы, якія выйшлі пад рэдакцыяй аўтара і інш.). Некаторыя бібліятэкі выкарыстоўваюць метад стварэння комплексаў бібліяграфічных запісаў, калі разам з бібліяграфічным апісаннем работы прыводзяцца звесткі і аб рэцэнзіях на яе. Далучэнне да падрыхтоўчага працэсу шырокага кола навукова-педагагічнай грамадскасці ўзбагаціла разглядаемыя выданні цікавымі метадычнымі знаходкамі. Найбольш важныя з іх: абавязковае выкарыстанне фондаў прыватных бібліятэк вучоных, прыцягненне да гэтага працэсу не толькі калег, вучняў, родных, але і шырокага кола чытачоў – карыстальнікаў падобнай інфармацыі, аматараў-краязнаўцаў, студэнтаў; адлюстраванне ў паказальніках, разам з апублікаванымі, архіўных дакументаў, рукапісаў, твораў, якія ўяўляюць вынік не толькі навуковай, але і іншых напрамкаў дзейнасці асобы, у прыватнасці вершаў, публіцыстычных артыкулаў; публікацыя ў якасці дадаткаў да паказальнікаў ілюстрацый вокладак асноўных манаграфічных выданняў, урыўкаў з навуковых і літаратурна-мастацкіх твораў, з рэцэнзій на творы вучонага; размяшчэнне перад тытульным лістом фотапартрэтаў асоб; выкарыстанне эпіграфаў да асноўных раздзелаў паказальнікаў; наяўнасць рэзюме на замежных мовах. Разам з класічнымі метадычнымі прыёмамі стварэння падобнай бібліяграфічнай прадукцыі пералічаныя навацыі садзейнічаюць павышэнню яе якасці, пашыраюць магчымасці яе выкарыстання ў розных кірунках бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

ЦНБ генерыруе некалькі БД. Сярод іх біябібліяграфічная БД «Дзеячы беларускай навукі", якая адлюстроўвае літаратуру аб дзейнасці вучоных, што ўнеслі значны ўклад у навуку Беларусі, а таксама аб ураджэнцах Беларусі, якія займаюцца навуковай дзейнасцю ў іншых дзяржавах. У БД прадстаўлены працы вучоных і літаратура аб іх. Бібліяграфічныя запісы фарміруюцца на падставе матэрыялаў навуковага, даведачнага характару і крыніц другасна-дакументнай інфармацыі з дадатковымі ўдакладненнямі. Дакументна-фактаграфічная БД "Біяграфістыка" дае кароткія біяграфічныя звесткі аб ву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чоных НАН Беларусі. Паўнатэкставая БД «Біяграфіі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі» ўключае біяграфічныя нарысы аб розных кірунках дзейнасці вучоных-юбіляраў у галіне прыродазнаўчых навук, тэхнікі, сельскай гаспадаркі, гісторыі. Ствараемыя БД даюць магчымасць выконваць разнастайныя даведкі, складаць паказальнікі, ажыццяўляць выданне біябібліяграфічных слоўнікаў тыпу «Хто ёсць хто» або «Хто быў хто», энцыклапедый.

Шырокае кола біябібліяграфічнай інфармацыі змяшчаецца сёння на сайтах вучоных, дзе, як правіла, публікуюцца спісы прац супрацоўнікаў, а часта даюцца і поўныя тэксты найбольш значных работ.

Асобы від біябібліяграфіі – даведнікі тыпу «Хто ёсць хто», якія змяшчаюць адрасна-даведачную інфармацыю аб вядучых спецыялістах галіны, адлюстроўваюць ступені іх кар'ернага росту, забяспечваюцца спісамі асноўных публікацый спецыялістаў. Часта такія даведнікі маюць электронныя аналагі – актуалізуемыя БД. Прыкладам можа служыць БД, генерыруемая Беларускім цэнтрам навукова-медыцынскай інфармацыі, «Здравоохранение Беларуси. Учреждения, услуги, товары. Кто есть кто».

### *5.10. Бібліяграфічныя базы даных у ДБФ бібліятэкі*

Разам з тэндэнцыяй скарачэння выпуску бібліяграфічных дапаможнікаў у традыцыйнай папяровай форме доля бібліяграфічных рэсурсаў на электронных носьбітах расце. Электронныя бібліяграфічныя рэсурсы прадстаўлены базамі даных вядучых рэспубліканскіх бібліятэк, органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі, абласных універсальных навуковых бібліятэк, бібліятэк ВНУ. Сёння большасць галіновых, тэматычных, краязнаўчых бібліяграфічных баз даных даступная ў межах лакальных сетак бібліятэк. Для доступу ў аддаленым рэжыме бібліятэкі ў першую чаргу прапанавалі свае электронныя каталогі. Так, онлайнавы доступ забяспечаны да каталогаў НББ, РНТБ, ЦНБ НАН РБ, БелСГБ, асобных бібліятэк ВНУ, якія выстаўлены ў інтэрнеце.

Лакальныя бібліяграфічныя базы даных, што генерыруюць бібліятэкі і органы НТІ краіны, разнастайныя па тэматыцы і ў асноўным адпавядаюць спецыялізацыі ў іх дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, НББ, акрамя электроннага каталога, які складаецца з лакальных баз даных «Кнігі», «Аўтарэфераты дысертацый і дысертацыі», «Ноты», «Аўдыёвізуальныя матэрыялы», «Карты», «Перыядычныя выданні», «Рэдкая кніга», «Беларускі нацыянальны дакумент (рэтраспекцыя)» і інш., генерыруе і базы даных з аналітычным адлюстраваннем матэрыялаў. Сярод іх база даных «Артыкулы», якая ўключае бібліяграфічныя апісанні артыкулаў з беларускіх і расійскіх выданняў (часопісаў, выданняў з працягам), са зборнікаў рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў на беларускай і рускай мовах па грамадскіх і гуманітарных навуках. БД «Культура і мастацтва Беларусі» ўключае бібліяграфічныя апісанні кніг, артыкулаў са зборнікаў, часопісаў, газет, аўтарэфераты, неапублікаваныя дакументы, якія паступаюць у даведачна-інфармацыйны фонд аддзела навуковай інфармацыі па праблемах культуры з 1992 г. на беларускай, рускай і замежных мовах па ўсёй тэматыцы сферы культуры і мастацтва Беларусі. БД папаўняецца штодзённа і дае магчымасць атрымаць бягучую і рэтраспектыўную бібліяграфічную інфармацыю. Аддзел навуковай інфармацыі па культуры НББ з 1997 г. вядзе таксама БД «Неапублікаваныя дакументы па культуры і мастацтве», якая адлюстроўвае інфармацыю аб асноўных службовых матэрыялах Міністэрства культуры Беларусі, упраўленняў культуры, дакументацыі навукова-метадычных цэнтраў і ўстаноў культуры.

Навукова-бібліяграфічны аддзел НББ вядзе дзве БД: БД «Чарнобыль» фарміруецца з 1993 г. і ўключае звесткі аб асобных выданнях, артыкулах з перыядычнага друку, прысвечаных праблемам аварыі на Чарнобыльскай АЭС; БД «Гісторыя Беларусі» ўключае інфармацыю аб друкаванай прадукцыі па гісторыі Беларусі, незалежна ад месца выдання, мовы, віду выдання.

Аддзел рукапісаў, старадрукаваных і рэдкіх выданняў НББ таксама генерыруе некалькі бібліяграфічных БД: БД «Кніга Беларусі» вядзецца з 1994 г. і ўлічвае дакументы, выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. на замежных мовах (лацінскі шрыфт), якія захоўваюцца ў фондах вядучых бібліятэк Беларусі, СНД, Еўропы; БД «Гісторыя кніжнай культуры Падляшша» вядзецца з 1993 г. і ўлічвае асобныя выданні, артыкулы, картаграфічныя выданні адпаведнай тэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матыкі; БД «Радзівіліяна» вядзецца з 1997 г. і ўключае звесткі аб кнігазборах княжацкага роду Радзівілаў у Нясвіжы, якія захоўваюцца ў фондах вядучых бібліятэк Беларусі, СНД, Еўропы.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я.Коласа НАН РБ акрамя электроннага каталога, які змяшчае больш за 90 тыс. бібліяграфічных запісаў і складаецца з 4 лакальных БД, дыферэнцыраваных па відах выданняў, вядзе шэраг бібліяграфічных баз даных. Сярод іх – БД «Прырода Беларусі», якая генерыруецца з 1990 г. і змяшчае матэрыялы па пытаннях прыродакарыстання і аховы прыроды, рэльефе, клімаце, каштоўных выкапнях, прыродных водах і глебах, раслінным і жывёльным свеце Беларусі. БД уключае звесткі аб кнігах, артыкулах з серыяльных выданняў і тэматычных зборнікаў, аўтарэфератах дысертацый, матэрыялах канферэнцый, нарад, сімпозіумаў на рускай і беларускай мовах, выдадзеных у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. Бібліяграфічны запіс, акрамя бібліяграфічнага апісання, уключае даведачныя анатацыі. БД «Беларускае мовазнаўства» адлюстроўвае розныя віды манаграфічных выданняў і аналітычныя матэрыялы па гісторыі і тэорыі беларускай мовы.

Каштоўнасць для навукоўцаў уяўляюць БД, якія непасрэдна адлюстроўваюць вынікі навукова-даследчай работы ў краіне: «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі», «Навуковыя з'езды, канферэнцыі Беларусі», «Матэрыялы сімпозіумаў, з'ездаў, канферэнцый, сходаў з удзелам вучоных НАН Беларусі», «Выданні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», «Нацыянальная акадэмія навук Беларусі» (адлюстроўвае літаратуру аб дзейнасці НАН Беларусі), «Дзеячы беларускай навукі», а таксама паўнатэкставую БД «Біяграфіі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі» і фактаграфічную БД «Біяграфістыка» (кароткія біяграфічныя звесткі аб вучоных НАН Беларусі).

РНТБ, акрамя электроннага каталога кніг і перыядычных выданняў, генерыруе базы даных па асобных праблемах навукі, тэхнікі, эканомікі, прамысловасці: БД «Эканоміка вытворчасці» вядзецца з 1996 г., з 2005 г. адлюстроўвае толькі артыкулы з часопісаў па розных аспектах эканамічнай дзейнасці; БД «Інавацыйная дзейнасць» генерыруецца з 2000 г. і ўключае ўсе віды дакументаў па пытаннях развіцця навукі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-даследчай работы, інфарматызацыі; шэраг тэматычных БД («Гісторыя развіцця вынаходніцтва на Беларусі», «Энергазберажэнне», «Экалагічна чыстыя і бяспечныя тэхналогіі ў вытворчасці», «Перапрацоўка і выкарыстанне прамысловых і бытавых адыходаў», «Машыны і абсталяванне для санітарнай уборкі горада») уключаюць бібліяграфічнае апісанне ўсіх відаў выданняў і аналітычных матэрыялаў па адпаведнай тэматыцы; БД «Матэрыялы міжнародных выстаў» прадстаўляе бібліяграфічныя апісанні прыстэндавых матэрыялаў міжнародных выстаў, што адбываліся ў Мінску з 1993 г.

Рэспубліканская навукова-медыцынская бібліятэка вядзе, акрамя электроннага каталога, БД «Нацыянальная бібліяграфія па медыцыне і ахове здароўя Рэспублікі Беларусь», у якой з 1994 г. адлюстроўваюцца бібліяграфічныя апісанні кніг, аўтарэфератаў дысертацый, артыкулаў з часопісаў, зборнікаў; БД «Зводны каталог замежных перыядычных выданняў па медыцыне і сумежных галінах».

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка генерыруе БД “BelAL” (электронны каталог), які адлюстроўвае дакументны фонд БелСГБ з 1993 г. і складаецца з анатаваных бібліяграфічных запісаў на кнігі, брашуры, пераклады і іншыя асобна выдадзеныя дакументы, а таксама артыкулы са зборнікаў, перыядычных выданняў і выданняў, што працягваюцца, якія выйшлі на тэрыторыі Беларусі і прысвечаны пытанням сельскай гаспадаркі. Па сутнасці, нягледзячы на назву “электронны каталог”, БД уяўляе сабой агульнагаліновую нацыянальную бібліяграфію па сельскай гаспадарцы.

Прэзідэнцкая бібліятэка вядзе электронны каталог у выглядзе лакальных БД “Books” і “Serial”, у якіх адлюстроўваюцца кнігі і брашуры, а таксама перыядычныя выданні, што паступілі ў бібліятэку. Генерыруецца БД “Analytical catalog”, у якой даюцца аналітычныя апісанні са зборнікаў, кніг, серыяльных выданняў, што паступілі ў бібліятэку, хаця, безумоўна, назва самой БД не з’яўляецца карэктнай.

Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі, акрамя электроннага каталога на свой фонд, які складаецца з лакальных баз даных, што адлюстроўваюць асобныя віды выданняў, генерыруюць базы даных, дзе падаюцца аналітычныя матэрыялы (аналагі сістэматычнай картатэкі артыкулаў). Вядуць таксама краязнаўчыя БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэкі ВНУ вядуць разнастайныя БД, сярод якіх звычайна БД прац супрацоўнікаў ВНУ. Акрамя таго, генерыруюцца і унікальныя прадукты. Напрыклад, бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў генерыруе БД "Standart", якая адлюстроўвае бібліяграфічныя запісы міжнародных, рэспубліканскіх, нацыянальных стандартаў у галіне бібліятэчнай справы, бібліяграфіі, выдавецкай, навукова-інфармацыйнай дзейнасці, музейнай і архіўнай справы; фарміруе БД "Christianstvo", якая адлюстроўвае гісторыю хрысціянства ў Беларусі, багаслоўскую літаратуру, артыкулы з перыядычных праваслаўных выданняў і іншыя матэрыялы адпаведнай тэматыкі.

Такім чынам, базы даных, якія генерыруюцца бібліятэкамі і інфармацыйнымі органамі рэспублікі, у асноўным маюць бібліяграфічны характар; бібліяграфічныя запісы прадстаўлены бібліяграфічным апісаннем, ключавымі словамі і рэдка анатацыямі; айчынныя базы даных у асноўным адлюстроўваюць новыя паступленні ў фонды бібліятэк; побач з электроннымі каталогамі, якія адлюстроўваюць асобныя віды выданняў, развіваецца вытворчасць аналітычных бібліяграфічных баз даных; літаратура падаецца на рускай і беларускай мовах, таму што асноўны паток дакументаў у краіне прадстаўлены менавіта на гэтых мовах; актуалізацыя БД у большасці бібліятэк ажыццяўляецца па меры паступлення дакументаў. Такі параметр, як аб'ём, з'яўляецца самым дынамічным, таму колькасныя паказчыкі прыводзяцца на пачатак бягучага года. Самыя вялікія БД у НББ і БелСГБ, прычым самы вялікі аб'ём у электронных каталогаў. Сярод асноўных інфармацыйных паслуг, што ажыццяўляюцца на падставе БД, можна назваць бягучы і рэтраспектыўны пошук, падрыхтоўку і выданне бібліяграфічных дапаможнікаў як бягучых, так і рэтраспектыўных. Слаба развіваецца ў краіне вытворчасць электронных выданняў (і ў прыватнасці, кампакт-дыскаў) на падставе генерыруемых БД, хаця такая практыка ўжо маецца ў НББ, ЦНБ НАН РБ, БелСГБ.

Безумоўна, што фарміраванне баз даных – працэс бесперапынны. З цягам часу будуць з'яўляцца новыя БД у адпаведнасці з новымі патрэбнасцямі спажыўцоў. Але бібліятэкі пры выбары тэматыкі і віду БД павінны ўлічваць, што права на існаванне ўсё больш будзе мець тая інфармацыйная прадук-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

цыя, якая з’яўляецца унікальнай, не мае аналагаў і таму каштоўная для карыстальнікаў; канвертуемай, сумяшчальнай у маштабах сукупных інфармацыйных рэсурсаў; даступнай для ўсяго грамадства, а не толькі для чытачоў дадзенай бібліятэкі.

Для забеспячэння паўнаты адказаў на паступаючыя запыты бібліятэкі, акрамя генерыравання ўласных бібліяграфічных БД, набываюць у свае ДБФ знешнія БД, як правіла, замежныя. Гэтым бібліятэка вырашае і такую задачу, як забеспячэнне доступу да сусветных інфармацыйных рэсурсаў непасрэдна ў самой бібліятэцы, інтэграванне сусветных і нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў у адной кропцы доступу.

НББ пачала камплектавацца базамі даных на CD-ROM дысках з 1996 г. На цяперашні час іх у бібліятэцы налічваецца больш за 1 тыс. Сярод паўнатэкставых БД – базы даных па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі, міжнародным заканадаўстве, а таксама БД агенцтваў “EBSCO”, “ProQuest”, выдавецтва Springer, якія змяшчаюць бібліяграфічную, рэфератыўную і паўнатэкставую інфармацыю па розных галінах ведаў з перыядычных выданняў. Сярод бібліяграфічных баз даных, якія набывае бібліятэка, бібліяграфічныя БД ЮНЕСКА, у прыватнасці БД дакументаў ЮНЕСКА, кумулятыўны паказальнік перакладаў, пачынаючы з 1979 г.; каталог Бібліятэкі Кангрэса ЗША (уключае бібліяграфічныя апісанні кніг, серыяльных выданняў па ўсіх галінах ведаў, аўдыёвізуальных і картаграфічных матэрыялаў, нотных выданняў на ўсіх мовах у лацінскай транслітэрацыі з 1969 г. па 1992 г.); Нацыянальная бібліяграфія Італіі (XV в. – 1997 г.); Нацыянальная бібліяграфія Іспаніі з XV в. па 2000 г.; Чэшскія кнігі, апублікаваныя ў XX ст.; Балгарскія кнігі; Бібліяграфія Бельгіі (1975–2000 гг.); Расійская нацыянальная бібліяграфія; базы даных ИНИОН «Социальные и гуманитарные науки» як палітэматычнага характару, так і галіновыя выпускі; электронныя выданні навукова-інфармацыйнага цэнтра “Інфармкультура” Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі “Литература по культуре и искусству» (таксама палітэматычныя і галіновыя электронныя выданні) і інш. Такім чынам, відавочна, што набываюцца БД універсальнага, а таксама сацыягуманітарнага зместу, што адпавядае ролі і месцу НББ у агульнарэспубліканскай інфармацыйнай сістэме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш значных вынікаў у набыцці профільных замежных БД дасягнула БелСГБ. З мэтай забеспячэння доступу да замежных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэка вядзе актыўную міжнародную дзейнасць. Сёння бібліятэка атрымлівае каля 40 БД паўнатэкставага, рэфератыўнага і бібліяграфічнага характару (больш за 15 млн. запісаў), якія адлюстроўваюць сусветны дакументны паток па сельскай і лясной гаспадарцы, ахове навакольнага асяроддзя, землекарыстанні, біялогіі і іншых сумежных галінах ведаў. Сярод іх найбольш аўтарытэтныя БД “AGRIS”, “CAB Abstracts”, “AGRICOLA”, “AGROS” і інш.

Актыўную работу па набыцці знешніх БД профільнай тэматыкі праводзіць РНМБ. У ДБФ яна набывае БД на CD-ROM медыцынскай тэматыкі. Сярод іх БД “Medline”, якая рыхтуецца Нацыянальнай медыцынскай бібліятэкай ЗША і адлюстроўвае артыкулы ў галіне медыцыны, малекулярнай біялогіі і біяхіміі з 4200 часопісаў, што выдаюцца ў 70 краінах; БД “The complete year book collection – CD” («Поўны штогоднік практычнага ўрача») выдаецца Нацыянальнай медыцынскай бібліятэкай ЗША і змяшчае больш за 50 000 артыкулаў з рэфератамі і каментарыямі эксперта на англійскай мове з 1990 г. па 1995 г.; БД “Расійская медыцына”, якая ўяўляе сабой каталог Дзяржаўнай цэнтральнай навукова-медыцынскай бібліятэкі Расіі; БД “Кардыялогія” і інш.

Прыклады набыцця знешніх баз даных бібліятэкамі краіны можна працягваць. Але важна падкрэсліць агульныя тэндэнцыі ў набыцці бібліяграфічных рэсурсаў на электронных носьбітах. Кожная бібліятэка імкнецца набываць найбольш аўтарытэтныя крыніцы па профілі сваёй дзейнасці, якія б далі магчымасць доступу спажыўцам да максімальна поўнай інфармацыі па пэўных галінах ведаў; мелі міжнародны ахоп бібліяграфуемых дакументаў, у якіх мелася б магчымасць іх аператыўнага і пастаяннага набыцця з новымі папаўненнямі. Вялікая ўвага з боку бібліятэк краіны надаецца камплектаванню электроннымі бібліяграфічнымі крыніцамі, якія рыхтуюцца універсальнымі, шматгаліновымі, галіновымі расійскімі цэнтрамі інфармацыі і бібліятэкамі. Гэта выклікана тым, што іх базы даных маюць міжнародны характар, рыхтуюцца на рускай мове, існуюць трывалыя сувязі паміж ведамаснымі бібліятэкамі нашай краіны і Расіі, ёсць магчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

масці атрымліваць расійскія БД на падставе ўзаемаабмену інфармацыйнымі прадуктамі.

Між тым маюцца і праблемы ў фарміраванні ДБФ гэтымі крыніцамі, якія звязаны з фінансава-эканамічнымі пытаннямі, неабходнасцю наладжвання інфармацыі ў краіне аб набываемых рознымі бібліятэкамі БД, неабходнасцю пастаяннага вывучэння інфармацыйнага рынку замежных БД, пастаўляемых на кампакт-дысках.

### *5.11. Крыніцы папулярнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі*

У склад ДБФ уваходзяць разам з разгледжанымі вышэй відамі бібліяграфічных дапаможнікаў крыніцы папулярнай бібліяграфіі. У ГОСТ 7.0 – 99 «Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения» папулярны бібліяграфічны дапаможнік вызначаецца як дапаможнік, прызначаны для задавальнення пазнавальных інтарэсаў шырокіх колаў чытачоў.

Крыніцы папулярнай бібліяграфіі (да ўвядзення ГОСТ 7.0 – 99 яны называліся рэкамендацыйнымі) адносяцца да спецыяльнай бібліяграфіі, у аснове стварэння якой ляжыць рэалізацыя ацэначнай функцыі. Яна заключаецца ў мэтанакіраваным адборы і рэкамендацыі лепшых першасных дакументаў чытачам па той ці іншай тэме ў адпаведнасці з канкрэтным мэтавым і чытацкім прызначэннем, з разнастайнымі інтарэсамі чытачоў.

Доўгі час рэкамендацыйная бібліяграфія разглядалася як сродак ідэалагічнай дзейнасці бібліятэк, прапаганды і кіравання масавым чытаннем. І гэта знаходзіла адбітак у тэматыцы рэкамендацыйных дапаможнікаў, адборы дакументаў, групоўцы матэрыялу. Усе гэтыя асаблівасці рэкамендацыйнай бібліяграфіі, калі пачалася перабудова, прывялі да таго, што яе (рэкамендацыйную бібліяграфію) пачалі разглядаць як «маніпулятара свядомасці», як дзейнасць па вытворчасці шматлікага патоку нікому не патрэбных бібліяграфічных даведнікаў, якія адлюстроўваюць такую ж некарысную літаратуру. Асобныя, найбольш радыкальныя спецыялісты адмаўлялі нават права на існаванне рэкамендацыйнай бібліяграфіі.

Асэнсаванне новай сацыяльна-культурнай сітуацыі, пераход да пабудовы дэмакратычнай дзяржавы прывялі ў апош-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няе дзесяцігоддзе XX ст. да перагляду тэарэтычных асноў рэкамендацыйнай бібліяграфіі, яе ролі і функцый, метадычных падыходаў да складальніцкай рэкамендацыйнай дзейнасці. Перагледжана ўжыванне тэрміна «рэкамендацыйная бібліяграфія». Лічыцца, што рэкамендацыйнасць – гэта метадычны прыём, які па сутнасці ляжыць у аснове ўсіх відаў спецыяльнай бібліяграфіі, у тым ліку навукова-дапаможнай, прафесійна-вытворчай, вучэбна-дапаможнай. І таму замест тэрміна «рэкамендацыйны дапаможнік» прапануецца тэрмін «папулярны бібліяграфічны дапаможнік», які больш дакладна адлюстроўвае мэтавае прызначэнне гэтага віду бібліяграфічнай дзейнасці. Ён з'яўляецца сродкам папулярызацыі ведаў, зафіксаваных у розных дакументах, задавальняе пазнавальныя інтарэсы шырокіх колаў чытачоў.

Сярод асноўных функцый папулярнай бібліяграфіі вылучаюць інфармацыйную, асветніцкую, адукацыйную і выхаваўчую. Рэалізацыі гэтых функцый спрыяюць і новыя метадычныя падыходы да складальніцкай дзейнасці. Галоўны з іх – пераход ад канцэпцыі адзінства мэтавага і чытацкага прызначэння пры вядучай ролі сацыяльна-дэмаграфічных прынцыпаў выдзялення чытацкіх груп да стварэння дапаможнікаў, у якіх даецца матэрыял для мноства адрасатаў і мэт чытання. З'яўляюцца новыя жанры бібліяграфічных дапаможнікаў, такія як бібліяграфічныя нарысы, анталогіі і хрэстаматыі, папулярныя бібліяграфічныя энцыклапедыі і іншыя, у якіх арганічна спалучаецца першасная інфармацыя (цікавыя факты, пазнавальная даведачная інфармацыя, у шэрагу выпадкаў і фрагменты тэкстаў твораў) з бібліяграфічнымі звесткамі аб кнігах, артыкулах і іншых дакументах, адкуль пры жаданні карыстальнікі маглі б атрымаць больш поўныя веды. Вырашэнню гэтай жа задачы спрыяюць комплекснасць у падборы дакументаў, якія адлюстроўваюць розныя пункты гледжання; шырыня бібліяграфуемага матэрыялу; структураванне матэрыялу з новымі яркімі семантычнымі назвамі раздзелаў; аўтарскі падыход да падрыхтоўкі дапаможнікаў.

Гэта дазваляе выкарыстоўваць крыніцы папулярнай бібліяграфіі ў індывідуальнай і масавай рабоце з чытачом; у час гутарак, рэкамендацыі літаратуры ў дапамогу адукацыйным, самаадукацыйным мэтам, літаратуры па тэме, пры складанні тэматычных спісаў, арганізацыі выстаў, правядзенні аглядаў, гасцёўняў, клубаў па інтарэсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначаючы выхаваўчую функцыю крыніц папулярнай бібліяграфіі, трэба мецць на ўвазе, што яны павінны садзейнічаць павышэнню культуры чытачоў у самым шырокім разуменні: культуры духоўнай, палітычнай і эканамічнай, экалагічнай, мастацкай, фізічнай, культуры зносін і, безумоўна, культуры чытання, інфармацыйнай культуры.

Крыніцы папулярнай бібліяграфіі з'яўляюцца важным сродкам для павышэння прафесійнай кваліфікацыі бібліятэкараў, настаўнікаў, выхавацеляў. Сістэматычна праглядваючы гэтыя крыніцы, яны змогуць пашырыць свой інфармацыйны запас звесткамі аб новых тэмах, аўтарах, жанрах і іншым, якія неабходны ім для прафесійнай дзейнасці, інфармавання чытачоў, задавальнення запытаў чытачоў аб літаратуры. Асабліва гэта тычыцца супрацоўнікаў абанемента, чытальнай залы, бібліёграфаў. Таму выкарыстоўваюцца яны ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў, настаўнікаў. Неабходны гэтыя крыніцы і ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні пры выкананні як бібліяграфічных, так і фактаграфічных запытаў.

Крыніцы папулярнай бібліяграфіі аказваюць значную дапамогу ў фарміраванні (дакамплектаванні) і раскрыцці фондаў бібліятэк, дазваляюць высветліць прабелы ў камплектаванні, а таксама прааналізаваць склад і змест фондаў, ступень актуальнасці. Дапамагаюць яны таксама пры планаванні работы бібліятэкі, асабліва гэта тычыцца такога жанру бібліяграфічных дапаможнікаў, як календары знамянальных і памятных дат. Таму набыццё гэтых крыніц у даведачна-бібліяграфічныя фонды бібліятэк з'яўляецца актуальнай задачай. Гэтыя паказальнікі ўваходзяць у ДБФ бібліяграфічнага аддзела і ў ДБФ іншых аддзелаў бібліятэкі, у першую чаргу аддзелаў абслугоўвання.

Падрыхтоўкай папулярных бібліяграфічных дапаможнікаў у краіне займаюцца многія бібліятэкі: НББ, якая непасрэдна іх рыхтуе, а таксама ажыццяўляе арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне гэтага кірунку бібліяграфічнай дзейнасці ў краіне; рэспубліканскія спецыяльныя бібліятэкі ў адпаведнасці са зместавай спецыялізацыяй сваёй дзейнасці; абласныя бібліятэкі рыхтуюць папулярныя бібліяграфічныя дапаможнікі пераважна краязнаўчай тэматыкі; дзіцячыя, публічныя бібліятэкі рыхтуюць бібліяграфічныя дапаможнікі, як правіла, малых формаў.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па змесце ствараюцца рэкамендацыйныя дапаможнікі наступных відаў: універсальныя, шматгаліновыя, галіновыя, тэматычныя, персанальныя, рэспубліказнаўчыя, краязнаўчыя. Каштоўнай крыніцай універсальнага зместу разглядаемага віду дапаможнікаў з'яўляецца бягучы бюлетэнь «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», які рыхтуе і штомесячна выдае з 1960 г. НББ. Аб значнасці яго для бібліятэк сведчыць і тыраж выпуску – больш за 3000 экзэмпляраў.

Бюлетэнь мае пастаянныя раздзелы. Першы раздзел «Навінкі беларускага друку» інфармуе аб новых кнігах беларускіх выдавецтваў (у тым ліку недзяржаўных) і найбольш значных артыкулах з рэспубліканскіх часопісаў і газет-штотыднёвікаў па меры іх паступлення ў НББ. Літаратура ў гэтым раздзеле падзяляецца на шэсць частак, падрубрыкі якіх могуць мяняцца ў залежнасці ад характару сабранай інфармацыі. У першай частцы «Што чытаць пра Беларусь» прадстаўлены рэспубліказнаўчы матэрыял; другая – «У дапамогу прафесійнаму чытанню» – інфармуе аб новых кнігах (акрамя вузкаспецыяльных) прадстаўнікоў розных прафесій; трэцяя – «У дапамогу абітурыентам»; чацвёртая – «Папулярная літаратура і літаратура для самаадукацыі» – прапаноўвае літаратуру па ўсіх галінах ведаў; пятая частка – «Мастацкая літаратура» – уключае звесткі пра кнігі і часопісныя публікацыі раманаў, аповесцей, паэм; шостая – «Кнігі і публікацыі – дзецям» – адлюстроўвае новыя выданні навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры для дзяцей, казкі. Бібліяграфічная характарыстыка дакументаў у раздзеле складаецца з бібліяграфічнага апісання, на неінфарматыўныя назвы даецца даведачная анатацыя, у якой у першую чаргу звяртаецца ўвага на гістарычны перыяд, геаграфічныя назвы, біяграфічныя звесткі пэўнай асобы. У дванаццатым нумары бюлетэня друкуюцца дапаможныя паказальнікі да раздзела (персанальны, прадметны і геаграфічны), якія пашыраюць магчымасці выкарыстання яго ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.

Другі пастаянны раздзел бюлетэня «У полі зроку рэцэнзента» інфармуе аб рэцэнзіях з беларускага перыядычнага друку на выданні, уключаныя ў бюлетэнь.

Раздзел «Памятныя даты» змяшчае бібліяграфічныя матэрыялы да знамянальных і памятных падзей краіны, юбілеяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдатных дзеячаў. Да кожнай даты даюцца ўступны тэкст (біяграфічная або гістарычная даведка) і спіс літаратуры. Інфармацыя аб юбілейных датах на наступны год папярэдне змяшчаецца ў штогадовым спісе «Беларускі каляндар,… г.», які ствараецца на падставе БД «Беларусь у асобах і падзеях» і выдаецца таксама на CD-ROM, штоквартальна інтэрнэт-версія прадстаўляецца на сайце НББ.

Кожны нумар бюлетэня выходзіць з дадаткам. Чатыры дадаткі знаёмяць з матэрыяламі да найбольш значных дат беларускага календара, астатнія дадаткі – высокаякасныя рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спісы, якія могуць выкарыстоўвацца як самастойныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Тэматыка гэтых спісаў самая разнастайная, але пераважна мае рэспубліказнаўчы характар. Сярод спісаў, апублікаваных за апошнія гады, – «Нацыянальная школа Беларусі», «Беларуская мастацкая проза на рубяжы тысячагоддзяў», «Запаведныя тэрыторыі Беларусі», «Учитесь познавать прекрасное» і інш.

У рабоце бібліятэк бюлетэнь выкарыстоўваецца пры планаванні, з дапамогай яго можна вызначаць найбольш важныя даты беларускага календара, актуальныя тэмы для правядзення розных мерапрыемстваў. Дадаткі даюць вялікія магчымасці для арганізацыі гутарак, канферэнцый, аглядаў, выстаў. Выкарыстоўваецца бюлетэнь для індывідуальнай работы з чытачамі, пры вядзенні картатэк рэцэнзій, краязнаўчай літаратуры, персаналій.

З 1972 г. НББ выдавала яшчэ адзін бягучы папулярны паказальнік, які штогод знаёміў карыстальнікаў са здабыткамі беларускага мовазнаўства, літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства, – «Беларуская мова, літаратура, мастацтва». У 2004 г. яго выданне перапынілася. Да цяперашняга часу яшчэ захаваўся паказальнік “Дзіцячая літаратура”, які выходзіць раз у пяць гадоў.

Да крыніц папулярнай бібліяграфіі адносяцца календары знамянальных і памятных дат. У 90-я гг. XX ст. яны перажылі «другое нараджэнне», і ўвага, цікавасць да іх значна павялічыліся. Сёння календары знамянальных дат рыхтуе не толькі НББ, але і навуковыя спецыяльныя бібліятэкі (РНМБ сумесна з Рэспубліканскім музеем гісторыі медыцыны штогод выдае паказальнік «Знаменательные и юбилейные даты



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

истории медицины Беларуси, … год»), універсальныя абласныя навуковыя бібліятэкі. Каштоўнасць і папулярнасць гэтых дапаможнікаў абумоўлены спалучэннем у іх бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, насычанасцю даведачнымі звесткамі, імкненнем складальнікаў адлюстраваць невядомыя да нядаўняга часу старонкі мясцовай гісторыі і культуры, лепшую літаратуру аб рэгіёне, краі, галіне ведаў, комплексна падаць разнастайныя матэрыялы, у тым ліку і невядомыя архіўныя.

Структура такіх календароў тыповая. Адкрываецца, як правіла, каляндар прадмовай, дзе даецца яго метадычная характарыстыка і прыводзяцца рэкамендацыі па выкарыстанні. Пасля прадмовы размяшчаецца пералік памятных дат года з адсылкай да старонак, дзе асобныя падзеі характарызуюцца больш падрабязна. Затым ідзе асноўная частка, у якой прыводзяцца тэкставыя даведкі аб кожнай памятнай даце (па месяцах і чыслах), а таксама фактаграфічныя, статыстычныя, бібліяграфічныя і іншыя матэрыялы. Пры адсутнасці звестак аб чысле ці месяцы той ці іншай падзеі інфармацыя аб ёй змяшчаецца ў канцы месяца ці года. Кожная старонка асноўнай часткі календара ўтрымлівае дакладныя звесткі аб кожнай памятнай падзеі, а таксама максімальна дакладнае і інфарматыўнае яе найменне. Значэнне падзеі, яе асаблівасці раскрываюцца ў тэкставай даведцы, для напісання якой прыцягваюцца не толькі бібліёграфы, але і навуковыя супрацоўнікі, журналісты, настаўнікі. Завяршаецца «старонка» рэкамендацыйным спісам літаратуры – 5–10 самых новых і папулярных назваў. Акрамя таго, выкарыстоўваюцца і прыводзяцца звесткі аб іншых матэрыялах (ілюстрацыі, аўдыё- і відэадакументы, статыстычныя даныя). Завяршаецца каляндар дапаможнымі паказальнікамі, звычайна імянным і геаграфічным, якія дазваляюць пашырыць яго даведачныя магчымасці.

Актывізавалася работа па стварэнні рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў абласнымі універсальнымі навуковымі бібліятэкамі, як правіла, краязнаўчага характару. У якасці прыкладу можна назваць плённую працу ў гэтым кірунку Магілёўскай АУНБ, якая выдала паказальнікі «Гісторыя вёсак Магілёўшчыны», «Тэатральная творчасць Магілёўшчыны», «Асветнікі Магілёўшчыны», «Музеі Магілёва» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *5.12. Бібліяграфічныя рэсурсы ў інтэрнеце*

Бібліяграфічныя рэсурсы ў інтэрнеце пададзены разнастайнымі крыніцамі.

Галоўнай складаючай бібліяграфічных рэсурсаў інтэрнета з'яўляюцца электронныя каталогі бібліятэк. У інтэрнеце прадстаўлена больш за 500 такіх каталогаў, прычым большую частку з іх складаюць каталогі бібліятэк ЗША. Найбольш поўны пералік бібліятэчных каталогаў розных краін свету можна атрымаць з дапамогай даведніка Yahoo (http: // www.yahoo.com), выбраўшы з асноўнага меню падпункт Libraries («Бібліятэкі») у раздзеле References («Даведачныя крыніцы»). З адкрытага меню можна выбраць бібліятэкі пэўнай краіны, галіны або тыпу. Найбольш інфарматыўнымі з’яўляюцца зводныя каталогі нацыянальных бібліятэк, каталогі бібліятэк буйных універсітэтаў.

Сярод каталогаў бібліятэк замежных краін самым фундаментальным з’яўляецца каталог Бібліятэкі Кангрэса ЗША (http: // lcweb. loc. gov / homepage / online. html), які прадстаўляе доступ да звестак больш за 27 млн. адзінак захоўвання, сярод якіх кнігі, перыядычныя выданні, карты, ноты, камп’ютэрныя файлы і рукапісы, у тым ліку шмат рускамоўных матэрыялаў, апісаных у транслітэрацыі.

У інтэрнеце выстаўлены каталогі многіх універсітэцкіх бібліятэк ЗША, напрыклад каталог універсітэта Карнегі-Мелан (http: // www. cmu. edu), універсітэтаў Берклі (http: // www. melvyl. ucop. edu), Карнель (http: // www. library. cornel. edu), Каламбія (http: // apthorp.cul.Columbia.edu). Зводны каталог бібліятэк Каліфарнійскага універсітэта, які носіць імя Melvyl (http: // www. dbs. cdlib. org), адлюстроўвае сукупныя фонды больш за 20 бібліятэк адной з буйнейшых універсітэцкіх сетак ЗША і налічвае больш за 9 млн. дакументаў.

На Еўрапейскім кантыненце сярод фундаментальных каталогаў найбольш значнымі з’яўляюцца каталог Брытанскай бібліятэкі (http: // www.blpc.bl.uk), які сёння адлюстроўвае практычна ўвесь кніжны фонд, газеты, карты, ноты; зводны каталог буйнейшых універсітэтаў Англіі і Ірландыі – COPAC (http: // copac.ac.uk); зводны каталог бібліятэк Швецыі – LIBRIS (http: // www. libris. kb. se) змяшчае больш за 3 млн. бібліяграфічных запісаў; зводны каталог бібліятэк Бельгіі, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаецца з каталога кніг (http: // www. libis. kuleuven. ac. be. ccb) і каталога часопісаў (http: // www. lib. ua. ac. be. /ANTILOPE); зводны каталог бібліятэк Нарвегіі (http: // www. bibsys. no), які адлюстроўвае фонды нацыянальнай, многіх універсітэцкіх і некаторых навуковых бібліятэк Нарвегіі, і інш.

Усе яны маюць зручныя англамоўныя web-інтэрфейсы, якія дазваляюць праводзіць просты і пашыраны пошук па традыцыйным наборы палёў, у ліку якіх індывідуальны і калектыўны аўтары, загаловак, ключавыя словы, прадметныя рубрыкі, а таксама ISBN і ISSN. Канкрэтная методыка карыстання кожным з гэтых каталогаў выкладзена ў спецыяльных файлах дапамогі. Карыстанне каталогамі бібліятэк большасці еўрапейскіх краін не зусім зручнае з прычыны наяўнасці ў іх алфавітах спецыфічных літар з дыякрытыкай, якіх няма ў стандартнай лацінскай клавіятуры. Бібліятэчныя каталогі замежных краін, як правіла, змяшчаюць звесткі выключна аб выданнях у цэлым і даволі рэдка – даныя аб аналітычных матэрыялах.

Пералік расійскіх бібліятэчных каталогаў можна знайсці па расійскіх даведніках па рэсурсах інтэрнета, напрыклад @RUS (Расійскі інтэрнет-каталог), List.ru (каталог рэсурсаў інтэрнета), Weblist і інш.

Буйнейшымі расійскімі каталогамі літаратуры універсальнага зместу, даступнымі праз інтэрнет, з'яўляюцца каталогі Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры, бібліятэкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта.

Каталог Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ўключае некалькі БД, выдзеленых па відах выданняў. Найбольшую каштоўнасць уяўляюць каталогі айчынных кніг, якія паступілі ў бібліятэку ў якасці абавязковага экзэмпляра з 1980 г. па 1997 г. і з 1998 г. па цяперашні час. Таксама выдзелены каталогі паступіўшых у бібліятэку замежных кніг, аўтарэфератаў дысертацый, дысертацый, нотных выданняў, інкунабулаў і кніг кірылічнага друку.

Каталог Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ўключае некалькі састаўных частак: БД кніг на рускай мове, паступіўшых у бібліятэку ў якасці абавязковага экзэмпляра з 1986 г.; аўтарэфератаў дысертацый; картаграфічных матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыялаў; літаратуры на замежных мовах з 1994 г. Усе каталогі рэгулярна папаўняюцца. БД кніг налічвае каля 1 млн. 220 тысяч бібліяграфічных запісаў і з'яўляецца адной з самых аўтарытэтных крыніц звестак аб расійскіх выданнях за апошнія гады. Прымяняемае праграмнае забеспячэнне (OPAC-Global) дазваляе працаваць з данымі максімальна камфортна.

Свае каталогі ў інтэрнеце прадставілі таксама ДПНТБ, ДПНТБ СА РАН, БПН РАН і іншыя бібліятэкі сістэмы РАН, ЦНСГБ, абласныя навуковыя бібліятэкі, бібліятэкі ВНУ.

Прыкладам зводнага расійскага каталога, выстаўленага ў інтэрнеце, з'яўляецца "Сводный каталог по научно-технической литературе", які можна знайсці на серверы ДПНТБ. Бібліяграфічная база даных "Уся Расія", што падтрымліваецца Цэнтрам ЛІБНЕТ, таксама ўяўляе па сутнасці зводны каталог і адлюстроўвае змест каталогаў некалькіх бібліятэк: ДПНТБ, РДБ, ДПНТБ СА РАН, БПН, асобных абласных бібліятэк.

Сярод беларускіх бібліятэк, якія выставілі свае электронныя каталогі ў інтэрнеце, буйныя навуковыя бібліятэкі.

Бібліятэкі Беларусі пры пераходзе на аўтаматызаваныя тэхналогіі работы па стварэнні інфармацыйных прадуктаў пачалі з падрыхтоўкі электронных каталогаў, адлюстроўваючы ў іх новыя паступленні. Менавіта электронныя каталогі як інфармацыйны прадукт звычайна першапачаткова выстаўляецца і на серверы бібліятэк. Па стану на 2005 г. у сетцы інтэрнета налічвалася больш за 30 беларускіх бібліятэчных сайтаў, але толькі 67 % з іх змяшчалі другасныя інфармацыйныя рэсурсы. Сярод рэспубліканскіх бібліятэк – гэта НББ, ЦНБ, РНМБ, БелСГБ, РНТБ, Прэзідэнцкая бібліятэка, ФБ БДУ, бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта і інш.

Электронны каталог НББ у інтэрнеце прадстаўлены яго невялікай часткай, колькасць бібліяграфічных запісаў перавышае 156 тыс. У каталогу адлюстроўваюцца манаграфічныя выданні, паступіўшыя ў бібліятэку пасля 1993 г.: кнігі, брашуры, зборнікі навуковых прац, даведнікі, інфармацыйныя выданні, аўтарэфераты дысертацый, камп'ютэрныя аптычныя дыскі. Прымяняемае праграмнае забеспячэнне дазваляе працаваць з каталогам максімальна камфортна. Маецца некалькі формаў запыту. «Базавы пошук» дазваляе весці пошук па ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паведнай кропцы доступу – аўтары, загалоўку, тэме, фразе, абмежаваўшы пошук мовай выдання. Пошук можна весці па слове, фразе, выкарыстоўваючы лагічныя аператары, а таксама выкарыстоўваючы сімвалы шаблонаў для пошуку слоў па заданым узоры з заменай аднаго адвольнага сімвала (выкарыстоўваецца знак падкрэслівання) або любой колькасці любых сімвалаў (знак працэнта).

«Пашыраны пошук» забяспечвае пошук па аўтары, загалоўку, тэме (прадметных рубрыках) з магчымасцю спалучэння палёў і абмежавання мовай выдання, відам дакумента (слоўнік прапаноўвае выбраць такія віды выданняў, як навуковыя, вучэбныя, даведачныя, бібліяграфічныя дапаможнікі, рэфератыўныя зборнікі, дысертацыі і аўтарэфераты, статыстычныя матэрыялы і інш.), датай публікацыі, выдавецтвам або месцам выдання. Карыстальнікам даецца таксама магчымасць весці пошук па прапануемых слоўніках аўтараў і ключавых слоў; па нумарах ISBN, ISSN, УДК, ДРСНТІ. Вынікі пошуку па запыту выдаюцца колькаснымі паказчыкамі агульнага знойдзенага масіву, а таксама порцыямі па 10 назваў з кароткім бібліяграфічным запісам. Каб праглядзець поўныя бібліяграфічныя апісанні, трэба адзначыць патрэбныя дакументы і выбраць фармат прагляду – ISBD або MARC. У поўным бібліяграфічным запісе ключавыя словы, індэксы УДК, ДАСНТІ маюць гіпертэкставыя спасылкі і дазваляюць весці далейшы тэматычны пошук, прыводзяцца таксама звесткі аб месцы захоўвання дакумента, шыфры і інвентарным нумары. З поўнага бібліяграфічнага запісу ў фармаце ISBD можна перайці і да прагляду гэтага запісу ў фармаце MARC і наадварот.

На серверы НББ прадстаўлены таксама вопытны варыянт зводнага электроннага каталога краіны. Для работы са зводным каталогам прымяняецца аналагічнае праграмнае забеспячэнне, што і да ЭК НББ.

Электронны каталог ЦНБ змяшчае манаграфічныя выданні на рускай мове, якія паступілі ў бібліятэку з 1994 г., і на беларускай мове, якія паступілі ў бібліятэку з 1903 г., а таксама айчынныя і замежныя перыядычныя выданні і выданні, якія працягваюцца. Інтэрфейс электроннага каталога ЦНБ аналагічны электроннаму каталогу НББ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ адзін удзельнік стварэння зводнага электроннага каталога выкарыстоўвае аднолькавы з ужо разглядаемымі бібліятэкамі інтэрфейс для ўласнага электроннага каталога – гэта РНТБ. На сайце РНТБ прадстаўлены зводны электронны каталог, які ўключае кніжныя выданні бібліятэкі і яе філіялаў з 1995 г. і налічвае больш за 23 тыс. бібліяграфічных запісаў. Папаўненне каталога – бягучае. Заказаць кнігі можна праз філіялы ў любым інфармацыйным цэнтры.

Ідэнтычны інтэрфейс мае і электронны каталог ФБ БДУ, у якім даюцца бібліяграфічныя апісанні артыкулаў, кніг, у тым ліку манаграфіі, зборнікі, падручнікі, даведачныя выданні на беларускай, рускай і замежнай мовах па ўсіх галінах ведаў.

Такім чынам, можна зрабіць высновы, што ЭК прадстаўлены яшчэ не на ўсіх сайтах бібліятэк, аб'ёмы адлюстраваных дакументаў невялікія, як і тэрмін, за які ў асноўным яны адлюстраваны. Некаторыя бібліятэкі ў электронных каталогах паказваюць не толькі асобна выдадзеныя выданні, але і аналітычныя матэрыялы (БелСГБ). Станоўчым з'яўляецца выкарыстанне цэлым радам бібліятэк краіны аднолькавага інтэрфейса для пошуку дакументаў, што аблягчае задачу карыстальніка пры звяртанні да каталогаў розных бібліятэк.

Акрамя бібліятэчных каталогаў, у інтэрнеце прадстаўлена вялікая колькасць бібліяграфічных баз даных (пры тыпалогіі часта да бібліяграфічных адносяць і рэфератыўна-бібліяграфічныя), галоўная каштоўнасць якіх заключаецца ў тым, што яны адлюстроўваюць звесткі не толькі аб асобных выданнях у цэлым, але і аб аналітычных матэрыялах, артыкулах з часопісаў і зборнікаў, а таксама звесткі як аб публікуемых дакументах, так і непублікуемых (справаздачах, дысертацыях і інш.). Стварэнне і падтрымка такіх баз у актуальным стане патрабуе сістэматычных і вельмі значных затрат. На Захадзе іх вядзенне з наступным продажам інфармацыі традыцыйна з'яўляецца даволі даходным бізнесам. У інтэрнеце прадстаўлены практычна ўсе вядомыя базы, у тым ліку, напрыклад, гіганцкі патэнцыял кампаніі Knight Ridder Information, які ўключае больш за 250 розных баз, знакаміты LEXIS/NEXIS. Аднак карыстанне гэтымі базамі платнае. Бібліяграфічныя базы даных, якія прадастаўляюцца ў бясплатнае карыстанне, у большасці сваёй з'яўляюцца своеасаблівымі "пабочнымі прадуктамі" розных камерцыйных праек-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таў, звязаных з інфармацыйным абслугоўваннем або вынікам спецыяльна спансіруемых навуковых распрацовак.

Адна з найбольш вядомых універсальных бібліяграфічных БД – БД Ingenta, якая ўключае апісанні артыкулаў з англамоўных часопісаў і зборнікаў. Бібліяграфічная БД першапачаткова стваралася ў рамках праекта UnCover, мэта якога – у дастаўцы спажыўцам поўных тэкстаў дакументаў. Камерцыйны поспех UnCover, што пачынаўся як сумесны праект асацыяцыі навуковых бібліятэк Каларада, прывёў да таго, што дадзеная служба выдзелілася ў самастойную з іншай назвай. Яе напаўненне вядзецца з 1988 г. і на цяперашні час яе аб'ём складае больш за 13 млн. запісаў з 18 тыс. часопісаў. Яе інфармацыйны масіў штодня папаўняецца некалькімі тысячамі новых запісаў. Пошук у БД ажыццяўляецца па аўтары, ключавых словах, назве перыядычнага выдання або па ўсіх палях адначасова. Падтрымліваюцца выкарыстанне лагічных аператараў AND, OR, NOT, а таксама пошукавая функцыя ўсячэння справа з дапамогай знака " * ". У выніку пошуку карыстальнік атрымлівае спіс бібліяграфічных апісанняў, які складаецца з абмежаванага набору элементаў, неабходных для ідэнтыфікацыі дакумента. Падсістэма выдачы вынікаў дазваляе праглядваць запісы (Summary), адзначаць (Mark) і захоўваць пералік рэлевантных запісаў (Marked list). Вынік пошуку можа быць высланы па электроннай пошце.

Неабходна адзначыць, што бібліяграфічныя БД фарміруюцца пераважна па галіновай або тэматычнай прымеце. У якасці прыкладаў галіновых БД можна прывесці адну з найбольш вядомых замежных рэфератыўна-бібліяграфічных БД – БД Medline, якая змяшчае бібліяграфічныя апісанні і рэфераты артыкулаў па медыцыне, хірургіі, стаматалогіі, догляду за хворымі і арганізацыі аховы здароўя, апублікаваных у міжнародных біямедыцынскіх часопісах, што выдаюцца ў 70 краінах свету. У расійскіх бібліятэках карыстальнікі могуць атрымаць доступ да БД Medline на серверы РБА, у беларускіх – на серверы РНМБ.

Сярод расійскіх інфармацыйных прадуктаў неабходна адзначыць базу даных Расійскай кніжнай палаты, якая па аб'ёме запісаў і храналагічным перыядзе з'яўляецца адной з найбольш фундаментальных крыніц звестак аб расійскіх кнігах, а таксама комплекс галіновых БД па сацыяльных і гу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

манітарных навуках (генерыруюцца ИНИОН), па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках (ВИНИТИ), па сельскай гаспадарцы (ЦНСХБ) і інш.

Што тычыцца бібліяграфічных БД беларускіх бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў, то праз інтэрнет да іх арганізаваны абмежаваны доступ (зарэгістраваным карыстальнікам) некалькімі бібліятэкамі. Бібліятэка Беларусі дзяржаўнага медыцынскага універсітэта арганізавала доступ да БД «Працы супрацоўнікаў БДМУ», ФБ БДУ – да БД праекта ELFE (электронная інфармацыя для бібліятэк). На сайтах бібліятэк часцей за ўсё прадстаўлены спісы новых паступленняў у бібліятэку як айчынных і замежных кніг, так і перыядычных выданняў (РНМБ, ЦНБ, НПБ, Бібліятэка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка і інш.).

### *5.13. Паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў у ДБФ бібліятэкі*

Адным з відаў бібліяграфічных дапаможнікаў, якія набываюцца ў ДБФ, з’яўляюцца паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў. У сучаснай інфармацыйнай сітуацыі значэнне бібліяграфіі бібліяграфіі ўзрастае, што звязана з яе асаблівасцямі і функцыямі, якія дазваляюць выкарыстоўваюць крыніцы гэтага віду бібліяграфіі ў розных напрамках дзейнасці.

Мадэліруючая, падагульняючая, прагнозная функцыі бібліяграфіі бібліяграфіі садзейнічаюць таму, што бібліяграфічная прадукцыя гэтага віду дае магчымасць не толькі пазнаёміцца з рэальна існуючымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі, але і выявіць “белыя плямы” ў бібліяграфічным забеспячэнні пэўных галін, выкарыстоўваць даныя бібліяграфіі бібліяграфіі ў працэсе кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю ў краіне (пры прагназіраванні і планаванні падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў, аналізе і ацэнцы вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці). Шырока выкарыстоўваюцца і яе пошукавыя магчымасці. Пры ўкараненні новых інфармацыйных тэхналогій ні адзін від бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы не можа ажыццяўляцца толькі на базе ўласных рэсурсаў. Неабходнасць узаемадзеяння бібліятэк у выкарыстанні як рэспубліканскіх, так і замежных бібліяграфічных рэсурсаў у выглядзе баз даных або ў рэжыме тэледоступу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ектыўна патрабуе добра наладжанай інфармацыі аб гэтых рэсурсах, з аднаго боку, а з другога – ведання бібліятэкарамі-бібліёграфамі гэтых крыніц інфармацыі, умення правільна выбраць рэлевантныя БД, прафесійна з імі працаваць.

Паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў прадстаўлены ў краіне рознымі відамі па функцыянальна-мэтавым прызначэнні: перспектыўнымі, бягучымі, рэтраспектыўнымі.

Навукова-бібліяграфічны аддзел НББ як каардынацыйны цэнтр бібліяграфічнай дзейнасці ў краіне складае і выдае з 1992 г. штогод перспектыўны дапаможнік “Тэматычны план выдання бібліяграфічных паказальнікаў навуковымі бібліятэкамі Беларусі і Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі ў ... годзе”, які мае выключнае значэнне для ўпарадкавання працэсу падрыхтоўкі і выдання бібліяграфічных дапаможнікаў. З 1997 г. па 1999 г. у тэматычным плане адлюстроўваліся таксама і звесткі аб генерыруемых бібліятэкамі базах даных.

У краіне склалася таксама цэнтральнае звяно сістэмы паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў – бягучыя і рэтраспектыўныя універсальныя (агульныя) бібліяграфічныя дапаможнікі.

Нацыянальная бібліятэка і Нацыянальная кніжная палата краіны на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, асабліва ў 60–70-я гады, імкнуліся знайсці аптымальны падыход да адбору дакументаў ва універсальныя дапаможнікі. На ўсесаюзных нарадах па бібліяграфіі бібліяграфіі, у працах вядомых бібліяграфазнаўцаў І.Б.Сіманоўскага, І.І.Фраловай выказваліся думкі аб магчымасці тэрытарыяльна-дзяржаўнага і рэспубліказнаўчага падыходу да аб'ектаў уліку. Абодва прынцыпы знайшлі ўвасабленне ў бягучых і рэтраспектыўных крыніцах, якія адлюстроўвалі бібліяграфічныя дапаможнікі.

Раней чым было наладжана рэгулярнае інфармаванне аб новых бібліяграфічных матэрыялах, у Беларусі быў падрыхтаваны буйны рэтраспектыўны паказальнік «Бібліяграфія беларускай савецкай бібліяграфіі. 1922–1961 гг.», складзены бібліёграфамі ЦНБ Л.І.Збралевіч і С.У.Фядулавай. У паказальніку адлюстраваны 1935 бібліяграфічных матэрыялаў: асобна выдадзеных неперыядычных і перыядычных, прыкніжных і прыартыкульных спісаў, друкаваных каталогаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спісаў паступленняў у бібліятэкі, выдадзеных на тэрыторыі краіны. Галіновая групоўка бібліяграфічных запісаў дазволіла раскрыць бібліяграфічную забяспечанасць асобных навук, галін вытворчасці. У прадмове дастаткова поўна асветлены ўзнікненне і развіццё асобных відаў і галоўных галін бібліяграфічнай інфармацыі, названы самыя важныя бібліяграфічныя крыніцы. Складальнікі добра ўсведамлялі падагульняючую функцыю паказальніка, неабходнасць скарыстаць якасную ацэнку ў адборы матэрыялу. Таму яны кіраваліся меркаваннем уключаць тое, што захавала сваю навуковую і практычную каштоўнасць.

Работу па рэтраспектыўным уліку бібліяграфічных дапаможнікаў ЦНБ прадоўжыла сумесна з НББ. У 1980 г. яны выдалі паказальнік «Бібліяграфічныя дапаможнікі Беларускай ССР. 1962 –1973 гг.», складзены З.Г.Рачок і З.А.Сядой. У параўнанні з папярэднім выданнем быў зменены прынцып адбору: уключаліся выдадзеныя ў Беларусі і па-за яе межамі беларусазнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы на рускай і ўкраінскай мовах. Пашыралася колькасць відаў і формаў уключаных матэрыялаў: у дапаможнік увайшлі спісы літаратуры ў падрадковых заўвагах, выдавецкія планы, паказальнікі зместу часопісаў.

Буйнейшы тэарэтык і арганізатар бібліяграфічнай справы ў Беларусі І.Б.Сіманоўскі абгрунтаваў навукова-даследчую і практычную ролю ўліку бібліяграфічных матэрыялаў па рэспубліказнаўчай прымеце. Ён запланаваў серыю «Матэрыялы па беларускай бібліяграфіі», у якой павінны былі з'явіцца выпускі, прысвечаныя рэспубліказнаўчым бібліяграфічным дапаможнікам незалежна ад часу, месца і зместу выдання. У 1965 г. выйшаў адзіны першы выпуск – манаграфія «Беларуская савецкая бібліяграфія» з прыкніжным спісам «Бібліяграфія беларускай савецкай бібліяграфіі». У дапаможніку ўлічаны рэспубліказнаўчыя універсальныя бібліяграфічныя дапаможнікі, што апублікаваны ў 1922–1965 гг. Разгледжаны вышэй паказальнік «Бібліяграфічныя дапаможнікі Беларускай ССР. 1962–1973 гг.» працягвае інфармацыю аб рэспубліказнаўчых бібліяграфічных дапаможніках да 1973 г.

Такім чынам, для краіны актуальнай на цяперашні час з'яўляецца праблема бібліяграфічнага адлюстравання бібліяграфічных матэрыялаў, выпушчаных як на тэрыторыі Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

русі, так і рэспубліказнаўчых, звязаных па аўтарскай прымеце з краінай, выпушчаных да 1922 г. Стабільнасць выпуску «Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі» не здымае і праблемы выдання універсальных рэтраспектыўных паказальнікаў за перыяд пасля 1973 г. Толькі ва універсальных рэтраспектыўных паказальніках магчыма абагульніць бібліяграфічную забяспечанасць галін ведаў і вытворчасці, што ў аднолькавай ступені важна для спажыўцоў і вытворцаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Рэтраспектыўнаму пошуку бібліяграфічных матэрыялаў, што выпушчаны ў свет у Беларусі, садзейнічаюць паказальнікі выданняў буйнейшых навуковых бібліятэк. Так, РНМБ свае дапаможнікі ўключыла ў паказальнік «Рэспубліканская навукова-медыцынская бібліятэка Беларусі: 1940–1990 гг.», РНМБФС выдала паказальнік «Выданні рэспубліканскай навукова-метадычнай бібліятэкі па фізічнай культуры» (Мн., 1987); РНТБ, НББ выдалі аналагічныя паказальнікі. Яны выдаюцца, як правіла, у сувязі з юбілейнымі датамі і (у пэўным сэнсе) раскрываюць бібліяграфічную распрацаванасць адпаведных галін. Такія ж выданні эпізадычна рыхтуюць абласныя універсальныя бібліятэкі.

Найбольш аператыўнае бягучае інфармаванне аб выдадзеных у краіне бібліяграфічных дапаможніках ажыццяўляе Нацыянальная кніжная палата Беларусі ў “Летапісе друку Беларусі”. У “Кніжным летапісе” ў рубрыцы 01 “Бібліяграфія. Каталогі. Паказальнікі літаратуры” адлюстроўваюцца асобна выдадзеныя бібліяграфічныя дапаможнікі, спісы, тэматычныя планы выдання і інш. Несамастойныя формы бібліяграфічных дапаможнікў – прыкніжныя спісы літаратуры – трэба шукаць у адпаведных галіновых раздзелах па бібліяграфічных запісах, у якіх даецца спасылка на наяўнасць бібліяграфічнага спіса літаратуры ў кнізе. У штогодніках “Кнігі Беларусі ...” таксама можна знайсці звесткі аб асобна выдадзеных дапаможніках і прыкніжныя спісы літаратуры такім жа шляхам, што і па “Кніжным летапісе”. Аналагічна ў “Летапісе часопісных артыкулаў” адлюстроўваюцца ўнутрычасопісныя спісы літаратуры і несамастойныя формы – прыартыкульныя спісы літаратуры. У “Летапісе нарматыўнатэхнічных, тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння” адлюстроўваюцца агляды літаратуры, тэматычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падборкі. “Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца” адлюстроўвае бягучыя бібліяграфічныя і інфармацыйныя выданні (рэфератыўныя, аглядныя), якія выходзяць з пэўнай перыядычнасцю.

Спецыялізаванае звяно бягучых паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў складае штогоднік НКП “Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі” (выходзіць з 1978 г.), які выконвае кумулятыўную функцыю і інфармуе аб выдадзеных у краіне бібліяграфічных дакументах розных відаў, формаў і тыпаў. У ім адлюстроўваюцца звесткі аб асобна выдадзеных бібліяграфічных паказальніках, спісах, аглядах, бібліяграфічных перыядычных выданнях, унутрыкніжных і ўнутрычасопісных бібліяграфічных паказальніках, прыкніжных і прыартыкульных спісах літаратуры аб’ёмам не менш за 15 назваў. Без колькаснага абмежавання ўключаюцца бібліяграфічныя матэрыялы краязнаўчага характару. У штогодніку не адлюстроўваюцца дапаможнікі тыпу “Метадычныя і бібліяграфічныя матэрыялы”, спісы цытаванай літаратуры, спісы, якія змешчаны ў вучэбных праграмах і падручніках для агульнаадукацыйных і сярэдніх навучальных устаноў, планы выдавецтваў, паказальнікі зместу часопісаў за год і меншы перыяд часу, спасылкі на літаратуру ў заўвагах, у тым ліку падрадковых. Аднак спасылкі на літаратуру ў заўвагах даюцца, калі ўпамінаецца краязнаўчая літаратура аб асобах і ўстановах.

Групоўка матэрыялу ў штогодніку мае свае асаблівасці. У пачатку змешчаны паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў і іншыя універсальныя бібліяграфічныя выданні. Астатнія бібліяграфічныя запісы згрупаваны ў адпаведнасці з УДК. У раздзелах на першае месца вынесены асобна выдадзеныя бібліяграфічныя паказальнікі і спісы, а затым, за рыскай, прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры. У межах кожнага раздзела, падраздзела матэрыял размяшчаецца ў алфавітным парадку з улікам моўнай прыметы: спачатку даецца рад на беларускай мове, потым на рускай, а далей – на замежных.

Штогоднік часткова анатаваны. У бібліяграфічным запісе прыводзяцца звесткі аб відах, аб’ёме, храналагічных рамках, мове і колькасці дакументаў, уключаных у бібліяграфічныя выданні. Самастойнае значэнне, важнае для пошукавай дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці бібліёграфа, маюць размешчаныя ў ім спіс рэцэнзій на бібліяграфічныя паказальнікі; спіс часопісаў, якія маюць пастаянныя бібліяграфічныя аддзелы; а таксама дапаможныя паказальнікі: імянны, загалоўкаў, калектываў, геаграфічны і моўны.

Бягучую інфармацыю бібліятэкары-бібліёграфы аб бібліяграфічных дапаможніках могуць таксама атрымаць у бюлетэні "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку". У канцы раздзела "Навінкі беларускага друку" змяшчаецца рубрыка "Да ўвагі бібліятэкараў", дзе даюцца звесткі аб новых выдадзеных у краіне бібліяграфічных паказальніках, метадычных матэрыялах, аглядах дзейнасці бібліятэк, паказальніках выданняў бібліятэк і інш.

Бягучае інфармаванне аб неапублікаваных бібліяграфічных спісах і картатэках ажыццяўлялася ў краіне праз універсальны "Паказальнік неапублікаваных бібліяграфічных спісаў і картатэк, складзеных бібліятэкамі Беларусі ў ... годзе", які рыхтаваўся і выдаваўся НББ з 1972 г. па 1999 г.

З 1986 г. РНТБ пачала выпускаць таксама са штогадовай перыядычнасцю "Паказальнік бібліяграфічных спісаў па важнейшых рэспубліканскіх комплексных праблемах", дзе адлюстроўваліся выкананыя бібліятэкай даведкі і апераджальныя спісы для спецыялістаў. Сёння гэтая інфармацыя змяшчаецца на сайце бібліятэкі.

Асобнае месца ў сістэме бібліяграфічнай інфармацыі аб бібліяграфічных дапаможніках краіны займаюць паказальнікі, якія раскрываюць бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк. У 1970 г. была спроба з боку НББ выдаваць штоквартальна спіс "Новыя паступленні даведачных, бібліяграфічных і метадычных матэрыялаў у фонд бібліятэкі". У 1974 г. адзіным выпускам "Зводны каталог айчынных даведачна-бібліяграфічных выданняў, што паступілі ў самыя буйныя бібліятэкі Беларусі", выйшаў штогоднік за 1972 г. На жаль, абодва гэтыя выданні спынены.

Сярод бягучых крыніц, што адлюстроўваюць паступленні бібліяграфічных дапаможнікаў у фонды бібліятэк краіны, інфармацыю аб замежных бібліяграфічных выданнях можна знайсці ў "Зводным каталогу новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі Рэспублікі Беларусь". У гэтым штоквартальніку быў выдзелены асобны раздзел "Бібліяграфічныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікі”, але з 2000 г. выпуск названага выдання спыніўся. Замежныя бібліяграфічныя выданні перыядычнага характару адлюстроўваліся ў штогодніку “Зводны паказальнік замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь”. Сёння электронны варыянт гэтага рэсурсу прадстаўлены ў НББ у выглядзе БД.

Пэўную работу па раскрыцці сваіх даведачна-бібліяграфічных фондаў праводзяць абласныя бібліятэкі. Мінская, Віцебская абласныя бібліятэкі штоквартальна выдаюць універсальныя спісы пад назвай “Новыя паступленні даведачных, метадычных і бібліяграфічных выданняў”. У бібліяграфічным апісанні асобна выпушчаных твораў прыводзіцца таксама шыфр захавання іх у бібліятэцы, што дазваляе больш аператыўна знайсці патрэбнае выданне.

Сярод рэтраспектыўных паказальнікаў, у якіх раскрываюцца бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк, трэба адзначыць дапаможнікі, што даюць магчымасць арыентавацца ў такім важным відзе неапублікаванай бібліяграфічнай прадукцыі, як каталогі і картатэкі. Да іх адносяцца даведнікі, выдадзеныя РНТБ, Прэзідэнцкай бібліятэкай, ЦГБ імя Я.Купалы г.Мінска і інш.

Асаблівую ўвагу неабходна акцэнтаваць на сумесным выданні НББ і ЦГБ імя Я.Купалы г.Мінска даведніка “Бібліяграфічныя рэсурсы буйнейшых бібліятэк г.Мінска ў дапамогу абслугоўванню навукі, вытворчасці, адукацыі, культуры і мастацтва” (Мн., 1990). Мэта выдання – садзейнічанне эфектыўнаму выкарыстанню наяўных бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў. Даведнік змяшчае звесткі аб формах бібліяграфічнага інфармавання, у тым ліку аб бягучых бібліяграфічных дапаможніках, пашпартныя даныя каталогаў і картатэк універсальных, галіновых і спецыяльных бібліятэк г.Мінска. Звесткі згрупаваны па галіновым прынцыпе, кожны комплекс уяўляе зводны даведачна-бібліяграфічны апарат акрэсленай галіны. Такую ж ролю ў адносінах да электронных інфармацыйных рэсурсаў буйных бібліятэк краіны сёння выконваюць дадаткі да манаграфіі «Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси» (аўтары Н.Ю.Бярозкіна, Л.А.Авгуль, Б.Б.Неўскі), у якіх прыводзяцца пашпартныя даныя генерыруемых і набываемых бібліятэкамі баз даных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералічаныя выданні, безумоўна, не могуць раскрыць поўна і комплексна наяўнасць у фондах бібліятэк краіны бібліяграфічных рэсурсаў, некаторыя з іх ужо страцілі сваю актуальнасць і патрабуюць перавыдання. Сёння праблема стварэння крыніц, якія б раскрывалі бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк, стала даволі актуальнай. Магчыма, гэта павінны быць зводныя каталогі, падрыхтаваныя па галіновай прымеце з адлюстраваннем у іх бібліяграфічных крыніц усіх формаў існавання, і менавіта рэспубліканская бібліятэкі павінны ўзяць на сябе задачу збору, захоўвання, распаўсюджвання звестак аб крыніцах другаснай інфармацыі – даведачных і інфармацыйных выданнях, каталогах і картатэках, базах і банках даных. Відаць, гэта павінны быць даведнікі па інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсах бібліятэк краіны, бібліятэк пэўнай галіны, ведамства, канкрэтнай бібліятэкі. Магчыма, на сайтах асобных бібліятэк, якія ствараюцца, трэба больш увагі ўдзяліць рэкламе як уласных бібліяграфічных рэсурсаў, так і набываемых.

Старэйшым тыпам дапаможніка бібліяграфіі бібліяграфіі ў нашай краіне з'яўляюцца агляды бібліяграфічных дапаможнікаў. У Беларусі яны рыхтуюцца за розныя адрэзкі часу. Сістэматычна выходзяць агляды бібліяграфічных дапаможнікаў па пэўных галінах ведаў, якія друкуюцца ў штогодніку «Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі». Да 1990 г. такія агляды друкаваліся кожны год, а пазней – раз у пяць гадоў. Раз у пяць гадоў агляды бібліяграфічных дапаможнікаў, выпушчаных АУНБ, рыхтуюцца каардынацыйным цэнтрам – навукова-бібліяграфічным аддзелам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і друкуюцца ў метадычных рэкамендацыях, прызначаных універсальным навуковым бібліятэкам па выніках аналізу іх работы.

Агляды бібліяграфічных дапаможнікаў маюць крыніцазнаўчае значэнне для вывучэння гісторыі бібліяграфіі, могуць выконваць ацэначную, арыентавальную, педагагічную, прагнастычную функцыі. Агляды бібліяграфічных дапаможнікаў, што друкуюцца ў штогодніку, па сутнасці з'яўляюцца зводнымі артыкуламі да разглядаемага штогодніка, а таксама выконваюць крыніцазнаўчую і арыентавальную функцыі: даюць агульную характарыстыку выдадзеных за год (пяць гадоў) бібліяграфічных дапаможнікаў па галіне ведаў, асоб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную характарыстыку больш значным у бібліяграфічным забеспячэнні галіны ведаў дапаможнікам, акцэнтуюць увагу на іх метадычных, пошукавых асаблівасцях, вылучаюць новыя з'явы ў галіновай бібліяграфіі, паказваюць узнікненне новых відаў бібліяграфічных дапаможнікаў, сведчаць аб бібліяграфічным асваенні новых актуальных тэм. Агляды ж бібліяграфічных дапаможнікаў НББ прызначаны бібліёграфам і бібліятэкарам і маюць ацэначны, метадычны і прагнастычны характар: змяшчаюць адказы на пытанні, наколькі складальніцкая праца бібліятэк за пяць гадоў адпавядала каардынацыйным планам; якія больш тыповыя метадычныя і арганізацыйныя недахопы выявіліся на падставе аналізу масіву бібліяграфічных дапаможнікаў; якія прапановы маюцца па іх удасканаленні; якія бачацца напрамкі развіцця таго ці іншага віду бібліяграфіі. З дапамогай гэтых аглядаў ажыццяўляецца рэгулюючая функцыя працэсу кіравання падрыхтоўкай бібліяграфічных дапаможнікаў у краіне.

Улік электронных бібліяграфічных рэсурсаў вядзецца ізалявана ад друкаваных крыніц інфармацыі, нягледзячы на тое, што выданні зараз, як правіла, маюць электронную версію, а электронныя крыніцы ўсё часцей выходзяць у свет у выглядзе цвёрдай копіі на кампактных аптычных дысках.

У адпаведнасці з пастановай урада «О государственной регистрации информационных ресурсов» у краіне з 2000 г. пачалася дзяржаўная рэгістрацыя інфармацыйных рэсурсаў. З 2004 г. адказнасць за арганізацыю і навукова-метадычнае кіраванне ўскладзена на НАН РБ, непасрэдна фарміраванне і вядзенне Дзяржаўнага рэгістра ажыццяўляе Інстытут прыкладных праграмных сістэм НАН Беларусі. Пастановай вызначана абавязковасць дзяржаўнай рэгістрацыі інфармацыйных рэсурсаў (ІР), створаных за кошт сродкаў дзяржавы, а таксама інфармацыйных рэсурсаў, створаных не за кошт дзяржавы, але якія маюць дзяржаўнае значэнне і не змяшчаюць звестак, што адносяцца да дзяржаўнай тайны. Іншыя інфармацыйныя рэсурсы могуць рэгістравацца на добраахвотнай аснове. Дзяржаўнай рэгістрацыі належаць ІР любой тэматычнай накіраванасці, прадстаўленыя ў выглядзе баз даных, баз ведаў і ў любой іншай форме, уключаючы сайты інтэрнета, электронныя выданні. Рэгістрацыя ажыццяўляецца пасля ўводу ІР у эксплуатацыю. Заяўнікамі, якія прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

staўляюць ІР на дзяржаўную рэгістрацыю, могуць быць дзяржаўныя органы кіравання, юрыдычныя і фізічныя асобы. Па выніках дзяржаўнай рэгістрацыі заяўнікам выдаецца рэгістрацыйнае пасведчанне. Па меры неабходнасці ў даныя аб ІР могуць быць унесены дапаўненні і ўдакладненні.

Асноўнымі мэтамі стварaемай сістэмы дзяржаўнай рэгістрацыі ІР з’яўляюцца забеспячэнне адзінай сістэмы ўліку ІР і вядзенне Дзяржаўнага рэгістра ІР; выключэнне дубліравання пры стварэнні новых ІР; забеспячэнне захаванасці ІР; падрыхтоўка ІР да перадачы на дзяржаўнае архіўнае захоўванне; інфармацыйнае забеспячэнне суб’ектаў гаспадарання аб саставе і змесце ІР у краіне.

З 2002 г. ажыццяўляецца выпуск каталога "Информационные ресурсы Беларуси" (першы выпуск быў падрыхтаваны БелНДПТІ інфарматызацыі, астатнія Інстытутам прыкладных праграмных сістэм). Каталог змяшчае інфармацыю аб уключаных у Дзяржрэгістр інфармацыйных рэсурсах краіны па розных галінах навукі, тэхнікі і вытворчасці і падрабязныя звесткі аб іх уладальніках. Каталог мае электронную версію.

Да пачатку дзяржаўнай рэгістрацыі рыхтаваўся БелІСА «Каталог баз данных научно-технического назначения», які меў шматгаліновы характар і ў адпаведнасці са структурай каталога адлюстроўваў БД па тэхніцы, статыстыцы, заканадаўстве, фінансах, хіміі і фізіцы, сельскай гаспадарцы і адукацыі. Каталог быў падрыхтаваны на падставе інфармацыі, атрыманай па выніках апрацоўкі анкет, прадастаўленых распрацоўшчыкамі і ўладальнікамі баз даных – міністэрствамі, навукова-даследчымі інстытутамі, прадпрыемствамі, ВНУ, дзяржаўнымі і камерцыйнымі органамі інфармацыі, бібліятэкамі, хаця трэба адзначыць, што колькасць іх абмежаваная. У каталогу знайшлі адлюстраванне паўнатэкставыя, лексікаграфічныя, бібліяграфічныя і рэфератыўныя БД. Структура бібліяграфічнага запісу ў каталогу ўключае звесткі аб поўнай і скарочанай назве БД, мове прадстаўлення звестак у БД, тыпе БД (фактаграфічная, бібліяграфічная, паўнатэкставая, лексікаграфічная), рэжыме выкарыстання (on-line, off-line), перыядзе актуалізацыі, ключавых словах доступу, выкарыстоўваемай сістэме кіравання БД, аб’ёме БД, аб распрацоўшчыку і ўладальніку БД, умовах атрымання БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Магчымы таксама пошук бібліяграфічных рэсурсаў праз інтэрнет. Да крыніц бібліяграфіі другой ступені можна аднесці серверы пошукавых машын, з дапамогай якіх можна вызначыць не толькі першасныя паўнатэкставыя крыніцы інфармацыі, выстаўленыя ў інтэрнеце, але і пошукавыя адрасы даведнікаў, каталогаў бібліятэк, бібліяграфічных, рэфератыўных БД пры сеткавым доступе да іх. Пошук інтэрнет-версій бібліяграфічных рэсурсаў можа ажыццяўляцца праз пошукавыя машыны на найменні арганізацый-трымальнікаў БД, а менш дакладна – па ключавых словах з абмежаваннем тыпу крыніцы інфармацыі.

Праз каталогі пошукавых машын можна атрымаць інфармацыю і аб іншых каталогах інтэрнет-рэсурсаў, пошукавых сістэмах, парталах. Так, напрыклад, па беларускай пошукавай сістэме POISK.com па катэгорыі каталога "Даведка" (падкатэгорыя "Каталогі і пошукавыя сістэмы") можна знайсці адрасы іншых беларускіх пошукавых службаў інтэрнета. У каталогу Akabita.by гэтая інфармацыя размешчана ў катэгорыі "Камп'ютэры і інтэрнет" (у падкатэгорыі "Агульныя рэсурсы"), прычым назвы, адрасы пошукавых сістэм размешчаны ў парадку іх рэйтынгу па колькасці наведвальнікаў. На першай старонцы каталога Net.by (усе пошукі Байнета) прадстаўлены не толькі назвы пошукавых машын як універсальнага, так і рэгіянальнага зместу, але і магчымасці пошуку праз іх.

У бібліятэках краіны ў дапамогу карыстальнікам пачалі ствараццa даведнікі па інтэрнет-рэсурсах галіновай тэматыкі. РНМБ выпусціла даведнік «Медыцынскія рэсурсы інтэрнета», прызначаны навукоўцам, медыцынскім работнікам, студэнтам з мэтай дапамогі пры пошуку патрэбнай медыцынскай інфармацыі. На медыцынскім пошукавым серверы med.by даведнік прадстаўлены ў раздзеле "Інтэрнет для ўрачоў", дзе выдзелены падраздзелы "Медыцынскія онлайнавыя часопісы", "Медыцынскія рэсурсы Расіі", "Пошук медыцынскай інфармацыі". ЦНБ вядзе работу па каталагізацыі інфармацыйных рэсурсаў інтэрнета, ствараючы так званы навігатар, БД па электронных рэсурсах інтэрнета. У ЦНБ усе рэсурсы класіфікаваны на пошукавыя рэсурсы інтэрнета, электронныя каталогі бібліятэк і тэматычныя рубрыкі па кірунках дзейнасці інстытутаў НАН: энцыклапедыі універсальнага характару, базы даных, даведачна-пошукавыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэмы і рэсурсы універсальнага зместу; фізіка-матэматычныя навукі; хімічныя навукі; біялагічныя навукі; гуманітарныя навукі; сельская гаспадарка. Апісанне рэсурсаў не стандартызавана, даюцца анатацыя з указаннем віду аплаты за рэсурс, сістэмы пошуку.

У БелСГБ вядзецца работа над стварэннем «Навігатара па сельскагаспадарчых рэсурсах інтэрнета». У ходзе работы былі выпрацаваны крытэрыі адбору рэсурсаў. Адбіраліся тыя рэсурсы, да якіх у бібліятэцы няма доступу: аўтарытэтныя бібліяграфічныя, фактаграфічныя БД, якія ўяўляюць навуковую каштоўнасць; віртуальныя (лічбавыя, электронныя, паўнатэкставыя) бібліятэкі і электронныя перыядычныя выданні; спасылкі на ўжо створаныя даведнікі па сельскай гаспадарцы (бібліяграфія трэцяй ступені). Пры апісанні рэсурсаў былі выкарыстаны палі згодна з ГОСТ 7.70 – 96 «Описание баз данных и машиночитаемых информационных массивов».

Акрамя таго, БелСГБ з 1998 г. удзельнічае ў міжнародным праекце па стварэнні стандартызаваных сайтаў-навігатараў па міжнародных і нацыянальных web-рэсурсах па сельскай гаспадарцы. Элементамі сайта з’яўляюцца спасылкі на сайты вядучых міжнародных інфармацыйных сістэм па сельскай гаспадарцы і сайты, якія змяшчаюць сельскагаспадарчую інфармацыю ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – удзельніцах праекта. БелСГБ стварае сайт, які павінен выступіць навігатарам па нацыянальных сельскагаспадарчых рэсурсах. У сувязі з тым, што такія сайты ў рэспубліцы на сёння практычна адсутнічаюць, БелСГБ замест спасылак размясціла на сваім сайце даведнікі па ўстановах адукацыі, навукі, інфармацыі і, не змяняючы стандарта прадстаўлення AgroWebBelarus, зрабіла спасылкі на старонкі гэтых даведнікаў. Таксама сталі фарміравацца старонкі вядучых вучоных краіны з іх біяграфіямі і бібліяграфіяй. Такім чынам, сфарміравалася асноўная інфармацыя аб установах і людзях, якія прадстаўляюць інтэлектуальны патэнцыял краіны. Па меры з’яўлення сайтаў у Беларусі спасылкі на падрыхтаваныя у БелСГБ і размешчаныя на AgroWebBelarus файлы будуць замяняцца спасылкамі на сайты. Сёння навігатар па інтэрнет-рэсурсах сельскагаспадарчай тэматыкі выстаўлены на сайце БелСГБ.

НББ размясціла на сваім web-сайце спіс адрасоў буйнейшых бібліятэк Беларусі. У лакальнай сетцы бібліятэкі прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаўлены ў электронным выглядзе навігатар, які адлюстроўвае інфармацыю аб рэсурсах, прадстаўленых у сетцы інтэрнета, – спасылкі на пошукавыя сістэмы, бібліятэчныя электронныя каталогі, выдавецтвы, тэматычныя базы даных, службы аператыўнага інфармавання, на адрасы web-сайтаў, прысвечаных Беларусі і Мінску; плануецца прадставіць звесткі і аб інфармацыйных рэсурсах абласных бібліятэк – апісанне баз даных, ствараемых бібліятэкамі, спасылкі на адрасы ў інтэрнеце. Файлы ў ім сфарміраваны па галіновай прымеце ў адпаведнасці з УДК. Асобным раздзелам выдзелены "Пошукавыя сістэмы". У раздзеле "Бібліяграфічныя каталогі" прадстаўлены адрасы электронных бібліятэк, бібліятэк РБ, РФ, замежных, адрасы замежных нацыянальных бібліятэк, каталогаў электронных версій друкаваных перыядычных выданняў і інш. А напаўненне раздзела "Адукацыя", напрыклад, уключае адрасы сайтаў арганізацый, якія падтрымліваюць адукацыйныя праекты, сайты арганізацый сферы адукацыі, сайты каталогаў перыядычных выданняў па адукацыі і інш. На жаль, матэрыял не анатаваны.

Стварэнне такіх даведнікаў, навігатараў па рэсурсах інтэрнета патрабуе пастаяннай актуалізацыі матэрыялу: рэгулярнага папаўнення базы даных новымі адрасамі і пастаяннай верыфікацыі (праверкі) існуючых у даведніку спасылак. Без надзейнага механізму карэкціроўкі любы навігатар па інтэрнет-рэсурсах старэе адразу ж пасля яго стварэння. Напрыклад, РНБ, працуючы над стварэннем універсальнага электроннага даведніка "Інфармацыйныя рэсурсы інтэрнета", забяспечвае штотыднёвае папаўненне базы і штомесячную праверку існуючых у даведніку спасылак. Пры апісанні рэсурсаў за аснову, як правіла, бярэцца ГОСТ 7.70 – 96 «Описание баз данных и машиночитаемых информационных массивов» або міжнародны стандарт "Dublin Core Metadata Set (DC)". Актуальнай з'яўляецца праблема стварэння стандартнага апісання электронных рэсурсаў самімі стваральнікамі гэтых рэсурсаў і размяшчэння яго ў самым рэсурсе, неабходнасць укаранення ідэнтыфікацыі электронных рэсурсаў (Univercal Resource Number – URN) накшталт кніжнай – міжнароднага кніжнага нумара (ISBN). Таксама важным з'яўляецца прадастаўленне анатацыі на дадзены рэсурс, дзе павінны прыводзіцца звесткі аб даступнасці рэсурсу, яго характары, а таксама па магчымасці ацэначныя элементы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *5.15. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў*

Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (ФНБД) – гэта частка ДБА, якая змяшчае арыгіналы або копіі выкананых у працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання пісьмовых даведак, а таксама бібліяграфічныя дапаможнікі і атрыманыя ў парадку абмену з іншых бібліятэк аналагічныя матэрыялы. У ФНБД, як правіла, уключаюцца тэматычныя даведкі, якія прысвечаны актуальнай тэматыцы, і прагназуецца, што па дадзенай тэме могуць быць паўторныя запыты; выкананне даведкі патрабавала шмат часу і выкарыстання разнастайных крыніц інфармацыі, у тым ліку і цяжкадаступных; тэма запыту бібліяграфічна не забяспечана спецыяльнымі крыніцамі або мае міжгаліновы комплексны характар. У сувязі з такімі крытэрыямі адбору для бібліяграфічнай прадукцыі фонду характэрныя актуальнасць тэматыкі, аператыўнасць інфармавання.

ФНБД у залежнасці ад тэхналогіі вядзення захоўваецца ў некалькіх формах: алфавітна-прадметнай або тэматычнай картатэкі; спецыяльных папках ці альбомах; у асобных канвертах, у якіх збіраюцца па меры выканання і выдачы карыстальнікам копіі машынапісных бібліяграфічных спісаў. На канверце звычайна ўказваюцца парадкавы нумар даведкі, прадметная рубрыка, тэма спіса, від, колькасныя паказчыкі ўключаных дакументаў, на якіх мовах, за якія гады і якія віды дакументаў уключаны ў спіс, а таксама дата выдачы даведкі і прозвішча бібліёграфа, які працаваў над яе выкананнем. У сувязі з тым, што канверты захоўваюцца у фармальным парадку, па парадкавых нумарах, да фонду складаецца алфавітна-прадметны паказальнік тэматычных даведак і іншых неапублікаваных дапаможнікаў.

ФНБД можа ўяўляць сабой сукупнасць тэматычных картатэк, дзе ў выглядзе картак адлюстроўваюцца выдадзеныя карыстальнікам рукапісныя бібліяграфічныя спісы. Асобныя картатэкі могуць выбарачна папаўняцца, калі па тэме ёсць пастаянныя запыты.

У сувязі з тым, што ў складзе ФНБД асноўную частку складаюць копіі пісьмовых даведак, ён часам бывае абмежаваны толькі імі, і тады яго прынята называць фондам выкананых даведак, што абмяжоўвае яго склад. У прафесійнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуры ФНБД калі-нікалі памылкова называюць архівам, але архіўных функцый ён не выконвае, таму што яго змест вызначаецца інфармацыйнай, а не гістарычнай каштоўнасцю захоўваемых дакументаў. Па меры неабходнасці ФНБД можа падвяргацца чыстцы і аднаўленню.

ФНБД у буйных бібліятэках вядзецца як бібліяграфічным, так і галіновымі, спецыялізаванымі аддзеламі. Напрыклад, у Гродзенскай АУНБ у аддзеле мастацтваў за 2000 г. у фонд было ўключана 307 бібліяграфічных спісаў па мастацтве, у падраздзяленне дзіцячай літаратуры – 463 спісы. У аддзеле краязнаўчай літаратуры ў ФНБД былі ўключаны даведкі па такіх актуальных тэмах, як "Педагагічнае таварыства ў Гародні (1907–1913 гг.), "Сумесныя прадпрыемствы ў лёгкай прамысловасці Гродзенскай вобласці", "Нёманскі суднаходны шлях ", "Кансультацыйны бізнес на Гродзеншчыне" і інш. У ЦБС такі фонд ствараецца ў бібліяграфічным аддзеле ЦБ. Некаторыя ЦБ копіі картак АПП накіроўваюць у аддзелы ЦБ і філіялы сістэмы, што дазваляе інфармаваць аб змесце фонду і больш эфектыўна яго выкарыстоўваць.

Выкарыстанне ФНБД разнастайнае. Пры выкананні паўторных запытаў на тэму бібліятэкару трэба не выдаваць аўтаматычна даведкі з фонду на паступіўшыя запыты без папярэдняга ўдакладнення, наколькі даведка адпавядае патрабаванням новага тэматычнага запыту. У неабходных выпадках патрэбна абавязковая дапрацоўка даведкі. Матэрыялы ФНБД могуць выкарыстоўвацца як аснова для вядзення доўгатэрміновай картатэкі, падрыхтоўкі бібліяграфічнага дапаможніка, пры арганізацыі выставаў, для падрыхтоўкі аглядаў.

Інфармаванне аб выкананых бібліятэкамі тэматычных даведках ажыццяўлялася ў краіне да 1999 г. праз штогодны "Паказальнік неапублікаваных бібліяграфічных спісаў і картатэк, складзеных бібліятэкамі Беларусі ў ... г.". Сёння такой зводнай інфармацыі ў краіне няма.

РНТБ размяшчае на сваім сайце ў раздзеле "Бібліяграфічныя спісы" спіс выкананых ёю за год тэматычных бібліяграфічных спісаў па важнейшых дзяржаўных навуковатэхнічных праграмах, якія спажыўцы могуць заказаць і атрымаць як у друкаваным, так і электронным выглядзе. Спісы размешчаны па галінах ведаў, пры апісанні спіса адзначаецца наяўнасць тэкставага матэрыялу з інтэрнета.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перспектыве НББ плануе на сваім web-сайце размясціць фонд бібліяграфічных даведак, выконваемых у структурных падраздзяленнях бібліятэкі.

Актуальным сёння для бібліятэк з’яўляецца пытанне, ці павінны бібліятэкі весці тэматычныя падборкі інтэрнет-рэсурсаў, якія тым больш не з’яўляюцца пастаяннымі (адныя з іх знікаюць, другія мяняюць адрасы). У шэрагу бібліятэк гэта ўжо робіцца. Напрыклад, вядуцца і карыстаюцца пастаянным попытам “Архівы электронных публікацый”, фарміруюцца тэматычныя дасье, якія запаўняюць лакуны ў фондзе. Тым самым сучасная бібліятэка, якая мае доступ да інтэрнета, значна пашырае колькасць сваіх інфармацыйных крыніц і валодае большымі інфармацыйнымі рэсурсамі для задавальнення запытаў карыстальнікаў.

### *Пытанні і заданні*

1. Выкананню якіх функцый садзейнічае ДБФ бібліятэкі? Чым ён адрозніваецца ад сістэмы каталогаў і картатэк?

2. Якія падыходы і крытэрыі ляжаць у аснове фарміравання ДБФ, як ён суадносіцца з профілем камплектавання асноўнага фонду бібліятэкі?

3. У чым праяўляюцца асаблівасці камплектавання ДБФ бібліятэк розных тыпаў?

4. Прааналізуйце даведачна-бібліяграфічны фонд канкрэтнай бібліятэкі і вызначце яго адпаведнасць функцыям і задачам, якія стаяць перад бібліятэкай.

5. Які ўплыў на камплектаванне ДБФ аказвае выкарыстанне ў бібліятэках новых інфармацыйных тэхналогій?

6. Як Вы разумееце паняцце “размеркаваны даведачна-бібліяграфічны фонд” бібліятэкі, рэгіёна? Чым выклікана яго існаванне? Якія сродкі для яго больш эфектыўнага выкарыстання павінны ствараецца?

7. Якія Вы бачыце перспектыўныя кірункі развіцця розных відаў бібліяграфіі ў краіне, зыходзячы з патрэбнасцей грамадства, асноўных груп карыстальнікаў, сусветнага вопыту?

8. Ахарактарызуйце стан бібліяграфічнай забяспечанасці асноўных галін ведаў у краіне навукова-дапаможнымі крыніцамі рознага ўзроўню, рознага функцыянальна-мэтавага прызначэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Вызначце асноўныя тэндэнцыі развіцця навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў нашай краіне.

10. Якія Вы можаце прывесці аргументы на карысць неабходнасці стварэння крыніц папулярнай бібліяграфіі?

11. Ці павінна ажыццяўляцца каардынацыя дзейнасці бібліятэк, органаў НТІ, навуковых устаноў па падрыхтоўцы электронных бібліяграфічных рэсурсаў на сучасным этапе і з дапамогай якіх сродкаў?

12. Якія базы даных па змесце адлюстраваных дакументаў, характары інфармацыі, грамадскім прызначэнні маглі б рыхтаваць бібліятэкі ВНУ на карпаратыўных пачатках?

13. Ахарактарызуйце існуючыя сродкі і магчымыя шляхі інфармавання аб інфармацыйных рэсурсах, якія маюцца ў краіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел III. АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ

## Глава 6. Тэхналогія і методыка падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў: агульныя пытанні

Працэс падрыхтоўкі бібліяграфічнай інфармацыі называецца бібліяграфаваннем. Ён з'яўляецца арганічнай састаўной часткай разнастайных кірункаў як бібліяграфічнай дзейнасці (складальніцкай, бібліяграфічнага інфармавання, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання), так і небібліяграфічных (камплектавання, апрацоўкі дакументаў, абслугоўвання чытачоў у бібліятэках). Вынікам працэсу бібліяграфавання з'яўляецца бібліяграфічнае абвяшчэнне, якое можа функцыянаваць як у вуснай, так і дакументальнай форме (бібліяграфічны запіс). Найбольш распаўсюджаным спосабам існавання бібліяграфічнай інфармацыі з'яўляецца бібліяграфічны дапаможнік.

Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, формаў – адзін з важнейшых кірункаў дзейнасці бібліятэкі па бібліяграфаванні дакументаў. Нягледзячы на скарачэнне колькасных паказчыкаў выпуску бібліяграфічных дапаможнікаў у традыцыйнай друкаванай форме, актуальнасць добрага ведання бібліёграфамі пытанняў арганізацыі, тэхналогіі і методыкі падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў як у традыцыйнай, так і машыначытальнай формах не зніжаецца. Наадварот, выкарыстанне сродкаў аўтаматызацыі ў бібліяграфічнай дзейнасці паўплывала на больш пільную ўвагу да вывучэння тэхналагічных і метадычных пытанняў бібліяграфічнай дзейнасці, уменняў паставіць задачы перад праграмістамі для распрацоўкі аўтаматызаваных тэхналогій працэсаў бібліяграфавання і ацэньваць якасць іх функцыянавання, пастаянна клапаціцца над пашырэннем асартыменту бібліяграфічнай прадукцыі; рыхтаваць бібліяграфічныя прадукты ў машыначытальнай форме з такімі якаснымі характарыстыкамі, якія б дазволілі іх рэалізоўваць на інфармацыйным рынку ў якасці тавару, выстаўляць у сусветныя камп'ютэрныя сеткі і выкарыстоўваць сусветныя інфармацыйныя рэсурсы ў розных формах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да арганізацыйных пытанняў складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці адносяцца пытанні яе матэрыяльнага, кадравага забеспячэння, каардынацыі і кааперацыі дзейнасці бібліяграфічных і небібліяграфічных падраздзяленняў, далучэння да гэтай работы спецыялістаў іншых галін ведаў і сфер дзейнасці ў якасці кансультантаў, рэдактараў, рэцэнзентаў, планавання і збыту бібліяграфічнай прадукцыі і інш.

Што тычыцца пытанняў тэхналогіі і методыкі бібліяграфавання, то доўгі час гэтыя паняцці разглядаліся як сінонімы, іх атаясамлівалі на практыцы. Але працэсы аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці з усёй вастрынёй паказалі: нягледзячы на тое, што пытанні методыкі складання дапаможнікаў розных відаў, рознага зместу ў большай ступені распрацаваны, даволі складаным аказалася па распрацаваных методыках вызначыць і падрыхтаваць тэхналагічнае апісанне разглядаемага кірунку дзейнасці. Сёння ў залежнасці ад выкарыстоўваемых сродкаў вылучаюцца традыцыйная (ручная) тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў; машынная тэхналогія; тэхналогія складання бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем адначасова традыцыйных і аўтаматызаваных сродкаў. Тэхналогія бібліяграфавання раскрывае паслядоўнасць бібліяграфічных аперацый, дзеянняў бібліёграфа (або ЭВМ – у машынным рэжыме), выкарыстоўваемых сродкаў і прадметаў працы ў мэтах падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.

Методыка бібліяграфавання раскрывае метадычныя прыёмы, рашэнні на падставе тэарэтычных распрацовак і перадавога вопыту пры складанні дапаможнікаў з мэтай рацыяналізацыі ажыццяўлення аперацый і працэсаў бібліяграфавання і атрымання прадуктаў з заданымі якасцямі. Методыка падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў залежыць ад розных фактараў: зместу рыхтуемага дапаможніка, яго мэтавага і чытацкага прызначэння, жанравых асаблівасцей, інфармацыйна-рэсурснага і матэрыяльнага забеспячэння гэтай работы. Між тым існуюць метадычныя правілы і прыёмы, агульныя для складання любога віду бібліяграфічнага дапаможніка. Менавіта іх і раскрывае агульная методыка бібліяграфавання. Асобная методыка бібліяграфавання раскрывае спецыфічныя асаблівасці падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, формаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да асобных адносіцца і галіновая методыка, якая раскрывае асаблівасці бібліяграфавання дакументаў па розных галінах ведаў.

Добрае веданне тэхналогіі і методыкі, арганізацыйных пытанняў складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці – неабходная ўмова прафесійнай падрыхтоўкі кожнага бібліятэкара-бібліёграфа. Яна дазволіць эфектыўна ажыццяўляць выкананне асноўных працэсаў і аперацый бібліяграфавання; забяспечыць якасць і зменшыць затраты на падрыхтоўку бібліяграфічнай прадукцыі; эфектыўна выкарыстоўваць ужо гатовыя бібліяграфічныя прадукты; якасна ажыццяўляць розныя працэсы бібліяграфічнага абслугоўвання; рацыянальна будаваць адносіны пры ўзаемадзеянні з іншымі структурнымі падраздзяленнямі бібліятэкі, іншымі бібліятэчнымі ўстановамі і інфармацыйнымі органамі, спецыялістамі розных галін ведаў і сфер дзейнасці.

У ліку асноўных патрабаванняў да складальнікаў бібліяграфічнай прадукцыі адносяцца і такія, як высокая агульнанавуковая падрыхтоўка; валоданне ўменнямі, здольнасцямі "ўвайсці, ўжыцца" ў тэму складаемага дапаможніка; веданне патрэбнасцей спажыўцоў, на якіх пераважна будзе разлічаны дапаможнік; добрае веданне існуючых інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў; аб'ектыўнасць; уменне лагічна мысліць; валоданне літаратурнымі здольнасцямі; акуратнасць і дасканаласць.

Падрыхтоўка бібліяграфічнага дапаможніка – гэта працаёмкі, комплексны працэс, які складаецца з чатырох асноўных этапаў: падрыхтоўчага, аналітычнага, сінтэтычнага і заключнага. Асаблівасці ажыццяўлення кожнага з іх мы і разгледзім.

### *6.1. Тэхналагічная характарыстыка падрыхтоўчага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў*

Падрыхтоўчы этап складання бібліяграфічнага дапаможніка ўключае наступныя працэсы: выбар і вывучэнне тэмы; распрацоўку плана-праспекта; выяўленне дакументаў.

*Пры выбары тэмы* абавязкова павінны ўлічвацца яе актуальнасць, грамадская важкасць; перспектыўны характар; адпаведнасць тыпавым патрэбнасцям асноўных груп спажыўцоў інфармацыі, якіх абслугоўвае бібліятэка; профільнасць тэмы спецыялізацыі ў дзейнасці бібліятэкі, адпавед-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць магчымасцям бібліятэкі; стан бібліяграфічнай забяспечанасці тэмы.

Выбраная тэма патрабуе абавязковага вывучэння, якое ажыццяўляецца ў двух аспектах. Першы – вывучэнне сутнасці тэмы, яе зместавых аспектаў. Ён праводзіцца з мэтай "уваходжання" ў тэму, каб якасна затым можна было адабраць дакументы, пазбегнуць пропускаў, даць ім кваліфікаваную ацэнку, ажыццявіць у неабходных выпадках іх рэкамендацыю. З гэтай мэтай бібліёграфамі выкарыстоўваюцца даведачныя, вучэбныя, аглядныя выданні, кансультацыі спецыялістаў.

Другі аспект – вывучэнне бібліяграфічнай забяспечанасці тэмы. Ён ажыццяўляецца з мэтай вырашэння пытання аб мэтазгоднасці складання новага бібліяграфічнага дапаможніка, вызначэння яго месца, суадносін з іншымі ўжо існуючымі або запланаванымі да выдання бібліяграфічнымі дапаможнікамі, знаёмства з вопытам бібліяграфавання. Дзеля гэтага бібліёграфамі выкарыстоўваюцца разнастайныя віды паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў як перспектыўнага, так і бягучага, рэтраспектыўнага характару.

Пасля таго як тэма дастаткова вывучана і зацверджана, бібліёграфы-складальнікі распрацоўваюць *план-праспект*. Па сутнасці гэта мадэль будучага дапаможніка, якая рэгламентуе далейшую работу над ім. У плане-праспекце адлюстроўваюцца ўсе пытанні як па зместу дапаможніка, так і метадычныя, звязаныя з адборам дакументаў, структураваннем матэрыялу.

У плане-праспекце адлюстроўваюцца абгрунтаванасць выбару тэмы, удакладняюцца яе тэматычныя граніцы, фармулюецца асноўная мэта складаемага дапаможніка, вызначаюцца яго мэтавае і чытацкае прызначэнне. У адпаведнасці з мэтавым і чытацкім прызначэннем устанаўліваюцца від, тып і жанр будучага дапаможніка; асноўныя прынцыпы адбору дакументаў (храналагічныя, тэрытарыяльныя, моўныя). Вызначаюцца віды дакументаў, якія будуць уключацца ў дапаможнік; структура і спосабы групоўкі матэрыялу ў будучым дапаможніку; склад даведачна-метадычнага апарату; асноўныя і дадатковыя крыніцы выяўлення дакументаў. Указваюцца таксама аб'ём, тэрміны працы, звесткі аб складальніках і рэдактарах, спосаб друкавання і афармлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Добры план-праспект дапамагае забяспечыць метадычнае адзінства і рацыянальную арганізацыю працы ўсяго калектыву складальнікаў, рэдактараў, скласці рабочы план, графік работы, размеркаваць абавязкі. План-праспект абмяркоўваецца, даецца на рэцэнзаванне спецыялістам – навуковым рэдактарам, рэдагуецца па заўвагах, зацвярджаецца і становіцца асноўным дакументам, якім будуць кіравацца складальнікі. У далейшым план-праспект можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы прадмовы да дапаможніка.

Апошні працэс, які адносіцца да падрыхтоўчага этапу, – *выяўленне дакументаў*, галоўная задача якога з максімальнай паўнатой сабраць дакументы, якія паводле акрэсленых у плане-праспекце крытэрыяў адносяцца да тэмы, адпавядаюць віду складаемага бібліяграфічнага дапаможніка. Канчатковы вынік гэтага працэсу – падрыхтоўка рабочай картатэкі бібліяграфічных запісаў, якія патрабуюць далейшага вывучэння.

У ходзе разглядаемага працэсу складальніку патрэбна правільна вызначыць кола крыніц, спосабы і паслядоўнасць іх прагляду. Шматлікасць крыніц, розная іх роля пры складанні розных відаў дапаможнікаў вядуць да неабходнасці іх размежавання на першасныя (перыядычныя выданні, зборнікі дакументаў, даведнікі, паўнатэкставыя базы даных і інш.) і другасныя (бібліяграфічныя, рэфератыўныя выданні, агляды, каталогі і картатэкі, бібліяграфічныя базы даных і інш.).

У залежнасці ад спосабу прагляду крыніцы падзяляюцца на асноўныя, якія праглядаюцца вельмі пільна з мэтай максімальна поўнага выяўлення дакументаў, і дадатковыя, якія праглядаюцца выбарачна ў мэтах кантролю за асноўнымі крыніцамі. Асноўныя і дадатковыя крыніцы могуць мяняцца месцамі ў залежнасці ад віду складаемага дапаможніка: бягучага ці рэтраспектыўнага, навукова-дапаможнага ці папулярнага, дакументнай і бібліяграфічнай забяспечанасці тэмы, навізны, вузасці тэмы складаемага дапаможніка.

Прагляд пачынаюць з асноўных другасных крыніц, потым абследуюць дадатковыя бібліяграфічныя крыніцы, а пасля гэтага звяртаюцца да першасных крыніц – асноўных і дадатковых. Крыніцы бягучай бібліяграфічнай інфармацыі, перыядычныя выданні і выданні, якія працягваюцца, праглядаюцца ў зваротна храналагічным парадку для таго, каб у першую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаргу выявіць апошнія новыя выданні, у неабходным выпадку пашырыць храналагічныя рамкі адбору дакументаў.

Бібліяграфічныя крыніцы могуць падвяргацца суцэльнаму прагляду, калі аналізуюцца ўсе бібліяграфічныя запісы ў крыніцах з фармальным размяшчэннем матэрыялу; і выбарачнаму, які прымяняецца пры выкарыстанні крыніц са змястоўнай групоўкай, у якіх аналізуюцца толькі пэўны раздзел, падраздзел.

Ужо ў ходзе працэсу выяўлення дакументаў праводзіцца іх фармальны і зместавы адбор пры аналізе бібліяграфічных звестак, якія прыводзяцца ў бібліяграфічным апісанні, анатацыях ці рэфератах. У выпадку, калі пытаннне аб адборы дакумента для дапаможніка выклікае сумненне, лепей уключыць яго ў рабочую картатэку, а канчатковае рашэнне адкласці да ацэнкі дакумента пры непасрэднай працы з ім de visu ці знаёмства з крытычным матэрыялам.

У працэсе выяўлення дакументаў складальнікі вядуць дзве картатэкі: картатэку выяўленых дакументаў і картатэку прагледжаных крыніц. Першая картатэка ўключае выяўленыя дакументы; на кожнай картцы, акрамя бібліяграфічнага запісу, могуць адлюстроўвацца дадатковыя звесткі аб крыніцы выяўлення дакументаў, аб крытычным матэрыяле на дакумент, шыфры месцаў захоўвання ў бібліятэках і інш. Матэрыял можна па-рознаму арганізоўваць у картатэцы: у агульным алфавіце аўтараў і назваў дакументаў (дапамагае ліквідаваць дубліраванне выяўленых дакументаў), па асноўных раздзелах будучага дапаможніка (дапамагае вызначыць і ацаніць напаўняльнасць раздзелаў, падраздзелаў).

Картатэка прагледжаных крыніц адлюстроўвае ўсе абследаваныя другасныя і першасныя крыніцы, дае ўяўленне аб паўнаце выяўлення дакументаў, дапамагае пазбегнуць паўторных зваротаў да прагледжаных крыніц і ў той жа час пазбегнуць пропускаў асобных крыніц і іх нумароў пры праглядзе. Пры складанні даведачна-метадычнага апарату дапаможніка дадзеная картатэка выкарыстоўваецца ў час падрыхтоўкі "Спіса прагледжаных крыніц", які складаецца да паказальнікаў літаратуры і дае карыстальніку ўяўленне аб яго інфармацыйнай базе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *6.2. Тэхналагічная характарыстыка аналітычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў*

Другім этапам падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў з'яўляецца аналітычны. Яго мэта – падрыхтаваць бібліяграфічныя запісы аб дакументах у адпаведнасці з вызначанай у плане-праспекце структурай, якія будуць уключаны ў рыхтуемы дапаможнік. Асноўнымі працэсамі дадзенага этапу з'яўляюцца агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў; бібліяграфічнае апісанне; анатаванне ці рэферыраванне; індэксаванне і прадметызацыя; афармленне бібліяграфічнага запісу. Пералічаныя працэсы цесна ўзаемазвязаны і па сутнасці ажыццяўляюцца, сумяшчаючыся ў часе.

Аналітычны этап прадугледжвае працу з кожным дакументам і пачынаецца з *агульнага бібліяграфічнага аналізу*, у ходзе якога бібліёграф знаёміцца са зместам і формай першаснага дакумента, высвятляе тэму, структуру, тыпалагічныя, жанравыя, стылявыя асаблівасці бібліяграфуемага дакумента, яго значнасць, адпаведнасць азначаным у плане-праспекце крытэрыям для ўключэння ў ствараемы дапаможнік. Акрамя гэтага, у ходзе разглядаемага працэсу фарміруецца неабходны матэрыял і для наступных аперацый аналітычнага этапу.

Тэхналогія аналізу дакумента ўключае азнаямленне з тытульным лістом, выдавецкімі данымі, зместам, прадмовай, уступным артыкулам, каментарыямі. Калі гэтага недастаткова для атрымання неабходных звестак, бібліёграф можа правесці выбарачнае чытанне тэксту ці чытанне ўсяго дакумента (артыкула). Могуць выкарыстоўвацца і дадатковыя матэрыялы для атрымання звестак аб змесце, значнасці дакумента, яго аўтары (крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, матэрыялы навуковых дыскусій, кансультацыі спецыялістаў).

Паралельна з агульным аналізам дакумента рыхтуецца ці ўдакладняецца яго *бібліяграфічнае апісанне*. Бібліяграфічнае апісанне павінна адпавядаць дзяржаўным стандартам, быць аднолькавым на працягу ўсяго дапаможніка па аб'ёме прыводзімых звестак, форме іх прадстаўлення. У залежнасці ад віду, тыпу, жанру ствараемага бібліяграфічнага дапаможніка аб'ём, паўната прыводзімых звестак у бібліяграфічным апісанні могуць быць рознымі (можна параўнаць бібліяграфічнае апісанне ў крыніцах агульнай рэтраспектыўнай, бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі і папулярным паказальніку).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на інфармацыйнае значэнне бібліяграфічнага апісання, усё ж такі яго недастаткова для атрымання поўнага і дакладнага ўяўлення аб першасным дакуменце. Атрымаць такую інфармацыю дапамагаюць анатацыя або рэферат.

У працэсе развіцця тэорыі згортвання інфармацыі існавала і існуе шмат азначэнняў паняцця "анатацыя". Але сёння існуе міждзяржаўны стандарт 7.0 – 99 "Рэферат і анатацыя", у якім дадзены азначэнні, структура гэтых другасных дакументаў, патрабаванні да іх, тэхналогія падрыхтоўкі. Згодна са стандартам пад *анатацыяй* разумеецца кароткая характарыстыка дакумента (яго часткі ці сукупнасці дакументаў) з пункту гледжання яго зместу, формы і прызначэння. Анатацыя можа ўключаць розныя звесткі аб дакуменце: якія дапаўняюць бібліяграфічнае апісанне дакумента, тлумачаць ці ўдакладняюць незразумелую назву; уключаюць характарыстыку асноўнай тэмы, праблемы дакумента (яго часткі ці сукупнасці дакументаў); указваюць на мэту работы і яе вынікі; указваюць на прадмет; даюць звесткі аб аўтарах і вартасцях твора (нават з іншых крыніц), жанравай і тыпавідавой прыналежнасці дакумента, мэтавым прызначэнні, акалічнасці выдання; указваюць на тое, што новага ўтрымлівае дакумент у параўнанні з іншымі сугучнымі па тэматыцы ці мэтавым прызначэнні.

Аб'ём, структура, змест і мэтанакіраванасць анатацый залежаць ад зместу анатуемага дакумента, віду, тыпу, жанру, аб'ёму складаемага бібліяграфічнага дапаможніка.

Існуе класіфікацыя анатацый па самых розных прыметах. Найбольш распаўсюджанай з'яўляецца класіфікацыя па функцыянальным прызначэнні і спосабе характарыстыкі анатуемых дакументаў. Па функцыянальным прызначэнні выдзяляюцца даведачныя і рэкамендацыйныя анатацыі.

Даведачная анатацыя можа адлюстроўваць самыя розныя звесткі: удакладняць неінфарматыўны загаловак, тэматыку дакумента, даваць звесткі аб аўтары, форме, жанры выдання, яго прызначэнні і іншых асаблівасцях дакумента, якія адсутнічаюць у бібліяграфічным апісанні. Для даведачных анатацый характэрныя спалучэнне дакладнасці, канкрэтнасці, дастатковай паўнаты звестак з лаканізмам і сціслацю выкладання. Выкарыстоўваюцца даведачныя анатацыі пераважна ў крыніцах навукова-дапаможнай і агульнай бібліяграфіі. Але

могуць прымяняцца і ў крыніцах папулярнай бібліяграфіі ў асноўным пры характарыстыцы даведачнай, вучэбна-метадычнай літаратуры, інфармацыйных і афіцыйных выданняў.

З дапамогай рэкамендацыйнай анатацыі бібліёграф характарызуе і дае ацэнку дакументам, зыходзячы з патрэбнасцей, узроўню падрыхтоўкі і іншых асаблівасцей чытацкай групы. Рэкамендацыйная анатацыя дапамагае прапагандаваць лепшую літаратуру, зацікавіць чытача, прыцягнуць увагу, арганізаваць сістэматычнае чытанне. Для яе характэрныя ацэначныя элементы, выкарыстанне выразных сродкаў, накіраваных на эмацыянальнае ўспрыманне інфармацыі, метадычных рэкамендацый. Аб'ём рэкамендацыйнай анатацыі перавышае аб'ём даведачнай анатацыі, але і пры яе падрыхтоўцы застаюцца неабходнымі патрабаванні дакладнасці, сцісласці, аб'ектыўнасці і навуковасці. Прымяняюцца гэтыя анатацыі пераважна ў дапаможніках папулярнага характару.

Па спосабе характарыстыкі дакументаў анатацыі падзяляюцца на агульныя, аналітычныя і групавыя.

Агульная анатацыя характарызуе дакумент у цэлым, калі ён адпавядае тэме дапаможніка.

Аналітычная анатацыя характарызуе частку дакумента (пэўны аспект зместу ці пэўную частку дакумента – главу, параграф), якая непасрэдна тычыцца тэмы дапаможніка.

Групавая анатацыя характарызуе некалькі дакументаў, блізкіх па змесце ці аб'яднаных адзінай выдавецкай формай, серыяй, падрыхтаваных адным аўтарам. Разгорнутыя групавыя анатацыі ўяўляюць сабой уводныя тэксты да раздзелаў з абагульненай характарыстыкай і ацэнкай зместу ўсіх дакументаў, уключаных у раздзел.

Ёсць і іншыя прыметы класіфікацыі анатацый: па ступені аўтаматызацыі; складальніку; форме прадстаўлення. Усе прыметы класіфікацыі перасякаюцца і прымяняюцца да адных і тых жа анатацый.

Анатаванне – працэс складаны, творчы, патрабуе высокай кваліфікацыі складальніка. Тэхналогія анатавання ўключае наступныя працэсы: чытанне; пабудова мадэлі (плана) анатацыі; напісанне анатацыі; рэдагаванне.

Чытанне можа быць азнаямленчым з мэтай агульнага знаёмства са зместам дакумента; вывучаючым з аналізам; рэфератыўным з элементамі пераказу, абагульнення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пабудова мадэлі (плана) анатацыі прадугледжвае загадзя вызначаныя, зададзеныя элементы анатацыі, якія могуць прысутнічаць у розных відах анатацый, на дакументы рознага зместу, розныя віды выданняў.

Непасрэдна напісанне анатацыі можа ажыццяўляцца з выкарыстаннем розных спосабаў, такіх як цытаванне ці экстрагіраванне (даслоўная перадача фрагментаў тэксту дакумента); перафразіраванне (пераказ, які прадугледжвае перабудову ўсёй кампазіцыйнай і сінтаксічнай структуры тэксту дакумента); інтэрпрэтацыя (аперыраванне сэнсам першаснага дакумента і выкладанне зместу ўжо на новым узроўні, нярэдка з уласнымі каментарыямі).

Рэдагаванне – гэта дасягненне сэнсавай цэласнасці і звязнасці тэксту рыхтуемай анатацыі, прывядзенне ў адпаведнасць з лексічнымі і сінтаксічнымі патрабаваннямі да тэкставай інфармацыі.

На аналітычным этапе замест анатацыі можа рыхтавацца рэферат.

*Рэферат,* згодна з міждзяржаўным стандартам, – "гэта скарочанае выкладанне зместу першаснага дакумента (ці яго часткі) з асноўнымі фактычнымі звесткамі і вывадамі". Рэферат павінен уключаць па магчымасці больш інфармацыі з першаснага дакумента. Найбольш грунтоўныя рэфераты могуць у пэўным сэнсе замяніць арыгінал.

У другасных крыніцах (рэфератыўных часопісах, выданнях экспрэс-інфармацыі) тэксту рэферата папярэднічаюць назва ці загаловак рэферата, бібліяграфічнае апісанне першаснага дакумента. Тэкст рэферата можа суправаджацца дадатковымі звесткамі.

У міждзяржаўным стандарце вызначана тыпавая структура рэферата. Тэкст рэферата павінен адлюстроўваць прадмет, тэму, мэту работы (указваюцца ў выпадку, калі гэта няясна з назвы дакумента); метады ці метадалогію правядзення работы (апісваюцца ў выпадку, калі вызначаюцца навізной ці ўяўляюць каштоўнасць з пункту гледжання гэтай работы, традыцыйныя метады толькі называюцца); вынікі работы, атрыманыя аўтарам дакумента (апісваюцца, наколькі магчыма, поўна, дакладна, інфарматыўна, прыводзяцца асноўныя тэарэтычныя і эксперыментальныя вынікі, фактычныя даныя, неабходна ўказваць межы дакладнасці і надзейнасці атры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мання даных, ступень іх абгрунтавання); сферу прымянення вынікаў работы; вывады (яны могуць суправаджацца рэкамендацыямі, ацэнкамі, меркаваннямі, гіпотэзамі, апісанымі ў дакуменце). Дадатковая інфармацыя – даныя, не істотныя для асноўнай мэты даследавання, а важныя па-за яго асноўнай тэмай, да таго ж можна ўказваць назву арганізацыі, у межах якой выканана праца, звесткі аб аўтары, спасылкі на раней надрукаваныя работы і інш.

Методыкай бібліяграфавання выпрацаваны тыпавыя схемы пабудовы рэферата на мастацкі твор, выраб, працэс, тэарэтычную частку даследавання.

Выпрацаваны шэраг метадычных патрабаванняў да падрыхтоўкі рэфератаў. Рэферат неабходна пачынаць фразай, у якой сфармулявана тэма дакумента; загалоўкі і звесткі, якія ёсць у бібліяграфічным апісанні, не павінны паўтарацца ў тэксце; трэба пазбягаць лішніх уводных слоў і фраз, накшкалт "аўтар разглядае", неінфарматыўных сказаў, малаўжываемых тэрмінаў; прытрымлівацца паслядоўнасці выкладання ў рэфераце яго асноўных элементаў; выкладанне павінна быць кароткім, дакладным, несці новую інфармацыю; выкарыстоўваецца стандартызаваная, прынятая ў пэўнай навуцы тэрміналогія. Скарачэнні і ўмоўныя абазначэнні (акрамя агульнавядомых) прымяняюцца абмежавана з абавязковым тлумачэннем іх пры першым ужыванні. Табліцы, графікі, дыяграмы, малюнкі прыводзяцца толькі ў выпадку неабходнасці, калі яны раскрываюць асноўны змест дакумента і дазваляюць скараціць аб'ём рэферата.

Пры складанні рэфератаў могуць быць выкарыстаны розныя знакавыя сродкі перадачы інфармацыі: славесныя, ілюстрацыйныя (графік, малюнак, фотаздымак і інш.), таблічныя, штучных знакавых сістэм (хімічныя формулы, матэматычныя знакі, ноты). Дапушчальным з'яўляецца і любое іх спалучэнне.

Рэфераты класіфікуюць па розных прыметах. Так, у залежнасці ад мэтавай накіраванасці рэферыравання выдзяляюць інфарматыўныя рэфераты, якія змяшчаюць фактаграфічную інфармацыю, і індыкатыўныя, якія ўказваюць на асноўныя аспекты зместу першаснага дакумента. Паводле такой падставы, як колькасць рэферыруемых крыніц, выдзяляюцца манаграфічныя, зводныя, аспектныя, ці фрагментарныя, рэфераты. У залежнасці ад арыентаванасці на спажыўца інфармацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і характару выкладання выдзяляюць агульныя (для шырокага кола спажыўцоў) і мэтавыя, ці спецыялізаваныя (для спецыялістаў пэўнай катэгорыі), рэфераты; па глыбіні згортвання інфармацыі – пашыраныя і кароткія; у залежнасці ад фармалізацыі структуры – тэкставыя, таблічныя, аспектныя; па спосабе падрыхтоўкі – ручныя і аўтаматызаваныя; паводле аўтарскага выканання – аўтарэферат і рэферат, падрыхтаваны рэферэнтам.

На практыцы распаўсюджаны два асноўныя тыпы рэфератаў: індыкатыўны (сігнальны) і інфарматыўны (рэферат-канспект). Індыкатыўны (сігнальны) рэферат, як правіла, невялікі па аб'ёме, адлюстроўвае найбольш значную (новую, каштоўную і карысную) фактаграфічную інфармацыю з рэферыруемага дакумента. Інфарматыўны (рэферат-канспект) больш шырока падае інфармацыю з першаснага дакумента і ўключае, як правіла, усе ці большую частку элементаў, пералічаных у стандартнай структуры рэферата. Акрамя названых тыпаў рэфератаў, ствараюцца розныя жанры рэфератаў: рэферат-пераклад, рэферат-рэцэнзія, рэферат-ілюстрацыя, рэферат-табліца, рэферат-фрагмент, рэферат тэлеграфнага стылю, аглядны рэферат.

Тэхналогія падрыхтоўкі рэфератаў адпавядае тэхналогіі падрыхтоўкі анатацый.

У тэхналагічным плане ўяўляе цікавасць знаёмства з выкарыстаннем фармалізаваных метадаў падрыхтоўкі анатацый і рэфератаў. Сутнасць іх грунтуецца на ідэі атрымання другаснага дакумента шляхам экстрагіравання з тэкстаў першакрыніцы сэнсавых блокаў, якія адпавядаюць асноўным элементам тыпавой схемы рэферата. Для ідэнтыфікацыі гэтых сэнсавых блокаў выкарыстоўваюць словы-маркёры – тыпавыя сінтаксічныя структуры, напрыклад "мэтай дадзенай работы з'яўляецца ...", "у даследаванні выкарыстоўваліся метады..." і інш. Словы-маркёры, як правіла, папярэджваюць інфарматыўныя звесткі, неабходныя для ўключэння ў рэферат.

Рэфераты выкарыстоўваюцца ў розных крыніцах навукова-дапаможнага характару – рэфератыўных часопісах, рэфератыўных зборніках, выданнях экспрэс-інфармацыі.

Вызначаючы адрозненні другасных дакументаў, такіх як анатацыя і рэферат, трэба адзначыць, што анатацыя адказвае на пытанне, аб чым гаворыцца ў першасным дакуменце, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэферат – што паведамляе першасны дакумент; аб'ём рэфератаў, згодна ГОСТ, перавышае сярэдні аб'ём анатацый. Пры падрыхтоўцы рэферата трэба прытрымлівацца абавязковай паслядоўнасці выкладання яго асноўных элементаў. Але на практыцы даволі цяжка правесці размежаванне паміж імі, таму што існуюць яшчэ і прамежкавыя формы другасных дакументаў – рэфератыўныя анатацыі. Не заўсёды складальнікі прытрымліваюцца асноўных патрабаванняў да гэтых відаў другасных дакументаў.

Для характарыстыкі дакументаў, уключаемых у бібліяграфічны дапаможнік, на аналітычным этапе прымяняюцца і вынікі такіх працэсаў, як індэксіраванне і прадметызацыя. *Індэксіраванне* – гэта працэс выражэння зместу дакумента на інфармацыйна-пошукавай мове. Індэксам называецца ўмоўнае азначэнне дзялення сістэмы класіфікацыі, да якой адносіцца дакумент. *Прадметызацыя* – гэта індэксіраванне зместу дакумента з дапамогай прадметных рубрык. Індэксіраванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ГОСТ 7.59 – 90 “Индексирование. Общие требования к систематизации и предметизации” і ГОСТ 7.66 – 92 “Индексирование документов. Общие требования к координатному индексированию”.

Вынікі разгледжаных вышэй аналітычных працэсаў аб'ядноўвае *бібліяграфічны запіс*. Колькасць элементаў у бібліяграфічным запісе можа быць розная ў залежнасці ад віду, тыпу, жанру складаемага дапаможніка. Мінімальнай і абавязковай адзінкай бібліяграфічнага запісу з'яўляецца бібліяграфічнае апісанне. Пры афармленні бібліяграфічнага запісу трэба прытрымлівацца абавязковай паслядоўнасці яго элементаў, кожны элемент пачынаць з новага радка, выкарыстоўваць розныя шрыфты, прабелы для лепшага ўспрымання тэксту.

### *6.3. Тэхналагічная характарыстыка сінтэтычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў*

Галоўная задача сінтэтычнага этапу – сфарміраваць структуру бібліяграфічнага дапаможніка, якая б адпавядала яго мэтаваму і чытацкаму прызначэнню, жанру. Гэтая задача рэалізуецца з дапамогай такіх працэсаў, як канчатковы адбор і групоўка дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Канчатковы адбор* – гэта выбар з масіву дакументаў, якія выяўлены на папярэдніх этапах, тых дакументаў, што адпавядаюць крытэрыям адбору, вызначаным у плане-праспекце дапаможніка. Папярэдні адбор дакументаў ажыццяўляецца ўжо ў працэсе падрыхтоўчага этапу – у ходзе іх выяўлення, а таксама на аналітычным этапе падчас агульнага бібліяграфічнага аналізу дакумента.

Адрозніваюць фармальны, зместавы і якасны адбор.

Фармальны адбор – гэта адбор па знешніх прыметах дакумента. Фармальныя абмежаванні пры адборы могуць быць фармальна-выдавецкія (від выдання, тыраж, аб'ём); храналагічныя (уліковы перыяд і час напісання); тэрытарыяльныя (месца выдання); моўныя. Могуць выступаць і прасторавыя абмежаванні, звязаныя з раскрыццём фонду пэўнай бібліятэкі ці асартыменту выдавецкай прадукцыі. У бібліяграфічнай практыцы пералічаныя фармальныя прыметы адбору звычайна сумяшчаюцца.

Пры зместавым адборы ўвага надаецца тэматыцы дакумента, яго адпаведнасці тэме, зместавым аспектам і праблемам, якім прысвечаны бібліяграфічны дапаможнік.

Якасны адбор – гэта адбор дакументаў у адпаведнасці з мэтавым і чытацкім прызначэннем дапаможніка, а таксама паводле іх навуковай, мастацкай і іншай каштоўнасці. Ён больш складаны, арыентаваны на рэалізацыю ацэначнай функцыі дапаможніка, патрабуе ад бібліёграфа добрага ведання асаблівасцей інфармацыйных патрэбнасцей асноўных груп спажыўцоў, якім прызначаецца дапаможнік, а таксама ўменне арыентавацца ў дакументным патоку і ажыццяўляць параўнальны аналіз якасці дакументаў.

У бібліяграфічнай практыцы ўсе віды адбору спалучаюцца, але ў залежнасці ад віду складаемага бібліяграфічнага дапаможніка па грамадскім, функцыянальна-мэтавым прызначэнні адзін з відаў адбору можа выступаць у якасці асноўнага, а іншыя – дадатковымі.

*Бібліяграфічная групоўка* – гэта аб'яднанне бібліяграфічных запісаў у групы па заданых прыметах. Мэты групоўкі ў бібліяграфічным дапаможніку – упарадкаванне, прывядзенне ў лагічную і стройную сістэму выяўленых першасных дакументаў; дапамога спажыўцу ў хуткім знаходжанні неабходных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыя бібліяграфічнага матэрыялу ў дапаможніку складаецца з трох наступных момантаў: падзяленне ўсяго масіву запісаў на пэўныя групы па абранай прымеце; вызначэнне паслядоўнасці раздзелаў, падраздзелаў і рубрык; выбар спосабу размяшчэння запісаў унутры рубрык, падрубрык (у апошніх дзяленнях).

Існуюць тры спосабы групоўкі: фармальная, зместавая, лагічная.

Фармальная групоўка грунтуецца на знешніх прыметах дакумента і арыентавана на забеспячэнне іх пошуку. Сярод яе разнавіднасцей выдзяляюцца размяшчэнне па алфавіце загалоўкаў дакументаў і прозвішчаў аўтараў; па відах выданняў; месцы выдання ці захоўвання; па храналагічных прыметах – датах выдання ці публікацыі дакументаў; мове; выдавецтвах і інш. Трэба ўлічваць мэтазгоднасць і рацыянальнасць прымянення гэтых груповак у залежнасці ад розных характарыстык складаемага дапаможніка. Так, алфавітная групоўка найбольш мэтазгодна ў невялікіх спісах ці ў апошніх дзяленнях бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў; храналагічная – у персанальных бібліяграфічных дапаможніках ці дапаможніках па гісторыі навукі; тапаграфічная – у бібліяграфічных дапаможніках газет; па відах выданняў – у выдавецкіх каталогах, у персанальных паказальніках, каб адлюстраваць дзейнасць вучонага ў розных кірунках.

Зместавая групоўка арыентавана на аб'яднанне ў структурных адзінках дапаможніка дакументаў, блізкіх па змесце. Зместавая групоўка можа быць сістэматычнай, тэматычнай і прадметнай.

Пры сістэматычнай групоўцы матэрыял размяшчаецца ў адпаведнасці з прынятай схемай класіфікацыі (УДК, ББК, галіновай навуковай класіфікацыяй і інш.). Яна адрозніваецца лагічнасцю, іерархічнасцю пабудовы, стабільнасцю, супарадкаванасцю раздзелаў і рубрык, якія адлюстроўваюць сувязі ў навуцы, жорсткасцю структуры. Гэты від групоўкі выкарыстоўваецца ва універсальных і галіновых бібліяграфічных дапаможніках.

Тэматычная групоўка ўяўляе сабой арганізацыю бібліяграфічных запісаў па тэмах, якія ў сукупнасці раскрываюць змест бібліяграфічнага дапаможніка. Агульная колькасць дзяленняў, назвы раздзелаў і падраздзелаў у адрозненне ад

сістэматычнай групоўкі могуць быць адвольнымі і ў блізкіх па змесце паказальніках. Яны дазваляюць засяродзіць увагу спажыўцоў інфармацыі на актуальных праблемах, паказаць сучасны стан, перспектывы развіцця пэўнай праблемы, яе міжпрадметныя сувязі. Пры тэматычнай групоўцы ўвага надаецца логіцы ў выдзяленні раздзелаў і падраздзелаў; дробнасць тэматычнай групоўкі залежыць ад агульнай колькасці дакументаў, ад чытацкага прызначэння (вельмі дробная групоўка немэтазгодная для малападрыхтаванага спажыўца інфармацыі). Выкарыстоўваецца гэты спосаб групоўкі ў тэматычных, міжгаліновых бібліяграфічных дапаможніках.

Пры прадметнай групоўцы ствараюцца комплексы бібліяграфічных запісаў па вузкіх тэмах – прадметных рубрыках, якія размяшчаюцца па алфавіце. Перавагі гэтага спосабу групоўкі – у хуткім пошуку неабходных дакументаў па канкрэтных пытаннях. Недахопы ж звязаны з тым, што ў сувязі са шматаспектнасцю дакументаў узнікае неабходнасць выкарыстання значнай колькасці прадметных рубрык, спасылачнага апарату паміж рубрыкамі, павялічваецца аб'ём дапаможніка. І ў той жа час алфавітны парадак размяшчэння прадметных рубрык разрывае сувязі паміж блізкімі па змесце запісамі, парушае іх лагічную паслядоўнасць. Таму гэты спосаб групоўкі прымяняецца вельмі рэдка, як правіла, у крыніцах навукова-дапаможнага характару.

Блізкай да прадметнай групоўкі з'яўляецца групоўка ў пермутацыйных паказальніках, якая заключаецца ў размяшчэнні бібліяграфічных запісаў па алфавіце ключавых слоў загалоўкаў. Пермутацыйныя паказальнікі фарміруюцца ў форме табліцы, якая складаецца з трох вертыкальных калонак: у левай прыводзіцца загаловак, у цэнтральнай – ключавое слова, а ў правай – астатнія элементы бібліяграфічнага запісу.

Лагічная, ці рэкамендацыйная, групоўка – гэта размяшчэнне бібліяграфічных запісаў у рэкамендуемай паслядоўнасці знаёмства, вывучэння тэмы, напрыклад ад агульнага да асобнага, ад простага да складанага і г.д. Звычайна выкарыстоўваецца ў крыніцах папулярнай бібліяграфіі.

Групоўка можа быць простая (элементарная) і складаная. Пры простай групоўцы матэрыял размяркоўваецца паміж дзяленнямі аднаго ўзроўню. Складаная групоўка прадугледжвае размеркаванне бібліяграфічных запісаў па раздзелах,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ў сваю чаргу падзяляюцца на больш дробныя падраздзелы, рубрыкі. Групоўка дакументаў па розных узроўнях можа ажыццяўляцца з выкарыстаннем розных спосабаў і відаў груповак, што садзейнічае дасягненню шматаспектнага раскрыцця зместу і формы аб'ектаў бібліяграфавання.

Мэтазгоднасць выбару спосабу і віду групоўкі залежыць ад зместу бібліяграфічнага дапаможніка, яго мэтавага і чытацкага прызначэння, аб'ёму, зместу і характару аб'ектаў бібліяграфавання.

Пры арганізацыі матэрыялу ў бібліяграфічным дапаможніку неабходна прытрымлівацца наступных патрабаванняў: схема групоўкі павінна быць стройнай, гэта значыць заснаванай на прымяненні адзінага прынцыпу дзялення па асноўных раздзелах; лагічнай; адпавядаць сучаснаму стану развіцця навукі. Каб пазбавіцца пэўных недахопаў схем групоўкі і адлюстраваць шматаспектнасць зместу пэўных дакументаў у адпаведных раздзелах, трэба выкарыстоўваць спасылачна-даведачны апарат.

### *6.4. Тэхналагічная характарыстыка заключнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў*

Заключны этап складаецца з працэсаў, якія забяспечваюць зручнасць карыстання бібліяграфічным дапаможнікам: падрыхтоўкі даведачна-метадычнага апарату, рэдагавання і афармлення дапаможніка перад здачай у друк.

У склад *даведачна-метадычнага апарату* ўваходзяць прадмова, уступны артыкул, дапаможныя паказальнікі, дадаткі, змест, метадычныя парады.

Як бы добра ні быў сфармуляваны загаловак, ён ніколі не можа паведаміць, перадаць чытачу ўсяго, што неабходна ведаць аб бібліяграфічным дапаможніку. Дадае гэтую інфармацыю для карыстальніка прадмова, якая з'яўляецца абавязковай для дапаможнікаў усіх відаў і тыпаў. Пры падрыхтоўцы прадмовы бібліёграф абапіраецца на тыя характарыстыкі, якія былі дадзены ў плане-праспекце, але ўжо ў форме тлумачэнняў спажыўцу, метадычных парад па выкарыстанні дапаможных паказальнікаў, асаблівасцей групоўкі матэрыялу, бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў. Абавязкова прыводзяцца звесткі аб прызначэнні дапаможніка, яго зместавых аспектах, даецца характарыстыка адлюстраваных у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможніку дакументаў, тлумачыцца спосаб размяшчэння матэрыялу, а не пералічваюцца назвы раздзелаў і падраздзелаў. Указваецца верхняя храналагічная мяжа адбору матэрыялу.

У бібліяграфічных дапаможніках, якія выходзяць з пэўнай перыядычнасцю ці ў серыях, прадмова звычайна змяшчаецца ў першым выпуску. Прадмова да папулярных дапаможнікаў павінна будавацца з улікам правіл стымулявання чытання, вырашаць задачу зацікавіць спажыўца інфармацыі зместам дапаможніка. Прадмова павінна быць яснай, зразумелай, лёгка аглядаемай, лаканічнай.

Уступны артыкул рыхтуецца не да ўсіх дапаможнікаў, часцей да крыніц рэпертуарнага характару, буйных дапаможнікаў спецыяльнай ретраспектыўнай бібліяграфіі, персанальных паказальнікаў. Ён уяўляе сціснуты агляд гісторыі развіцця і сучасны стан распрацаванасці і дакументальнай забяспечанасці тэмы або агляд дакументаў, якія адлюстраваны ў дапаможніку. Ва ўступным артыкуле могуць давацца спасылкі на адпаведныя бібліяграфічныя запісы тэксту дапаможніка, прыводзіцца статыстычныя абагульненні і вывады, заснаваныя на выніках аналізу адлюстравання ў дапаможніку літаратуры. Рыхтуюць уступныя артыкулы, як правіла, навуковыя рэдактары ці кансультанты – спецыялісты ў дадзенай галіне ведаў.

Дапаможныя паказальнікі рыхтуюцца з мэтай павышэння пошукавых магчымасцей дапаможніка, на якія ўжо скіраваны такія сродкі ў дапаможніку, як групоўка бібліяграфічных запісаў. Любы дапаможны паказальнік уяўляе сабой упарадкаваны (часцей за ўсё ў алфавітным парадку) пералік звязаных адзінай прыметай паняццяў. Пры гэтым ад кожнай рубрыкі паказальніка даецца адсылка да адпаведных нумароў бібліяграфічных запісаў ці старонак бібліяграфічнага тэксту. Для рубрык паказальніка могуць быць узяты любыя элементы бібліяграфічнага запісу, адсюль вялікая разнастайнасць дапаможных паказальнікаў. Сярод іх дапаможны паказальнік аўтараў; імянны паказальнік, які ўключае, акрамя прозвішчаў і ініцыялаў аўтараў, звесткі аб рэдактарах, складальніках, перакладчыках, ілюстратарах і іншых асобах, якія прымалі ўдзел у падрыхтоўцы твораў друку, з указаннем іх характару дзейнасці. У імянны паказальнік могуць уключацца і перса-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальныя рубрыкі – прозвішчы асоб, якія ўпамінаюцца ў бібліяграфуемых творах; для іх выдзялення выкарыстоўваецца такі метадычны прыём, як заключэнне нумара бібліяграфічнага запісу ў круглыя дужкі, ці даецца ўдакладненне – "аб ім". Персанальныя рубрыкі могуць суправаджацца датамі жыцця, указваюцца род заняткаў, званне і інш. Можа складацца асобны персанальны дапаможны паказальнік.

Сярод распаўсюджаных дапаможных паказальнікаў адзначаюцца паказальнік загалоўкаў; геаграфічны, у якім адлюстроўваюцца геаграфічныя назвы, з тэксту дакумента; паказальнік калектываў, арганізацый ці ўстаноў, якія выдалі творы друку; паказальнік моў у выпадку, калі ў дапаможнік уключана літаратура на розных мовах; тапаграфічны – месцаў выдання; храналагічны, які адлюстроўвае дакументы па гадах напісання ці выдання і выкарыстоўваецца ў агульных рэтраспектыўных крыніцах ці крыніцах персанальнага характару. Найбольш складаным для падрыхтоўкі з'яўляецца прадметны паказальнік. Прадметны паказальнік аб'ядноўвае пад кожнай прадметнай рубрыкай спасылкі на творы, у якіх знайшлі адлюстраванне пэўнае вузкае паняцце, якасць, працэс ці прадмет, прычым для іх вызначэння бібліёграфу даводзіцца не толькі аналізаваць усе элементы бібліяграфічнага запісу, але і звяртацца да саміх твораў друку.

Новыя віды дапаможных паказальнікаў звязаны з выкарыстаннем ЭВМ, сярод іх можна вылучыць пермутацыйныя паказальнікі.

Выбар відаў дапаможных паказальнікаў вызначаецца спосабам групоўкі матэрыялу (дзейнічае прынцып ад супрацьлеглага – раскрыццё зместу і формы бібліяграфуемых дакументаў у дапаможным паказальніку павінна адрозніваецца ад спосабу групоўкі ў асноўным тэксце); мэтавым і чытацкім прызначэннем дапаможніка (шляхам прагназавання запытаў асноўных груп спажыўцоў, з якімі яны могуць звяртацца да дапаможніка); аб'ёмам самога дапаможніка, характарам і зместам адлюстраваных у ім дакументаў (у дапаможніках гістарычнага характару, якія змяшчаюць значны біяграфічны матэрыял, мэтазгодны дапаможны паказальнік асоб; па хіміі і хімічнай тэхналогіі – паказальнік хімічных рэчаў і інш.); спосабам бібліяграфічнай характарыстыкі твораў друку (да дапаможнікаў сігнальнага ўзроўню можа складацца прадметны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паказальнік у сувязі з тым, што змест дакументаў у самым тэксце раскрыты недастаткова).

*Рэдагаванне бібліяграфічных дапаможнікаў.* Бібліяграфічныя дапаможнікі, якія рыхтуюцца да друку, падвяргаюцца навуковаму, літаратурнаму, бібліяграфічнаму рэдагаванню. Кожны з гэтых відаў рэдагавання ў аднолькавай ступені значны і ўплывае на якасць бібліяграфічнага дапаможніка. Навуковае рэдагаванне ажыццяўляецца ў працэсе складання дапаможніка, літаратурнае і бібліяграфічнае – перад друкаваннем.

Навуковае рэдагаванне ажыццяўляе ці кваліфікаваны бібліёграф, які спецыялізуецца ў галіне ведаў, па якой складаецца дапаможнік, ці кваліфікаваны спецыяліст па дадзенай галіне. Навуковы рэдактар удзельнічае ў вызначэнні тэмы, ідэйнай задумы, мэтавага і чытацкага прызначэння дапаможніка; прымае ўдзел у падрыхтоўцы ці рэцэнзаванні плана-праспекта бібліяграфічнага дапаможніка. У арганізацыі далейшай работы супрацоўніцтва можа ісці рознымі кірункамі. Рэдактар можа прыступіць да работы з рукапісам, калі яна ўжо падрыхтавана. Ён дае ацэнку навуковай значнасці дапаможніка; вызначае адпаведнасць яго зместу пастаўленым мэтам, чытацкаму прызначэнню; аналізуе структуру дапаможніка, назвы раздзелаў, іх лагічнасць, характар анатацый і адпаведнасць зместу дакумента, сучаснаму стану развіцця навукі, склад даведачна-метадычнага апарату. Рэдактар працуе са складальнікам на кожным этапе бібліяграфавання, дае кансультацыі па кожным раздзеле, указвае найбольш рацыянальныя падыходы да падрыхтоўкі дапаможніка, абмяркоўвае іх разам з бібліёграфамі-складальнікамі.

Літаратурнае рэдагаванне заключаецца ў шматразовай дасканалай вычытцы ўсяго тэксту дапаможніка з мэтай выпраўлення стылістычных памылак, паўтораў, недакладных ці неправільных выразаў, памылак і інш. Асаблівая ўвага звяртаецца на тэкст прадмовы, уступнага артыкула, анатацый ці рэфератаў. Літаратурнаму рэдагаванню таксама належаць фармулёўкі назваў раздзелаў, падраздзелаў, рубрык з мэтай зрабіць іх больш дакладнымі, яснымі.

Пры рэдагаванні анатацый, уводных тэкстаў трэба ўлічваць асаблівасці ўспрымання тэксту чытачамі. Анатацыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўводны тэкст могуць уключаць невялікую колькасць незнаёмых слоў ці спецыяльных тэрмінаў (не больш за 2% незнаёмых слоў, тэрмінаў). Аптымальнай павінна быць даўжыня сказа. Чытачы з нізкім узроўнем падрыхтаванасці добра ўспрымаюць сказы, калі ў іх не меней шасці слоў, але не болей 17. У мэтах даступнасці анатацый трэба таксама мець на ўвазе іх аб'ём. Так, мінімальная па аб'ёме анатацыя змяшчае сем радкоў (70 слоў).

Бібліяграфічнае рэдагаванне ажыццяўляе бібліёграф, і яно зводзіцца да праверкі аднолькавасці бібліяграфічных апісанняў, адпаведнасці іх ГОСТ, правільнасці нумарацыі бібліяграфічных запісаў, паўнаты і дакладнасці адлюстравання матэрыялу ў дапаможных паказальніках, афармлення дадаткаў.

Апошні працэс падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў – *афармленне бібліяграфічнага дапаможніка* перад здачай у друк. Як і любы друкаваны твор, бібліяграфічны дапаможнік мае сваю кампазіцыю, якая вызначае паслядоўнасць яго элементаў.

Асноўным элементам бібліяграфічнага дапаможніка з'яўляецца асноўны тэкст, які складаецца з бібліяграфічных запісаў; астатнія элементы ці папярэднічаюць яму, ці ідуць за ім. Да першых адносяцца прадмова, уступны артыкул, хparty храналагічная канва жыцця і дзейнасці пэўнай асобы, якой прысвечаны паказальнік, спіс умоўных скарачэнняў. Непасрэдна за бібліяграфічным тэкстам ідуць дапаможныя паказальнікі, спіс прагледжаных крыніц. Кампазіцыя бібліяграфічнага дапаможніка павінна быць адлюстравана ў змесце бібліяграфічнага дапаможніка, які змяшчаецца ў канцы ці ў пачатку дапаможніка.

Разам з пералічанымі элементамі, што вызначаюць структуру бібліяграфічнага дапаможніка, абавязкова афармляецца тытульны ліст, на якім указваюцца прозвішча і ініцыялы складальніка; назва дапаможніка і звесткі, якія яго тычацца (падзагаловак, звесткі аб паўторнасці выдання), выхадныя даныя, звесткі аб калектыўным аўтары (назве бібліятэкі ці іншых устаноў, якія выпускаюць дапаможнік). Найбольш значныя звесткі з ліку тых, што змяшчаюцца на тытульным лісце, выносяцца на вокладку. Акрамя тытульнага ліста могуць выкарыстоўвацца контртытул (дадатковы тытульны ліст, які змяшчаецца з левага боку перад тытулам звычайна ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

серыйных ці шматтомных выданнях і на якім указваюцца звесткі аб серыі, перакладзе тытульнага ліста на замежныя мовы і інш.); шмуцтытул (асобны ліст перад кожным раздзелам з указаннем назвы раздзелаў); калонтытул (асобны радок зверху кожнай старонкі над лінейкай, якая аддзяляе яго ад асноўнага тэксту, у якім указваецца назва рубрыкі ці падрубрыкі).

У паліграфічным афармленні важная роля належыць ілюстрацыйнаму матэрыялу.

### *6.5. Тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі*

Аўтаматызацыя бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў у бібліятэках дазваляе ажыццяўляць і працэс падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем ЭВМ.

Аўтаматызаваная тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных выданняў грунтуецца на тым, што зыходным дакументам для іх падрыхтоўкі служаць ужо выверaныя бібліяграфічныя запісы, якія знаходзяцца ў электроннай памяці ЭВМ. Так, некаторыя бібліятэкі рыхтуюць традыцыйныя формы бібліяграфічных дапаможнікаў як аналагі існуючых тэматычных баз даных. Пад часткова аўтаматызаванай тэхналогіяй разумеюць тэхналогію, якая прадугледжвае ручны адбор бібліяграфічнай інфармацыі з наступным уводам у ЭВМ і апрацоўкай на аўтаматызаваным рабочым месцы (АРМ) бібліёграфа. Пад змешанай тэхналогіяй падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў разумеюць тэхналогію, пры якой выкарыстоўваюцца як традыцыйныя крыніцы адбору інфармацыі, так і вынікі ўжо праведзенай аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў у электроннай форме.

Разгледзім асаблівасці змешанай тэхналогіі падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў (згодна з асноўнымі выдзеленымі вышэй этапамі і працэсамі бібліяграфавання) як найбольш распаўсюджанай у практыцы бібліятэк на сучасным этапе.

На падрыхтоўчым этапе выбар, вывучэнне тэмы, падрыхтоўка плана-праспекта бібліяграфічнага дапаможніка ўваходзяць у абавязкі бібліёграфа. Часта замест тэрміна “план-праспект” выкарыстоўваецца тэрмін “тэхнічнае заданне” на стварэнне БД. Змест тэхнічнага задання складаецца з наступных раздзелаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Агульныя звесткі. Прыводзяцца поўная назва БД і яе ўмоўнае абазначэнне; найменне распрацоўшчыка і заказчыка; абгрунтаванне неабходнасці стварэння БД; пералік дакументаў, на падставе якіх ствараецца БД; парадак афармлення і прад'яўлення заказчыку вынікаў работы па фарміраванні БД; планавыя тэрміны пачатку і заканчэння работ.

2. Прызначэнне і мэты стварэння БД. Указваюцца склад карыстальнікаў, тып БД, які ўключае ўсе яе класіфікацыйныя прыметы ў адпаведнасці з патрабаваннямі карыстальнікаў; састаў рашаемых БД задач, вобласці прымянення і мэты БД.

3. Патрабаванні да БД. Прыводзяцца патрабаванні да складу, структуры і спосабаў арганізацыі даных. Указваюцца фармальныя межы адбору дакументаў – храналагічныя, геаграфічныя, моўныя і відавыя; семантычныя, задаваемыя шляхам пералічэння класіфікацыйных індэксаў, прадметных рубрык, ключавых слоў або дыскрыптараў, якія адлюстроўвалі б змест БД. Даюцца патрабаванні да складу элементаў пошукавага вобраза дакументаў (ПВД), падставы выбару для лінгвістычных сродкаў, якія забяспечваюць раскрыццё зместу дакументаў у БД; патрабаванні да інфармацыйнай сумяшчальнасці БД, а таксама да абароны інфармацыі.

4. Характар і змест работы па стварэнні БД. Прыводзіцца пералік нарматыўна-метадычных дакументаў, якія рэгламентуюць стварэнне БД. Даюцца абгрунтаванне выбару крыніц фарміравання БД, пералік існуючых у дадзенай прадметнай вобласці БД, інфармацыйных выданняў, раздзелаў бібліятэчных каталогаў і картатэк, перыядычных выданняў і інш., якія трэба абследаваць пры распрацоўцы БД, характарыстыка адбору дакументаў для ўключэння ў БД. Прыводзяцца патрабаванні да састаўлення ПВД, да запаўнення фармату машыннага запісу і да вядзення БД.

Важным пытаннем з'яўляецца вызначэнне структуры бібліяграфічнага запісу ў БД, якое ўключае выбар фармату бібліяграфічнага запісу і вызначэнне саставу палёў бібліяграфічнага запісу. Уніфікацыя прадстаўлення бібліяграфічнага запісу на машынным носьбіце дасягаецца за кошт выкарыстання камунікатыўных фарматаў (MARC, UNIMARC, BELMARC і інш.). Асноўнай адзінкай бібліяграфічнага запісу ў камунікатыўным фармаце з'яўляюцца палі даных. Поле даных – гэта частка бібліяграфічнага запісу, прызначаная для прадстаўлення даных пэўнай катэгорыі: вобласці біблія-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічнага апісання, прадметнай рубрыкі, шыфру захоўвання і інш. Поле даных можа змяшчаць адно або некалькі падпалёў пераменнай або фіксаванай даўжыні. Выбар саставу палёў бібліяграфічнага запісу на падставе камунікатыўнага фармату ажыццяўляецца ў адпаведнасці з мэтай стварэння і прызначэннем канкрэтнай БД. У складзе палёў бібліяграфічнага запісу павінны быць вызначаны тыя палі (элементы запісу), якія спецыяльна прызначаны для пошуку дакументаў, напрыклад загалоўкі бібліяграфічных запісаў, загаловак дакумента, класіфікацыйныя індэксы, прадметныя рубрыкі, ISBN, ISSN і інш. Вынікам выканання дадзенага вызначэння з’яўляецца пералік палёў бібліяграфічнага запісу ў выбраным фармаце.

5. Парадак кантролю і ацэнкі БД. Указваюцца парадак узгаднення і зацвярджэння дакументацыі, якая характарызуе БД, віды і метады ацэнкі якасці БД. Даецца ацэнка БД і адпаведна спажывецкаму попыту на яе, зыходзячы з ахопу крыніц па асноўнай тэматыцы, а таксама па сумежных галінах. Апісваюцца пошукавыя магчымасці БД, фармат запісу (абменны або ўнутраны) аб’ём БД, аператыўнасць адлюстравання інфармацыі (час паміж выпускам першакрыніц і стварэннем БД), аператыўнасць прадастаўлення інфармацыі (сярэдні час пошуку інфармацыі па запытах карыстальнікаў).

На гэтым жа этапе рыхтуецца праграма работы ЭВМ, якая ўключае апісанне зместу, характару, паслядоўнасці праводзімых над зыходнымі данымі аперацый на зразумелай машыне мове; праграміруецца таксама вынік работы. Праграму работы ЭВМ рыхтуе праграміст, які кансультуецца з бібліёграфам. Але гэта не трэба разумець, што да кожнага бібліяграфічнага дапаможніка рыхтуецца спецыяльная праграма, бібліяграфаванне з'яўляецца адной з функцый інтэграваных АБІС.

Працэс выяўлення дакументаў можа ажыццяўляцца як у аўтаматызаваным рэжыме, так і ўручную па традыцыйных крыніцах, разгледжаных у адпаведных тэмах гэтага раздзела. Калі бібліятэка мае бібліяграфічныя крыніцы на электронных носьбітах – электронны каталог, тэматычныя, галіновыя, універсальныя БД як уласнай генерацыі, так і набываемыя, то, безумоўна, працэс выяўлення дакументаў у першую чаргу будзе адбывацца па дадзеных крыніцах у ходзе аўтаматызаванага пошуку. У якасці крыніц могуць выкарыстоўвацца і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БД, даступныя ў тэлекамунікацыйным, онлайнавым рэжыме. Дзеля гэтага неабходна правільна вызначыць БД, якія могуць уключаць неабходныя дакументы, скласці пошукавае прадпісанне з прадметных рубрык, класіфікацыйных індэксаў, выкарыстоўваемых у БД схем класіфікацый, якое адлюстроўвала б тэму ўсяго дапаможніка, яго раздзелаў, падраздзелаў. Пошукавае прадпісанне ўводзіцца ў выглядзе тэматычнага запыту ў ЭВМ. Складанасць работ на дадзеным этапе вызначаецца неабходнасцю вырашэння праблемы сэнсавай адпаведнасці паміж тэрмінамі індэксавання, якія апісваюць, з аднаго боку, змест ствараемай БД, а з другога – змест інфармацыйнага масіву, у якім ажыццяўляецца адбор дакументаў. Вырашэнне гэтай праблемы прадугледжвае выкарыстанне метаду залішняга індэксавання (далучэння сінонімаў, родавых, відавых і асацыятыўных паняццяў), інверсіі словазлучэнняў, разбіўкі словазлучэнняў на састаўныя часткі і інш. У арганізацыі аўтаматызаванага інфармацыйнага пошуку асобае значэнне мае выбар стратэгіі і тактыкі пошуку, заснаваных на выкарыстанні лагічных аператараў “І” , “АБО”, “НЕ”, а таксама правабаковых і левабаковых усячэнняў.

Ажыццяўляюцца машынны пошук і змястоўны адбор дакументаў. Для правядзення фармальнага адбору па вызначаных у плане-праспекце (тэхнічным заданні) крытэрыях ужываецца камбінаваны пошук шляхам увядзення абмежаванняў у тэматычны пошук па відах неабходных дакументаў, храналагічных рамках і інш. Вынікам гэтага этапу з'яўляецца адабраны ЭВМ масіў дакументаў – банк бібліяграфічных даных (пры традыцыйнай тэхналогіі – картатэка выяўленых дакументаў).

У выпадку, калі выкарыстоўваюцца і традыцыйныя крыніцы пошуку, бібліяграфічныя запісы выяўленых дакументаў бібліёграф павінен прадставіць у машыначытальным фармаце ў адпаведнасці з выкарыстоўваемым праграмным забеспячэннем і фарматам бібліяграфічных запісаў. Бібліяграфічныя запісы на гэтыя дакументы бібліёграф уводзіць з дапамогай клавіятуры шляхам запаўнення палёў экраннай формы выбранага для вядзення БД фармату бібліяграфічнага запісу як дапаўненне да сфарміраванага файла дакументаў, адабраных у аўтаматызаваным рэжыме. Зноў уводзімыя запісы аўтаматычна кумуліруюцца. Зліянне масіваў запісаў, уведзеных уручную і з БД, адбываецца згодна праграмы работы ЭВМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль машыначытальнага бібліяграфічнага запісу прадугледжвае праверку адпаведнасці элемента запісу назве поля і правільнасці ўведзенай інфармацыі.

Аналітычны этап. Атрыманыя вынікі машыннага пошуку аналізуюцца і дапрацоўваюцца. Бібліёграф ажыццяўляе прагляд бібліяграфічных запісаў дакументаў на экране дысплея: прымае рашэнне аб рэлевантнасці адабраных машынай дакументаў (зместавы і фармальны адбор); ажыццяўляе карэкціроўку бібліяграфічнага запісу шляхам увядзення неабходных дадатковых звестак – анатацый ці рэфератаў, вынікаў індэксіравання дакумента ў выглядзе класіфікацыйных індэксаў, кодаў класіфікатараў і рубрыкатараў, прадметных рубрык, ключавых слоў, дыскрыптараў, індэкса раздзела схемы групоўкі складаемага дапаможніка ў адпаведнае поле машыначытальнага фармату, рубрык для фарміравання дапаможных паказальнікаў; дадатковай інфармацыі, такой, як сіглы арганізацый, – месцаў захоўвання першасных дакументаў, шыфры захоўвання дакументаў, ідэнтыфікацыйныя нумары электронных копій дакументаў, звесткі аб дабавачных бібліяграфічных запісах, даце завяршэння апрацоўкі дакумента, а таксама звесткі службовага характару. Пры фарміраванні гіпертэкставых БД выкарыстоўваюцца гіпертэкставыя (кантэкстныя) спасылкі.

Калі дакумент не падыходзіць для ўключэння ў паказальнік, то ён не індэксіруецца бібліёграфам і аўтаматычна выключаецца з памяці машыны. З мэтай павелічэння дакладнасці ці паўнаты выдаваемай ЭВМ інфармацыі бібліёграф можа ажыццяўляць карэкціроўку пошукавага прадпісання.

З адабраных бібліяграфічных запісаў фарміруецца файл будучага бібліяграфічнага паказальніка. ЭВМ дубліруе яго. Дубліраванне неабходна для спасылачных запісаў аб дакументах, змест якіх павінен адлюстроўвацца ў некалькіх раздзелах асноўнага тэксту. Трэба адзначыць, што агульны бібліяграфічны аналіз першасных дакументаў, іх анатаванне, рэферыраванне, індэксіраванне, якасны адбор патрабуюць звароту бібліёграфа і прагляду кожнага дакумента de visu.

У аўтаматызаваным рэжыме ажыццяўляюцца групоўка бібліяграфічных запісаў па закладзенай у праграму схеме, нумарацыя бібліяграфічных запісаў, фарміраванне дапаможных паказальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заключны этап. Далейшая праца са сфарміраваным файлам ажыццяўляецца з дапамогай адной з праграм тэкставых рэдактараў. Адбываецца ўвод назваў раздзелаў і падраздзелаў, дапаможных паказальнікаў, друкуюцца прадмова, уступны артыкул, змест, неабходныя дадаткі, афармляецца тытульны ліст.

ЭВМ фарміруе макет выдання. Яго рэдагуюць. Пасля праўкі ЭВМ аўтаматычна набірае макет бібліяграфічнага дапаможніка, фотанабор тыражыруецца і пераплятаецца.

Калі дапаможнік будзе існаваць у электроннай форме, то на заключным этапе фарміравання БД ажыццяўляюцца апісанне і рэгістрацыя БД.

Апісанне БД уяўляе сабой сукупнасць характарыстык зместу і формы прадстаўленых у ёй даных, дастатковых для ўліку яе ў складзе нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама для прыняцця рашэння аб яе рэлевантнасці і даступнасці карыстальнікам. Сярод элементаў апісання БД выдзяляюцца абавязковыя і факультатыўныя. Састаў абавязковых элементаў вызначаецца прызначэннем БД (фарміраванне эксплуатацыйнай дакументацыі, дзяржаўная рэгістрацыя, сертыфікацыя) і формай пастаўкі БД. Склад абавязковых і факультатыўных элементаў прыводзіцца ў ГОСТ 7.70 – 96 “Описание баз данных и машиночитаемых информационных массивов» (дадаткі Б, В, Г).

У Беларусі рэгістрацыю БД, улік электронных рэсурсаў, забеспячэнне зацікаўленых спажыўцоў звесткамі аб наяўнасці і месцазнаходжанні неабходнай ім інфармацыі ажыццяўляе Інстытут прыкладных праграмных сістэм НАН РБ.

Рэгістрацыя БД уключае два этапы: выяўленне характарыстык прадстаўлення БД у органы рэгістрацыі і запаўненне рэгістрацыйнай формы БД.

Выяўленне характарыстык прадстаўлення БД у органы рэгістрацыі зводзіцца да вызначэння набору характарыстык прадстаўлення БД у дзяржаўным рэгістры інфармацыйных рэсурсаў і ўключае наступныя звесткі:

– уладальнік БД;

– назва арганізацыі, ведамства, адрас, тэлефон, факс, адрас электроннай пошты, прозвішча адміністратара БД і інш.;

– агульныя звесткі аб БД: назва БД; прызначэнне БД (даследчая, вучэбная, адрасная, камерцыйная і інш.); змест і асаблівасці БД (прыводзяцца апісанне размешчанай інфар-

мацыі, тып БД); віды ўключаных дакументаў, крыніц; аб'ём, мова запісаў; год стварэння; рэтраспектыва; перыяд аднаўлення БД і інш.;

– карыстальніцкія характарыстыкі: тып ЭВМ, аперацыйная сістэма (АС), СКБД / ППП, назва сеткі пры наяўнасці аддаленага доступу, сеткавы адрас, фармат дастаўкі, аказваемыя паслугі; колькасць карыстальнікаў; абмежаванні па доступу да інфармацыі і інш.

Запаўненне рэгістрацыйнай формы БД зводзіцца да запаўнення карты-заяўкі на рэгістрацыю.

Такім чынам, пры падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі выключаюцца найбольш працаёмкія працэсы адбору дакументаў, бібліяграфічнага апісання, групоўкі, стварэння дапаможных паказальнікаў, карэкціроўкі тэксту. Затраты на падрыхтоўку бібліяграфічнага паказальніка скарачаюцца, павялічваецца аператыўнасць выпуску друкаванай прадукцыі, паляпшаецца камфортнасць выданняў.

### *Пытанні і заданні*

1. Ахарактарызуйце асноўныя метадычныя падыходы, якія павінны знайсці адлюстраванне ў плане-праспекце пры складанні навукова-дапаможных і папулярных бібліяграфічных дапаможнікаў.

2. Пакажыце на прыкладах, ад чаго і якім чынам залежаць выбар спосабу групоўкі матэрыялу ў дапаможніку, выбар фарміруемых дапаможных паказальнікаў.

3. Чым адрозніваецца прадмова ад уступнага артыкула да бібліяграфічнага дапаможніка?

4. Як будуць уплываць на метадычныя рашэнні тып, жанр складаемага дапаможніка? Пакажыце на прыкладах.

5. Якія крыніцы будуць выступаць у якасці асноўных, а якія ў якасці дадатковых крыніц выяўлення дакументаў пры складанні бягучых і рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў, пры складанні навукова-дапаможных і папулярных дапаможнікаў?

6. Якімі пошукавымі сродкамі забяспечваюцца ствараемыя бібліяграфічныя базы даных?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел IV. АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

## Глава 7. Спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі і асноўныя метады вывучэння іх інфармацыйных патрэбнасцей

### *7.1. Паняцце і сутнасць інфармацыйных патрэбнасцей*

Асноўнымі ўласцівасцямі, якія характарызуюць абанента любой інфармацыйнай сістэмы, з'яўляюцца яго інфармацыйныя патрэбнасці (ІП). Задавальненне пастаянна ўзрастаючых і змяняемых ІП разглядаецца як галоўная мэта стварэння і функцыянавання любой інфармацыйнай, у тым ліку і бібліяграфічнай і сістэмы.

Інфармацыйныя патрэбнасці чалавека – гэта ўсвядомленая ім неабходнасць атрымання некаторай інфармацыі, патрэбнай для вырашэння пэўнай задачы, дасягнення пастаўленай мэты. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што практычна кожны сучасны чалавек займаецца не толькі прафесійнай, але і іншымі відамі дзейнасці – вучыцца, удзельнічае ў грамадскай рабоце, мае нейкае хобі і г.д. Любая прафесійная і непрафесійная дзейнасць абумоўлівае ці выклікае свае ІП. Таму ў аднаго чалавека можа быць шмат розных па характары і змесце інфармацыйных патрэбнасцей.

Вялікая роля ў фарміраванні тэорыі інфармацыйных патрэбнасцей адводзіцца Д.Е.Шэхурыну. Значны ўклад у яе распрацоўку ўнес С.Д.Кагаткоў. Згодна іх тэорыі ІП носяць аб'ектыўна-суб'ектыўны характар. Яны ўзнікаюць у вучоных, спецыялістаў у працэсе іх прафесійнай дзейнасці і існуюць незалежна ад усведамлення спажыўца, гэта значыць ІП характарызуюцца сацыяльнай канкрэтнасцю, якая вынікае з прыналежнасці спажыўца да пэўнага звяна адміністрацыйна-эканамічнай сістэмы; змест і характар дзейнасці абумоўліваюць аб'ектыўны характар ІП.

У той жа час неабходнасць атрымання інфармацыі парознаму асэнсоўваецца, усведамляецца спажыўцамі ў сувязі з іх рознай прафесійнай падрыхтоўкай, розным запасам ведаў, інфармацыйным патэнцыялам і ўзніклай у сувязі з гэтым інфармацыйнай сітуацыяй. Таму інфармацыйныя патрэбнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожнага канкрэтнага чалавека – суб’екта – адрозніваюцца ад інфармацыйных патрэбнасцей другога чалавека, занятага такой жа дзейнасцю. У гэтым праяўляецца суб’ектыўны характар інфармацыйных патрэбнасцей.

У сваю чаргу ІП з’яўляюцца стымулам для дзейнасці чалавека, якая накіравана на пошук патрэбнай інфармацыі, і яе можна назваць інфармацыйна-пошукавай дзейнасцю. Яна адбываецца больш паспяхова ў тым выпадку, калі спажывец мае добрую інфармацыйную падрыхтоўку, ведае крыніцы пошуку і інш. Знойдзеная інфармацыя, яе выкарыстанне садзейнічаюць выкананню базавай прафесійнай ці непрафесійнай дзейнасці. Развіццё і ўскладненне базавай прафесійнай дзейнасці, у тым ліку і ў выніку выкарыстання інфармацыі, вядзе да ўзнікнення новых патрэбнасцей у інфармацыі, і цыкл паўтараецца, але ўжо на якасна новым узроўні.

У залежнасці ад суб’ектаў – носьбітаў інфармацыйных патрэбнасцей – выдзяляюцца грамадскія, калектыўныя, індывідуальныя ІП. Грамадскія патрэбнасці найбольш шырокія па змесце. Яны ўзнікаюць у працэсе грамадскай дзейнасці людзей. У пэўным сэнсе калектыўныя і індывідуальныя патрэбнасці з’яўляюцца па сутнасці грамадскімі, таму што выступаюць прадуктам дзейнасці грамадства. Іншая справа, што ў якасці суб’екта ІП могуць выступаць грамадства ўвогуле, розныя сацыяльныя групы, калектывы, асобныя грамадзяне.

Бібліяграфічная дзейнасць задавальняе ўсе віды ІП. Пры падрыхтоўцы разнастайных бібліяграфічных дапаможнікаў улічваюцца галоўным чынам грамадскія і калектыўныя (групавыя) патрэбнасці. Пры абслугоўванні карыстальнікаў непасрэдна ў бібліятэках у працэсе бібліяграфічнага інфармавання ўлічваюцца ў большасці калектыўныя і індывідуальныя патрэбнасці. Пры даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні задавальняюцца індывідуальныя патрэбнасці, звязаныя з выкананнем разавых запытаў канкрэтнага карыстальніка.

Такім чынам, тэарэтычна быў абгрунтаваны вывад аб аб’ектыўна-суб’ектыўным характары інфармацыйных патрэбнасцей, раскрыты дзейнасны падыход да іх фарміравання і задавальнення, распрацавана класіфікацыя ІП. Гэта мае вялікае значэнне як для вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей, так і для іх задавальнення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўсім інфармацыйным цыкле (узнікненне інфармацыйных патрэбнасцей – інфармацыйна-пошукавая дзейнасць – спажыванне інфармацыі – прафесійная (непрафесійная) дзейнасць) толькі два моманты паддаюцца непасрэднаму вывучэнню, таму што праяўляюцца ў выглядзе пэўных вынікаў. Гэта прафесійная і інфармацыйна-пошукавая дзейнасць. Усе астатнія моманты гэтага працэсу з'яўляюцца ўнутранымі (псіхічнымі) і паддаюцца толькі ўскоснаму вывучэнню.

У самой прафесійнай дзейнасці яшчэ няма патрэбнасцей у інфармацыі, але яе аналіз дазваляе атрымаць даныя аб мэтах, задачах, змесце гэтай дзейнасці, што ў канчатковым выніку фарміруе інфармацыйныя патрэбнасці суб'екта. Аб'ектамі аналізу пры гэтым могуць быць сам працэс дзейнасці і яго кампаненты (мэта –прадмет – сродкі – вынік); нарматыўная, планавая, справаздачная дакументацыя.

Пры вывучэнні інфармацыйна-пошукавай дзейнасці могуць даследавацца: паводзіны спажыўцоў інфармацыі; іх меркаванні аб змесце і формах бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання; вынікі інфармацыйна-пошукавай дзейнасці – паступіўшыя ад іх запыты ў бібліятэку, выкарыстаныя першасныя і другасныя дакументы, цытуемыя, напрыклад, у справаздачах; рэакцыя на пасылаемыя бібліятэкай абвяшчэнні аб новай літаратуры.

У розных спалучэннях названыя вынікі інфармацыйна-пошукавай дзейнасці часцей аналізуюцца пры вывучэнні інфармацыйных патрэбнасцей, тым больш, што некаторыя з іх назапашваюцца ў працэсе абслугоўвання і не патрабуюць дадатковых працоўных затрат для збору зыходнай інфармацыі.

З аб'ектаў аналізу вытворчай дзейнасці часцей аналізу падлягае планава-справаздачная і нарматыўная дакументацыя, у меншай ступені – меркаванні суб'ектаў аб змесце іх прафесійнай дзейнасці.

Калі цалкам характарызаваць інфармацыйныя патрэбнасці, то іх неабходна вызначаць па наступных найбольш значных прыметах: змест інфармацыйных патрэбнасцей або тэматыка неабходнай інфармацыі; характар неабходнай інфармацыі (віды выданняў, тыпы дакументаў, мова публікацый, хinduлагічныя межы і інш.); профільнасць інфармацыйных патрэбнасцей – профільныя (пры супадзенні тэматыкі інфарма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйных патрэбнасцей з базавай адукацыяй карыстальнікаў або профілем іх вытворчай, прафесійнай дзейнасці), патрэбнасці ў інфармацыі па сумежных галінах ведаў, патрэбнасці ў галінах ведаў, далёкіх ад праблематыкі дзейнасці і базавай адукацыі карыстальнікаў; стабільнасць інфармацыйных патрэбнасцей (стабільныя, доўгатэрміновага дзеяння, разавыя); пераважныя для карыстальніка інфармацыі формы прадастаўлення інфармацыі.

Такім чынам, колькасць прымет, па якіх можна ахарактарызаваць інфармацыйныя патрэбнасці, няшмат. Аднак іх выяўленне патрабуе правядзення спецыяльных даследаванняў і выкарыстання разнастайных метадаў.

### *7.2. Метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей*

Сярод метадаў вывучэння ІП, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў бібліятэках, вызначаюцца сацыялагічныя метады апытання: анкетаванне і інтэрв'юіраванне. Дакладнасць збіраемых з дапамогай гэтых метадаў звестак у многім вызначаецца ўмелай фармулёўкай пытанняў, веданнем прынцыпаў канструявання анкеты, правіл, якіх трэба прытрымлівацца пры сацыялагічных даследаваннях. У цэлым анкеты звычайна ўключаюць чатыры групы пытанняў: аб спажыўцу (яго прафесійнай прыналежнасці, спецыяльнасці, адукацыі, займаемай пасадзе і г.д.); аб тэматыцы патрэбнасцей; аб характары неабходнай інфармацыі; аб узроўні задавальнення ІП з дапамогай розных крыніц інфармацыі, формаў іх прадастаўлення.

Агульнай вартасцю метадаў апытання з'яўляюцца адсутнасць арганізацыйных складанасцей пры іх выкарыстанні, папярэдняя распрацоўка даследчай дакументацыі, што дазваляе запраграмаваць атрыманне неабходных даных у адпаведнасці з задачамі даследавання. Недахопам указаных метадаў з'яўляецца тое, што яны базіруюцца на суб'ектыўных думках спажыўцоў аб змесце сваіх інфармацыйных патрэбнасцей (натуральнае жаданне спажыўцоў выглядаць лепей у вачах даследчыка); дзейнічае таксама псіхалагічны стэрэатып: не патрабаваць ад бібліятэкі больш, чым ён ужо прывык атрымліваць.

Пэўнае месца сярод выкарыстоўваемых метадаў займае назіранне. Гэты метад патрабуе дакладнага вызначэння аб'ек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

та назірання, выяўлення сутнасці назіраемых з'яў і фіксавання вынікаў. Метад назірання ўжываецца пры вывучэнні пытанняў, звязаных з выкарыстаннем даведачна-бібліяграфічнага фонду, каталогаў і картатэк бібліятэкі, экспануемых на выставах дакументаў, выкарыстаннем дакументаў у ходзе правядзення комплексных формаў бібліяграфічнага інфармавання, з валоданнем спажыўцом метадамі пошуку інфармацыі па электронных рэсурсах і інш. Гэта працаёмкі метад, і ён мае абмежаваную сферу дзеяння: адначасова назіранне можа ажыццяўляцца пры вывучэнні патрэбнасцей невялікага кола спажыўцоў і на працягу невялікага адрэзку часу.

Шырока выкарыстоўваюцца пры вывучэнні інфармацыйных патрэбнасцей метады аналізу дакументацыі. У якасці аб'ектаў вывучэння можа выступаць бібліятэчная дакументацыя: дзённікі аддзелаў бібліятэкі, чытацкія фармуляры, журналы ўліку даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, талоны зваротнай сувязі ў сістэме выбіральнага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ), прыартыкульныя і прыкніжныя спісы да работ спажыўцоў і інш. Бібліятэчная дакументацыя паступова збіраецца ў бібліятэцы, і яе выкарыстанне не ўяўляе складанасцей. Аднак трэба памятаць, што атрыманая ў працэсе вывучэння бібліятэчнай дакументацыі інфармацыя дае звесткі аб змесце інфармацыйных патрэбнасцей у мінулым і не дазваляе прагназаваць іх асаблівасці ў будучым. Як адзначалася, ІП з'яўляюцца катэгорыяй дынамічнай.

З канца 60 – пачатку 70-х гг. ХХ ст. пачынаюць актыўна распрацоўвацца спосабы вывучэння і прагназавання ІП, дзе асноўная роля адводзіцца аналізу прафесійнай дзейнасці спецыялістаў. Першапачаткова гэтыя метады экспертных ацэнак, сінтэзіравання сітуацый, аналізу вытворчых функцый і рашаемых спажыўцом задач выкарыстоўваліся спецыялістамі органаў НТІ на падставе вывучэння вытворча-тэхнічнай, планавай, справаздачнай дакументацыі ў дачыненні да інфармацыйнага забеспячэння НДР і ВКР, але ў далейшым яны ўкараняюцца і ў практыку работы бібліятэк. Так, аналіз палажэння аб аддзеле дазваляе вызначыць тэматычную накіраванасць работ, якая вынікае па сутнасці са сферы і прадмета дзейнасці; кірункі праводзімых работ; структуру падраздзялення; задачы і функцыі аддзела, месца яго ў структуры ўсёй арганізацыі. Аналіз планаў работы дае магчымасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначыць тэматыку работ, змест работы па этапах, тэрміны правядзення работ, размеркаванне абавязкаў сярод членаў калектыву. Такім чынам, аналіз дакументацыі дазваляе выявіць аб'ектыўны змест ІП, прагназаваць іх развіццё, фармалізаваць сам працэс вызначэння ІП.

Выбар метадаў выяўлення ІП у значнай меры абумоўлены спецыфікай аб'екта даследавання, мэтамі даследавання, магчымасцямі. Пры выбары аптымальных спосабаў вывучэння ІП трэба ўлічваць асноўныя патрабаванні, якія тычацца даследавання (рэпрэзентатыўнасці, аб'ектыўнасці, дакладнасці атрымліваемых даных, працаёмкасці), а таксама зыходзіць са спецыфікі даследчых метадаў і мэт канкрэтнага даследавання. Так, найбольшая аб'ектыўнасць даных забяспечваецца метадамі аналізу інфармацыйных запытаў, вытворча-тэхнічнай і планавай дакументацыі, сінтэзавання сітуацыі. Патрабаванню шырыні ахопу спажыўцоў у большай ступені задавальняюць метады анкетавання, аналізу чытацкіх фармуляраў, інфармацыйных запытаў спажыўцоў. Пры неабходнасці аператыўна атрымаць ці ўдакладніць даныя аб ІП мэтазгодна прымяняць метады апытання. Яны ж разам з аналізам інфармацыйных запытаў з'яўляюцца найменш працаёмкімі.

Такім чынам, кожны з разгледжаных метадаў мае свае перавагі і недахопы, таму для атрымання больш дакладных даных аб ІП іх неабходна выкарыстоўваць у комплексе. Атрыманыя вынікі вывучэння ІП трэба пастаянна ўдакладняць, ажыццяўляючы маніторынг ІП спажыўцоў, што з'яўляецца адной з галоўных функцый аддзелаў маркетынгу ў бібліятэках.

### *7.3. Асноўныя групы спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі ў бібліятэках розных тыпаў і асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей*

Бібліяграфічнае абслугоўванне прадугледжвае веданне асноўных груп спажыўцоў, якія карыстаюцца паслугамі бібліятэк, і асаблівасцей іх ІП. Карыстальнікаў любой бібліятэкі можна ўмоўна падзяліць на рэальных і патэнцыяльных спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі. Рэальныя спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі – гэта тыя, хто запісаны і пастаянна звяртаюцца ў бібліятэку. Патэнцыяльныя – гэта тыя, хто яшчэ не запісаны ў бібліятэку, але могуць стаць яе чытачамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму пры арганізацыі бібліяграфічнага абслугоўвання неабходна ўлічваць не толькі рэальных спажыўцоў, але і патэнцыяльных, весці працу з імі, уплываць на фарміраванне іх інфармацыйных патрэбнасцей.

Склад спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі з'яўляецца асаблівым для кожнай бібліятэкі і вызначаецца яе тыпам, асноўнымі задачамі, магчымасцямі, месцам у агульнай сістэме інфармацыйнага забеспячэння рэгіёна. Праведзеныя ў Рэспубліцы Беларусь даследаванні даюць магчымасць уявіць склад карыстальнікаў бібліятэк розных тыпаў. Так, па выніках праведзенага НББ сумесна з іншымі рэспубліканскімі навуковымі бібліятэкамі даследавання "Чытач навуковай бібліятэкі г.Мінска і шляхі ўдасканалення яго абслугоўвання" можна адзначыць, што для НББ характэрны традыцыйныя групы спажыўцоў навуковай бібліятэкі: навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, спецыялісты розных галін народнай гаспадаркі, студэнты. 50 % зваротаў у бібліятэку звязаны з навуковымі мэтамі, 20 % – з пытаннямі павышэння кваліфікацыі, 17 % – з педагагічнай дзейнасцю, 10 % – з вытворчай дзейнасцю, 20 % – з асабістымі захапленнямі. У ЦНБ 80% спажыўцоў арыентаваны на навуковыя мэты звароту ў бібліятэку. У БелСГБ, РНТБ, Навуковай педагагічнай бібліятэцы ад 40 да 46% карыстальнікаў маюць мэты наведвання, звязаныя з вытворчай дзейнасцю. Склад карыстальнікаў навуковых спецыяльных бібліятэк па адукацыі сведчыць аб пераважнай большасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй – ад 67% у РНТБ да 92% у ЦНБ. Важнай асаблівасцю работы гэтых бібліятэк з'яўляецца таксама стабільнасць асноўных груп карыстальнікаў.

Іншая сітуацыя назіраецца ў абласных універсальных навуковых бібліятэках. Пераважная большасць спажыўцоў гэтых бібліятэк – студэнты ВНУ (ад 30 % – у Віцебскай АУНБ да 38 % – у Брэсцкай), у сярэднім 25 % – навучэнцы, ад 14 да 30 % – спецыялісты розных галін ведаў і розных сфер дзейнасці, ад 6 да 9 % – рабочыя, пенсіянеры. Асноўныя мэты наведвання гэтых бібліятэк – вучоба (58 %); індывідуальныя захапленні (33 %); дзелавыя мэты, звязаныя з навуковай, вытворчай дзейнасцю, павышэннем кваліфікацыі, складаюць каля 30 %. Па складу чытачоў і мэтавым наведванні АУНБ усё больш набліжаюцца да масавых бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ЦБС пераважная большасць карыстальнікаў – вучні (да 35%); студэнты (ад 7 да 15%); служачыя, спецыялісты (каля 18%); рабочыя; пенсіянеры.

Склад спажыўцоў навукова-тэхнічных бібліятэк, бібліятэк ВНУ вызначаецца тымі катэгорыямі, якія працуюць на пэўным прадпрыемстве, заводзе, ва ўстанове.

Аналіз вынікаў шматлікіх даследаванняў, праведзеных па вывучэнні ІП розных груп спажыўцоў, дае магчымасць вызначыць пэўныя залежнасці паміж зместам ІП і асноўнымі фактарамі, якія ўплываюць на іх фарміраванне. Так, напрыклад, характар дзейнасці спажыўцоў інфармацыі (навукова-даследчая, вытворчая, педагагічная, кіраўніцкая) вызначае мэтавую накіраванасць ІП і запытаў, уплывае на відавую структуру неабходных выданняў. На тэматыку ІП значны ўплыў аказвае спецыяльнасць, згодна з якой выдзяляюцца тры групы спецыялістаў: спецыялісты гуманітарнага і грамадскага профіляў; прыродазнаўчых навук; комплексу прыкладной галіны ведаў. Спецыяльнасць аказвае ўплыў таксама на паўнату неабходнай інфармацыі. ІП спецыялістаў грамадскіх навук маюць комплексны характар, ім у большай ступені патрэбныя даныя іншых навук, іх цікавіць літаратура за вялікі храналагічны адрэзак часу, іх ІП больш стабільныя. У той жа час спецыялісты прыкладных навук аддаюць перавагу новым выданням, іх ІП больш дынамічны, зменлівы.

Асаблівасці ІП спецыялістаў у залежнасці ад пасады характарызуюцца наступным: пашырэннем тэматычных меж ІП у кіраўнікоў, неабходнасцю атрымання абагульненай, сінтэзаванай другаснай інфармацыі, аператыўнасцю і своечасовасцю атрымання неабходнай інфармацыі.

ІП неабходна вывучаць пастаянна, сачыць за іх зменамі, своечасова ўлічваць гэтыя змены ў бібліяграфічным абслугоўванні.

### *Пытанні і заданні*

1. Раскрыйце механізм фарміравання інфармацыйных, бібліяграфічных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі і магчымасці іх вывучэння.

2. Па якіх прыметах можна ахарактарызаваць патрэбнасці ў бібліяграфічнай інфармацыі карыстальнікаў?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Правядзіце параўнальны аналіз розных метадаў вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей.

4. Выкарыстоўваючы метад мадэлявання, ахарактарызуйце інфармацыйныя патрэбнасці настаўнікаў, бібліятэкараў, студэнтаў.

5. Як бы вы арганізавалі ў бібліятэцы работу па вывучэнні інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў сваёй бібліятэкі?

## Глава 8. Бібліяграфічнае абслугоўванне: агульныя пытанні

Кардынальныя змены, якія адбываюцца ва ўсіх сферах грамадства, патрабуюць перагляду і ўдасканалення кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, у тым ліку і бібліяграфічнага абслугоўвання. Згодна з ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения” бібліяграфічнае абслугоўванне вызначаецца як працэс забеспячэння спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыяй. У адрозненне ад працэсу бібліяграфавання бібліяграфічнае абслугоўванне арыентавана на давядзенне да спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі. Для яго сёння характэрныя такія новыя арганізацыйныя і зместавыя падыходы, як накіраванасць на задавальненне рэальных патрэбнасцей і запытаў спажыўцоў; дэмакратызацыя абслугоўвання; прыярытэтнае развіццё інфармацыйнай функцыі бібліятэкі ў параўнанні з функцыяй фондаўтварэння, заснаванае на неабходнасці забеспячэння бібліятэкай максімальна шырокага доступу спажыўцам да знешніх інфармацыйных рэсурсаў; рознабаковае інфармацыйнае ўзаемадзеянне бібліятэк на аснове выкарыстання новых тэхналагічных магчымасцей, звязаных з укараненнем інфармацыйных тэхналогій. Усё гэта выклікае неабходнасць весці пошук формаў абслугоўвання, пашыраць асартымент бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг, клапаціцца аб павышэнні іх якасці.

Адрозніваюць два віды бібліяграфічнага абслугоўвання: бібліяграфічнае інфармаванне і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне. У адпаведнасці з ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения» бібліяграфічнае інфармаванне вызна-

чаецца як сістэматычнае забеспячэнне бібліяграфічнай інфармацыяй абанента ў адпаведнасці з яго доўгатэрміновым запытам. У параўнанні з папярэднім стандартам на тэрміналогію ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці з азначэння бібліяграфічнага інфармавання зняты такі момант, як распаўсюджванне інфармацыі без запыту, што наўрад ці правільна. У практыцы бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў шырока выкарыстоўваецца так званае ініцыятыўнае інфармаванне, якое ажыццяўляецца бібліяграфічнай службай без запытаў з боку канкрэтных груп, асоб па найбольш актуальных, сацыяльна значных тэмах. У якасці мэты ставіцца раскрыццё наяўных інфармацыйных рэсурсаў, актыўнае давядзенне інфармацыі аб іх да спажыўцоў, рэклама найбольш каштоўных выданняў, новых паступленняў, калекцый і інш.

Паводле крытэрыю ахопу карыстальнікаў адрозніваюць дыферэнцыраванае і недыферэнцыраванае (масавае) бібліяграфічнае інфармаванне. Дыферэнцыраванае інфармаванне, у сваю чаргу, падзяляецца на індывідуальнае – інфармаванне індывіда ў адпаведнасці з яго патрэбнасцямі – і групавое (калектыўнае) – інфармаванне груп карыстальнікаў, аб'яднаных па прымеце падобнасці інфармацыйных патрэбнасцей.

У адрозненне ад бібліяграфічнага інфармавання, якое прадугледжвае рэгулярнасць давядзення бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах, даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ўяўляе дзейнасць па задавальненні разавых запытаў карыстальнікаў.

### *8.1. Масавыя формы бібліяграфічнага інфармавання*

Мэта масавага бібліяграфічнага інфармавання – садзейнічанне інфармаванню шырокага кола асоб і калектываў, зацікаўленых у сістэматычным атрыманні звестак аб выдадзенай літаратуры. Спецыфіка гэтага віду абслугоўвання заключаецца ў тым, што яно не арыентавана на пэўную групу спажыўцоў, не ўлічвае іх пэўныя інфармацыйныя патрэбнасці, гэта абслугоўванне без запыту. Масавае бібліяграфічнае інфармаванне з'яўляецца адным са сродкаў прапаганды літаратуры, якая паступіла ў фонд бібліятэкі, раскрыцця фондаў бібліятэкі, прадастаўлення інфармацыі па сацыяльна значных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У бібліятэках выкарыстоўваюцца розныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання: бюлетэні новых паступленняў, выставы і агляды новых паступленняў, дні інфармацыі, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, інфармаванне па радыё і тэлебачанні.

Распаўсюджанай формай масавага бібліяграфічнага інфармавання з'яўляецца выпуск *інфармацыйных бюлетэняў,* у якіх адлюстроўваюцца новыя паступленні ў фонд бібліятэкі. У РБ такія бюлетэні выпускаюць рэспубліканскія бібліятэкі, абласныя універсальныя бібліятэкі ("Паказальнік новых даведачных, бібліяграфічных і метадычных выданняў, паступіўшых у Мінскую АУНБ"). Цэнтральныя бібліятэкі ЦБС выпускаюць бюлетэні новых паступленняў, якія з'яўляюцца адным са сродкаў арганізацыі бібліяграфічнага доступу да сукупнага фонду сістэмы.

ЦБ ЦБС рыхтуюць інфармацыйныя бюлетэні, дыферэнцыраваныя па аб'ектах бібліяграфавання. Большасцю ЦБ рыхтуюцца бюлетэні новых паступленняў кніг і брашур, усё часцей у іх уключаецца і інфармацыя аб нотных выданнях, аўдыёвізуальных матэрыялах (дыяфільмах, слайдах), гуказапісах, нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі. Асобнымі выданнямі выходзяць бюлетэні, якія адлюстроўваюць перыядычныя выданні, паступіўшыя ў фонд сістэмы. Асновай для падрыхтоўкі бюлетэня выступае картатэка новых паступленняў, якая вядзецца аддзелам камплектавання і апрацоўкі літаратуры. Удзел у яго падрыхтоўцы прымае таксама і бібліяграфічны аддзел ці сектар інфармацыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі. Матэрыял у дапаможніку размяшчаецца ў сістэматычным парадку згодна з той схемай класіфікацыі, якая прынята ў каталогах бібліятэкі. Бібліяграфічны запіс складаецца з бібліяграфічнага апісання, на неінфарматыўныя загалоўкі дадаецца даведачная анатацыя, пасля бібліяграфічнага апісання ўказваюцца сігламі падраздзяленні ЦБ ці бібліятэкі-філіялы, якія атрымалі гэтае выданне. На палях з левага боку ад бібліяграфічнага запісу ўказваецца шыфр захоўвання кнігі ў бібліятэцы. У канцы года да ўсіх выпускаў бюлетэня рэкамендуецца складаць дапаможны даведачна-метадычны апарат у выглядзе алфавітнага спіса аўтараў і назваў кніг, адлюстраваных ва ўсіх выпусках. Бюлетэнь забяспечваецца кароткай прадмовай, у якой тлума-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чацца мэта выдання, прынцыпы пабудовы, правілы афармлення заказаў на кнігі з адзінага фонду ЦБС, раскрываюцца ўмоўныя скарачэнні. Адно з важнейшых патрабаванняў да бюлетэняў – аператыўнасць іх выдання і звядзенне да мінімуму інфармацыйнага інтэрвалу. Аптымальны варыянт – штомесячнае выданне бюлетэня з інфармацыйным інтэрвалам, які не перавышае паўтара месяца.

Функцыянальнае прызначэнне бюлетэняў новых паступленняў не абмяжоўваецца раскрыццём толькі фонду бібліятэкі; яны актыўна выкарыстоўваюцца чытачамі пры выбары кніг, бібліятэкарамі пры правядзенні індывідуальных і групавых формаў бібліяграфічнага інфармавання, выкананні разавых запытаў чытачоў.

Спецыяльныя навуковыя і універсальныя навуковыя бібліятэкі складаюць бюлетэні новых паступленняў шматгаліновага, галіновага і тэматычнага характару, якія трэба разглядаць як сродкі групавога бібліяграфічнага інфармавання, арыентаваныя на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей пэўных груп карыстальнікаў.

Бюлетэні новых паступленняў выступаюць сёння і як інфармацыйны прадукт, які рыхтуецца ў аўтаматызаваным рэжыме, як фрагмент электроннага каталога (ці галіновай базы даных спецыяльных навуковых бібліятэк), які адлюстроўвае новыя паступленні за пэўны загадзя вызначаны перыяд. Асобныя бібліятэкі (ЦНБ, бібліятэкі ВНУ) выстаўляюць бюлетэні новых паступленняў на сайтах сваіх бібліятэк. Нумары бюлетэняў за папярэднія гады можна прагледзець на сайтах бібліятэк у раздзеле “Архіў”.

*Выставы і бібліяграфічныя агляды*. Выстава літаратуры – гэта рэгулярная, аператыўная форма нагляднай інфармацыі і прапаганды матэрыялаў, якія паступілі ў фонд бібліятэкі за пэўны перыяд. Па характары экспануемай літаратуры выставы бываюць універсальныя, галіновыя, тэматычныя; асобных відаў выданняў; па месцы экспазіцыі – стацыянарныя, выязныя і перасоўныя.

Выставы – прагляды новай літаратуры універсальнага характару – праводзяцца ў бібліятэцы строга перыядычна і ў пэўныя дні працягласцю ад 7 да 10 дзён, прычым усе экспанаты на працягу гэтага часу не выдаюцца з бібліятэкі ў іншыя аддзелы. На такіх выставах экспанаты змяняюцца па меры

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

паступлення новай літаратуры, аднак не радзей аднаго раза ў месяц у загадзя ўстаноўленыя дні. У загалоўку выставы ўказваецца дата змены экспазіцыі. На выставах новых паступленняў экспануюцца не толькі кнігі, але і іншыя віды выданняў. Матэрыял групуецца па галінах ведаў, літаратура па найбольш актуальных пытаннях, краязнаўстве можа выдзяляцца ў спецыяльныя тэматычныя раздзелы. Бібліяграфічныя і інфармацыйныя выданні размяшчаюць у адпаведнасці з іх зместам разам з першаснымі дакументамі. Пры арганізацыі выставы неабходна прадумаць і пытанні, звязаныя са стварэннем умоў для камфортнай працы чытача з літаратурай (спецыяльна аформленае для выставы памяшканне, дастатковая колькасць месцаў, добрае асвятленне, афармленне выставы з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей яе ўспрымання – наяўнасць загалоўкаў, ілюстрацый, каляровае афармленне, прасторава-кампазіцыйнае рашэнне экспазіцыі і інш.). Для ўліку заказаных выданняў у кожны экспануемы дакумент укладваецца картка, на якой чытач, які жадае ўзяць кнігу, запісвае сваё прозвішча і нумар свайго чытацкага фармуляра.

Тэматычныя выставы-прагляды могуць адносіцца да формаў масавага бібліяграфічнага інфармавання у тым выпадку, калі арганізуюцца па актуальных сацыяльна значных тэмах, якія ўяўляюць цікавасць для самых розных катэгорый чытачоў; могуць адносіцца і да групавых формаў бібліяграфічнага інфармавання, калі арганізуюцца з мэтай задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей пэўных груп чытачоў.

Пры неабходнасці паўтарэння выставы ці выкарыстання яе матэрыялаў у іншых бібліятэках рэкамендуецца складаць картатэку экспазіцыі, некаторыя тэматычныя выставы могуць перадавацца ў іншыя бібліятэкі (“кальцавыя выставы”).

*Бібліяграфічныя агляды.* Адрозніваюць тры віды вусных бібліяграфічных аглядаў: новых паступленняў, тэматычныя, бібліяграфічных выданняў. Усе тры віды аглядаў праводзяцца і для шырокай аўдыторыі, і для вузкага кола слухачоў, аб’яднаных агульнымі вытворчымі, навуковамі і іншымі інтарэсамі.

Агляды новых паступленняў літаратуры праводзяцца з мэтай рэгулярнага і аператыўнага азнаямлення з новымі паступіўшымі ў бібліятэку выданнямі. Практыка работы бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэк паказала неэфектыўнасць правядзення аглядаў новай літаратуры ў чытальнай зале. Усё часцей яны праводзяцца ў комплексе з іншымі формамі бібліяграфічнага інфармавання: сумесна з выставамі, на днях інфармацыі. Як правіла, у агляд уключаюцца лепшыя, з пункту гледжання актуальнасці, навізны і значнасці, выданні. Матэрыял у аглядзе падаецца ў лагічнай паслядоўнасці і ўзаемасувязі з улікам важнасці і значнасці кожнай крыніцы, з захаваннем прынцыпу пераходу ад агульнага да асобнага. У агляд рэкамендуецца ўключаць бібліяграфічныя выданні па тэме, у якасці ілюстрацыйнага матэрыялу выкарыстоўваць не толькі рэкамендуемыя крыніцы, але і фактаграфічную інфармацыю, аўдыёвізуальныя матэрыялы. Для правядзення аглядаў па вузкаспецыяльных тэмах рэкамендуецца запрашаць спецыялістаў адпаведнага профілю.

Улік выставачнай работы вядзецца па наступных паказчыках: па кожнай асобна ўзятай выставе ўлічваецца колькасць экспануемых матэрыялаў, выдадзеных дакументаў па выніках выставы, наведванняў. Пры уліку бібліяграфічных аглядаў улічваюцца тэма, колькасць наведвальнікаў.

Формай масавага бібліяграфічнага інфармавання з’яўляецца таксама *дзень інфармацыі*. Дзень інфармацыі – гэта комплекснае мерапрыемства, якое прадугледжвае інфармацыю аб новай літаратуры, якая паступіла ў бібліятэку за пэўны перыяд, звычайна за месяц. Асноўныя працэсы падрыхтоўкі і правядзення дня інфармацыі – адбор і сістэматызацыя дакументаў; падрыхтоўка і разгортванне экспазіцыі (у вітрынах, на стэндах, сталах і інш.); рэклама дня інфармацыі і запрашэнне спажыўцоў інфармацыі; правядзенне дня інфармацыі: прагляд і адбор матэрыялаў выставы наведвальнікамі, вусныя бібліяграфічныя агляды, кансультацыі, гутаркі і іншыя бібліятэчна-бібліяграфічныя мерапрыемствы; рэгістрацыя ўдзельнікаў дня інфармацыі; афармленне заявак на атрыманне літаратуры; аналіз эфектыўнасці правядзення дня інфармацыі.

Аб дні інфармацыі бібліятэка абвяшчае чытачоў, арганізацыі і ўстановы, якія знаходзяцца ў зоне абслугоўвання з дапамогай стэнда-плаката, праз мясцовы друк, а таксама шляхам рассылкі спецыяльных пісьмаў-апавяшчэнняў, індывідуальных запрашэнняў. Асабліва важна такая рэклама ў пачатковы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд арганізацыі дзён інфармацыі, затым яны павінны па магчымасці праводзіцца ў пэўныя дні тыдня. Працяг іх – 2–3 дні.

Аснову дня інфармацыі складае выстава-прагляд новых пастудленняў, методыка правядзення якой разглядалася вышэй. Акрамя выставы, у гэтае комлекснае мерапрыемства ўключаюцца агляды найбольш значных дакументаў, агляды літаратуры па раздзелах ці па асобных тэмах з улікам складу спажыўцоў інфармацыі; агляды новых бібліяграфічных дапаможнікаў і іншых інфармацыйных выданняў; кансультацыі аб тым, як сачыць за новай літаратурай, аб інфармацыйных прадуктах і паслугах бібліятэкі і інш. У асобных бібліятэках агляды запісваюцца на магнітную стужку, і пры жаданні спажыўцы могуць іх праслухаць. У падрыхтоўцы і правядзенні дня інфармацыі ўдзельнічаюць розныя падраздзяленні бібліятэкі.

Дзень інфармацыі – комплекснае мерапрыемства, аб’ектам уліку павінен быць дзень інфармацыі ў цэлым, а не асобныя складаючыя яго часткі. Уліку належаць: колькасць прадстаўленай і выдадзенай літаратуры, колькасць наведвальнікаў, колькасць новых запісаных у ходзе правядзення мерапрыемства чытачоў.

### *8.2. Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне*

Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне – гэта сістэматычнае забеспячэнне бібліяграфічнай інфармацыяй спажыўцоў у адпаведнасці з іх доўгатэрміновымі індывідуальнымі ці групавымі інфармацыйнымі запытамі. Абанентамі дыферэнцыраванага бібліяграфічнага інфармавання можа выступаць асобны спецыяліст ці група спецыялістаў, патрэбнасці якіх характарызуюцца агульнасцю тэматыкі. Адпаведна адрозніваюць індывідуальнае і групавое бібліяграфічнае інфармаванне, індывідуальных і калектыўных абанентаў. Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне – эфектыўны, але працаёмкі від абслугоўвання, таму сёння не кожная бібліятэка можа дазволіць сабе выкарыстоўваць яго дастаткова шырока, многімі бібліятэкамі формы дыферэнцыраванага бібліяграфічнага абслугоўвання прапануюцца ў якасці платных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі формамі *індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання* з'яўляюцца: індывідуальнае інфармаванне, выбіральнае распаўсюджанне інфармацыі (ВРІ), індывідуальнае інфармаванне з элементамі ВРІ, дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва (ДАК), ці тэматычнае абслугоўванне кіраўніцтва.

Тэхналогія ажыццяўлення ўказаных формаў дыферэнцыраванага абслугоўвання аднолькавая. Першы працэс – гэта вызначэнне кола абанентаў, якія будуць абслугоўвацца ў разглядаемым рэжыме. Іх выбар вызначаецца тыпам бібліятэкі, яе задачамі ў агульнай сістэме інфармацыйнага забеспячэння рэгіёна, галіны, ведамаснай прыналежнасці і рэсурснымі магчымасцямі. Кожная бібліятэка сёння ў працэсе правядзення маркетынгавых даследаванняў праводзіць сегментаванне рынку спажыўцоў інфармацыі і вызначае прыярытэтныя групы карыстальнікаў для сваёй бібліятэкі, у тым ліку і карыстальнікаў, якім у першую чаргу неабходна сістэматычная інфармацыя аб новай літаратуры ў дапамогу іх прафесійнай дзейнасці.

Другі працэс – вызначэнне зместу інфармацыйных патрэбнасцей абанентаў. У гэтых мэтах могуць выкарыстоўвацца разнастайныя метады вывучэння ІП, якія ўжо былі ахарактарызаваны. Але незалежна ад таго, якія метады будуць выкарыстоўвацца, важным з'яўляецца атрыманне наступнай інфармацыі: тэматыка ІП; віды выданняў, якія ўяўляюць цікавасць; на якіх мовах; ступень паўнаты неабходнай інфармацыі (абмежавана новымі паступленнямі ў фонд бібліятэкі ці не); ступень згортвання прадстаўляемай бібліятэкай інфармацыі; пастаянна праглядаемыя самастойна спажыўцом крыніцы інфармацыі; пераважныя для спажыўца формы прадстаўлення інфармацыі. Важным з'яўляецца таксама атрыманне звестак аб спажыўцу інфармацыі: прозвішча, месца працы, пасада, кантактны тэлефон.

Усе атрыманыя звесткі заносяцца ў дзве спецыяльныя картатэкі: алфавітную індывідуальных і групавых абанентаў і алфавітна-прадметную картатэку тэм. На верхнім баку карткі ў картатэцы абанентаў указваюцца наступныя звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку, месца працы, пасада, кантактны тэлефон або адрас для абвяшчэнняў, назвы тэм (або тэмы). На адваротным баку карткі вядзецца ўлік адасланых аб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вяшчэнняў з указаннем даты адпраўкі, колькасці дакументаў, якія ўключаны ў абвяшчэнні, вынікаў апрацоўкі талонаў зваротнай сувязі. На картках групавых абанентаў абавязкова адлюстроўваюцца наступныя звесткі: поўная назва прадпрыемства (арганізацыі), прозвішча кіраўніка (ці асобы, адказнай за арганізацыю інфармацыйнага абслугоўвання), кантактны тэлефон, адрас, асноўны профіль дзейнасці прадпрыемства і пералік тэм інфармавання. Адваротны бок карткі прызначаны для ўліку адпраўленых абвяшчэнняў і запытаў на першасныя дакументы. У картатэцы тэм на кожнай картцы ўказваюцца назва тэмы і прозвішчы абанентаў ці назвы прадпрыемстваў, якіх яна цікавіць.

Наступны працэс звязаны з вызначэннем кола праглядаемых крыніц, па якіх будуць выяўляцца дакументы для інфармавання абанентаў. У залежнасці ад патрабуемай абанентам паўнаты гэта могуць быць толькі новыя паступленні ў фонд бібліятэкі (картатэка новых паступленняў ці самі выданні, перыядычныя выданні і інш.) ці дадаткова і іншыя другасныя крыніцы інфармацыі, якія могуць забяспечыць паўнату інфармавання па тэме. Бібліёграф праглядвае вызначаныя крыніцы і ажыццяўляе адбор дакументаў у адпаведнасці са зместам запытаў. Дзеля забеспячэння рэлевантнасці падбіраемай бібліяграфічнай інфармацыі бібліёграф павінен дастаткова добра арыентавацца ў адпаведных праблемах, ведаць тэрміналогію і інш.

Адабраны матэрыял аналізуецца, апрацоўваецца і афармляецца ў выглядзе абвяшчэння. Форма абвяшчэння можа быць рознай: пісьмовыя абвяшчэнні на спецыяльных бланках, на картках, у выглядзе тэматычных бібліяграфічных спісаў, падборак і інш. На спецыяльных бланках, акрамя бібліяграфічнага абвяшчэння аб дакуменце, якое павінна ўключаць абавязкова бібліяграфічнае апісанне дакумента (уключацца таксама могуць анатацыя або рэферат, класіфікацыйныя індэксы ці прадметныя рубрыкі), можа быць размешчаны і талон зваротнай сувязі, з дапамогай якога абанент павінен ацаніць атрыманую інфармацыю па наступнай шкале: 5 – каштоўная, будзе выкарыстана ў рабоце; 4 – уяўляе цікавасць; 3 – вядомая з іншых крыніц; 2 – не ўяўляе цікавасці; 1 – не адпавядае тэме; 0 – патрэбна копія ці сам дакумент.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абвяшчэнні адсылаюцца абаненту. Абанент знаёміцца з імі. Запаўняе карту зваротнай сувязі, адсылае яе ў бібліятэку.

Бібліёграф аналізуе карту зваротнай сувязі. Калі ёсць запыт на першакрыніцу ці копію дакумента, то адсылае яе абаненту. У неабходных выпадках па выніках аналізу зваротнай сувязі ажыццяўляе карэкціроўку функцыянавання сістэмы: праводзіць удакладненне тэматыкі запыту, дадаткова высвятляе, якія крыніцы праглядвае абанент самастойна, удакладняе крыніцы выяўлення дакументаў і інш.

Адрозненне формаў індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання заключаецца ў наступным: індывідуальнае інфармаванне ажыццяўляецца па новых паступленнях у фонд бібліятэкі. Выбіральнае распаўсюджванне інфармацыі абавязкова прадугледжвае адпаведнасць наступным патрабаванням: максімальная паўната даводзімай да абанентаў бібліяграфічнай інфармацыі; кароткае раскрыццё зместу дакумента з дапамогай анатацыі, рэферата ці набору прадметных рубрык; аператыўнасць і рэгулярнасць давядзення інфармацыі; наяўнасць пастаяннай зваротнай сувязі з абанентам; забеспячэнне абанента першаснымі дакументамі ці іх копіямі пры паступленні на іх запыту. Індывідуальнае інфармаванне з элементамі ВРІ прадугледжвае інфармаванне па новых паступленнях у фонд бібліятэкі, але з наяўнасцю зваротнай сувязі ці прадастаўленнем копій першасных дакументаў. Такая форма, як дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва, адрозніваецца ад іншых наступнымі асаблівасцямі: у якасці абанентаў выступаюць кіраўнікі, якім патрэбна інфармацыя, што змяшчала б аналіз звестак з дакументаў з высновамі і рэкамендацыямі, была дастаткова абагульненай, своечасовай, дакладнай, кароткай у выкладанні і мела прагнастычны і супастаўляльны характар. Згодна з гэтымі патрабаваннямі інфармацыя павінна прадастаўляцца кіраўнікам у выглядзе агляду, аналітычнай даведкі. Хаця ў залежнасці ад магчымасцей бібліятэкі інфармацыйныя абвяшчэнні могуць дасылацца абанентам у выглядзе бібліяграфічных запісаў з пашыранымі анатацыямі, рэфератамі. Адразу па запатрабаванні кіраўніцтва павінны прадастаўляцца і самі першасныя дакументы або іх копіі.

*Групавое інфармаванне.* Значнае месца ў рабоце бібліятэк па бібліяграфічным інфармаванні займаюць формы групавога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнага інфармавання, такія як тэматычныя выставы і агляды, тэматычныя спісы новых паступленняў, дні спецыяліста, кальцавая пошта. У якасці абанентаў групавога інфармавання выступаюць калектывы, падставай для выдзялення якіх з'яўляюцца такія прыметы, як сумесная работа калектыву і агульнасць вырашаемых задач (выдзяляюцца аддзелы, кафедры і іншыя вытворчыя ці навуковыя калектывы); агульнасць прафесіі (настаўнікі беларускай мовы і інш.); агульнасць адукацыйнага і прафесійнага ўзросту (маладыя спецыялісты той ці іншай сферы і інш.).

Тэхналогія ажыццяўлення групавога бібліяграфічнага інфармавання з дапамогай тэматычных спісаў літаратуры нічым не адрозніваецца ад тэхналогіі індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання. Рыхтавацца тэматычныя спісы літаратуры могуць таксама як на падставе прагляду новых паступленняў у бібліятэку, так і прагляду другасных крыніц.

Да групавых формаў бібліяграфічнага інфармавання адносіцца і такая форма, як дзень спецыяліста (ДС). Ён праводзіцца для пэўнай катэгорыі спецыялістаў з улікам асаблівасцей іх інфармацыйных патрэбнасцей і можа быць прысвечаны як больш ці менш вузкай тэматыцы, якая цікавіць дадзеную групу спецыялістаў, так і пэўнай галіне ведаў. Накіраванасць дадзенага мерапрыемства мае комплексны характар і звязана з азнаямленнем спецыялістаў з дасягненнямі па тэме ў навуцы, практыцы; з адлюстраваннем дадзеных праблем у літаратуры; з прапагандай інфармацыйных прадуктаў і паслуг бібліятэкі і пашырэннем інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

У адпаведнасці з мэтавай накіраванасцю складаецца і праграма дня спецыяліста, якая звычайна ўключае мерапрыемствы бібліятэчнага і небібліятэчнага характару. Так, у праграму абавязкова ўключаюцца такія формы небібліятэчнага характару, як выступленні вядучых спецыялістаў, вучоных з лекцыямі, дакладамі па тэме ДС, шырокае абмеркаванне прафесійных праблем, знаёмства са спецыяльна падабранымі экспанатамі, экскурсіі на прадпрыемствы, прагляд кінафільмаў па тэме ДС. Асноўная роля ў правядзенні гэтых формаў адводзіцца спецыялістам адпаведнай галіны ведаў ці сферы дзейнасці. Акрамя таго, як правіла, спецыялісты праводзяць тэматычныя агляды літаратуры, даюць ацэнку матэрыялу з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пункту гледжання магчымасці яго выкарыстання на практыцы, знаёмяць калег з сучасным станам адлюстравання дадзенай тэмы ў літаратуры.

Сярод бібліятэчных формаў аснову ДС складае выстава-прагляд літаратуры па тэме. Калі ДС праводзіцца для дадзенай катэгорыі спецыялістаў ці па дадзенай тэме ўпершыню, то падбор літаратуры ажыццяўляецца рэтраспектыўна, як правіла, за тры – пяць апошніх гадоў, пры паўторным правядзенні бібліятэкі абмяжоўваюцца экспанаваннем новых паступленняў. На выставе павінны быць прадстаўлены ўсе віды выданняў, прычым не толькі тыя, што знаходзяцца ў бібліятэцы, але і заказаныя з іншых бібліятэк. Калі літаратуру не ўдалося атрымаць з іншых бібліятэк, складаецца дадатковы спіс літаратуры, які экспануецца разам з першаснымі дакументамі. Методыка афармлення тэматычнай выставы-прагляду аналагічная універсальнай. У праграму ДС уключаюцца таксама такія бібліятэчныя мерапрыемствы, як агляд літаратуры па тэме, агляд бібліяграфічных і інфармацыйных выданняў, кансультацыі бібліёграфаў аб тым, як сачыць за новай літаратурай па тэме, рэкламна-інфармацыйныя абвяшчэнні аб інфармацыйных прадуктах і паслугах бібліятэкі і інш.

На ДС арганізуецца як дзяжурства спецыялістаў-кансультантаў, так і бібліёграфаў-кансультантаў. У абавязкі бібліёграфа-кансультанта ўваходзяць правядзенне кансультацый, праверка расстаноўкі дакументаў на выставе, раздача наведвальнікам анкет, кантрольных лісткоў наведвальнікаў і інш.

Сярод арганізацыйных пытанняў падрыхтоўкі ДС трэба адзначыць, што ДС праводзіцца на падставе загадзя распрацаванага плана, які ўключае тры раздзелы: арганізацыйны (вызначаюцца тэматыка, форма правядзення, месца, дата, працягласць ДС, мерапрыемствы па рэкламна-інфармацыйным забеспячэнні ДС, неабходныя тэхніка-вытворчыя, натурныя, наглядныя матэрыялы); зместавы (указваюцца канкрэтныя бібліятэчныя і небібліятэчныя мерапрыемствы, адказныя за іх падрыхтоўку і правядзенне); вывучэнне эфектыўнасці (вызначаюцца асноўныя віды эфектыўнасці, якія будуць вывучацца, плануецца падрыхтоўка інструментарыя для правядзення гэтай работы).

Пры падрыхтоўцы ДС вялікая работа ў арганізацыйным плане праводзіцца з кіраўніцтвам прадпрыемства, арганіза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі, для спецыялістаў якіх ён праводзіцца. Разам з кіраўніцтвам удакладняюцца і ўзгадняюцца тэма ДС, план правядзення, вызначаюцца тэма даклада, лекцыі, адказныя спецыялісты.

Вялікая ўвага надаецца рэкламна-інфармацыйнаму забеспячэнню ДС. У гэтых мэтах выкарыстоўваюцца індывідуальныя запрашэнні, аб'явы, плакаты, якія вывешваюцца ў бібліятэках, на прадпрыемствах, ва ўстановах, выкарыстоўваюцца рэкламныя буклеты, абвяшчэнні праз сродкі масавай інфармацыі.

Адной з эфектыўных формаў групавога бібліяграфічнага інфармавання, якая дазваляе даводзіць патрэбныя матэрыялы да рабочага месца спецыялістаў, з'яўляецца кальцавая пошта. Гэтая форма выкарыстоўваецца бібліятэкамі прадпрыемстваў, арганізацый, дзе спецыялісты працуюць у непасрэднай блізкасці, ведаюць адзін аднаго і маюць падобныя па змесце патрэбнасці. Для іх бібліятэка падбірае з новых паступленняў першасныя (малааб'ёмныя дакументы – афіцыйныя матэрыялы, інструкцыі, рэкамендацыі, палажэнні) і другасныя дакументы (агляды, зборнікі рэфератаў, спісы літаратуры), якія камплектуюцца ў спецыяльныя папкі. Гэтая папка матэрыялаў перадаецца з суправаджальным лістом па пэўным маршруце. У суправаджальным лісце ўказваецца спіс спецыялістаў, якія павінны пазнаёміцца з матэрыяламі, перадаючы іх потым адзін другому ў паслядоўнасці прозвішчаў, што ўказаны ў лісце. Апошні з іх павінен вярнуць папку ў бібліятэку. Для знаёмства з матэрыяламі кожнаму спецыялісту адводзіцца два–тры дні. Калі матэрыял уяўляе цікавасць для абанента, ён можа заказаць копію, запрасіць дадатковую інфармацыю, папрасіць зрабіць пераклад. Аднаму з супрацоўнікаў бібліятэкі даручаецца сачыць за праходжаннем папкі па кальцавой пошце. У бібліятэцы можа выкарыстоўвацца і наступная тэхналагічная схема праходжання матэрыялу: бібліятэка–абанент – бібліятэка–абанент.

### *8.3. Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне з выкарыстаннем аўтаматызаваных тэхналогій*

Прынцыпова тэхналогія ажыццяўлення такіх формаў дыферэнцыраванага абслугоўвання, як ВРІ ў аўтаматызаваным рэжыме, мала чым адрозніваецца ад традыцыйнай. Распраца-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваныя і выкарыстоўваемыя ў бібліятэках сістэмы ВРІ звычайна з'яўляюцца падсістэмамі інтэгральнай аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы, хаця для бібліяграфічных аддзелаў распрацоўваюцца і спецыяльныя праграмы аўтаматызаванага ВРІ, якія вырашаюць задачу абслугоўвання ў рэжыме ВРІ як індывідуальных, так і калектыўных абанентаў. Першыя аперацыі па вызначэнні кола абанентаў і вывучэнні іх ІП праводзіць бібліёграф. Атрыманыя даныя заносяцца ў спецыяльны файл, які па змесце адлюстроўвае інфармацыю з дзвюх картатэк – тэм і абанентаў.

Асаблівая ўвага надаецца пераводу доўгатэрміновых запытаў спажыўцоў на інфармацыйна-пошукавую мову (ІПМ) дадзенай сістэмы. Часцей за ўсё ў бібліятэках выкарыстоўваюцца некалькі ІПМ для фармулёўкі запытаў: дэскрыптары, індэксы распаўсюджаных і выкарыстоўваемых класіфікацыйных схем. Утвараецца масіў пошукавых вобразаў запытаў.

Існуючыя ў бібліятэках базы даных як уласнай генерацыі, так і набытыя можна разглядаць як масіў пошукавых вобразаў дакументаў. Згодна з вызначанай перыядычнасцю інфармавання бібліёграф ажыццяўляе камбінаваны пошук неабходных дакументаў па БД новых паступленняў. У працэсе машыннага пошуку адбываецца параўнанне пошукавых вобразаў запытаў і пошукавых вобразаў дакументаў. Вынікам пошуку з'яўляецца адабраны масіў дакументаў, які можна праглядзець у поўным фармаце бібліяграфічнага запісу і фармаце бібліяграфічнай карткі. Бібліёграф ажыццяўляе канчатковы адбор дакументаў, фарміраванне іх у спецыяльны файл і раздрукоўку на спецыяльным бланку ў выглядзе традыцыйнага бібліяграфічнага спіса літаратуры або перапісвае яго на дыскету ці перадае па электроннай пошце на камп'ютэр абанента.

Для бібліёграфа праграма аўтаматызаванага ВРІ забяспечвае магчымасць уводу і захоўвання запытаў абанентаў; прагляд вынікаў пошуку па розных неабходных параметрах; дапаўненне бібліяграфічных запісаў машыннага пошуку анатацыямі, рэфератамі і іншай інфармацыяй; фарміраванне масіваў даных зваротнай сувязі і заказаў на першакрыніцы; атрыманне ў любы момант статыстычнай інфармацыі аб функцыянаванні сістэмы ВРІ. Для абанента дадзеная прагра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ма забяспечвае магчымасць атрымаць інфармацыю ў зручнай форме; перапісаць інфармацыю ў асабістую БД; кумуляраваць прадстаўленую інфармацыю; ацаніць кожны прагледжаны дакумент па прынятай сістэме ацэнак зваротнай сувязі.

Сёння ў якасці абанентаў групавога бібліяграфічнага інфармавання можа выступаць і бібліятэка нізавога звяна, выражаючы інфармацыйныя патрэбнасці абанентаў сваёй сістэмы ВРІ і выступаючы пасрэднікам паміж абслугоўваемымі ёю спецыялістамі і аўтаматызаванай сістэмай ВРІ галіновага комплексу. Прычым атрымліваць неабходную інфармацыю бібліятэка можа як на электронных носьбітах у выглядзе тэматычных БД, так і з выкарыстаннем тэлекамунікацыйнага доступу.

### *Пытанні і заданні*

1. Параўнайце азначэнні, якія прыводзяцца ў ГОСТ 7.0 – 84 “Библиографическая деятельность. Основные термины и определения” і ў ГОСТ 7.0 – 99 “Информационно-библиотечная деятельность. Библиография. Термины и определения», у адносінах да бібліяграфічнага абслугоўвання, абгрунтуйце іх асаблівасці.
2. Чым адрозніваюцца асноўныя формы індывідуальнага інфармавання паміж сабой?
3. Абгрунтуйце, чаму такая форма, як выбіральнае распаўсюджванне інфармацыі, лічыцца больш эфектыўнай у параўнанні з іншымі формамі дыферэнцыраванага інфармавання?
4. Чым адрозніваюцца такія комплексныя формы, як дзень інфармацыі і дзень спецыяліста?
5. У чым вы бачыце перспектывы развіцця бібліяграфічнага інфармавання ў бібліятэках?

## Глва 9. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: агульныя пытанні

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з’яўляецца адным з відаў бібліяграфічнага абслугоўвання, абавязковым і значным кірункам дзейнасці бібліятэк усіх тыпаў. Тэарэтычная трактоўка даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання за-

снавана на разуменні патрэбнасці ў ім. Немагчымасць атрымаць патрэбную інфармацыю у сувязі з існаваннем розных бар'ераў (фізічных, эканамічных, псіхалагічных і інш.), змест якіх разглядаецца ў курсе "Бібліяграфазнаўства. Тэорыя", прыводзіць да неабходнасці звароту за дапамогай да пасрэднікаў (бібліёграфаў, інфармацыйных брокераў) паміж спажыўцамі і зафіксаванай у розных крыніцах інфармацыяй. Спажыўцы становяцца карыстальнікамі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, якія з разавымі запытамі звяртаюцца ў бібліятэку, бібліяграфічную службу ці іншую інфармацыйную ўстанову. Значэнне даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання не зменшыцца, таму што вышэйзначаныя бар'еры ў рознай форме і ступені існавалі і будуць існаваць. На думку вучоных, нягледзячы на інтэрнет, спажывец можа самастойна атрымаць толькі 5% неабходнай яму інфармацыі, таму што яму невядома сістэма каардынат для кожнага параметра – характарыстыкі дакумента.

ГОСТ 7.0 – 99 "Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения» дае наступнае азначэнне гэтага віду бібліяграфічнага абслугоўвання: "Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне – гэта абслугоўванне ў адпаведнасці з запытамі спажыўцоў інфармацыі, звязанае з прадастаўленнем даведак і іншых бібліяграфічных паслуг". Гэтае азначэнне не можа задаволіць спецыялістаў, таму што не раскрывае розніцы паміж відамі бібліяграфічнага абслугоўвання. Яно патрабуе ўдакладненняў. Больш адэкватным з'яўляецца разуменне такога віду абслугоўвання, як абслугоўванне ў адпаведнасці з разавымі запытамі спажыўцоў інфармацыі.

У працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання вылучаюцца тры асноўныя элементы: разавы запыт – пошук інфармацыі – адказ.

*Разавы запыт* можа насіць бібліяграфічны і фактаграфічны характар. Бібліяграфічны запыт уяўляе сабой патрабаванне на бібліяграфічную інфармацыю. Фактаграфічны запыт – гэта запыт на атрыманне канкрэтных звестак тэхнічнага, храналагічнага, статыстычнага характару.

*Адказ на запыт* можа быць выдадзены ў выглядзе даведкі, метадычнай кансультацыі і адмовы. Асноўнымі станоўчымі формамі адказу на запыт з'яўляюцца даведкі і метадычныя

кансультацыі, якія ў залежнасці ад характару змешчанай у іх інфармацыі могуць быць бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі.

Бібліяграфічныя даведкі бываюць трох тыпаў: тэматычныя, адрасна-бібліяграфічныя, удакладняльныя. Згодна з міждзяржаўным стандартам *тэматычная даведка* – гэта бібліяграфічная даведка, якая змяшчае пералік дакументаў па пэўнай тэме. Некалькі шырэй трактуе змест тэматычнай даведкі І.Р.Маргенштэрн. Ён лічыць, што тэматычная даведка ўяўляе сабой любое мноства бібліяграфічных запісаў (у тым ліку і адзін) па прадмету пошуку ці любое мноства дакументаў па якой-небудзь аб'яднальнай іх прымеце (агульнасці зместу, аўтарства, месца ці часу іх стварэння, серыі і інш.).

*Адрасна-бібліяграфічная даведка* – гэта бібліяграфічная даведка, якая змяшчае звесткі аб наяўнасці і (ці) месцазнаходжанні запытваемага дакумента ў пэўным фондзе бібліятэкі, органа НТІ, архіва і інш.

*Удакладняльная бібліяграфічная даведка* – гэта бібліяграфічная даведка, якая ўстанаўлівае і (ці) удакладняе элементы бібліяграфічнага апісання дакумента, што адсутнічаюць ці недакладныя ў запыце спажыўца інфармацыі.

*Фактаграфічная даведка* – гэта адказ на запыт, які змяшчае фактычныя звесткі па сутнасці пытання (факты, лічбы, даты і інш. ).

Выдзяляюцца таксама і падтыпы даведак адпаведна іх зместу: патэнтныя, нотаграфічныя, па ўстанаўленні месца публікацыі прававых актаў і інш.

Адказ на запыт можа быць дадзены таксама ў выглядзе *метадычнай кансультацыі*, якая змяшчае парады і ўказвае шляхі атрымання неабходнай інфармацыі. Па сутнасці метадычная кансультацыя ў шэрагу выпадкаў з'яўляецца "мяккай" ускоснай адмовай выконваць запыт і мае на мэце накіраваць актыўнасць спажыўца на самастойны пошук, развіць бібліяграфічную самастойнасць чытача, перавесці яго ў рэжым бібліяграфічнага самаабслугоўвання. Замена даведкі кансультацыяй адбываецца, калі спажывец здольны самастойна правесці просты пошук ці па роду сваёй дзейнасці (падрыхтоўка дысертацыі, дыпломнай работы) абавязаны самастойна шукаць інфармацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказ на разавы запыт можа быць не толькі станоўчым, але і адмоўным. У такім выпадку ён называецца адмовай. *Адмова* – гэта адказ на разавы запыт, які змяшчае матывіроўку немагчымасці выдаць спажыўцу інфармацыю, рэлевантную запыту. Адрозніваюць два віды адмовы. Адмова на этапе прыёму запыту – гэта адмова, згодна з якой бібліяграфічны пошук па запыту не вядзецца і запыт не прымаецца да выканання. Даецца ён у выпадках, калі запыт паступіў не па профілі бібліятэкі, даведачна-бібліяграфічны апарат не прыстасаваны да пошуку патрабуемай інфармацыі, пошук інфармацыі спажывец павінен весці самастойна, запыт звязаны з культурна-адпачынкавым правядзеннем часу, запыт не змяшчае дастатковых звестак для бібліяграфічнага пошуку. Адмова па даведцы – гэта адказ, які змяшчае звесткі аб тым, што патрабуемая спажыўцу інфармацыя не выяўлена па бібліяграфічных ці іншых крыніцах яе пошуку.

Пераадрасаванне – гэта адказ, які змяшчае адрас бібліятэкі ці органа інфармацыі з абвяшчэннем спажыўца аб перадачы яго запыту ў гэтую бібліятэку. У дадзеным выпадку бібліёграф запісвае тэлефон спажыўца і дамаўляецца аб тэрмінах яго паўторнага звароту. Запыты перанакіроўваюцца ў бібліятэкі, здольныя і згодныя іх паўнацэнна задаволіць, як правіла, бібліятэкі-філіялы накіроўваюць запыты ў цэнтральныя бібліятэкі ЦБС, цэнтральныя бібліятэкі – у галіновыя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці рэгіёнаў. Пры гэтым бібліятэка прымае запыт да выканання пры наяўнасці і дакладнасці ўсіх неабходных даных.

Па форме адказу выдзяляюцца адказы ў вуснай, пісьмовай і электроннай формах.

У залежнасці ад крыніцы паступлення запытаў адказы падзяляюцца на ўнутраныя (выконваюцца для спажыўцоў пры непасрэдным кантакце з імі) і знешнія (выконваюцца па запытах, якія паступілі па розных каналах сувязі, у тым ліку з філіялаў ЦБС і іншых бібліятэк, ад “віртуальных” карыстальнікаў па электроннай пошце).

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ажыццяўляецца ў двух рэжымах: аператыўным і падоўжаным. Аператыўнае абслугоўванне ажыццяўляецца адразу пасля паступлення запыту, звычайна пры непасрэдным кантакце са спажыўцом (або па тэлефоне). Падоўжанае абслугоўванне ажыццяў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляецца дыяхронна пры немагчымасці аператыўна знайсці рэлевантны адказ і згодзе спажыўца на чаканне адказу. Тэрміны выканання даведак вызначаюцца ў “Палажэнні аб даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні ў бібліятэцы” (у асобных бібліятэках тэрмін падоўжанага абслугоўвання вызначаецца да трох сутак ці па дамоўленасці).

Важным элементам даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання з’яўляецца *бібліяграфічны пошук*. Тэрмін “бібліяграфічны пошук” увайшоў ва ўжытак бібліяграфічнай навукі і практыкі параўнальна нядаўна, пад уплывам інфарматыкі. Раней бібліёграфы карысталіся тэрмінамі “бібліяграфічнае адшуканне” і “бібліяграфічнае выяўленне”. У выніку праведзенай у апошнія гады работы па ўпарадкаванні бібліяграфічнай тэрміналогіі былі ўдакладнены названыя паняцці. Згодна з ГОСТ 7.0 – 99 “бібліяграфічны пошук – гэта інфармацыйны пошук, які ажыццяўляецца на падставе бібліяграфічных даных”. Разавы бібліяграфічны запыт выклікае дзеянні суб’екта бібліяграфічных працэсаў – бібліёграфа, пасрэдніка паміж спажыўцом і крыніцамі шукаемай інфармацыі. Суб’ект вызначае прадмет пошуку, складае пошукавы вобраз запыту, а затым ажыццяўляе бібліяграфічны пошук неабходнай інфармацыі. Яго адрозненне заключаецца ў тым, што гэта разнавіднасць дакументнага, пошуку, і ў ходзе яго правядзення шукаюцца і даводзяцца да спажыўца не самі дакументы, а толькі звесткі аб іх. Фактаграфічны пошук прадугледжвае адшуканне саміх фактаў, а не звестак аб дакументах.

Эфектыўнасць бібліяграфічнага пошуку, як і ўвогуле даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, звязана з дасягненнем максімальна магчымай аператыўнасці задавальнення запыту ў спалучэнні з высокай якасцю выдаваемых спажыўцам даведак. Якасць даведак перш за ўсё вымяраецца рэлевантнасцю інфармацыі (адпаведнасць знойдзенай бібліяграфічнай інфармацыі запыту спажыўца) і пертынентнасцю (адпаведнасць выдадзенай бібліяграфічнай інфармацыі рэальным патрэбнасцям спажыўца).

Якасць і аператыўнасць даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання залежаць ад наступных фактараў: стану даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, узроўню ўзаемадзеяння бібліятэк у галіне даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, інфармацыйнай культуры спажыўцоў, кваліфікацыі і вопыту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліёграфа. На апошнім фактары неабходна засяродзіць асаблівую ўвагу. Поспех даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў значнай меры залежыць ад асобы бібліёграфа, яго агульнанавуковай падрыхтоўкі, прафесійнага майстэрства, ведання тэхналогіі ажыццяўлення розных працэсаў абслугоўвання, асаблівасцей інфармацыйных патрэбнасцей розных груп спажыўцоў і механізма фарміравання і выражэння іх запытаў. Доўгі час ажыццяўленне складаных бібліяграфічных адшуканняў лічылася ўдзелам нямногіх людзей, якія валодаюць шырынёй пазнання, унікальнай памяццю, веданнем бібліяграфічных рэсурсаў. Важнымі якасцямі бібліёграфа лічацца ўменне хутка пераключацца з адной тэмы на другую, інтуіцыя, эўрыстычныя здольнасці, педагагічны такт, альтруізм у пэўнай меры.

### *9.1. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання*

Існуюць два падыходы пры разглядзе тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Першы звязаны з вызначэннем дакладнай паслядоўнасці дзеянняў бібліёграфа ў працэсах даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пераходаў ад адной крыніцы да другой пры выкананні розных відаў і падвідаў даведак. Складаюцца так званыя “жорсткія алгарытмы” рашэнняў. Але нельга алгарытмамі ахапіць усе варыянты запытаў і адказаў, акрамя таго, яны прывучаюць бібліёграфаў да шаблоннага мыслення, таму сёння яны больш карысныя для навучання спажыўцоў элементарным правілам пошуку па каталогах, картатэках, у тым ліку існуючых і ў электроннай форме.

Больш прадуктыўным лічыцца другі падыход, які арыентуе бібліёграфа на добрае веданне тэхналогіі абслугоўвання, крыніц пошуку. Для засваення другога падыходу мы і разгледзім яго больш падрабязна.

У тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання вылучаюцца наступныя этапы выканання запытаў: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай (фактаграфічнай) інфармацыі; афармленне даведкі і рэгістрацыя яе ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту. Кожны з гэтых этапаў уключае шэраг працэсаў і аперацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы этап – *прыём запыту* – складаецца з наступных працэсаў: фармулёўка і ўдакладненне запыту; вызначэнне прадмета пошуку, мэты запыту, іншых пошукавых прымет у залежнасці ад віду запыту і ўжо вядомай спажыўцу інфармацыі; складанне пошукавага прадпісання. Гэты этап выключна важны. Маладыя бібліёграфы звычайна недаацэньваюць яго; яны баяцца паказаць спажыўцу сваю недасведчанасць, спадзяюцца на дапамогу калег, даведачных выданняў і, як вынік, павінны будуць дадаткова траціць час на паўторнае ўдакладненне прадмета пошуку. На гэтым этапе ў найбольшай ступені выяўляецца педагагічная сутнасць даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. У працэсе прыёму запыту паміж бібліёграфам і спажыўцом адбываецца размова; бібліёграф абавязкова павінен удакладніць тэму пошуку, змест інфармацыі, ступень неабходнай паўнаты, аператыўнасць атрымання адказу, ступень зробленага самастойнага пошуку, форму прадастаўлення неабходнай інфармацыі і інш. У залежнасці ад тыпу запыту вызначаюцца і іншыя звесткі, напрыклад, пры тэматычным бібліяграфічным запыце абавязкова вызначаюцца мэта запыту, храналагічныя, моўныя межы неабходных выданняў, што не патрэбна высвятляць пры прыёме адрасна-бібліяграфічнага запыту. На гэтым этапе бібліёграф вызначае таксама тып запыту. Магчыма фармалізацыя прыёму запыту з выкарыстаннем бланкаў (формаў) на запыт, якія забяспечваюць мінімальны якасны ўзровень прыёму запыту, тэхналагічна фармалізаванае фарміраванне пошукавага прадпісання ці пошукавага вобраза запыту (сукупнасць пошукавых прымет запыту) і яго наступнага задавальнення. На гэтым жа этапе ў неабходных выпадках бібліёграф ажыццяўляе знаёмства з тэмай, выкарыстоўваючы даведачныя, вучэбныя выданні, кансультацыі са спецыялістамі.

Другі этап – *устанаўленне кола крыніц*, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту, – уключае наступныя працэсы: падбор крыніц, іх аналіз, вызначэнне паслядоўнасці іх прагляду. Малады бібліёграф спяшаецца пасля прыёму запыту да вядомых крыніц, вопытны бібліёграф спачатку ажыццяўляе пошук у думках, уяўляе яго змест і структуру. Існуюць дзесяткі відаў крыніц інфармацыі. Для паспяховага правядзення гэтага этапу бібліёграф павінен навучыцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ядноўваць шматлікія крыніцы інфармацыі ў блокі, арыентуючыся на тыповыя пошукавыя прыметы. Прапануюцца пяць блокаў крыніц інфармацыі для выканання тыпавых бібліяграфічных даведак:

а) па змесце прадмета пошуку: поўнасцю супадаючыя з ім, больш шырокага зместу і больш вузкага (па адным ці некалькіх аспектах);

б) па якасным характары адбору дакументаў: выбіральныя ці поўныя;

в) па прадстаўленні дакументаў у храналогіі іх стварэння: новыя (бягучыя бібліяграфічныя дапаможнікі); усе ў комплексе (пастянна папаўняемыя каталогі і картатэкі, БД); рэтраспектыўныя;

г) па відах адлюстроўваемых дакументаў: друкаваныя, рукапісныя, аўдыёвізуальныя, электронныя і інш.;

д) па спосабе арганізацыі бібліяграфічнай інфармацыі ў крыніцы (па відах групоўкі бібліяграфічных запісаў, дапаможных паказальнікаў).

Крыніцы фактаграфічнага пошуку можна вызначыць па трох прыметах:

а) па прызначэнні: прамыя (даведачныя); ускосныя (рассеяныя, патрабуючыя выбарачнага прагляду разнародных тэкстаў);

б) па надзейнасці: найноўшыя аўтарытэтныя; устарэлыя;

в) па спосабе арганізацыі інфармацыі: арыентаваныя на аператыўны пошук (выданні з дэтальным зместам, дапаможнымі паказальнікамі, фармальнай групоўкай) ці патрабуючыя суцэльнага прагляду тэксту.

Важна мець на ўвазе і чытацкае прызначэнне крыніц: для дарослых і дзяцей, для спецыялістаў і неспецыялістаў.

Найбольшы поспех пошуку забяспечваюць непасрэднае веданне канкрэтных крыніц і тое, якое яны займаюць месца ў сістэме інфармацыйнага забеспячэння грамадства. Але пры вызначэнні крыніц бібліёграфу павінен быць вядомы закон шматкратнага адлюстравання бібліяграфічнай інфармацыі, які забяспечвае запасныя варыянты падбору крыніц. Ён асабліва важны, калі лепшая крыніца па якіх-небудзь умовах недаступная для выкарыстання. Гэта значыць, што ў распараджэнні бібліёграфа, як правіла, маюцца некалькі крыніц, у рознай ступені перакрываючыя зместам адна другую. Але



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нельга імкнуцца да абмежавання колькасці крыніц пераважна агульнымі універсальнымі (каталогамі і картатэкамі, бягучымі дзяржаўнымі бібліяграфічнымі крыніцамі). Менавіта гэтую тэндэнцыю вызначаюць даследчыкі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў рабоце бібліёграфаў універсальных бібліятэк пры выкананні тэматычных запытаў. Такую тэндэнцыю можна ацаніць як своеасаблівую "эканомію мыслення", выкліканага ў значнай меры псіхалагічным ціскам пошуку ў прысутнасці спажыўца. Але гэта не зусім прафесійны падыход пры наяўнасці ў ДБФ канкрэтных спецыяльных крыніц, у большай ступені адпаведных запыту.

У канчатковым выніку пры адборы крыніц неабходна кіравацца наступнымі крытэрыямі: адпаведнасць іх зместу прадмету пошуку; каштоўнасцю, паўнатой, надзейнасцю змяшчаемай інфармацыі; адпаведнасцю чытацкаму адрасу і мэтавай устаноўцы запыту; даступнасцю адлюстраванай інфармацыі; ступенню паўнаты бібліяграфічных запісаў; умовамі аператыўнага пошуку; індывідуальнымі асаблівасцямі.

Апошні працэс названага этапу – вызначэнне паслядоўнасці прагляду крыніц – па сутнасці гэта тэст на паспяховае вядзенне даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, крытэрый ацэнкі кваліфікацыі бібліёграфа. Пры выкананні тэматычнай даведкі правільна ўстаноўленая першая крыніца можа змяшчаць да 90% шукаемай інфармацыі, а для іншых відаў запытаў можа быць адзінай. Менавіта ад якасці ажыццяўлення гэтай аперацыі залежаць аператыўнасць і рацыянальнасць пошуку.

Трэці этап – *непасрэдны пошук* – уключае наступныя працэсы: прагляд крыніц; выяўленне інфармацыі; яе ацэнка і адбор. Ён заключаецца ў непасрэдным выяўленні і адборы рэлевантнай інфармацыі па прагледжаных крыніцах. Калі бібліёграф кепска ведае гэтую крыніцу, ён павінен з ёй пазнаёміцца – паглядзець уводзіны, уступны артыкул, групоўку, даведачна-метадычны апарат, пашпарт на каталог ці картатэку і інш. У асноўным жа гэты этап аднолькавы аналагічным працэсам і аперацыям пры падрыхтоўцы бібліяграфічнага дапаможніка.

Наступны этап у выкананні запыту складаецца *з афармлення даведкі і яе рэгістрацыі*. Для вуснай даведкі неабход-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным патрабаваннем пры яе выдачы спажыўцу з'яўляецца сцісласць, якая спалучаецца з дакладнасцю звестак. Як правіла, вусную даведку афармляе сам спажывец. Яму можна рэкамендаваць указваць адрас дакумента, яго шыфр захоўвання ў дадзенай бібліятэцы, а галоўнае – дакладна і дастаткова поўна запісваць бібліяграфічныя даныя.

Пісьмовая бібліяграфічная даведка павінна быць аформлена ў выглядзе бібліяграфічнага спіса (дапаможніка з простай структурай) ці паказальніка (дапаможніка са складанай структурай у адпаведнасці з агульнымі метадычнымі патрабаваннямі) на спецыяльным бланку бібліятэкі (ці аддзела) і змяшчаць наступныя параметры: зыходны нумар і дату выканання даведкі; спасылку на нумар і (ці) дату запыту; адрас спажыўца ці ўстановы, куды накіроўваецца даведка; тэкст бібліяграфічнай даведкі (калі яна змяшчае больш за 10–15 бібліяграфічных запісаў, то апошнія афармляюцца ў якасці дадатку да бланка); подпісы загадчыка аддзела і (ці) выканаўца. Бібліяграфічныя апісанні павінны адпавядаць ГОСТ і па магчымасці суправаджацца шыфрамі захоўвання дакументаў.

Усе даныя аб выкананых даведках заносяцца ў "Кнігу ўліку бібліяграфічных даведак" па прынятай у бібліятэцы форме. Звычайна прымяняюцца журналы ці сшыткі ўліку даведак, якія прасцей і кампактней. Форма рэгістрацыі даведак можа быць розная: агульны журнал, журнал для рэгістрацыі асобных відаў даведак, бланкі запытаў і выкананых даведак. Для спрашчэння рэгістрацыі даведак і эканоміі часу рэкамендуецца прымяняць уніфікаваную сістэму скарачэнняў назваў катэгорый спажыўцоў, мэт запытаў, крыніц. У бібліятэках асобна вядуцца картатэкі адмоў.

Выкананая пісьмовая даведка пасля рэгістрацыі выдаецца спажыўцу інфармацыі.

Калі пісьмовая даведка ўяўляе вартасць на значным адрэзку часу і можа быць выкарыстана паўторна, копія гэтай даведкі накіроўваецца ў фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (фонд выкананых даведак).

### *9.2. Асаблівасці выканання розных тыпаў даведак*

*Тэматычныя даведкі* змяшчаюць бібліяграфічную інфармацыю па пэўнай тэме і ўяўляюць сабой пералік дакументаў у выглядзе бібліяграфічнага дапаможніка. Тэматычныя біб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліяграфічныя даведкі класіфікуюцца па розных прыметах: змесце; мэтавым прызначэнні; форме давядзення інфармацыі; па ступені складанасці ці працаёмкасці выканання. У бібліятэках тэматычныя даведкі займаюць вядучае месца ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, складаючы ад 70 да 80% даведак, выконваемых бібліятэкай.

Асаблівасці выканання тэматычных даведак у тэхналагічным плане не адрозніваюцца ад агульнай тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання і звязаны са зместам выканання тых ці іншых працэсаў і аперацый.

Так, на этапе прыёму запыту бібліёграф павінен атрымаць ад спажыўца інфармацыі магчыма поўны набор звестак, які неабходны для выдачы яму пертынентнай інфармацыі: дакладную фармулёўку тэмы запыту; мэтавую накіраванасць выкарыстання атрыманай інфармацыі; патрабуемую паўнату атрымання інфармацыі па тэме; храналагічныя, моўныя, тэрытарыяльныя, відавыя межы адбору дакументаў.

На другім этапе работы над тэматычнай даведкай асаблівасці звязаны з вызначэннем кола крыніц выяўлення дакументаў. І тут бібліёграф павінен улічваць від тэматычнай даведкі, неабходную ступень паўнаты прадастаўлення інфармацыі. Але калі пералічваць магчымыя крыніцы выканання тэматычных запытаў, то да іх трэба аднесці фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў; "Паказальнік неапублікаваных бібліяграфічных спісаў і картатэк, складзеных бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь"; інфармацыю на сайтах бібліятэк аб выкананых даведках; каталогі і картатэкі бібліятэк, якія раскрываюць змест дакументаў; крыніцы бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі як універсальнага, так і галіновага, тэматычнага характару ў залежнасці ад зместу запыту і яго бібліяграфічнай забяспечанасці; рэфератыўныя і аглядныя выданні; прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры; непасрэдны прагляд першасных крыніц.

Трэці этап звязаны з выяўленнем і адборам бібліяграфічных запісаў. Рэкамендуецца, як і пры выкананні аналагічных працэсаў падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў, ажыццяўляць прагляд крыніц у зваротна храналагічным парадку, весці картатэкі выяўленых дакументаў і прагледжаных крыніц, а адбор дакументаў рабіць у адпавед-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці са зместавымі, якаснымі і фармальнымі крытэрыямі, якія былі вызначаны пры прыёме запыту. Пры цяжкасцях, звязаных з дакладнасцю і неабходнасцю ацэнкі паўнаты адбору дакументаў, бібліёграф можа звяртацца за кансультацыямі да спажыўца інфармацыі. Групоўка бібліяграфічных запытаў, якая выконваецца на апошнім тэхналагічным этапе, павінна адпавядаць аб'ёму выяўленай інфармацыі і катэгорыі складанасці даведкі. Калі ў даведку ўключаецца няшмат дакументаў, то бібліяграфічныя запісы групуюцца па алфавіце; для даведак, выкананых у дапамагу самаадукацыі, рацыянальна групіраваць матэрыял у рэкамендуемай паслядоўнасці чытання; для аб'ёмных даведак рэкамендуецца прымяняць групоўкі з улікам зместу.

Выкананая тэматычная даведка можа быць прадстаўлена спажыўцу інфармацыі ў форме бібліяграфічнага спіса, паказальніка, картатэкі ці як вуснае абвяшчэнне.

*Асаблівасці выканання ўдакладняльных бібліяграфічных даведак*. Удакладняльная даведка аднаўляе бібліяграфічнае апісанне дакумента. Удакладняльныя запыты ўзнікаюць у выпадках, калі даныя аб дакуменце недакладныя або няпоўныя. Такія сітуацыі ўзнікаюць і ў сувязі з нізкім узроўнем інфармацыйнай культуры спажыўцоў у выніку нядбайнага запісу, наяўнасцю памылак у бібліяграфічных запісах у недасканалых бібліяграфічных крыніцах, пры спробах аднавіць звесткі аб дакуменце па памяці і інш. Найбольш распаўсюджанымі відамі ўдакладняльных запытаў, з якімі звяртаюцца спажыўцы інфармацыі ў бібліятэку, з'яўляюцца наступныя: пошук існуючай, па меркаваннях спажыўца, работы па вядомым прозвішчы аўтара; пошук публікацыі, якую выкарыстоўваў спажывец раней, але зараз памятае толькі яе тэму ці год выдання, ці часопіс, дзе яна была апублікавана; скажона прозвішча аўтараў (замена адной літары іншай, пераблытаны ініцыялы); прозвішча рэдактара, перакладчыка, складальніка ці мастака прадстаўлена як прозвішча аўтара кнігі; артыкул з часопіса ці раздзел зборніка шукаюць як асобна выдадзеную кнігу; памылкі ў вызначэнні года выдання ці крыніцы апублікавання і інш. У масавых бібліятэках найбольш часта сустракаюцца запыты, звязаныя з удакладненнем звестак аб публікацыях твораў мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры выкананні гэтага тыпу даведак на першым тэхналагічным этапе пры прыёме запыту неабходна выявіць магчыма большую колькасць звестак аб дакуменце, вядомых спажыўцу (крыніца атрымання звестак спажыўцом, дадатковыя звесткі аб аўтары, месцы выдання і інш.). Гэта робіцца для таго, каб устанавіць найбольш дакладныя даныя (пошукавыя прыметы), на якія можна будзе абапірацца пры пошуку. На другім этапе пры выбары крыніцы і вызначэнні шляхоў пошуку трэба вызначаць такія бібліяграфічныя крыніцы, структура якіх адпавядае вядомым пошукавым прыметам дакумента. Так, калі ў якасці пошукавай прыметы выступае прозвішча аўтара, то неабходна звяртацца да бібліяграфічнага дапаможніка з алфавітнай групоўкай або да таго, які мае аўтарскі ці імянны дапаможны паказальнік. Калі вядомы загаловак, то пошук вядуць па бібліяграфічных дапаможніках са зместавай групоўкай або тых, што маюць прадметны ці дапаможны паказальнік загалоўкаў. Неабходна ўлічваць, што толькі адна пошукавая прымета не гарантуе выканання даведкі. Немагчыма атрымаць рэлевантную інфармацыю, калі невядома хаця б тэма работы; наяўнасць жа некалькіх прымет дае магчымасць бібліёграфу ажыццяўляць варыятыўны пошук, пераходзячы ад адной крыніцы пошуку да другой. Бібліёграф павінен валодаць гібкай сістэмай пошуку, добра ведаць асаблівасці разнастайных бібліяграфічных крыніц, аператыўна мяняць кірункі пошуку, быць гатовым да шматварыянтнасці пошуку, а таксама быць настойлівым, упэўненым у станоўчым выніку.

У сувязі з наяўнасцю тыповых удакладняльных запытаў у бібліяграфічнай практыцы выпрацаваны і найбольш тыповыя алгарытмы ўдакладняльнага пошуку. Так, напрыклад, пры ўстанаўленні (ці ўдакладненні) аўтара кнігі, калі вядомы яе загаловак або тэма, год выдання, выпрацавана наступная паслядоўнасць звароту да бібліяграфічных крыніц: сістэматычны і (ці) прадметны каталог; картатэка загалоўкаў мастацкай літаратуры; краязнаўчы каталог; дапаможныя паказальнікі да органаў дзяржаўнай бібліяграфіі, адпаведныя іх раздзелы; бягучыя тэматычныя і (ці) галіновыя бібліяграфічныя дапаможнікі, рэфератыўныя часопісы і зборнікі (адпаведныя раздзелы ці дапаможныя паказальнікі); тэматычныя і спецыяльныя картатэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удакладняльная даведка можа быць выдадзена спажыўцу ў вуснай ці пісьмовай форме. Пасля таго як чытачу будзе перададзена поўнае і дакладнае бібліяграфічнае апісанне дакумента, даведка лічыцца выкананай і даныя аб ёй бібліёграф заносіць у журнал уліку даведак. У асобных выпадках, калі бібліёграф не можа знайсці неабходныя звесткі аб дакуменце, карыстальніку выдаецца адмова, якая таксама фіксуецца ў журнале ўліку даведак і бібліяграфічных кансультацый з указаннем прычын невыканання запыту.

*Асаблівасці выканання адрасна-бібліяграфічных даведак*. Адрасна-бібліяграфічная даведка ўстанаўлівае наяўнасць і месцазнаходжанне дакумента.

Пры прыёме такога тыпу запыту ў спажыўца інфармацыі неабходна высветліць усе вядомыя яму элементы бібліяграфічнага апісання. Выкананне адрасна-бібліяграфічных даведак часта ўскладняецца тым, што яны з'яўляюцца вынікам недакладных звестак аб дакуменце. Спажывец не можа знайсці патрэбную яму работу не таму, што яе няма, а таму што шукае яе па скажоных звестках. Таму адрасны пошук часта папярэджваецца ўдакладняльным. І наогул, перад тым як устанавіць наяўнасць і месцазнаходжанне дакумента, бібліёграф нярэдка ажыццяўляе папераджальны ўдакладняльны пошук з тым, каб мець аб ім дастатковы набор дакладных звестак.

Існуюць два віды адраснага пошуку: пошук дакумента, які захоўваецца ў бібліятэцы, куды паступіў запыт, і пошук дакумента, які адсутнічае ў бібліятэцы, што выконвае запыт. Менавіта ад гэтых відаў запытаў залежыць і вызначэнне крыніц пошуку. Першы від пошуку не патрабуе складаных адшуканняў. Патрэбны дакумент шукаюць па картказых, друкаваных, электронных каталогах бібліятэкі-выканаўцы: алфавітным (у неабходных выпадках – генеральным) каталогу; каталогу перыядычных выданняў і выданняў, якія працягваюцца; каталогах нарматыўна-тэхнічных дакументаў; аўдыёвізуальных матэрыялаў. Пры такіх запытах часта даецца не даведка, а метадычная кансультацыя. Запыты другога віду – аб дакументах, якія адсутнічаюць у дадзенай бібліятэцы, – выконваюцца з выкарыстаннем зводных каталогаў, бюлетэняў новых паступленняў, друкаваных каталогаў буйнейшых бібліятэк. Пры станоўчым зыходзе адраснага пошуку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абанент атрымлівае поўнае бібліяграфічнае апісанне дакумента з указаннем яго месцазнаходжання ў фондах бібліятэк краіны, прыводзіцца шыфр захоўвання кнігі (артыкула) у бібліятэцы, дзе быў прыняты запыт. Пры адмоўным выніку бібліяграфічнае апісанне дакумента знаходзяць па крыніцах бягучай дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі ці іншых бібліяграфічных паказальніках, а заказ перадаюць у бібліятэку, фонды якой адпавядаюць профілю запыту.

*Асаблівасці выканання фактаграфічных даведак*. Фактаграфічная даведка змяшчае прамы адказ (фактаграфічную інфармацыю) на запыт аб тых ці іншых аб'ектах, падзеях, працэсах, датах, цытатах, тлумачэннях тэрмінаў, выкладанні канцэпцый і інш. Да фактаграфічнай інфармацыі адносяцца як звесткі, якія атрымліваюць з дакументаў (першасных ці другасных), так і з непасрэдных крыніц іх узнікнення (вымяральных сістэм, спецыялістаў і інш.). Адрозніваюць два віды фактаграфічнага пошуку: дакументна-фактаграфічны, які заключаецца ў адшуканні ў дакументах "кускоў тэксту" або цытат, што змяшчаюць фактаграфічную інфармацыю, ці ў выдачы загадзя падрыхтаваных фактаграфічных апісанняў, напрыклад з фактаграфічнай картатэкі адрасоў і г.д.; і фактаграфічны, які прадугледжвае не толькі адшуканне рэлевантнай фактаграфічнай інфармацыі, але і фарміраванне (сінтэзаванне) на яе аснове новых фактаграфічных апісанняў, што адсутнічалі ў гатовым выглядзе да паступлення запыту.

По сваім змесце фактаграфічныя запыты выключна разнастайныя. Крыніцамі іх выканання ў бібліятэках выступаюць даведачныя выданні, фактаграфічныя картатэкі, фактаграфічныя БД, першасныя крыніцы, афіцыйныя выданні і матэрыялы, тэматычныя папкі-дасье, бібліяграфічныя крыніцы. Не выключаецца магчымасць звароту бібліёграфа і да спецыялістаў па пэўнай галіне ведаў.

Даведка, якая выдаецца спажыўцу ў вуснай ці пісьмовай форме, акрамя непасрэдна фактаграфічнай інфармацыі, можа змяшчаць і бібліяграфічную інфармацыю аб дакуменце, дзе знаходзяцца цікавыя для спажыўца звесткі. Такога роду факультатыўная інфармацыя можа быць выкарыстана абанентамі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў мэтах праверкі дакладнасці прыведзеных у даведцы звестак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *9.3. Аўтаматызаваная тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання*

Аўтаматызаваная тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання прадугледжвае выкарыстанне сродкаў, крыніц пошуку на нетрадыцыйных носьбітах інфармацыі, разнастайных бібліяграфічных, фактаграфічных, паўнатэкставых баз даных, магчымасцей тэлекамунікацыйнага доступу да аддаленых крыніц інфармацыі, а таксама мае пэўныя асаблівасці пры ажыццяўленні асноўных этапаў, працэсаў і аперацый. Разгледзім гэтыя тэхналагічныя асаблівасці.

На першым этапе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання прыём запыту ажыццяўляецца бібліёграфам, і ў ходзе гутаркі са спажыўцом інфармацыі высвятляюцца ўсе тыя ж звесткі, аб якіх гаварылася пры разглядзе традыцыйнай тэхналогіі. Пасля прыёму запыту бібліёграф ажыццяўляе яго перадмашынную апрацоўку.

Перадмашынная апрацоўка запыту, ці падрыхтоўка яго да ўводу ў сістэму, заключаецца ў аналізе запыту, правядзенні семантычных аперацый, звязаных з індэксаваннем зместу запыту з улікам лінгвістычнага забеспячэння БД, выкарыстоўваемых інфармацыйна-пошукавых моў, і складанні пошукавага прадпісання. Сюды ж уваходзяць улікова-рэгістрацыйныя аперацыі, якія зводзяцца да фіксавання запыту і праверкі яго на дублетнасць. Вынікам перадмашыннай апрацоўкі з'яўляецца запаўненне рабочага ліста запыту, у якім, акрамя пошукавага вобраза запыту, змяшчаюцца ўказанні аб парадку выдачы інфармацыі (эшаланіраванне выдачы) і форме выдачы (раздрукоўка ў выглядзе спіса, табуляграм ці карт, перадача ў каналы дыстанцыйнай сувязі, перазапіс на дыскету ці іншыя носьбіты інфармацыі).

Перадмашынная апрацоўка запыту можа быць і аўтаматычнай, якая ажыццяўляецца з дапамогай праграмы-дыспетчара, што ёсць у складзе матэматычнага забеспячэння сістэмы. У гэтым выпадку функцыі праграмы-дыспетчара зводзяцца да прыняцця рашэння аб тым, якія рабочыя праграмы, у якім рэжыме і ў якой паслядоўнасці неабходна выканаць, каб задаволіць дадзены запыт, і ў прывядзенні запыту ў неабходны для работы выгляд.

Увод запыту ў сістэму пасля яго перадмашыннай апрацоўкі – наступны працэс аўтаматызаванай тэхналогіі даве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Рабочы ліст запыту перадаецца ў групу падрыхтоўкі даных, дзе фарміруецца пакет запытаў для ўводу ў ЭВМ. Калі прадугледжаны дыялог з ЭВМ у рэальным часе, тэхналогія ўводу запыту ў ЭВМ мяняецца: пошукавае прадпісанне фарміруецца непасрэдна бібліёграфам (ці спажыўцом) на яго тэрмінальным устройстве і ўводзіцца ім у машыну.

У цяперашні час вядомы два асноўныя рэжымы працы аўтаматызаваных сістэм: пакетны і дыялогавы. Пакетны рэжым прадугледжвае фарміраванне сукупнасці запытаў спажыўцоў інфармацыі, пошукавых прадпісанняў, праграм пошуку ў адзіным пакеце, які дазваляе ажыццявіць пошук інфармацыі, неабходнай некальнкім абанентам адначасова. Выдача вынікаў магчыма толькі па заканчэнні апрацоўкі ўсяго пакета.

Дыялогавы рэжым прадугледжвае зносіны чалавека з ЭВМ. Адрозніваюць лакальны дыялог, калі тэрмінал, з дапамогай якога ажыццяўляецца дыялог, знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад ЭВМ і карыстальнік не звяртаецца да каналаў сувязі агульнага карыстання, і дыстанцыйны, які прадугледжвае зварот спажыўца да гэтых каналаў (тэлефон, тэлеграф, радыёсувязь). Магчымасць дыстанцыйнага рэжыму дазваляе спажыўцу мець прамы доступ да неабходных звестак нават у тым выпадку, калі інфармацыйны цэнтр знаходзіцца ад яго на значнай адлегласці. Дыялогавы рэжым дазваляе атрымліваць у кароткі тэрмін большую колькасць адказаў на запыты і адначасова абслугоўваць большую колькасць спажыўцоў; удакладняць фармулёўку запыту пры ўдзеле спажыўца; адразу адбіраць неабходныя дакументы і не затрачваць машынны час на друкаванне непатрэбных спажыўцу звестак; аплачваць толькі рэлевантныя адказы.

Пошук інфармацыі – гэта цэнтральны працэс пры аўтаматызаванай тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Сутнасць яго заключаецца ў супастаўленні пошукавага вобраза дакумента, які захоўваецца ў сістэме, з пошукавым прадпісаннем запыту. Пры гэтым ажыццяўляюцца лагічныя і вылічальныя дзеянні, што прадугледжаны сукупнасцю алгарытмаў і праграм.

У практыцы бібліятэк выкарыстоўваюцца шэсць асноўных тыпаў пошуку па бібліяграфічных базах даных, і ў прыват-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці па электронным каталогу – пошукавым сродку, які першапачаткова пачынае фарміравацца ў бібліятэцы пры пераходзе яе на аўтаматызаваную тэхналогію ажыццяўлення бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў:

– загаловак – пошук па асноўным загалоўку кнігі, часопіса ці серыі;

– аўтар – пошук па прозвішчы аўтара, мастака, рэдактара, арганізацыі, адказнай за выданне, назве канферэнцыі;

– аўтар-загаловак – пошук па камбінацыі ўказаных прымет;

– прадметная рубрыка;

– нумар-пошук па кодах і нумарах – шыфры, класіфікацыйным індэксе, ISSN, ISBN;

– ключавое слова – пошук па асобным слове з загалоўка, прозвішчы аўтара, назве ці прадметнай рубрыцы.

У любым з гэтых тыпаў пошуку магчымы пошук з выкарыстаннем булевых (лагічных) аператараў. Булеў пошук дазваляе таксама камбінаваць у адным запыце розныя тыпы пошуку, напрыклад класіфікацыйныя індэксы з прадметнымі рубрыкамі і інш.

Разгледзім асаблівасці асобных тыпаў пошуку, напрыклад пошук па загалоўку. Для простага пошуку па загалоўку дакумента бібліёграф (карыстальнік) уводзіць з клавіятуры загаловак патрэбнага дакумента або, як мінімум, першае слова загалоўка. Загаловак правяраецца па спецыяльным паказальніку (файлу) загалоўкаў і па нарматыўным файле уніфікаваных загалоўкаў. Пры гэтым асобныя пачатковыя словы загалоўкаў (як правіла, артыклі) пры сарціроўцы і пошуку не ўлічваюцца. У выпадку, калі колькасць супадзенняў запыту з загалоўкамі, уключанымі ў файл загалоўкаў, шматлікая або калі дакладных супадзенняў няма, сістэма фарміруе і выводзіць на дысплей спіс рэлевантных загалоўкаў у алфавітным парадку, пры якім кожнаму ўваходу (загалоўку) прысвойваецца паслядоўны нумар. Такім чынам, сістэма прапануе дакладныя фармулёўкі загалоўкаў, якія маюцца ў каталогу, іх карыстальнік можа выбраць пры праглядзе алфавітнага паказальніка загалоўкаў. Затым бібліёграфу (карыстальніку) дастаткова ўказаць адпаведны нумар (рубрыку паказальніка) у спісе рэлевантных загалоўкаў, і сістэма выводзіць на экран адпаведныя запыту кароткія бібліяграфічныя запісы сумесна са звесткамі аб месцазнаходжанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожнага дакумента па даных модулей кнігавыдачы ці камплектавання. Пры гэтым тыпе пошуку сістэма дазваляе бібліёграфу праглядаць па алфавіце як кароткія, так і больш поўныя знойдзеныя бібліяграфічныя запісы ці вяртацца да паказальніка загалоўкаў. Калі запыту дакладна адпавядае толькі адзін бібліяграфічны запіс, сістэма адразу выводзіць кароткі бібліяграфічны запіс з патрэбным загалоўкам, не фарміруючы і не выводзячы на экран спіс загалоўкаў.

Пошук па аўтары ажыццяўляецца праз файл аўтараў, які ўключае ўсіх сааўтараў, ілюстратараў, рэдактараў і іншых, указаных у бібліяграфічных запісах і нарматыўным файле імён і найменняў аўтараў. Пошук па аўтары ажыццяўляецца аднолькава, як і пошук па загалоўках, толькі ў адказ на запыт сістэма фарміруе і выводзіць спіс рэлевантных запыту аўтараў з указаннем колькасці загалоўкаў па кожным аўтары.

Пошук па камбінацыі "аўтар–загаловак" з'яўляецца самым распаўсюджаным. Для дадзенага віду пошуку дастаткова ўвесці некалькі першых літар імя / наймення аўтара і загалоўка. Пошук ажыццяўляецца па двух файлах – аўтарскім і загалоўкаў. Гэта самы хуткі спосаб атрымаць патрэбныя звесткі. Такі тып пошуку можа ажыццяўляцца ў два этапы, працэдуры якіх дубліруюць пошук па аўтары і пошук па загалоўку. Пры гэтым тыпе пошуку нават пры ўсечаных фармулёўках у запытах вынікі пошуку зводзяцца ўсяго да некалькіх рэлевантных запісаў. Калі запыту адпавядае толькі адзін бібліяграфічны запіс, то ён адразу выводзіцца на экран дысплея, калі некалькі, то сістэма фарміруе і выводзіць спіс, прапануючы выбраць неабходную рубрыку і перайсці да прагляду бібліяграфічных запісаў ці вярнуцца да спіса. Калі ў каталогу няма запісаў, рэлевантных запыту, сістэма выводзіць паведамленне: "Нічога не знойдзена, паспрабуйце яшчэ раз".

Пошук па прадметнай рубрыцы прадугледжвае фармулёўку запыту ў выглядзе прадметнай рубрыкі. Дакладны адказ патрабуе поўнага супадзення прадметнай рубрыкі запыту і прадметнай рубрыкі пошукавага вобраза дакумента. Але калі ў каталогу няма дакладнага супадзення ці калі ў паказальніку прадметных рубрык ёсць некалькі рубрык, што адпавядаюць умовам запыту, сістэма фарміруе і выводзіць на тэрмінале спіс рэлевантных прадметных рубрык з указаннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасці бібліяграфічных запісаў, якія адпавядаюць кожнай прадметнай рубрыцы. Спіс прадметных рубрык можна праглядаць па алфавіце ў абодва бакі для ўдакладнення запыту.

Пошук па ключавых словах звычайна ўключае наступныя падвіды: пошук па ключавых словах імя / прозвішча аўтара; пошук па ключавых словах загалоўка; пошук па ключавых словах прадметнай рубрыкі. У любым з указаных відаў пошуку мноства супадаючых з запытам імён ці прозвішчаў аўтараў, загалоўкаў, прадметных рубрык выводзіцца на экран ў выглядзе фарміруемага сістэмай пераліку адпаведных рубрык разам з колькасцю запісаў па кожнай рубрыцы, г.зн. па аўтары, загалоўку ці прадметнай рубрыцы. Калі ў каталогу толькі адзін запіс дакладна адпавядае запыту, сістэма выводзіць яго адразу, абмінаючы пераліку рэлевантных рубрык.

У межах пошуку па ключавых словах маецца дадатковая магчымасць усячэння ключавых слоў з правага боку. Усечаная частка слова абазначаецца спецыяльным знакам, напрыклад знакам # . Такога ўсячэння слоў "уручную" іншыя тыпы пошуку не патрабуюць па прычыне таго, што гэта закладзена ў іх імпліцытна, гэта значыць падразумеваецца пры алфавітнай сарціроўцы пошукавых элементаў. Але пры пошуку па ключавых словах усячэнне неабходна ўказваць пры фармулёўцы запыту. Так, пошук па ключавым слове "біблія #" дадаткова да бібліяграфічных запісаў, якія змяшчаюць у назве гэтую частку слова, выдасць таксама найменні – Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Санкт-Пецярбургскае бібліятэчнае таварыства і інш. Пошук па ключавым слове загалоўка з'яўляецца найбольш важным у гэтым тыпе пошуку. У файле загалоўкаў у пошук уключаюцца ўсе словы ўсіх загалоўкаў, акрамя вельмі абмежаванай колькасці "стоп-слоў", у асноўным артыкляў. Выкарыстанне паказальніка ключавых слоў загалоўкаў з'яўляецца свайго роду альтэрнатывай пошуку па прадметных рубрыках. Пошук па ключавых словах прадметных рубрык ажыццяўляецца аналагічна, але адбываецца ў файле прадметных рубрык, уключаных у каталог.

Пошук па нумары звычайна ажыццяўляецца па наступных прыметах: па шыфрах захоўвання, у тым ліку пры сістэматычнай расстаноўцы фонду; па міжнародных стандартных нумарах выданняў (ISSN, ISBN); нумары друкаванай карткі нацыянальнага бібліяграфічнага цэнтра; дзяржаўным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгістрацыйным нумары. Спецыялісты распрацоўваюць таксама пошук па класіфікацыйных індэксах.

Пры аўтаматызаванай тэхналогіі ажыццяўлення даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання прымяняецца пошук з выкарыстаннем булевых аператараў. Пошук называецца булевым па імені англійскага матэматыка Джорджа Буля. Ён у сярэдзіне XIX в. распрацаваў алгебру, якая мела фундаментальнае значэнне для вылічальнай тэхнікі і стала называцца булевай. Булева алгебра мае справу з логікай, а не з вызначэннем лічбавых значэнняў дваічных пераменных *x* або *y*. Гэтыя дваічныя пераменныя могуць прымаць толькі адно з двух значэнняў: "праўда" або "няпраўда", а ўзаемаадносіны паміж гэтымі пераменнымі выражаюцца ў лагічнай форме з дапамогай такіх аператараў, як *and / і* (лагічная кан'юнкцыя), *or / ці* (лагічная дыз'юнкцыя) і *not / не* (лагічнае адмаўленне). Пры пошуку ў электронным каталогу, бібліяграфічных базах даных булевыя аператары выкарыстоўваюцца ў якасці спецыфікатараў, напрыклад запыт па ключавым слове: "маркетынг" *або* "збыт" *і* "апрацоўка тэкстаў". Булеў пошук па ключавых словах з'яўляецца вельмі эфектыўным.

Онлайнавы доступ да электроннага каталога дае магчымасць не толькі выкарыстоўваць даныя каталагізацыі, але і іншыя модулі аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы – модуля камплектавання і модуля кнігавыдачы (напрыклад, звесткі аб тым, што дакумент выдадзены на абанемент, на выставу, на які тэрмін; ці бібліяграфічныя звесткі аб дакументах, якія ўжо заказаны / атрыманы бібліятэкай, але не паступілі ў фонд / апрацоўку).

Онлайнавы доступ дае магчымасць бібліёграфу (карыстальніку) у пэўныя моманты перарваць дыялог і прагледзець знойдзеныя бібліяграфічныя запісы; спыніць прагляд, увесці новыя пошукавыя прыметы пры камбінаваным шматаспектным пошуку з дапамогай булевых аператараў ці новы запыт; надрукаваць бібліяграфічны запіс, які яго зацікавіў, ці ўсе знойдзеныя дакументы; заказаць бібліяграфічны спіс ці копію дакумента.

Завяршальная аперацыя аўтаматызаванай тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання – выдача інфармацыі, якая заключаецца ў падрыхтоўцы вынікаў пошуку да вываду і выбару формы выдачы. Магчымы вывад інфармацыі на роз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя носьбіты; выдача зместу дакументаў у цэлым ці толькі асобных частак; інфармацыя можа быць апрацавана і выдадзена ў форме тэксту, табліцы і інш.

З развіццём тэлекамунікацый у практыку даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання трывала ўвайшло такое паняцце, як дыстанцыйны, ці аддалены, доступ, і ўжо з 1987 г. у навуковы зварот уваходзіць паняцце онлайнавага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пад якім разумеецца прадастаўленне карыстальнікам інфармацыі з тэрытарыяльна аддаленых баз даных пры дапамозе онлайнавых інфармацыйна-пошукавых сістэм. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў рэжыме онлайн з'яўляецца лагічным працягам традыцыйнага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, паколькі адпавядае цэламу раду працэсаў, аперацый, характарыстык традыцыйнага віду дзейнасці (наяўнасць узаемадзеяння "карыстальнік – бібліёграф", матываваны інфармацыйны пошук і інш.), разам з тым існуюць і спецыфічныя асаблівасці.

### *9.4. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з выкарыстаннем сродкаў інтэрнета*

Пры ажыццяўленні пошуку неабходнай інфармацыі па інфармацыйных рэсурсах інтэрнета ёсць некалькі стратэгій пошуку. Самы просты, калі дакладна вядомы адрас патрэбнага дакумента, то ў адрасны радок пры рабоце з браўзерам інтэрнет – інтэрнет Explorer уводзіцца адрас, і на маніторы праз некаторы час можна праглядзець поўны тэкст дакумента. Але часцей за ўсё даводзіцца ажыццяўляць выкананне розных тыпаў запытаў з выкарыстаннем разнастайных пошукавых сродкаў інтэрнета.

На прыкладзе работы з універсальнымі пошукавымі сістэмамі інтэрнета разгледзім асаблівасці ажыццяўлення даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання пры фарміраванні пошукавага прадпісання, яго ўводзе ў пошукавую сістэму, атрыманні вынікаў пошуку.

*Фарміраванне пошукавага прадпісання.* Пры рабоце з універсальнымі пошукавымі сістэмамі трэба мець на ўвазе, як ажыццяўляецца фарміраванне пошукавага вобраза дакумента ў базах даных пошукавых сістэм. У наш час усе буйныя пошукавыя сістэмы пры індэксаванні вэб-старонак поўнасцю скануюць іх тэкст, г.зн. у пошукавы вобраз дакумента

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уключаюцца ўсе словы на старонцы. З дапамогай распрацаваных алгарытмаў ажыццяўляюцца пэўнае выключэнне, фільтрацыя інфармацыі, аднак распрацоўшчыкі пошукавых сістэм не заўсёды прадастаўляюць карыстальнікам інфармацыю аб гэтых алгарытмах. На падставе арыгінальнага тэксту дакумента пошукавая сістэма стварае індэкс – спецыяльнае прадстаўленне дакумента, зручнае для хуткага пошуку. Інфармацыйна-пошукавай мовай гэтых сістэм з'яўляецца мова ключавых слоў, якая ўяўляе сабой сукупнасць ненарміраваных лексічных адзінак з загалоўкаў, рэфератаў або поўнага тэксту дакумента. У межах гэтай мовы могуць выкарыстоўвацца словы, словазлучэнні або фразы, што і трэба ўлічваць пры фарміраванні пошукавага вобраза запыту. Фактычна бібліёграф (карыстальнік) самастойна вызначае ўводзімыя ім тэрміны як ключавыя, дапускаючы, што дакументы, якія іх змяшчаюць, будуць рэлевантнымі запыту.

Але трэба мець на ўвазе, што паўнатэкставае індэксаванне дакументаў мае як свае перавагі, якія заключаюцца ў вычарпальным характары адлюстравання зместу дакумента, так і недахопы, якія заключаюцца ў тым, што выдаваемая інфармацыя часта аказваецца неадэкватнай запыту. Таму бібліёграфу трэба валодаць пэўнымі ведамі аб методыцы фарміравання пошукавага вобраза запыту і пошукавага прадпісання. У сувязі з існаваннем сінанімii для забеспячэння паўнаты пошуку важна складаць розныя варыянты пошукавага вобраза запыту, выкарыстоўваючы сінонімы ключавых слоў або блізкія ім па сэнсе тэрміны. Для атрымання рэлевантных дакументаў часта бывае неабходным не толькі выявіць усе дакументы з ключавымі словамі, але і выключыць з іх ліку дакументы з непажаданымі тэрмінамі. Для выканання такога роду запыту складаецца пошукавае прадпісанне, якое ўяўляе сабой пошукавы вобраз запыту, дапоўнены лагічнымі аператарамі, неабходнымі для паспяховай рэалізацыі пошуку.

Такім чынам, калі размова ідзе аб пошукавым вобразе запыту, то пад гэтым падразумеваецца набор ключавых слоў (слоў запыту). Калі паміж імі задаюцца адносіны (наяўнасць або адсутнасць у тэксце), размова ідзе аб фарміраванні пошукавага прадпісання.

Пошукавае прадпісанне задаецца з дапамогай лагічных аператараў. Лагічны аператар уяўляе сабой сімвал, які вызна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чае лагічную аперацыю. Існуюць тры асноўныя віды лагічных аперацый, якія выкарыстоўваюцца ў сінтаксісе інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ) пошукавых сістэм (ПС) WWW:

– лагічная аперацыя памнажэння, якая патрабуе абавязковага ўваходджання двух або болей слоў запыту ў дакумент; ёй адпавядае лагічны аператар *і (и);*

– лагічная аперацыя складання, якая патрабуе абавязковага ўваходджання хаця б аднаго слова запыту ў дакумент; ёй адпавядае лагічны аператар *або (или);*

– лагічная аперацыя адмаўлення, якая патрабуе выключэння з вобласці пошуку тых дакументаў, якія змяшчаюць указаныя словы; ёй адпавядае лагічны аператар *не (не).*

Існуюць розныя спосабы абазначэння лагічных аператараў. Яны могуць азначацца з дапамогай літар *(і=and; або= or; не=not)* або сімвалаў (*і* абазначаецца знакам “+” ці “&”; *або* – знакам “|”; *не* – знакам “-”). Пошукавыя сістэмы, якія маюць развіты сінтаксіс ІПМ, дапускаюць выкарыстанне абазначэння аператараў і літарамі, і сімваламі. Больш падрабязныя звесткі аб гэтым змяшчаюцца ў даведачных раздзелах па складанні запытаў, якія ёсць у кожнай ПС.

Прывядзём прыклады выкарыстання лагічных аператараў:

– бібліятэкі *і* архівы – пошук дакументаў, якія змяшчаюць абодва словы;

– бібліятэкі *або* архівы – пошук дакументаў, якія змяшчаюць або слова “бібліятэкі”, або слова “архівы”, або абодва словы;

– бібліятэкі *не* архівы – пошук дакументаў, якія змяшчаюць слова “бібліятэкі”, але не маюць у тэксце слова “архівы”;

– бібліятэкі *і* архівы *не* абласныя – пошук дакументаў, якія змяшчаюць слова “бібліятэкі” і “архівы”, але не маюць у тэксце слова “абласныя”;

– бібліятэкі *і* архівы *або* “інфармацыйныя цэнтры” – пошук дакументаў, якія змяшчаюць словы “бібліятэкі” і “архівы” або спалучэнне слоў “інфармацыйныя цэнтры”.

Пры састаўленні складанага пошукавага прадпісання, калі пошукавай сістэме трэба задаць пэўны парадак апрацоўкі ключавых слоў і аператараў, якія да іх адносяцца, выкарыстоўваюцца круглыя дужкі.

Схема: (x *or* y) *and* (z *or* q).

Прыклад: (бібліятэкі або архівы) і (абласныя або гарадскія).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па такім запыце будуць знойдзены дакументы, якія змяшчаюць словы або словазлучэнні: абласныя бібліятэкі, гарадскія архівы, абласныя архівы або гарадскія бібліятэкі. Калі дужкі апусціць, то будуць знойдзены дакументы, якія змяшчаюць тэрмін *x* або тэрміны *y* і *z*, або тэрмін *q*, а менавіта бібліятэкі; абласныя архівы; гарадскія.

Пры састаўленні запыту з выкарыстаннем ключавых слоў важным бывае не толькі іх наяўнасць у тэксце шукаемага дакумента, але і размяшчэнне гэтых слоў у адносінах аднаго да другога ці да пачатку дакумента. Гэта называецца ступенню блізкасці ключавых слоў.

Для вызначэння ступені блізкасці двух ключавых слоў у тэксце шукаемага дакумента выкарыстоўваюцца аператары блізкасці (NEAR, BEFORE і інш.). Так, напрыклад, калі два ключавыя словы аб'яднаны аператарам NEAR, пошукавая сістэма знаходзіць дакументы, у якіх гэтыя словы суседнічаюць у межах некалькіх слоў адзін ад аднаго (як правіла, у адным сказе або абзацы). Аператар BEFORE задае пошук слоў у дакладнай паслядоўнасці, але на любой адлегласці іх паміж імі. Для пошуку фразы выкарыстоўваюцца коскі, якія паступова выцеснілі з ужывання аператар AFTER.

Акрамя ўжо пералічаных аператараў, кожная пошукавая сістэма мае свае дадатковыя, ці спецыяльныя, аператары, якія пашыраюць магчымасці састаўлення пошукавага прадпісання, а таксама ўлічваюць асаблівасці пошуку інфармацыі ў гіпертэкставым асяроддзі. Іх можна падзяліць на тры групы:

– пошук у пэўных абласцях html-дакументаў (напрыклад, “title” – пошук у загалоўку дакумента);

– пошук html-дакументаў, якія знаходзяцца на пэўных вузлах ці сайтах (напрыклад, “domain”, “host”);

– пошук розных аб'ектаў у структуры html-дакументаў у выглядзе гіперспасылак, відарысаў, мультымедыйнай інфармацыі, праграмных кодаў, дыялогавых формаў (напрыклад, “applet”, “image”).

У якасці спецаператараў могуць выступаць вышэйназваныя сімвалы “+” і “-“, аднак у дадзеным выпадку яны выкарыстоўваюцца для павышэння або паніжэння вагі слова пры ранжыраванні спіса вынікаў пошуку.

Многія пошукавыя сістэмы даюць магчымасць правядзення пошуку па частцы ключавога слова. Гэтая функцыя назы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваецца “ўсячэнне”. Часцей за ўсё падтрымлівае такія яе разнавіднасці, як усячэнне справа і замена адной ці болей літар у сярэдзіне слова. Як правіла, для гэтага выкарыстоўваюцца знакі “+” (для абазначэння адвольнай часткі слова) і “?” (для абазначэння любога сімвала слова). Напрыклад: касм* = касматы, касметыка, касмічны, касметычка; к?нц?рт = канцэрт, концерт.

У час пошуку большасць развітых пошукавых сістэм улічваюць марфалагічныя формы зададзеных ключавых слоў. Гэта асабліва важна для расійскіх, беларускіх пошукавых сістэм, таму што руская, беларуская мовы адносяцца да моў, у якіх формы слоў утвараюцца з дапамогай канчаткаў. Дадзеная пошукавая функцыя рэалізуецца ў кожнай ПС пазнаму. Часцей за ўсё пры апрацоўцы запыту яна дзейнічае па ўмаўчанні; для таго, каб шукаць патрэбнае слова у той граматычнай форме, у якой яно было ўведзена, патрабуюцца спецыяльныя аператары.

Пры ўводзе запыту неабходна звяртаць увагу на тое, у якім рэгістры (верхнім ці ніжнім) уводзяцца ключавыя словы. Развітыя пошукавыя сістэмы адрозніваюць словы, набраныя малымі і вялікімі літарамі. Гэтая функцыя называецца “чуллівасць да рэгістра малых і вялікіх літар”. Усе пошукавыя сістэмы, якія валодаюць гэтай функцыяй, падпарадкоўваюцца агульнаму правілу. Калі ключавыя словы пачынаюцца з вялікай літары або поўнасцю ўведзены вялікімі літарамі, то гэтыя ж словы, напісаныя малымі літарамі, знойдзены не будуць. Пры ўводзе ключавых слоў малымі літарамі вобласць пошуку пашыраецца, таму што ключавыя словы шукаюцца незалежна ад рэгістра.

Распрацоўшчыкі буйных пошукавых сістэм у мэтах прыцягнення да сваёй сістэмы максімальнай колькасці карыстальнікаў часта прапануюць прыводзіць запыт на натуральнай мове. Аднак эксперты адзначаюць, што рэалізацыя дадзенай пошукавай функцыі з’яўляецца справай далёкай будучыні. Пры дапамозе спецыяльных алгарытмаў з уведзеных карыстальнікам фраз выбіраюцца назоўнікі, уласныя імёны, прыметнікі, дзеясловы і адсякаюцца займеннікі, прыслоўі, службовыя часткі мовы. Пасля гэтага пошукавая сістэма апрацоўвае запыт так, як быццам ён складаўся з ключавых слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Увод запыту або пошукавага прадпісання ў пошукавую сістэму адбываецца з дапамогай інтэрфейса пошукавай сістэмы.* Сёння ўсе буйныя пошукавыя сістэмы маюць як мінімум два пошукавыя інтэрфейсы: просты пошук (simple search) і пашыраны пошук (advanced search, power search). Адрозненне паміж імі заключаецца ў магчымасці састаўлення запытаў і пошукавых прадпісанняў рознай ступені складанасці. Абодва інтэрфейсы адносяцца да графічнага тыпу і рэалізаваны ў выглядзе web-старонак, якія змяшчаюць шэраг спецыяльных элементаў. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца поле для ўводу ключавых слоў, селектарныя кнопкі і меню.

Поле для ўводу ключавых слоў "Search for" і кнопка адпраўкі запыту з'яўляюцца абавязковымі для любога тыпу інтэрфейса.

Селектарныя кнопкі даюць шырокія магчымасці для дэталізацыі запыту, дазваляючы абмежаваць ці пашырыць вобласць пошуку дадатковымі параметрамі (абмежаваннямі па даце стварэння дакумента, па моўнай прыналежнасці дакумента), а таксама змяніць форму выдачы вынікаў пошуку.

Меню складаецца з опцый, гэта значыць параметраў для апрацоўкі запыту. Опцыі служаць, як правіла, для састаўлення розных варыянтаў пошукавага прадпісання і камбінуюцца з палямі для ўводу ключавых слоў. Акрамя таго, яны могуць несці самастойную сэнсавую нагрузку (напрыклад, для абазначэння мовы дакумента), і ў гэтым выпадку меню працуе як селектарная кнопка для выбару аднаго з параметраў пошуку.

Поўны набор пошукавага інтэрфейса часцей прадстаўлены на старонцы пашыранага пошуку. У сувязі з тым, што састаўленне пошукавых прадпісанняў з выкарыстаннем лагічных і спецыяльных аператараў з'яўляецца дастаткова складанай задачай для непадрыхтаванага карыстальніка, распрацоўшчыкі пошукавых сістэм спрабуюць вырашыць гэтую праблему шляхам стварэння на старонцы пашыранага пошуку так званых шаблонаў. Шаблоны складаюцца з абласцей для ўдакладнення запыту, якія называюцца фільтрамі. Як правіла, першая вобласць удакладнення ўяўляе слоўнікавы фільтр. Карыстальніку прапануецца скласці пошукавы выраз з дапамогай спецыяльных формаў, якія з'яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камбінацыяй з меню і палёў для ўводу ключавых слоў. Опцыі меню могуць мець абазначэнні “абавязкова” (“обязательно”, “must include”); “пажадана” (“желательно”, “should include“); “выключыць” (“исключить”, “must not include”), што па сэнсе адпавядае лагічным аператарам *and, or, not.* Опцыі цэнтральнага меню “ўсе формы” ці “дакладная форма” даюць магчымасць пошуку ключавых слоў з улікам або без уліку марфалогіі. Меню справа абмяжоўвае пошук пэўнай вобласцю html-дакумента (сказ, дакумент, фраза, загаловак, анатацыя, спасылка, адрас).

Колькасць і разнавіднасці дадатковых, акрамя слоўнікавага, фільтраў могуць вар’іравацца ў залежнасці ад пошукавых функцый, якія падтрымлівае пэўная пошукавая сістэма. Сярод найбольш распаўсюджаных фільтраў выступаюць храналагічныя, моўныя, па дамену, у тым ліку верхняга ўзроўню, геаграфічныя, наяўнасці мультымедыйнай інфармацыі ў структуры html-дакумента.

Фільтры могуць ствараецца з дапамогай розных элементаў пошукавага інтэрфейса.

Выкарыстанне фільтраў значна спрашчае працэдуру саставлення пошукавага прадпісання. Аднак, як адзначаюць спецыялісты, яно не можа ў поўнай ступені замяніць тыя магчымасці, якія даюць лагічныя аператары. Па-першае, колькасць палёў у слоўнікавых фільтрах, за рэдкім выключэннем, не перавышае трох. Па-другое, незразумелым застаецца парадак апрацоўкі ключавых слоў, дакладней, аператараў, якія да іх адносяцца. У сувязі з гэтым многія пошукавыя сістэмы даюць магчымасць уводу запыту як з дапамогай лагічных аператараў, так і выкарыстаннем шаблонаў.

Некаторыя пошукавыя сістэмы дазваляюць карыстальнікам ствараць так званыя ўстаноўкі пошуку (customize search). Карыстальнік пераходзіць на старонку, якая змяшчае некаторы набор фільтраў (напрыклад, па даце стварэння, па моўнай або геаграфічнай прыналежнасці дакумента), задае неабходныя параметры пошуку, захоўвае іх, вяртаецца на папярэднюю старонку (простага ці пашыранага пошуку) і ўводзіць запыт. Створаныя ўстаноўкі захоўваюцца або на працягу аднай пошукавай сесіі, або запамінаюцца браўзерам і дзейнічаюць пастаянна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля фармулёўкі запыту ў рамках адпаведнага пошукавага інтэрфейса пошукавая сістэма ажыццяўляе пошук і выдае вынік пошуку ў онлайнавым рэжыме.

*Прадастаўленне вынікаў пошуку і ранжыраванне дакументаў*. Вынік пошуку выдаецца ў выглядзе спіса спасылак на html-дакументы, якія адпавядаюць умовам пошукавага запыту або пошукавага прадпісання.

Пры выдачы вынікаў пошуку дакументы ранжыруюцца ў адпаведнасці з тымі крытэрыямі, якія былі створаны распрацоўшчыкамі ПС. Гэтыя крытэрыі вельмі важна ўлічваць пры выбары пошукавай сістэмы, таму што ад іх залежыць эфектыўнасць пошукавага працэсу. Алгарытмы ранжыравання могуць быць такімі, што бібліёграф, праглядзеўшы першыя 20 (максімум 30) спасылак на web-старонцы, можа вызначыць наяўнасць або адсутнасць патрэбнай яму інфармацыі і прыняць рашэнне аб мэтазгоднасці далейшага пошуку або замене пошукавага інструмента.

Падрабязныя звесткі аб тым, як тая ці іншая канкрэтная пошукавая сістэма ранжыруе дакументы, друкуюцца вельмі рэдка. Метады ранжыравання выяўляюцца шляхам тэсціравання кожнай канкрэтнай ПС, але ў большасці выпадкаў выкарыстоўваюцца адны і тыя ж агульныя прынцыпы.

Адзін з найбольш важных фактараў – гэта месцазнаходжанне ключавых слоў або фраз. Калі слова запыту змяшчаецца ў загалоўку або першых абзацах, то тады гэтая старонка можа атрымаць высокі ранг. Уваходжанне ключавых слоў у поле html-дакумента “META” таксама можа павысіць ранг web-старонкі.

Частата ўжывання ключавых слоў у дакуменце, а таксама іх блізкасць адно да аднаго маюць вялікае значэнне для ранжыравання дакументаў. Як правіла, калі ўведзены бібліёграфам (карыстальнікам) набор слоў ужываецца ў дакуменце як фраза, то многія пошукавыя сістэмы выдаюць спасылкі на такія дакументы ў пачатку вынікаў пошуку.

Некаторыя пошукавыя сістэмы пры ранжыраванні ўлічваюць колькасць наведванняў канкрэтнай web-старонкі. Пры выдачы вынікаў пошуку ў пачатку спіса ўказваюцца старонкі з больш высокім рэйтынгам.

Калі пошукавыя сістэмы ў якасці дадатковага сервісу прапаноўваюць карыстальнікам каталог інтэрнэт-рэсурсаў, то

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

web-старонка, знойдзеная па каталогу, можа атрымаць больш высокі ранг.

Асноўная праблема, з якой сутыкаецца бібліёграф (карыстальнік) пры рабоце з ПС, – гэта атрыманне вялікай колькасці нерэлевантных дакументаў. Старонкі, якія атрымліваюць высокі ранг, неабавязкова змяшчаюць сапраўды патрэбную для карыстальніка інфармацыю. Адным са шляхоў павышэння рэлевантнасці вынікаў пошуку з'яўляецца выкарыстанне зваротнай сувязі. У большасці развітых ПС гэтая функцыя рэалізуецца з дапамогай спасылкі "More like this" (у расійскіх пошукавых сістэмах – "найти похожие страницы/сайты"), якая суправаджае кожны знойдзены дакумент. Бібліёграфам (карыстальнікам) таксама прапаноўваецца магчымасць правядзення ўдакладняльнага пошуку. Як правіла, для гэтага неабходна памеціць адпаведную опцыю "Search within these results" (у расійскіх пошукавых сістэмах – «искать в найденном»).

Выкарыстанне ўказаных метадаў ранжыравання і функцыі зваротнай сувязі з'яўляецца частковым вырашэннем праблемы павышэння эфектыўнасці і дакладнасці пошуку. Вельмі часта карыстальнік аказваецца перад неабходнасцю ўручную фільтраваць вялікія спісы знойдзеных дакументаў. Бібліёграфам, спецыялістам інфармацыйнага пошуку, каб палепшыць вынікі пошуку, трэба выкарыстоўваць магчымасці вар'іраваць фармулёўкі запыту.

Пры вывадзе вынікаў пошуку, акрамя спіса спасылак, бібліёграф (карыстальнік) атрымлівае разнастайную дадатковую інфармацыю, указанне на тое, якая колькасць дакументаў па запыце знойдзена ў базе ПС. Прычым у большасці выпадкаў ПС выдаюць толькі першыя 200 рэлевантных дакументаў. Колькасць спасылак, якая выводзіцца на адну старонку, як правіла, хістаецца ад 10 да 20. ПС дазваляюць змяняць гэтую настройку або на старонцы пашыранага пошуку, або на старонцы стварэння ўстановак пошуку.

Форма прадастаўлення вынікаў пошуку будуецца па пэўнай схеме, якая часцей за ўсё складаецца з загалоўка дакумента, першых радкоў тэксту і URL-дакумента (электроннага адраса). З дадатковых звестак могуць прысутнічаць дата апошняга аднаўлення старонкі, яе памер у кілабайтах, спасылка на адпаведную рубрыку каталога інтэрнэт-рэсурсаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі пошуку часцей за ўсё выводзяцца па ступені рэлевантнасці і радзей па даце ці алфавіце знойдзеных дакументаў. Дзве апошнія формы выкарыстоўваюцца ў якасці дадатковых. Многія ПС прадстаўляюць толькі адну рэлевантную старонку з пэўнага сайта. Калі карыстальніку патрэбна пазнаёміцца з астатнімі дакументамі, ён павінен звярнуцца да спасылкі “More results from this site” (у пошукавых сістэмах на рускай мове – спасылка “другие документы”).

*Віртуальнае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.* Актыўнае ўкараненне і выкарыстанне інэрнет-тэхналогій прывяло да таго, што ў агульнай структуры карыстальнікаў паступова склалася новая група, для абазначэння якой выкарыстоўваецца тэрмін “віртуальныя”, ці “аддаленыя”, карыстальнікі. Значная колькасць такіх карыстальнікаў не толькі звяртаюцца да сайтаў бібліятэк з мэтай пошуку інфармацыі і дакументаў, але і з запытамі даведачна-бібліяграфічнага характару. Развіццё віртуальных камунікатыўных зносін з дапамогай сучасных праграмна-тэхнічных сродкаў паўплывала на вылучэнне асобнага напрамку ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, што атрымала назву электроннае, або віртуальнае, даведачнае абслугоўванне, якое вызначаецца як перадача па сетцы даведачных і навучальных паслуг усім карыстальнікам бібліятэкі ў любы час незалежна ад іх месцазнаходжання.

Выдзяляюцца тры асноўныя кірункі электроннага даведачнага абслугоўвання:

– абслугоўванне карыстальнікаў праз электронную пошту;

– абслугоўванне карыстальнікаў у рэжыме рэальнага часу на аснове chat-тэхналогій, а таксама відэа- і тэлеканферэнцый;

– поўнасцю аўтаматычнае прадастаўленне інфармацыі ў адказ на запыты карыстальнікаў на падставе выкарыстання спецыяльна арганізаваных баз ведаў/БД выкананых запытаў.

Два першыя кірункі ўяўляюцца традыцыйнымі па змесце. Іх асаблівасць у тым, што для іх выканання выкарыстоўваюцца сучаснае праграмнае забеспячэнне і сродкі сувязі. Так, даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне або непасрэдна праз электронную пошту, або на падставе web-формаў запытаў, прадстаўленых на сайтах бібліятэк, з’яўляецца перанясеннем выканання пісьмовых запытаў у новае электроннае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асяроддзе. Web-формы запытаў уключаюць набор стандартных палёў, запоўніўшы якія, карыстальнік прадстаўляе максімальна поўную інфармацыю аб запыце, дазваляючы звесці да мінімуму абмен паведамленнямі паміж бібліёграфам і карыстальнікам для высвятлення сутнасці інфармацыйнага запыту (распрацаваны і выстаўляюцца спецыяльныя web-формы, прызначаныя для тэматычных, адрасна-бібліяграфічных запытаў).

Chat-абслугоўванне ў рэжыме рэальнага часу, якое базіруецца на выкарыстанні спецыяльнага праграмнага забеспячэння, дазваляе кіраваць двухбаковым узаемадзеяннем "карыстальнік–бібліёграф", уяўляецца аналагам абслугоўвання карыстальнікаў на бібліяграфічным пункце.

Прынцыпова новай з'явай у даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні стала прадастаўленне карыстальнікам БД запытаў/адказаў для самастойнага аўтаматызаванага пошуку пры поўнай адсутнасці зносін "карыстальнік–бібліёграф". Усе тры кірункі актыўна развіваюцца за мяжой, асабліва ў навуковых бібліятэках, якія ствараюць комплексныя віртуальныя службы. Работа па стварэнні віртуальных даведачных службаў пачалася і ў буйных бібліятэках нашай краіны. Першай такую службу арганізавала НББ і праз свой сайт прадастаўляе магчымасці выканання запытаў розных тыпаў.

Для арганізацыі электроннага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання бібліятэкі на сваіх web-сайтах ствараюць раздзел "Запытай у бібліятэкара" (Ask a librarian). Гэтая назва азначае віртуальныя службы, якія адказваюць на запыты карыстальнікаў або шляхам пераадрасацыі іх да адпаведных анлайнавых або друкаваных крыніц інфармацыі, або прадстаўляюць гатовую фактаграфічную і бібліяграфічную інфармацыю. Службы тыпу "Ask a..." функцыянуюць у web-асяроддзі, у аснове іх дзейнасці ляжыць узаемадзеянне "карыстальнік–пасрэднік". У якасці пасрэднікаў выступаюць як бібліятэчныя спецыялісты, так і спецыялісты пэўных галін ведаў, чые прафесійныя веды могуць быць выкарыстаны пры выкананні запытаў ("Ask a Scientist", "Ask a Linguist", "Ask the experts" і інш.).

У апошнія гады намецілася тэндэнцыя аб'яднання такіх службаў у кансорцыумы і карпаратыўныя аб'яднанні, якія дазваляюць ажыццяўляць цэнтралізаванае электроннае даве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з размеркаваным характарам выканання запытаў карыстальнікаў. У аснове аб’яднання – прыналежнасць да таго ці іншага тыпу бібліятэк, склад карыстальнікаў, прафесійная спецыялізацыя персаналу. Карпаратыўны падыход абумоўлены ў асноўным тым, што ў большасці выпадкаў ні адна бібліятэка не ў стане ў сувязі з абмежаванасцю персаналу забяспечыць работу віртуальнай даведачнай службы ў часавым рэжыме “24/7”. Акрамя таго, работа ў рамках карпарацыі дазваляе накіраваць запыты карыстальнікаў менавіта ў тыя бібліятэкі, чые фонды і калекцыі, а таксама ўзровень прафесійнай кваліфікацыі персаналу найбольш адпавядаюць канкрэтнаму запыту.

Нягледзячы на інтэнсіўнае развіццё электроннага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, спецыялісты адзначаюць, што яно з’яўляецца пакуль толькі дапаўненнем да традыцыйнага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, але яго не замяняе.

### *Пытанні і заданні*

1. Якія асноўныя элементы даведачнага бібліяграфічнага абслугоўвання? Калі разглядаць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне як від дзейнасці, то як бы вы змаглі ахарактарызаваць яго асноўныя элементы?
2. Па якіх крытэрыях вызначаецца эфектыўнасць даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання?
3. Для чаго неабходна класіфікацыя даведак?
4. Параўнайце традыцыйную і аўтаматызаваную тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, вызначце іх асаблівасці.
5. Вызначце і абгрунтуйце фактары, якія сведчаць аб павышэнні значэння даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў дзейнасці бібліятэк на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел V. ФАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СПАЖЫЎЦОЎ ІНФАРМАЦЫІ

## Глава 10. Агульныя пытанні фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі

Адным з важнейшых кірункаў дзейнасці бібліятэк усіх тыпаў традыцыйна з'яўляецца прапаганда бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў. У апошнія гады адбываецца трансфармацыя работы бібліятэкі па прапагандзе бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў у такі кірунак, як фарміраванне інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Гэта звязана з працэсамі інфарматызацыі грамадства, асэнсаваннем ва ўсім свеце фундаментальнай ролі новых інфармацыйных тэхналогій у грамадскім развіцці, разглядам, вывучэннем у шырокім сацыякультурным кантэксце такіх феноменаў, як інфармацыя, інфармацыйнае грамадства, інфарматызацыя адукацыі, іншых сфер грамадскага жыцця і г.д. У гэтых умовах праблема фарміравання інфармацыйнай культуры асобы набывае новае значэнне.

Разгляд суадносін традыцыйнага кірунку бібліяграфічнай дзейнасці, які яшчэ і сёння ў планах работы і справаздачных дакументах бібліятэкі вызначаецца як прапаганда бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў і фарміравання інфармацыйнай культуры, паказвае адрозненне саміх азначэнняў паняццяў і іх зместавай напаўняльнасці. Тэрмін "прапаганда" азначае "распаўсюджванне ... ідэй з мэтай асветы, выхавання і арганізацыі мас"; канцэпцыя фарміравання інфармацыйнай культуры прадугледжвае спалучэнне мэтанакіраванага, планамерна і сістэматычна ажыццяўляемага працэсу інфармацыйнага навучання кожнага грамадзяніна ў адпаведнасці з прынятай у краіне сістэмай агульнага і прафесійнага навучання з дзейнасцю розных суб'ектаў сістэмы дакументных камунікацый па стварэнні ўмоў і правядзенні спецыяльных мерапрыемстваў, накіраваных на авалоданне спажыўцамі ведамі, уменнямі і навыкамі работы з інфармацыяй.

Гістарычна працэс фарміравання інфармацыйнай культуры пачынаўся з засваення бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці, неабходнай для падрыхтоўкі кваліфікаванага карыстальніка, які б лёгка арыентаваўся ў фондзе і ДБА бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адпаведна зместам навучання з'яўлялася перадача ведаў і фактычных звестак аб структуры і складзе фонду, каталогах, бібліяграфічных дапаможніках, аб правілах бібліяграфічнага апісання і афармлення патрабаванняў на літаратуру.

С цягам часу паглыбляліся і станавіліся больш разнастайнымі ІП карыстальнікаў. Ускладненне інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці карыстальнікаў за кошт неабходнасці выкарыстання ўсё больш шырокага кола крыніц, звароту ў іншыя бібліятэкі і цэнтры інфармацыі для атрымання патрэбных звестак, літаратуры выклікалі патрэбнасць у ведах аб існуючай інфармацыйнай прадукцыі і паслугах, магчымасцях МБА і ММБА.

У 60-я гг. ХХ ст. пачаліся актыўнае даследаванне чытання як складанейшага сацыяльна-псіхалагічнага працэсу, пошук шляхоў яго рацыяналізацыі і павышэння эфектыўнасці. З'явілася неабходнасць гаварыць ужо не аб бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці, а аб культуры чытання, пад якой сталі разумець веды, уменні і навыкі, неабходныя чытачу для паўнацэннага выбару, успрымання і разумення прачытанага твора друку. Гэта прадугледжвала веданне чытачом правіл карыстання бібліятэкамі; асэнсаваны выбар тэматыкі чытання; арыентацыю ў крыніцах, у тым ліку і ДБА бібліятэкі; сістэматычнасць і паслядоўнасць чытання, уменне выбраць канкрэтную кнігу; веданне правіл гігіены чытання; валоданне прыёмамі рацыянальнага чытання, якія забяспечваюць арыентацыю ў кнізе, засваенне і глыбокае разуменне прачытанага; уменне выкарыстоўваць на практыцы атрыманую інфармацыю, якую знайшлі ў розных крыніцах; валоданне прыёмамі канспектавання, рэферыравання і інш.

Выкарыстанне ў паўсядзённым жыцці тэхнічных сродкаў, прымяненне новай інфармацыйнай тэхнікі і тэхналогіі выклікалі да жыцця такое паняцце, як "камп'ютэрная пісьменнасць", пад якой сталі разумець веды, уменні і навыкі працы з камп'ютэрамі з мэтай жыццядзейнасці ў грамадстве, заснаваным на інфармацыі.

Хуткія тэмпы развіцця новых інфармацыйных тэхналогій, пераход да інфармацыйнага грамадства абумовілі шырокае выкарыстанне ў сярэдзіне 90-х гг. ХХ ст. такога тэрміна, як "інфармацыйная культура".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння існуе шматлікая колькасць азначэння паняццяў "інфармацыйная культура", "інфармацыйная пісьменнасць". Так, пад інфармацыйнай пісьменнасцю прапануецца разумець сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, якія дазваляюць спажыўцу самастойна выяўляць і выкарыстоўваць інфармацыю ў мэтах задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей. Пад інфармацыйнай культурай маецца на ўвазе ўзровень, які дазваляе чалавеку не толькі свабодна арыентавацца ў інфармацыйным асяроддзі, але і ўдзельнічаць у яго фарміраванні і пераўтварэнні, садзейнічаць інфармацыйнаму ўзаемадзеянню.

Часта ў спецыяльным друку можна сустрэць атаясамліванне паняццяў "інфармацыйная культура" і "бібліятэчна-бібліяграфічныя веды" (або "камп'ютэрная пісьменнасць"). Але па сваёй зместавай напаўняльнасці паняцце "інфармацыйная культура" больш шырокае, яно не толькі ўключае бібліятэчна-бібліяграфічную пісьменнасць, культуру чытання і камп'ютэрную пісьменнасць, але і прадугледжвае авалоданне чалавекам цэлым комплексам дадатковых ведаў, уменняў і навыкаў, у тым ліку веды аб прыродзе і сутнасці інфармацыі, яе асноўных характарыстыках, формах існавання, грамадскіх функцыях, асаблівасцях інфармацыйных камунікацый. Яно ўключае і веды аб тым, што сабой уяўляе працэс інфарматызацыі, якія спецыфічныя асаблівасці інфармацыйнага грамадства і як яны ўплываюць на жыццё кожнай асобы; арыентацыю ў прававых нормах, звязаных з распаўсюджваннем і выкарыстаннем інфармацыі, даступнасцю яе, аховай інтэлектуальнай уласнасці, інфармацыйнай бяспекай і інш.; арыентацыю ў сукупных інфармацыйных рэсурсах як электронных, так і традыцыйных (фондах і ДБА бібліятэк, архіваў, бібліяграфічных, фактаграфічных і паўнатэкставых БД і інш.); уменне фарміраваць уласныя пошукавыя сістэмы; здольнасці выкарыстоўваць фармальныя і нефармальныя каналы камунікацыі для атрымання неабходнай інфармацыі; здольнасці да інфармацыйных зносін, гатоўнасць самому выступаць у ролі кансультанта, актыўнага распаўсюджвальніка новых ведаў.

Н.Б.Зіноўева лічыць, што змест інфармацыйнай культуры, яе асэнсаванае і мэтанакіраванае фарміраванне ўключаюць некалькі ўзроўняў: светапоглядны; маральны; псіхалагічны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйна-прававы; камунікатыўны; кніжны, чытацкі; бібліяграфічны; лексічны і інфармацыйна-тэхнічны. Так, фарміраванне светапогляднага ўзроўню павінна быць накіравана на гарманізацыю ўнутранага свету чалавека шляхам пазнання ім законаў і заканамернасцей распаўсюджвання інфармацыі ў грамадстве, уздзеяння яе на асобу, тэарэтычнае асэнсаванне ролі інфармацыі ў кантэксце культуры. Маральны ўзровень звязаны з выхаваннем у кожнага асабістай адказнасці за распаўсюджванне інфармацыі, фарміраванне прынцыпаў і перакананняў, якія б перашкаджалі распаўсюджванню сацыяльна-дэструктыўнай інфармацыі, дэзінфармацыі, маніпуліраванню свядомасцю людзей. У псіхалагічным аспекце фарміраванне інфармацыйнай культуры заключаецца ў выпрацоўцы аптымальнай рэакцыі на паступаючую інфармацыю і адэкватных паводзін асобы, уменняў дзейнічаць ва ўмовах залішняй інфармацыі, ацэньваць якасны бок інфармацыі, адбіраць з масы звестак верагодныя, дакладныя, суадносіць іх з інфармацыяй, якая маецца, крытычна пераасэнсоўваць, згортваць і разгортваць, выпрацоўваць навыкі псіхагігіены ўспрымання інфармацыі, рацыянальныя звычкі, якасці асобы для абароны ад інфармацыйнага шуму. У сацыяльным аспекце фарміраванне інфармацыйнай культуры заключаецца ў выпрацоўцы сацыяльна неабходнага ўзроўню інфармаванасці, што выступае абавязковай умовай сацыялізацыі і выканання шматлікіх задач у грамадстве. Камунікатыўны бок павінен спрыяць фарміраванню культуры зносін, культуры перадачы інфармацыі; інтэлектуальны – выпрацоўцы ўменняў працы з інфармацыйнымі крыніцамі і афармленню атрыманых вынікаў; лексічны – удасканаленню мовы пісьма, разуменню і выкарыстанню аўтарскіх тэкстаў і інш.

Усе кампаненты інфармацыйнай культуры з’яўляюцца ўзаемазвязанымі і ўзаемаабумоўленымі. Перавага якога-небудзь з іх у структуры інфармацыйнай культуры асобы негатыўна адбіваецца на яе агульным узроўні. Так, дамінаванне бібліяграфічнага кампанента пры адсутнасці іншых (напрыклад, кніжнага, лексічнага, інтэлектуальнага) зробіць фарміраванне інфармацыйнай культуры бессэнсоўным, таму што ёй пры такім падыходзе па сутнасці няма чаго рэгуляваць. Фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы з дамінаваннем тэхналагічнага кампанента (з акцэнтам на камп’ютэрную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісьменнасць) яшчэ больш небяспечна па сваіх выніках. Неразвітасць іншых кампанентаў (светапогляднага, маральнага, інфармацыйна-прававога) пры наяўнасці тэхналагічных ведаў можа прывесці да выкарыстання гэтых ведаў і ўменняў у сацыяльна-дэструктыўных мэтах.

Таксама трэба мець на ўвазе тым, хто займаецца фарміраваннем інфармацыйнай культуры асобы, што недапушчальным з'яўляецца шлях фарміравання яе толькі на ўзроўні ведаў і ўменняў. Сёння актуальным з'яўляецца фарміраванне інфармацыйнай свядомасці, інфармацыйных паводзін, інфармацыйнага светапогляду, гэта значыць фарміраванне асобы, якую характарызуе высокі ўзровень інфармацыйнай культуры.

Састаўной часткай інфармацыйнай культуры з'яўляецца бібліяграфічная культура, якая прадугледжвае сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў працы асобы з другасна-дакументальнай (бібліяграфічнай) інфармацыяй. Змест работы бібліятэкі па фарміраванні асобы высокага ўзроўню бібліяграфічнай культуры павінен заключацца ў фарміраванні ў спажыўца ўяўленняў аб ролі, функцыях, формах існавання бібліяграфічнай інфармацыі; наменклатуры бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, якія прапануюць на інфармацыйным рынку розныя суб'екты сістэмы дакументных камунікацый; фарміраванні ўменняў і навыкаў успрымаць бібліяграфічную інфармацыю, самастойна ажыццяўляць бібліяграфічныя працэсы і аперацыі, накіраваныя на пошук бібліяграфічнай інфармацыі, ствараць бібліяграфічныя прадукты ў выглядзе бібліяграфічных запісаў, дапаможнікаў, каталогаў і картатэк, бібліяграфічных баз даных, перапрацоўваць вынікі бібліяграфічнай дзейнасці, перадаваць бібліяграфічную інфармацыю для калектыўнага карыстання і інш.

У сучасных умовах значная ўвага павінна надавацца знаёмству спажыўцоў інфармацыі з аддаленымі бібліяграфічнымі, даведачнымі, фактаграфічнымі рэсурсамі, магчымасцямі пошуку інфармацыі па камп'ютэрных сетках (лакальных, рэгіянальных, сусветных), выяўленню інфармацыі пры аддаленым доступе і яе адборы, знаёмстве з новымі відамі інфармацыйных, бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, якія можа прадаставіць бібліятэка з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій. Надзвычай актуальнымі з'яўляюцца пытанні, звязаныя з вывучэннем пошукавых сістэм і даведнікаў інтэрнета.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння задачу фарміравання інфармацыйнай, у тым ліку і бібліяграфічнай, культуры спажыўцоў трэба разглядаць як задачу дзяржаўнай значнасці. Гэта абумоўлена шэрагам аб'ектыўных фактараў.

Па-першае, інфармацыйная культура – гэта спосаб жыццядзейнасці чалавека ў інфармацыйным грамадстве. 70% працоўнага насельніцтва занятыя ў ЗША ў інфармацыйных сферах. Але нават больш значна тое, што інфармацыйная культура – гэта падмурак здольнасці асобы самастойна нарошчваць недастатковыя веды: агульнакультурныя, прафесійныя, звязаныя са светам захапленняў, з паўсядзённым жыццём. Становіцца ўсё больш відавочным, што з развіццём цывілізацыі людзі без адукацыі, якія не валодаюць навыкамі самастойна вучыцца і перавучвацца, выцясняюцца за межы жыцця, дастойнага для чалавека. Праблемы вырашэння пытанняў фарміравання сістэмы бесперапыннай адукацыі насельніцтва, карэнныя змены ў сістэме адукацыі з арыентацыяй на самастойную працу навучэнцаў, развіццё сацыяльнага, тэхнічнага прагрэсу, перабудова эканомікі – непасрэдна залежаць ад узроўню інфармацыйнай культуры асобы (грамадства).

Па-другое, больш высокай інфармацыйнай падрыхтоўкі асобы патрабуе развіццё міжнародных навуковых, вытворчых, культурных сувязей.

Па-трэцяе, развіццё інфармацыйных патокаў, змены ў носьбітах інфармацыі, тэхналогіі прадастаўлення інфармацыі патрабуюць пастаяннага аднаўлення і папаўнення інфармацыйных ведаў, уменняў і навыкаў.

Сёння, паводле вынікаў сацыялагічных даследаванняў, адзначаецца ўсё яшчэ невысокі ўзровень інфармацыйнай культуры насельніцтва. Адна з прычын нізкага ўзроўню інфармацыйнай культуры ў краіне – недастатковы ўзровень агульнай інфарматызацыі грамадства, а самае галоўнае – адсутнасць належнай увагі да пытанняў фарміравання інфармацыйнай культуры будучых спецыялістаў ва ўсіх структурах сістэмы адукацыі. Патрэбны распрацоўка і прыняцце на дзяржаўным узроўні канцэпцыі і праграмы інфармацыйнай падрыхтоўкі насельніцтва (навучэнцаў, студэнтаў, спецыялістаў) ці вылучэнне спецыяльнага раздзела ў праграме па інфарматызацыі грамадства, прысвечанага інфармацыйнай падрыхтоўцы карыстальнікаў інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне інфармацыйнай культуры пачынаецца ў сям'і, да яго падключаюцца школа, сярэднія спецыяльныя, вышэйшыя навучальныя ўстановы, сродкі масавай інфармацыі, розныя суб'екты сістэмы дакументных камунікацый, а затым яно працягваецца ўсё жыццё.

Украінскія спецыялісты прапаноўваюць весці навучанне інфармацыйнай пісьменнасці ў адпаведнасці з прынятай сістэмай агульнага і прафесійнага навучання – ад школы да дактарантуры. Для вучняў 1–3-х класаў прапануецца распрацаваць вучэбную праграму "Асновы інфармацыйнай пісьменнасці школьніка", але выкладаць яе не шляхам увядзення спецыяльнай дысцыпліны, а ажыццяўляць у рамках выкладаемых прадметаў, пазакласнай работы. Для вучняў 5–8-х класаў прапануецца ўвесці спецыяльную вучэбную дысцыпліну "Інфармацыйная пісьменнасць школьніка", накіраваную на авалоданне пачатковымі ведамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій. Для вучняў старшых класаў мэтазгодна ўвесці курс "Інфармацыйная культура школьніка". Усе гэтыя прадметы павінны выкладацца паралельна з курсам інфарматыкі. У ВНУ таксама прапануецца ўвесці дзве дысцыпліны – на першых курсах "Асновы інфармацыйнай культуры", а з 3-га курса – "Інфармацыйная культура спецыяліста".

Даследаванні выкладчыкаў Кемераўскай дзяржаўнай акадэміі культуры і мастацтваў прывялі да высновы, што рэальнае павышэнне інфармацыйнай культуры грамадства магчыма толькі пры арганізацыі спецыяльнай інфармацыйнай адукацыі, у прыватнасці шляхам уключэння ў навучальны працэс адукацыйных устаноў у якасці абавязковага курса "Асновы інфармацыйнай культуры асобы". Прычым гэты курс разглядаецца як інтэграваная вучэбная дысцыпліна, якая павінна спалучаць у непарыўным адзінстве поспехі традыцыйнай, пераважна кніжнай, бібліятэчна-бібліяграфічнай культуры з культурай, якая базіруецца на дасягненнях новых інфармацыйных тэхналогій.

Трэба адзначыць, што менавіта так у арганізацыйным плане прадугледжвалася і пабудова сістэмы бібліяграфічнага навучання ў нашай краіне, значную ролю ў фарміраванні якой адыграла пастанова ЦК КПСС 1974 г. "О повышении роли библиотек в коммунистическом воспитании трудящихся и научно-техническом прогрессе". Пэўны вопыт у гэтым

кірунку назапашаны ў Беларусі. Значную ролю ў арганізацыі такой работы, яе ажыццяўленні, распрацоўцы праграмна-метадычнага забеспячэння адыгралі бібліятэкі. У многіх школах, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, ВНУ гэтая работа праводзіцца бібліятэкамі і сёння. Але ёй патрэбныя новы імпульс, стварэнне стройнай сістэмы інфармацыйнага навучання кожнага грамадзяніна, перагляд зместу, формаў, падыходаў да гэтага кірунку дзейнасці.

Роля бібліятэк у фарміраванні бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры не зніжаецца, наадварот, набывае новае значэнне, павышаюцца яе актуальнасць, значнасць. Бібліятэка выступае як спецыфічная арганізацыя, якая аб’ядноўвае задачы і функцыі інфармацыйнай, культурна-асветніцкай і адукацыйнай установы. Таму ў параўнанні з іншымі суб’ектамі сістэмы дакументных камунікацый яна мае магчымасці не толькі забяспечыць доступ да інфармацыі, але і арганізаваць, ажыццяўляць культурна-адукацыйную дзейнасць, накіраваную на фарміраванне ў карыстальнікаў культуры новага тыпу – інфармацыйнай. Бібліятэка таксама садзейнічае фарміраванню інфармацыйнай культуры іншых суб’ектаў, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні інфармацыйнай культуры грамадства, сацыяльных груп, асобы – бацькоў, выхавацеляў дзіцячых садкоў, настаўнікаў, выкладчыкаў і інш. Менавіта бібліятэкі маюць магчымасць комплекснага падыходу да фарміравання сучаснага ўзроўню інфармацыйнай культуры, якая ўбірае ў сябе ўсе формы, тыпы інфармацыйнай культуры: вусныя, дакументныя, электронныя. Унікальнасць дзейнасці бібліятэкі заключаецца і ў тым, што яна мае сродкі і метады карэкціроўкі і кіравання працэсам фарміравання інфармацыйнай культуры асобы з улікам ужо існуючага ўзроўню шляхам канструявання індывідуальнай інфасферы асобы ў межах міжасобасных зносін бібліятэкара і індывіда; дае магчымасць спалучаць пазнавальную і практычную інфармацыйную дзейнасць асобы ў адпаведнасці з яе патрэбнасцямі.

Асэнсаванне значнасці гэтай праблемы прыводзіць да арганізацыі ў бібліятэках спецыяльных падраздзяленняў, класаў для інфармацыйнага, бібліяграфічнага навучання спажыўцоў інфармацыі. Такія класы працуюць ва універсітэтах, публічных бібліятэках ЗША. У большасці бібліятэк нашай краіны за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыю гэтай работы адказваюць бібліяграфічныя аддзелы бібліятэкі, прымаюць у ёй удзел усе аддзелы, якія вядуць абслугоўванне карыстальнікаў. У абласных бібліятэках у апошнія гады адной з функцый аддзелаў інфармацыйных рэсурсаў, новых інфармацыйных тэхналогій стала падрыхтоўка карыстальнікаў да работы з інтэрнет-рэсурсамі, авалодання камп'ютэрнай графікай, тэхналогіяй стварэння ўласных web-сайтаў. Паводле прагнозаў спецыялістаў, сёння ўзрастае патрэбнасць бібліятэк менавіта ў бібліятэкарах, бібліёграфах–кансультантах, арыентаваных на работу па бібліяграфічнай, інфармацыйнай падрыхтоўцы карыстальнікаў.

Калі вызначаць задачы бібліятэк у сістэме фарміравання бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры кожнай асобы нашага грамадства, то трэба адзначыць, што супрацоўнікі бібліятэкі павінны:

– выступаць ініцыятарамі, арганізатарамі і выканаўцамі арганізаванага навучання розных катэгорый спажыўцоў інфармацыі ў ходзе навучальнага працэсу;

– ствараць інфармацыйнае асяроддзе ў бібліятэцы, якое накіравана на фарміраванне інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі;

– ажыццяўляць мэтанакіраванае бібліяграфічнае, інфармацыйнае навучанне шляхам правядзення сістэмы спецыяльных мерапрыемстваў;

– ажыццяўляць штодзённыя зносіны з карыстальнікамі, якія павінны быць арыентаваны на пастаянную перадачу і засваенне карыстальнікамі бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў.

Пад інфармацыйным асяроддзем трэба разумець сукупнасць максімальна спрыяльных (зручных) умоў задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей кожнага карыстальніка, які прыйшоў у бібліятэку. Камфортнасць інфармацыйнага асяроддзя забяспечваецца інтэлектуальнай і фізічнай даступнасцю інфармацыі; наяўнасцю метаінфармацыі, якая дапамагае карыстальніку арыентавацца як у бібліятэцы, так і яе асобных падраздзяленнях, дапамагае атрымаць звесткі аб асартыменце бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, асартыменце і даступнасці БД (шляхам афармлення стэндаў, плакатаў, схем размяшчэння структурных падраздзяленняў, падрыхтоўкі даведнікаў, памятак і інш.). Гэтая інфармацыя дапамагае кары-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стальніку арыентавацца ў дакументах (напрыклад, з дапамогай спецыяльных закладак або колеру супервокладкі выдзяляюцца на паліцы кнігі для пэўнага ўзросту або новыя кнігі; у найбольш цікавыя кнігі ўкладваюцца рэкламныя матэрыялы, інфармацыя аб аўтары кнігі або лістоўкі “Што чытаць далей”). Сёння ў бібліятэках шырока выкарыстоўваюцца прыёмы мнемамеханікі (спецыяльныя прыёмы, пабудаваныя на замацаванні асацыятыўных вобразаў, сувязей), якія аблягчаюць запамінанне магчыма большай колькасці звестак, фактаў, заснаваных галоўным чынам на законах асацыяцый, напрыклад мнеманічныя знакі розных службаў бібліятэкі, лагатыпы. Камфортнасць інфармацыйнага асяроддзя забяспечваецца таксама падрыхтаванасцю і добразычлівасцю бібліятэчнага персаналу і матэрыяльна-тэхнічным камфортам.

Не страчваюць свайго значэння і сёння распрацаваныя ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве асноўныя прынцыпы фарміравання бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры спажыўцоў, метадычныя падыходы да гэтай работы.

Працэс фарміравання бібліяграфічнай культуры, як і ўсякі іншы працэс навучання, грунтуецца на наступных дыдактычных прынцыпах:

– навуковага падыходу да фарміравання бібліяграфічнай культуры, якое павінна весціся з улікам навейшых дасягненняў бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства, кнігазнаўства і інфарматыкі, а таксама такога новага навуковага кірунку, як інфармацыйная культура асобы;

– сістэматычнасці, бесперапыннасці і паслядоўнасці (пераемнасці) фарміравання бібліяграфічнай культуры. Прынцып сістэматычнасці прадугледжвае вывучэнне бібліяграфічнай складаючай з іншымі кампанентамі інфармацыйнай культуры (камунікатыўнай, кніжнай, інфармацыйна-тэхнічнай, інфармацыйна-прававой, маральнай, светапогляднай і інш.). Ён таксама прадугледжвае неабходнасць уліку таго факта, што павінна быць пэўная сістэма ў фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў: школа – сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, ВНУ, навучанне чытачоў сталага ўзросту (спецыялістаў). Гэта ў сваю чаргу патрабуе пераемнасці ў змесце навучання, распрацоўкі праграм такім чынам, каб яны не паўтаралі адна адну, а развівалі веды асобы з улікам яе новага сацыяльнага, прафесійнага становішча, узросту, мэтавай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіраванасці звяртання да інфармацыі, фарміравалі сістэмнае ўяўленне аб інфармацыйнай карціне свету;

– сувязі тэорыі з практыкай. Вопыт работы бібліятэк паказаў, што найбольш эфектыўным з'яўляецца навучанне чытачоў, пры якім тэорыя і методыка пошуку літаратуры спалучаюцца з непасрэднымі практычнымі заняткамі;

– нагляднасці. Вядома, што прыблізна 90% інфармацыі чалавек успрымае праз зрокавыя каналы, таму наглядныя вобразы дазваляюць больш паспяхова і трывала засвойваць вывучаемы матэрыял;

– даступнасці, адпаведнасці вывучаемага матэрыялу ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў, апоры на вядучы тып дзейнасці, характэрны для пэўнага ўзросту; адпаведнасці выкарыстоўваемых матадычных прыёмаў, мовы зносін з навучэнцамі падчас заняткаў асаблівасцям узроставай псіхалогіі ўспрымання і засваення матэрыялу;

– дыферэнцыраванага падыходу да фарміравання бібліяграфічнай культуры розных катэгорый спажыўцоў інфармацыі з улікам іх узроставых, сацыяльных, прафесійных прымет, мэт чытання, а таксама з улікам наяўных бібліятэчнабібліяграфічных і інфармацыйных ведаў. У залежнасці ад катэгорыі карыстальнікаў, вылучаных па розных прыметах, рыхтуюцца праграмы бібліяграфічнага навучання для розных катэгорый, вызначаюцца змест навучання, формы і метады, метадычныя прыёмы, напрамкі ўзаемадзеяння з іншымі бібліятэкамі і небібліятэчнымі ўстановамі;

– свядомасці, актыўнасці навучэнцаў у бібліятэцы. Пры арганізацыі работы па фарміраванні бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў неабходна фарміраваць матывацыю на засваенне прапануемага матэрыялу, выкарыстоўваць сродкі, метадычныя прыёмы, скіраваныя на развіццё прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці карыстальнікаў, актыўнае засваенне матэрыялу. Бібліёграф павінен імкнуцца дапамагчы карыстальнікам асэнсаваць, што авалоданне імі бібліяграфічнай культурай робіць іх больш упэўненымі, больш падрыхтаванымі для любога віду пазнавальнай, практычнай, навуковай і іншых відаў дзейнасці, забяспечвае падрыхтаванасць да жыцця ў інфармацыйным грамадстве. Фарміраванне ўстойлівай матывацыі немагчыма без зацікаўленага выкладання з боку бібліёграфа, выкарыстання розных формаў, у тым ліку і гульнёвых, нетрадыцыйных і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод метадычных патрабаванняў да арганізацыі і зместу гэтай работы выдзяляюцца наступныя. Пры вызначэнні зместу бібліяграфічнага, інфармацыйнага навучання акцэнт патрэбна рабіць не на крыніцазнаўчую падрыхтоўку спажыўцоў інфармацыі, а на метадычную; трэба не старацца рыхтаваць са спажыўцоў інфармацыі бібліятэкараў, бібліёграфаў, а вызначаць змест ведаў, уменняў і навыкаў, якія неабходны менавіта для дадзенай катэгорыі спажыўцоў (дзеля гэтага патрэбна распрацоўка спецыяльнага праграмна-метадычнага забеспячэння гэтай работы). Змест навучання павінен пастаянна ўзбагачацца, актуалізавацца ў адпаведнасці з тымі зменамі, якія адбываюцца ў сістэме дакументных, інфармацыйных камунікацый; работа па фарміраванні інфармацыйнай культуры розных катэгорый спажыўцоў павінна праводзіцца сумесна бібліятэкамі з адміністрацыяй навучальных устаноў, выкладчыкамі, іншымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый. Неабходна ўлічваць выніковасць, эфектыўнасць работы ў дадзеным кірунку, звязаную з вызначэннем узроўню бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Для правядзення гэтай работы павінны быць спецыяльна падрыхтаваныя кадры бібліятэкараў-бібліёграфаў, але і кожны супрацоўнік бібліятэкі павінен валодаць методыкай фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў у сувязі з тым, што гэтая работа вядзецца як падчас спецыяльна запланаваных мерапрыемстваў, так і штодзённа ў форме парад, рэкамендацый пры абслугоўванні спажыўцоў, іх звяртанні за бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогай.

Адной з актуальных праблем работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры з’яўляецца вызначэнне эфектыўнасці гэтай работы. Як паказвае вопыт, з боку бібліятэк больш увагі надаецца зместу, формам і метадам работы і значна менш – вывучэнню выніковасці гэтай работы, вызначэнню ўзроўню засваення бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў. Трэба адзначыць, што да цяперашняга часу адсутнічае адзіная распрацаваная методыка вызначэння ўзроўню бібліятэчна-бібліяграфічнай культуры. Так, адзін з падыходаў, распрацаваны Л.І.Пятровай, заключаецца ў тым, што прапануецца наступны комплекс характарыстык, з дапамогай якіх можна вызначыць узровень бібліяграфічнай падрыхтаванасці карыстальнікаў:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– уменне чытача разумець і весці бібліяграфічныя запісы;

– уменне самастойна арыентавацца ў каталогах і картатэках;

– уменне карыстацца даведачнымі, бібліяграфічнымі і інфармацыйнымі выданнямі;

– уменне правільна заказваць патрэбную крыніцу;

– самастойна выконваць нескладаныя бібліяграфічныя адшуканні, арыентавацца ў фондах бібліятэкі;

– інфармаванасць чытача аб бібліятэчна-бібліяграфічных паслугах.

Для вызначэння названых характарыстык прапануецца выкарыстоўваць некалькі метадаў: апытанне чытачоў, спажыўцоў інфармацыі; аналіз чытацкіх патрабаванняў; аналіз зваротаў да дзяжурнага бібліёграфа; аналіз выкарыстання даведачных, бібліяграфічных выданняў, розных відаў бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг. Узровень бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў можна вывучаць да і пасля правядзення мерапрыемстваў па бібліяграфічным навучанні. У асобных бібліятэках для вывучэння ўзроўню бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў праводзіцца дзень суцэльнага ўліку попыту. Без ведання ўзроўню бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў навучанне карыстальнікаў будзе стыхійным, таму што толькі канкрэтныя веды дазваляюць ставіць рэальныя задачы ў правядзенні гэтай работы, адпаведна ім вызначаць змест і формы, ацэньваць работу бібліятэкі па дадзеным кірунку, адмовіўшыся ад “валу”, калі работа бібліятэкі вызначаецца толькі колькасцю мерапрыемстваў і колькасцю чытачоў, спажыўцоў інфармацыі.

Узровень інфармацыйнай культуры карыстальніка прапануецца вызначаць па наступных крытэрыях:

– уменне адэкватна фармуляваць сваю патрэбнасць у інфармацыі;

– эфектыўна ажыццяўляць пошук патрэбнай інфармацыі ва ўсёй сукупнасці інфармацыйных рэсурсаў;

– перапрацоўваць інфармацыю і ствараць якасна новую;

– весці індывідуальныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы;

– адбіраць і ацэньваць інфармацыю;

– здольнасць да інфармацыйных зносін;

– камп’ютэрная пісьменнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наогул для павышэння эфектыўнасці работы бібліятэк у гэтым кірунку патрабуюць свайго вырашэння наступныя праблемы: распрацоўка цэласнай дзяржаўнай канцэпцыі і праграмы інфармацыйнай адукацыі ў краіне; далейшая тэарэтычная распрацоўка новага навуковага кірунку – інфармацыйная культура; распрацоўка метадычных пытанняў работы розных суб’ектаў, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні інфармацыйнай культуры грамадства, асобы, у тым ліку і бібліятэк, у святле новых адукацыйных парадыгмаў, працэсаў інфарматызацыі адукацыі; падрыхтоўка вучэбнай, вучэбна-метадычнай літаратуры па дадзеным кірунку як для тых, хто навучае, так і для навучэнцаў; падрыхтоўка педагагічных і бібліятэчных кадраў для правядзення гэтай работы, якія б здолелі забяспечыць кваліфікаванае фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў інфармацыі розных узроставых і сацыяльных катэгорый.

### *10.1. Формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі*

Бібліятэкі прымаюць удзел у фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі ў ходзе арганізаванага навучання ў вучэбных установах, дзе асноўнымі формамі заняткаў з’яўляюцца лекцыі, семінары, дзелавыя і сітуацыйныя гульні, дыспуты і іншыя; у працэсе фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы. Уся сістэма інфармавання, бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання накіравана на фарміраванне інфармацыйнай, бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі, прычым адной з прагрэсіўных тэндэнцый з'яўляецца комплексны характар праводзімых мерапрыемстваў, у склад якіх уключаюцца і формы рэкламнага, прапагандысцкага, навучальнага характару, накіраваныя менавіта на пашырэнне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў. Бібліятэкай таксама праводзяцца спецыяльныя мерапрыемствы, накіраваныя непасрэдна на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Для гэтага кірунку дзейнасці бібліятэк сёння характэрны значныя трансфармацыі. Праблема заключаецца ў неабходнасці зняць разрыў паміж электронным асяроддзем і старой мадэллю абслугоўвання і падрыхтоўкі спажыўцоў. Для вырашэння гэтай праблемы патрабуюцца не толькі актуалізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зместу навучання, але і развіццё інтэрактыўных сродкаў зносін паміж бібліятэкарам і спажыўцом інфармацыі: развіццё электронных сродкаў навучання, фарміраванне такога асяроддзя, якое павінна зрабіць бібліятэку простай і транспарантнай, каб у меншай ступені ўзнікалі патрэбнасці ў спецыяльным навучанні карыстальнікаў.

У практыцы бібліятэк прымяняюцца разнастайныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Іх можна класіфікаваць па розных прыметах. У залежнасці ад аўдыторыі выдзяляюцца наступныя формы: індывідуальныя, групавыя, масавыя. Месца правядзення вызначае стацыянарныя і выязныя мерапрыемствы. У залежнасці ад спосабаў (сродкаў) перадачы і фарміравання бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў выдзяляюцца вусныя; наглядныя; у форме друкаваных выданняў; электронныя; комплексныя, якія ўяўляюць сабой сукупнасць усіх вышэйпералічаных формаў у розных спалучэннях.

*Масавыя формы* фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі адрасуюцца ўсім карыстальнікам бібліятэкі, змест іх звязаны з фарміраваннем асноў інфармацыйнай, бібліяграфічнай пісьменнасці, авалоданнем кожным чытачом правіламі карыстання бібліятэкай і яе інфармацыйнымі рэсурсамі, стварэннем умоў для самастойнай работы чытача ў бібліятэцы. Да асноўных масавых формаў бібліяграфічнага навучання адносяцца плакаты, выставы, агляды, дапаможнікі, даведнікі, інфармацыя ў СМІ, дні бібліяграфіі і інш.

Да наглядных формаў адносяцца плакаты. Яны з'яўляюцца даволі распаўсюджанай формай нагляднай прапаганды бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў. У бібліятэках выкарыстоўваюцца плакаты-даведнікі па бібліятэцы, што раскрываюць яе структуру, прызначэнне і месцазнаходжанне аддзелаў, якія вядуць абслугоўванне чытачоў; плакаты-паказальнікі размяшчэння розных частак ДБА; плакаты-схемы размяшчэння матэрыялу ў сістэматычным, прадметным каталогах, размяшчэння ДБФ і інш. Для навучання чытачоў элементарным навыкам работы ў бібліятэцы рэкамендуецца плакат-узор запаўнення патрабавання на літаратуру, афармлення заказу па МБА. Могуць выкарыстоўвацца і плакаты рэкламнага характару з інфармацыяй аб розных відах бібліяграфічных крыніц, аб выпуску новых даведачных выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобае месца ў бібліяграфічнай падрыхтоўцы спажыўцоў займаюць схемы - алгарытмы пошуку дакументаў, у якіх наглядна прадстаўлены варыянты пошуку літаратуры з выкарыстаннем усіх бібліяграфічных сродкаў. Да вартасцей гэтай формы можна аднесці нагляднасць і прастату, відавочнасць паслядоўнасці дзеянняў, магчымасць параўнальна лёгка і хутка засвойваць навыкі і прыёмы працы з рознымі бібліяграфічнымі крыніцамі – каталогамі, картатэкамі, інфармацыйнымі выданнямі. Схемы-алгарытмы пошуку інфармацыі па асабліва складаных па структуры замежных бібліяграфічных дапаможніках, даведніках у перакладах на беларускую або рускую мову дадаюць ці ўклейваюць непасрэдна ў гэтыя дапаможнікі.

Асноўныя патрабаванні да плакатаў, якія выдаваліся як друкарскім спосабам, так і рыхтаваліся бібліятэкай самастойна, – прадуманасць зместу і формы, адпаведнасць тэксту і ілюстрацыйнага матэрыялу, пастаяннае аднаўленне нагляднага матэрыялу ў адпаведнасці са зменамі ў рабоце бібліятэк, бібліяграфічных сродках пошуку інфармацыі, прынцыпамі сучаснага дызайну.

Пры пераходзе на выкарыстанне персанальных камп'ютэраў плакаты могуць быць пераведзены ў электронную форму. З дапамогай пэўных каманд спажывец інфармацыі можа звярнуцца за даведкай аб структуры бібліятэкі, наменклатуры яе паслуг, выкарыстанні той ці іншай бібліяграфічнай прадукцыі ў электроннай форме і атрымаць як тэкставую, так і тэкстава-графічную інфармацыю на маніторы камп'ютэра. З дапамогай інтэрнета спажывец інфармацыі можа звярнуцца да web-старонкі бібліятэкі і таксама атрымаць інфармацыю, якая дае ўяўленні аб бібліятэцы і яе паслугах і якая раней (ці паралельна) была прадстаўлена ў выглядзе плакатаў.

Цэнтральнае месца сярод наглядных масавых формаў бібліяграфічнага навучання карыстальнікаў інфармацыі займаюць выставы даведачных, бібліяграфічных і іншых відаў інфармацыйных выданняў. Выставы могуць быць пастаянна дзеючымі новых выданняў, на якіх прадстаўлены ўсе віды даведачных, інфармацыйных выданняў з сістэматычным аднаўленнем матэрыялу, пастаянным месцам экспазіцыі (як правіла, у бібліяграфічным аддзеле), выдзяленнем адпаведных раздзелаў, ці часовымі (афармляюцца ў сувязі з пэўнымі

актуальнымі падзеямі і носяць тэматычны характар). Могуць арганізоўвацца выставы канкрэтнага віду бібліяграфічных дапаможнікаў, інфармацыйных выданняў; выставы па адным бібліяграфічнм дапаможніку. Выставы даведачных, інфармацыйных выданняў могуць быць самастойнымі, а могуць уяўляць сабой раздзелы (часткі) кніжных выстаў (напрыклад, раздзел "Інфармацыйныя выданні" на выставе новых паступленняў у бібліятэку).

Асноўныя метадычныя патрабаванні да арганізацыі разглядаемых выстаў: абгрунтаваны падбор інфармацыйных выданняў (шматлікасць выданняў на выставе рассейвае ўвагу, абцяжарвае пошук і выбар неабходнага выдання); лагічнасць іх групоўкі і размяшчэння (ці па прызначэнні, ці па змесце); наяўнасць тлумачальных тэкстаў (назвы выставы, раздзелаў; анатацый, якія б раскрывалі прызначэнне і магчымасці выкарыстання асобных выданняў; да замежных выданняў рэкамендуецца даваць пераклад загалоўкаў і анатацыю).

Задача бібліятэчных работнікаў, бібліёграфаў – ажыццяўляць мэтанакіраваную работу як па арганізацыі саміх выстаў, так і па знаёмстве, прапагандзе іх сярод чытачоў з мэтай фарміравання ў чытачоў навыкаў самастойна сачыць за паступленнямі новых выданняў, карыстацца выставамі як крыніцамі знаёмства і пошуку неабходных выданняў.

Сярод масавых вусных формаў бібліяграфічнага навучання чытачоў неабходна вылучыць розныя віды аглядаў даведачных, бібліяграфічных і іншых інфармацыйных выданняў бібліятэк, органаў НТІ, замежных інфармацыйных устаноў. Выдзяляюцца агляды новых паступленняў разглядаемых відаў выданняў, агляды аднаго віду бібліяграфічных ці інфармацыйных выданняў, агляд аднаго бібліяграфічнага дапаможніка (часцей праводзіцца ў выглядзе прэзентацыі). У адрозненне ад аглядаў літаратуры гэтыя агляды павінны быць больш кароткімі, таму што да чытача будзе даводзіцца згорнутая інфармацыя, ад якой хутка стамляюцца; агляд павінен суправаджацца дэманстрацыяй інфармацыйных выданняў; павінна быць выкарыстана фактаграфічная інфармацыя, якая магла б зацікавіць спажыўца.

Сёння ўсё часцей агляды бібліяграфічных, інфармацыйных выданняў праводзяцца ў складзе комплексных мерапрыемстваў, як непасрэдна накіраваных на фарміраванне бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічнай культуры спажыўцоў, так і ў складзе комплексных мерапрыемстваў інфармацыйнага характару (дзень інфармацыі, дзень спецыяліста і інш.).

Да масавых вусных формаў адносяцца таксама лекцыі па мясцовым радыё, кансультацыі агульнага характару, разлічаныя на ўсе групы чытачоў бібліятэкі, напрыклад “Як карыстацца каталогамі і картатэкамі бібліятэкі”, чытацкія канферэнцыі аб ролі бібліяграфіі ў жыцці знакамітых вучоных, спецыялістаў і інш.

Вялікія магчымасці ў фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі маюць друкаваныя выданні. Сёння разнастайныя віды выданняў, накіраваныя на рэкламу бібліятэкі і яе паслуг, на знаёмства спажыўцоў інфармацыі з інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі, магчымасцямі іх выкарыстання, рыхтуюцца амаль кожнай бібліятэкай. Бібліятэкі разглядаюць рэкламу як сродак уключэння іх у сацыякультурнае жыццё рэгіёна, павышэнне аўтарытэту сярод насельніцтва, папулярызацыю сваіх магчымасцей і паслуг. Росквіт друкаванай рэкламы выклікала камп'ютэрызацыя. Камп'ютэрныя "выданні" лістовак, закладак, памятак, буклетаў – гэта ўжо рэаліі нашага часу шэрага бібліятэк.

Умоўна друкаваныя выданні дадзенага віду можна падзяліць на даведачна-кансультацыйныя, метадычныя, інфармацыйныя.

Дапаможнікі даведачна-кансультацыйнага характару павінны даць чытачам элементарны набор бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў аб бібліятэцы і яе паслугах. Гэта лістоўкі, буклеты, памяткі, у якіх, напрыклад, могут быць выкладзены правы і абавязкі чытачоў, правілы карыстання каталогамі і картатэкамі, інструкцыі для карыстальнікаў электроннымі сродкамі пошуку інфармацыі і інш. Так, пры адкрыцці электроннага чытальнага зала бібліятэкай распрацоўваецца пакет дакументацыі для карыстальніка: правілы карыстання залай; інструкцыі аб рабоце з браўзерамі па праглядзе гіпертэкставых дакументаў, пошукавымі сістэмамі, аб выкарыстанні магчымасцей электроннай пошты, пошуку і атрыманні доступу да разнастайных інфармацыйных масіваў і інш. Прычым разнастайнасць баз і банкаў даных, праграмнага забеспячэння функцыянавання АБІС ускладняе працэс пошуку неабходнай інфармацыі для карыстальнікаў і патрабуе ад кожнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі добра распрацаванай методыкі пошуку інфармацыі і адлюстравання яе ў інструкцыях для чытачоў.

Выданні метадычнага характару прызначаны ў дапамогу да заняткаў са спажыўцамі інфармацыі. Яны могуць быць выкарыстаны і спецыялістамі, якія самастойна авалодваюць навыкамі інфармацыйнай, бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Да друкаваных матэрыялаў дадзенага віду можна аднесці памяткі, метадычныя парады, метадычныя рэкамендацыі па бібліяграфічным апісанні дакументаў, складанні бібліяграфічных спісаў да навуковых работ, выкарыстанні стандартаў пры падрыхтоўцы другасна-дакументнай інфармацыі, выкарыстанні бібліяграфічных, інфармацыйных выданняў у дапамогу навуковай дзейнасці і інш. У бібліятэках ствараюцца навучальныя праграмы ў электронным выглядзе: "Каталогі – вашы памочнікі ў вучобе", "Бібліяграфічны апарат навуковай работы".

Да інфармацыйных дапаможнікаў можна аднесці даведнікі па бібліятэках, органах інфармацыі, архівах, музеях, якія раскрываюць звесткі аб структуры, фондзе, ДБА і іншым, рэкламуюць іх інфармацыйныя, бібліяграфічныя прадукты і паслугі.

Да электронных формаў, якія садзейнічаюць фарміраванню бібліяграфічнай культуры спажыўцоў і дапамагаюць у інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці, адносяцца: створаны інтэрфэйс да ўласных праграмных сродкаў; web-старонкі бібліятэк, выстаўленыя ў інтэрнет ці ў іншыя камп'ютэрныя сеткі, на якіх змяшчаецца інфармацыя аб структуры бібліятэкі, інфармацыйных рэсурсах, як першасных, так і другасных, інфармацыйных прадуктах і паслугах і інш.; даведкі, якія суправаджаюць розныя праграмы АБІС, накіраваныя на знаёмства з ёй карыстальнікаў і аказанне дапамогі пры выкарыстанні электронных прадуктаў і паслуг бібліятэкі з дадзеным праграмным забеспячэннем (напрыклад, пры звароце да электронных выданняў); спецыяльныя навучальныя праграмы. Да электронных сродкаў можна аднесці і існуючыя на электронных носьбітах, сайтах бібліятэк настаўленні, даведнікі па бібліятэках, другасных інфармацыйных рэсурсах, "навігатары" інтэрнет-адрасоў сайтаў, што змяшчаюць інфармацыю па пэўных галінах ведаў, і інш.

Усё большае распаўсюджанне ў рабоце бібліятэк атрымліваюць комплексныя формы фарміравання бібліяграфічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры спажыўцоў інфармацыі. Да традыцыйных адносяцца экскурсіі, дні бібліяграфіі, дні бібліятэкі, якія спалучаюць вусныя, наглядныя і друкаваныя формы. Напрыклад, праграма дня бібліяграфіі ўключае экскурсіі па бібліятэцы, агляды даведачных, бібліяграфічных, інфармацыйных выданняў, кансультацыі па розных частках ДБА бібліятэкі, кансультацыі метадычнага характару (як сачыць за новай літаратурай, як аформіць спіс работы і г.д.), інфарміны, віктарыны, прэзентацыі новых бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, распаўсюджванне друкаваных матэрыялаў у дапамогу інфармацыйнай дзейнасці спажыўцоў інфармацыі, знаёмства з рознымі выставамі, нагляднымі сродкамі, якія адрасаваны карыстальнікам у дапамогу іх спажывецкай дзейнасці ў бібліятэцы.

Перавагі гэтых формаў заключаюцца не толькі ў комплексным выкарыстанні розных сродкаў бібліяграфічнага навучання спажыўцоў інфармацыі, але і ў комплексным прадстаўленні магчымасцей бібліятэкі як канала інфармацыйных рэсурсаў, сервісных паслуг, арганізацыі адпачынку; актывізацыі пазнавальнай інфармацыйнай дзейнасці спажыўцоў інфармацыі; ажыццяўленні зваротнай сувязі са спажыўцамі (адказы на пытанні спажыўцоў, кантроль за засваеннем атрыманых падчас мерапрыемства ведаў і інш.). Правядзенне гэтых формаў патрабуе вялікай падрыхтоўчай работы: распрацоўкі плана падрыхтоўкі і правядзення, дакладнага вызначэння праграмы мерапрыемства, прыцягнення да ўдзелу ў днях бібліяграфіі супрацоўнікаў розных структурных падраздзяленняў бібліятэкі, правядзення рэкламна-інфармацыйных мерапрыемстваў.

Актывізавалася дзейнасць бібліятэк па выкарыстанні сродкаў масавай інфармацыі для папулярызацыі кнігі, чытання, рэкламы бібліятэкі, пашырэння ведаў спажыўцоў інфармацыі аб яе магчымасцях і ўзмацнення яе інфармацыйнага ўздзеяння на насельніцтва. Так, напрыклад, амаль усе ЦБС Віцебскай вобласці рыхтуюць матэрыял для радыёперадачы "Бібліятэка каля мікрафона", Жлобінская ЦБ ужо не адзін год вядзе перадачу "Бібліятэчная служба навін", Рэчыцкая ЦБ сістэматычна выходзіць на мясцовае радыё з перадачай "Бібліяфакт", Чачэрская ЦБ вядзе радыёлекторый "Час. Кніга. Чалавек" і інш. З 1988 г. на Гомельскім тэлебачанні пачала выходзіць тэлеперадача "Кніжны кур'ер", супрацоўніцтва з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мясцовым тэлебачаннем распачалі таксама бібліятэкі Віцебскай, Мінскай абласцей. Тэлебачанне дазваляе значна пашырыць аўдыторыю, паказаць магчымасці бібліятэк як аднаго з важнейшых каналаў інфармацыі грамадства, зламаць стэрэатып успрымання бібліятэк як "казённых", "шэрых" устаноў.

*Групавыя і індывідуальныя формы* звязаны з рэалізацыяй дыферэнцыраванага падыходу да фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі, спрыяюць пераемнасці, глыбіні навучання, праводзяцца з улікам рэальных патрэбнасцей спажыўцоў у інфармацыйных ведах і ўзроўню іх інфармацыйнай падрыхтоўкі.

Адной з такіх формаў з'яўляюцца бібліяграфічныя кансультацыі, якія бываюць індывідуальнымі і групавымі. Індывідуальныя бібліяграфічныя кансультацыі праводзяцца пры кожным звароце спажыўца інфармацыі да бібліятэкара, бібліёграфа. Асабліва часта індывідуальнае кансультаванне ажыццяўляецца ў працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пры выкананні канкрэтных запытаў спажыўцоў інфармацыі. Пры гэтым бібліёграф значную ўвагу надае аналізу запатрабаванняў спажыўца, разбору яго памылак пры ажыццяўленні пошуку, дае парады па методыцы бібліяграфічнага пошуку, аб крыніцах пошуку, правільнасці афармлення яго вынікаў і інш. Такое навучанне мае добрыя вынікі, таму што спажывец праяўляе асабістую зацікаўленасць, мае пазітыўную ўстаноўку на ўспрыманне інфармацыі. Але гэтая форма патрабуе і ад бібліёграфа высокай бібліяграфічнай культуры, таму што кансультацыі прыходзіцца даваць без папярэдняй падрыхтоўкі, тэматыка іх можа быць самая разнастайная, патрабуецца ўлік псіхолага-педагагічных асаблівасцей індывідуальнай работы са спажыўцамі.

Групавыя кансультацыі праводзяцца для асноўных груп спажыўцоў інфармацыі з улікам іх інфармацыйных патрэбнасцей і асаблівасцей інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці, маюць, як правіла, тэматычны характар, загадзя плануюцца, рыхтуюцца бібліёграфам.

Да групавых адносяцца і іншыя разнастайныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры: тэматычныя выставы даведачных, бібліяграфічных і інфармацыйных выданняў, агляды, экскурсіі, дні бібліяграфіі, друкаваныя матэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест указаных формаў, методыка іх падрыхтоўкі і правядзення вызначаюцца патрэбнасцямі, узроўнем інфармацыйнай культуры той групы спажыўцоў, на якую яны разлічаны; для павышэння іх эфектыўнасці некаторыя з іх праводзяцца як выязныя, па месцы працы спажыўцоў інфармацыі; да іх правядзення (напрыклад, аглядаў інфармацыйных выданняў у дапамогу спецыялістам) могуць далучацца самі спецыялісты, каб даць больш аб'ектыўную ацэнку выданням, паказаць месца і ролю кожнага выдання ў сістэме інфармацыйнага забеспячэння галіны ведаў ці сферы дзейнасці.

Бібліятэкамі выпрацаваны і спецыфічныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры асобных груп карыстальнікаў, такіх як школьнікі, студэнты, спецыялісты.

### *10.2. Асаблівасці фарміравання бібліяграфічнай культуры асобных груп спажыўцоў інфармацыі*

Работу па фарміраванні бібліяграфічнай культуры школьнікаў ажыццяўляюць сёння школьныя, дзіцячыя і масавыя бібліятэкі сумесна з настаўнікамі школ. Арганізатарам гэтай работы ў раёне выступае дзіцячая бібліятэка, якая складае графік правядзення заняткаў, ажыццяўляе кантроль за яго выкананнем, каардынуе дзейнасць дзіцячых, школьных і масавых бібліятэк, ажыццяўляе метадычную дапамогу ў правядзенні гэтай работы, праводзіць працу з адміністрацыяй школ і настаўнікамі.

Да цяперашняга часу бібліятэчныя работнікі выкарыстоўваюць трэцяе выданне праграмы, якая падрыхтавана ў выглядзе практычнага дапаможніка "Библиотечно-библиографические знания – школьникам" (1989) і прадугледжвае фарміраванне ў школьнікаў кнігазнаўчых ведаў, развіццё навыкаў самастойнай работы з кнігай, знаёмства з бібліятэкамі, іх асаблівасцямі, структурай ДБА, набыццё ўменняў карыстацца фондам бібліятэк і ДБА, весці самастойны пошук і выбіраюць кнігі з дапамогай яго розных частак, прымяняць бібліятэчна-бібліяграфічныя веды пры выкананні розных даручэнняў. Безумоўна, што сёння праграма бібліяграфічнай падрыхтоўкі школьнікаў патрабуе актуалізацыі, ўвядзення новых тэм.

Што тычыцца асноўных формаў правядзення заняткаў, то іх выбар залежыць ад ўзросту школьнікаў. Для малодшых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школьнікаў праводзяцца ўрокі пазакласнага чытання, на якіх настаўнікі-славеснікі побач з аналізам мастацкіх твораў вырашаюць задачу выхавання чытацкіх навыкаў; школьныя бібліятэкі праводзяць экскурсіі, гутаркі, тэатралізаваныя заняткі, шырока выкарыстоўваюць гульнёвыя формы – гульні-вандроўкі па кнігах, ДБА. Для школьнікаў старшых класаў праводзяцца ўрокі (бібліятэчныя, камп'ютэрнай пісьменнасці, бібліятэчна-камп'ютэрныя), практычныя заняткі, інфармацыйныя дзелавыя гульні, інфарміны, вечары пытанняў і адказаў, гульні тыпу КВЗ "Што, дзе, калі?", экскурсіі, прэзентацыі БД, CD-ROM дыскаў. У дзіцячых бібліятэках ствараюцца класы па навучанні школьнікаў рабоце на персанальных камп'ютэрах і выкарыстанні электронных сродкаў інфармацыі.

Між тым, нягледзячы на назапашаны вопыт работы бібліятэк, яшчэ застаецца шмат праблем: уключэнне ў якасці абавязковага курса "Інфармацыйная культура школьніка" ў вучэбныя планы агульнаадукацыйных школ, распрацоўка новых праграм навучання школьнікаў, падрыхтоўка школьных бібліятэкараў да правядзення гэтай работы, каардынацыя дзейнасці бібліятэк, настаўнікаў (у тым ліку і выкладчыкаў школьнага курса "Інфарматыка") па фарміраванні інфармацыйнай, бібліяграфічнай культуры школьнікаў.

Фарміраванне бібліяграфічнай культуры студэнтаў ажыццяўляецца ў працэсе арганізаванага навучання: на лекцыях, практычных, семінарскіх занятках пры выкладанні курсаў "Асновы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў", "Асновы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў і інфарматыкі", "Уводзіны ў спецыяльнасць", а ў апошні час у асобных ВНУ пачаў уводзіцца курс "Інфармацыйная культура спецыяліста". Змест, напаўняльнасць гэтых курсаў, як і колькасць адведзеных гадзін на іх выкладанне, розная ў розных ВНУ. У сувязі з названымі ў пачатку дадзенага раздзела аб'ектыўнымі фактарамі і вопытам іншых краін СНД мяркуецца, што і ў ВНУ нашай краіны паступова будзе ўведзены ў якасці абавязковага курс "Інфармацыйная культура спецыяліста". Праграмы выкладання гэтага курса прапануецца будаваць з улікам блочна-модульнага прынцыпу стварэння інварыянтнай часткі курса, аднолькавай для студэнтаў усіх спецыялізацый. У гэтую частку можна ўключыць пытанні, звязаныя з разглядам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыроды і сутнасці інфармацыі, яе асноўных характарыстык, формаў існавання і грамадскіх функцый; пытанні, прысвечаныя інфармацыйнай палітыцы сучаснага грамадства, псіхафізіялагічным асаблівасцям інфармацыйнага ўзаемадзеяння, маральна-этычным нормам у сістэме інфармацыйных камунікацый. У рамках зменнай часткі курса павінна вывучацца спецыфіка канкрэтнага галіновага інфаасяроддзя, прапануецца ўдзяліць увагу характарыстыцы галіновых інфармацыйных рэсурсаў і сістэм, сучасных інфармацыйных тэхналогій пошуку, выкарыстання і распаўсюджання інфармацыі з улікам профілю падрыхтоўкі спецыялістаў і ўзаемадзеяння іх з галіновымі ІПС.

Бібліятэкі ВНУ выкарыстоўваюць разнастайныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры студэнтаў у выглядзе спецыяльных бібліятэчных мерапрыемстваў: праводзяць дні першакурсніка, дні дыпломніка, дні бібліяграфіі, дні дапаможнікаў, выставы, арганізоўваюць куткі ў дапамогу самастойнай рабоце студэнтаў, выкарыстоўваюць іншыя формы нагляднай, друкаванай, вуснай, электроннай перадачы інфармацыі. Некаторыя бібліятэкі ВНУ, у прыватнасці навуковая бібліятэка БДПА, стварылі ў структуры даведачна-бібліяграфічнага аддзела спецыяльны сектар па арганізацыі і правядзенні бібліятэчна-бібліяграфічных заняткаў.

Работа бібліятэк па фарміраванні інфармацыйнай, бібліяграфічнай культуры спецыялістаў ажыццяўляецца прафіляванай ў залежнасці ад сферы дзейнасці спецыялістаў, галіновай прыналежнасці, узроўню інфармацыйнай падрыхтоўкі, іх гатоўнасці працягваць сваё інфармацыйнае навучанне. Праводзяць гэтую работу, як правіла, навуковыя бібліятэкі, а таксама навукова-тэхнічныя і спецыяльныя па месцы работы ці вучобы спецыялістаў. Трэба адзначыць, што (паводле даных сацыялагічных даследаванняў буйнейшых бібліятэк Расіі, Беларусі) каля 80 % спецыялістаў–чытачоў бібліятэк – рэгулярна звяртаюцца за дапамогай да бібліёграфаў, 60 % – асэнсоўваюць неабходнасць і гатовыя працягваць сваё інфармацыйнае навучанне. Навыкамі камп'ютэрнай пісьменнасці валодаюць каля 40% рэспандэнтаў. Сярод формаў бібліяграфічнага навучання спецыялісты аддаюць перавагу (у парадку зніжэння рэйтынгу) такім, як даведнікі па фондах і каталогах; наглядныя сродкі перадачы бібліятэчна-бібліяграфічных ве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даў і інфармавання аб інфармацыйных рэсурсах; практычныя паказы методык інфармацыйнага пошуку; лекцыі па асновах інфармацыйнага пошуку з улікам спецыялізацый; аглядныя экскурсіі; аглядныя лекцыі; семінары; відэа- і аўдыёкурсы.

У рэспубліканскіх навуковых бібліятэках, бібліятэках ВНУ краіны адкрываюцца інтэрнет-класы, дзе праводзіцца ў тым ліку і навучанне спецыялістаў па выкарыстанні інтэрнет-рэсурсаў; штогод БелСГБ праводзіць аднатыднёвыя курсы па знаёмстве і засваенні новых інфармацыйных тэхналогій для карыстальнікаў інфармацыі – работнікаў НДІ, навуковых устаноў, ВНУ і іншых арганізацый АПК. АУНБ краіны вядуць падрыхтоўку спажыўцоў інфармацыі па аваладанні камп'ютэрамі, навыкамі пошуку электронных рэсурсаў у рамках праграмы ІАТР (Праграма прадастаўлення доступу і навучання ў інтэрнеце, праект Праграмы развіцця ААН "Інтэрнет-2").

Нягледзячы на даволі значны пералік формаў, прымяняемых у бібліятэках, іх практыка пастаянна ўзбагачаецца, і пры творчым падыходзе да распаўсюджвання бібліяграфічных ведаў станоўчыя вынікі могуць быць дасягнуты толькі пры самых разнастайных спалучэннях метадаў і формаў, традыцыйных і наватарскіх.

### *Пытанні і заданні*

1. У чым заключаюцца прычыны трансфармацыі работы бібліятэкі па прапагандзе бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў у такі кірунак, як фарміраванне інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі?

2. Прывядзіце азначэнне паняццяў "бібліятэчна-бібліяграфічная пісьменнасць", "культура чытання", "камп'ютэрная пісьменнасць", "бібліяграфічная культура", "інфармацыйная пісьменнасць" і "інфармацыйная культура" і ўстанавіце іх суадносіны.

3. Вызначце ролю і задачы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

4. Якія тэндэнцыі і перспектывы развіцця работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі вы можаце вызначыць?

5. Як вывучаецца эфектыўнасць работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

*Аб бібліятэчнай* справе ў Рэспубліцы Беларусь: закон Рэсп. Беларусь // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. – 1995. – № 20. – Арт. 238. – С. 8–21.

*Аб інфарматызацыі:* закон Рэсп. Беларусь // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. – 1995. – № 33. – Арт. 428. – С. 3–15.

*Березкина, Н.Ю.* Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н.Ю.Березкина, Л.А.Авгуль, Б.Б.Невский. – Мн.: Красико-Принт, 2002. – 144 с.

*Вохрышева, М.Г.* Библиографическая деятельность: структура и эффективность / М.Г.Вохрышева. – М.: Кн. палата, 1989. – 199 с.

*ГОСТ 7.0–99.* Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения: межгос. стандарт. – СИБИД. – Мн.: Белстандарт, 1999. – 23 с.

*ГОСТ 7.76–96.* Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения: межгос. стандарт. – Мн.: Белстандарт, 1998. – 34 с.

*ГОСТ 7.9–95.* Реферат и аннотация. Общие требования: межгос. стандарт. – Мн.: Белстандарт, 1999. – 8 с.

*Коготков, Д.Я.* Библиографическая деятельность библиотеки: организация, управление, технология: учебник / Д.Я.Коготков. – СПб.: Профессия, 2003. – 304 с.

*Концепция* информационного взаимодействия библиотек Беларуси: разработана в рамках Программы развития единой компьютерной сети Республики Беларусь (НИКС РБ) и утверждена на засед. Респ. библ. совета при Мин-ве культуры 3.03.2000 г. / Бел. библиотеч. ассоциация. – Мн.: Красико-Принт, 2001. – 47 с.

*Леонов, В.П.* Реферирование и аннотирование научно-технической литературы /В.П.Леонов – Новосибирск: Наука. Сиб. отд-ние, 1986. – 176 с.

*Лявончыкаў, В.Е.* Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: падручнік / В.Е.Лявончыкаў. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991. – 258 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Моргенштерн, И.Г.* Научная организация библиографического труда: учеб. пособие по спецкурсу / И.Г.Моргенштерн. – Челябинск: Челябинск. гос. ин-т искусства и культуры, 1992. – 102 с.

*Моргенштерн, И.Г.* Справочно-библиографическое обслуживание в библиотеках: науч.-практ. пособие / И.Г. Моргенштерн. – М.: Либерея, 1999. – 79 с.

*Моргенштерн, И.Г.* Общее библиографоведение: учеб. пособие / ЧТАКИ; И.Г.Моргенштерн. – СПб.: Профессия, 2005. – 208 с.

*Справочник* библиографа / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – 528 с. (Серия «Библиотека».)

*Справочник* библиотекаря / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб.: Профессия, 2001. – 439 с. (Серия «Библиотека».)

*СТБ 7.60–93.* Выданні. Асноўныя віды. Тэрміны і азначэнні. – Мн.: Дзяржстандарт, 2003. – 44 с.

*Степанов, В.* Практические уроки: интернет для библиотекарей (С компьютером на «ты»; вып. 2) / В.Степанов. – М.: Либерея, 1998. – 64 с.

*World Wide Web* – стратегия эффективного поиска: справочник для библиотек / РНБ, РБА; сост. И.С.Галеева и др. – СПб.: Рос. нац. б-ка, 2001. – 207 с.

*Дадатковая*

*Алёшин, Л.И.* Электронные базы данных персоналий / Л.И.Алёшин // Библиография. – 1999. – №1. – С. 28–30.

*Барышева, О.В.* Библиография в эпоху электронной коммуникации / О.В.Барышева, Р.С.Гиляревский // Библиография. – 1999. – № 6. – С. 3–13.

*Берестова, Т.Ф.* СБА универсальных библиотек: модные веяния и устойчивые тенденции / Т.Ф.Берестова // Библиография. – 1997. – № 4. – С. 49–54.

*Брежнева, В.В.* Информационное обслуживание: продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации предприятий / В.В.Брежнева, В.А.Минкина; СПбГУКИ. – СПб.: Профессия, 2004. – 304 с. – (Серия «Библиотека».)

*Васильева, Т.А.* Комплектование и организация компактных оптических дисков в универсальных научных библиотеках / Т.А.Васильева, В.Ю.Елесина // Науч. и техн. б-ки. – 1997. – № 2. – С. 76–81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Гиржон, А.А.* К вопросу организации учета баз данных / А.А.Гиржон // Информационные технологии в библиотеках на рубеже веков: проблемы, поиски, решения: материалы междунар. науч.-практ. конф. – Мн.: Красико-Принт, 1999. – С. 133–136.

*Ерохо, Т.А.* Справочно-библиографическое обслуживание пользователей в виртуальной сфере: зарубежный опыт и перспективы развития в НББ // Бібл. свет. – 2005. – № 4. – С. 10–13.

*Жабко, Е.Д.* Справочно-библиографическое обслуживание в 1990-е годы: тенденции развития / Е.Д.Жабко // Информационно-библиографическое обслуживание. Вып.1.История и современное состояние: сб. ст. / Рос. национальная библиотека. – СПБ., 2003. – 192 с.

*Жабко, Е.Д.* Справочное обслуживание в сетевой сфере: от локального обслуживания к национальным корпоративным службам / Е.Д.Жабко // Биб. компьютерные сети: Россия и Запад. – М.: Либерея, 2003. – Вып. 2. – С. 39–47.

*Зыгмантовіч, С.В.* Бібліятэкі ў сістэме фарміравання інфармацыйнай культуры асобы / С.В.Зыгмантовіч // Бібліятэчны свет. – 2002. – № 4. – С. 10–12.

*Ильина, И.И.* Как пользоваться Российской библиографией на CD-ROM / И.И.Ильина, Д.М.Гитер, М.Б.Лавринович // Мир библиографии. – 1999. – № 3. – С. 8–10.

*Капырына, А.* Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ва ўмовах аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў / А.Капырына // Бібліятэчны свет. – 1997. – №2. – С. 8–10.

*Климаков, Ю.В.* Муниципальная библиотека: справочно-библиографический аппарат: учеб.-метод. пособие / Ю.В.Климаков. – М.: Либерея-Бибинформ, 2005. – 88 с.

*Майстрович, Т.В.* Доступ пользователей к машиночитаемым источникам информации / Т.В.Майстрович // Науч. и техн. б-ки. – 1998. – № 4. – С. 35–39.

*Минкина, В.А.* Информационное обслуживание. Продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации / В.А.Минкина, В.В.Брежнева. – СПб.: Профессия, 2003. – 320 с.

*Минкина, В.А.* Формирование информационной культуры личности / В.А.Минкина, В.В.Брежнева // Мир библиографии. – 1998. – № 3. – С. 21–23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мотульский, Р.С.* Международное сотрудничество библиотечно-информационных учреждений Республики Беларусь / Р.С.Мотульский // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 2. – С. 31–34.

*Пилко, И.С.* Технологические процессы в библиотечной работе: учеб.-метод. пособие / И.С.Пилко. – М.: Либерея, 2005. – 176 с. – Вып. 26. (Библиотекарь и время XXI век.)

*Пилко, И.С.* Технологическое обеспечение производства библиографических продуктов и услуг / И.С.Пилко // Науч. и техн. б-ки. – 1990. – №1. – С. 11–15.

*Пилко, И.С.* Электронный библиографический сервис: расчёты и просчёты / И.С.Пилко, Л.Г.Тараненко // Библиография. – 2000. – №6. – С. 3–7.

*Поручи* поиск человеку: виртуальные справочные службы в современных библиотеках / Н.Б.Михнова и др.; под общ. ред. И.Б.Михновой. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2005. – 304 с.

*Романенко, В.Н.* Сетевой информационный поиск: практ. пособие / В.Н.Романенко, Г.В.Никитина; Российская академия естественных наук. Северо-Западное отделение образования и развития науки. – СПб.: Профессия, 2003. – 288 с.

*Формирование* информационной культуры личности в библиотеках и образовательных учреждениях: учеб.-метод. пособие / Н.И.Гендина, Н.И.Колкова, И.Л.Скипор, Г.А.Стародубова; науч. ред. Н.И.Гендина. – 2-е изд., перераб. – М.: Школьная б-ка, 2003. – 296 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**Зыгмантовіч** Святлана Вікенцьеўна

**АРГАНІЗАЦЫЯ І ТЭХНАЛОГІЯ
БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

*Вучэбны дапаможнік*

Рэдактары І.В.Смяян, Л.Ц.Спірыдонава
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2006 г. Фармат 60Х84 1/16.
Папера пісчая № 2. Друк глыбокі. Ум. друк. арк. 19,0.
Ул.-выд. арк. 16,9. Тыраж экз. Заказ

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія ЛП № 496 ад 25.06.2002 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ